WEISSRUSSISCHE AKADEMIE DER WISSENSCHAFTEN

VEROFFENTLICHUNGEN

DER

ABTEILUNG FÜR HUMANISTISCHE WISSENSHAFTEN

BUCH 9

ARBEITEN DER PHILOLOGISCHEN UNTERABTEILUNG

BAND II

UNTER DER GESAMTREDAKTION DER PRÄSIDIUMS PHILOLOGISCHEN UNTERABTEILUNG

MINSK 1929

рх. 6

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

ЗАПІСКІ

АДДЗЕЛУ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

КНІГА 9

ПРАЦЫ КЛЯСЫ ФІЛЁЛЁГІІ

ТОМ II

69

ПАД АГУЛЬНАЙ РЭДАКЦЫЯЙ
ПРЭЗЫДЫУМУ КЛЯСЫ ФІЛЁЛЁГІІ

МЕНСК 1929

Библ-ка им. В. Г. Белинского
Академии наук БССР

ЦНБ НАН Беларуси

С. Некрашэвіч.

Да характарыстыкі беларускіх гаворак Парыцкага раёну.

(Кароткі этнографічна-лінгвістычны нарыс).

Гаворкі Парыцкага раёну ў шмат якіх адносінах зьяўляюцца для беларускага дыялектолёга цікавымі гаворкамі, бо як раз па тэрыторыі Парыцкага раёну праходзяць граніцы некалькіх моўных зьяў, што становяць сабою найбольш характэрныя асаблівасьці беларускае мовы. Гэтая абставіна, а таксама маё блізкае знаёмства з гаворкамі раёну і падалі мне думку ўзяцца за вывучэньне гаворак гэтага раёну [1]).

Параўноўваючы гаворкі Парыцкага раёну з іншымі дасьледаванымі беларускімі гаворкамі, трэба сказаць, што яны бліжэй за ўсё стаяць да дасьледаваных О. Воўк-Левановічам гаворак в. Татаркавічы

---

[1]) Для вывучэньня Парыцкіх гаворак я зрабіў дзьве паездкі. Першая мая паездка адбылася ўлетку 1927 г. разам з этнографам А. Ягоравым, які запісаў народныя песьні (мэлёдыі). Мы пабывалі ў наступных вёсках: Палянках, Пакалічах, Дабравольшчыне, Казлоўцы і ў м. Парычах. Апрача таго, я яшчэ адзін пабываў у в. в. Слабодцы, Коўцічах, Майсееўцы (Літоўскай) і Малімонах.

Улетку 1928 г. сумесна з А. Ягоравым і проф. П. А. Бузуком я паехаў у Парыцкі раён у другі раз. Цяпер мы разам пабывалі ў в.в. Раманішчах, Чэрніне, Дуброве і Чыркавічах. У Чыркавічах П. А. Бузук адстаў, і ў далейшым я езьдзіў удвох з А. Ягоравым. Мы пабывалі ў Парычах, Данілоўцы, Васілёўцы і Краснаўцы. Апрача таго, я яшчэ адзін пабываў у в. в. Воземлі і Карпілаўцы Глускага раёну. На абедзьве паездкі мною было затрачана каля 20 дзён. Тэрмін бязумоўна малы для дакладнага вывучэньня гаворак даволі такі вялікага раёну, тым больш, што з гэтага раёну як раз няма аніякіх матар'ялаў, — ні ў друкаваных матар'ялах ранейшых этнографаў (Фольклёрныя матар'ялы П. Шэйна, А. Сержпутоўскага, І. Сербава, Н. Янчука датычаць іншых раёнаў Баббрускай акругі) ні ў рукапісным зборы фольклёрных матар'ялаў Катэдры этнографіі Беларускае Акадэміі Навук, якія можна-б было скарыстаць у мэтах вывучэньня гаворак Парыцкага раёну.

Калі аднак я адважыўся характарызаваць усе Парыцкія гаворкі, то выключна таму, што я ведаю гаворку шмат якіх вёсак раней (Забалацьця, Тумараўкі, Істопак, Пратасоў, Медзьведава і інш.).

Зразумела, што мне хацелася даць дакладнае апісаньне гаворак раёну. З гэтай мэтай я зьвярнуўся з дыялектолёгічнай програмай да настаўніцтва Парыцкага раёну з просьбай аб яе запаўненьні. На жаль з 43 разасланых друкаваных програм ні на адну з іх адказаў не паступіла. Не паступіла таксама ад настаўніцтва адказаў і на мае кароткія пісьмовыя запытаньні адносна некаторых моўных зьяў, што мяне цікавілі, за выключэньнем настаўнікаў Краснаўскай школы С. Г. Мітраховіча і Пратасаўскай В. І. Бараноўскага, якім тут і выражаю сваю шчырую падзяку.

Аднак я ўсё-ж спадзяюся, што ўсе характэрныя асаблівасьці беларускіх гаворак Парыцкага раёну мною адмечаны, і што ў маёй працы значных недахопаў ня будзе.

і ваколічных вёсак.[1]) Аднак у Парыцкіх гаворках ёсьць ці мала і іншых рысаў, уласьцівых выключна гэтым гаворкам.

Праўда, блізка што ўсе адзначаныя тут асаблівасьці Парыцкіх гаворак ужо раней зафіксаваны ў досьледах акад. Е. Ф. Карскага і другіх па матар'ялах з іншых масцовасьцяй Беларусі. Тым ня менш апошняя абставіна не пазбаўляе Парыцкія гаворкі іх цікавасьці і ня можа служыць перашкодай для іх дасьледаваньня, бо дыялектолёгія кожнай мовы павінна ня толькі выявіць усе асаблівасьці данай мовы, але і паказаць разьмяшчэньне моўных зьяў на тэрыторыі гэтай мовы.

Перш чым прыступіць да разгляду гаворак Парыцкага раёну, лічу патрэбным даць кароткі географічна-этнографічны і эканомічны нарыс, каб паказаць уплыў прыродных умоў і эканомікі на мову раёну, склад насельнасьці раёну і тое месца асноўнай групы насельнасьці — сялян-беларусаў, якое яны займаюць адносна культурных уплываў на сваю мову.

Парыцкі раён ляжыць у паўднёва-ўсходнім кірунку ад акруговага г. Бабруйску і займае плошчу ў 1532 кв. вярсты. 30,8% гэтай плошчы занята лясамі[2]). Цэнтрам раёну зьяўляецца м. *Парычы.* Адлегласьць м. Парыч ад Бабруйску 45 в. Бліжэйшымі чыгуначнымі станцыямі раёну зьяўляюцца: на ўсходзе *Красны Бераг,* на поўдні *Рацьміравічы* і на паўднёвы-ўсход *Шацілкі,* усе Зах. чыг., прыблізна ў 30 в. кожная ад м. Парыч. З гэтых станцый і чыгуначных ліній першыя дзьве знаходзяцца ў суседніх раёнах (Жлобінскім і Глускім), і толькі трэйцяя лінія са ст. Шацілкамі, пабудаваная перад самай імпэрыялістычнай вайной, праходзіць па невялікім кавалку тэрыторыі раёну. Такім парадкам чыгунка сколькі-небудзь значнага уплыву на мову насельнасьці ня робіць.

Большы ўжо ў гэтым сэнсе робіць уплыў вялікая суднаходная рака Бярэзіна (мясцовая назва *Бяроза*), што працякае па тэрыторыі раёну і падзяляе яго на дзьве палавіны. Правы бераг Бярозы высокі, пяшчаны; левы нізкі, лугавы. Вясною ў часе паводкі, калі вада затапляе лугі, шырыня Бярозы дасягае 4-5 в. У такую пору зносіны праваберажнай часткі раёну з леваберажнай слабыя, і калі падтрымліваюцца, то бадай выключна на чаўнох. Дый улетку, калі нават высыхаюць лугі, зносіны абедзьвюх частак раёну таксама неінтэнсыўныя, бо пераправы праз Бярозу магчымы толькі ў некаторых месцах, дый то выключна на паромах. Рака Бяроза ў раёне мае дзьве прыстані: м. Парычы і м. Шацілкі. Навігацыйны пэрыод Бярозы каля 6 месяцаў. За гэты час прыходзяць параходы з Украіны (Кіева) і з Барысава. За гэты-ж час па Бярозе сплаўляецца на Украіну многа лесу і лясных матар'ялаў. Аднак уплыў Бярозы, як суднаходнай ракі на мову насельнасьці ўсяго раёну ўсё-ж невялікі і бадай выключна абмяжоўваецца прыстанямі — м. Парычамі і Шацілкамі, мова якіх нават па іншых прычынах аж да самай рэволюцыі адчувала на сабе моцны расійскі ўплыў (існаваньне ў мястэчках расійскай і зрусіфікаванай яўрэйскай інтэлігенцыі, існаваньне ў м. Парычах жаночай 8 кляс. епархіяльнай школы і вышэйшай пачатковая школы). Ня робячы аднак беспасярэдна значнага ўплыву на мову насельнасьці, як суднаходная рака, Бяроза куды большы ўплыў робіць на мову праваберажнай і леваберажнай

---

[1]) О. В. Воўк-Левановіч. Важнейшыя рысы гаворкі в. Татаркавічы і гаворак вак. вёсак (Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук ІБК, кн. 2).

[2]) Матар'ялы па лясной дасьледчай справе. 1927.

частак раёну, як натуральная перашкода, што падзяляе раён на дзьве часткі. Гэтая перашкода настолькі сур'ёзная, што Бяроза часта зьяўляецца прыроднай граніцай некаторых моўных зьяў.

Гаворачы аб уплыве прыродных умоў на мову раёну, нельга не адзначыць лясоў і балот, якія таксама часта становяць сабою прыродныя граніцы паасобных моўных зьяў.

У адміністрацыйных адносінах раён падзяляецца на наступныя 16 сельсаветаў: 1) Сьцяпскі, 2) Шчадрынскі (яўрэйскі), 3) Дабравольшчынскі, 4) Каралева-Слабодзкі, 5) Казлоўскі, 6) Парыцкі местачковы, 7) Раманіцкі, 8) Чэрнінскі, 9) Пратасаўскі, 10) Гарохавіцкі, 11) Дуброўскі, 12) Любаньскі, 13) Ракшынскі, 14) Чыркавіцкі, 15) Шацілаўскі і 16) Коўціцкі.

Лік насельніцтва раёну, апрача м. Парыч, згодна перапісу 1926 г., складае 44033 чалав.: 21483 мужч. і 22550 жанч. З іх: беларусаў 35784 чал. або 81% (18560 муж. і 18224 жанч.), рускіх 3181 чал. або 7% (1508 м. і 1673 ж.), яўрэяў 3102 чал. або каля 7% (1461 м. і 1641 жанч). і палякоў 1769 чал. або 4% (903 м. і 966 ж.). Аднак лік палякоў у раёне трэба лічыць значна ніжэй, бо беларуская каталіцкая шляхта па прычынах, аб якіх будзе сказана ніжэй, залічае сябе да палякоў, хоць польскай мовы ня ведае. Дзеля гэтага пры вылічэньні больш-менш запраўднага ліку палякоў трэба выходзіць з ліку асоб, якія карыстаюцца польскай мовай, як роднай. А такіх асоб у раёне будзе толькі 328 або каля 1% (141 м. і 187 ж.). Такім чынам лік беларускай групы ў раёне трэба лічыць у 37325 чал. або 85%.

Самым населеным пунктам раёну зьяўляецца м. Парычы (3548 чал.; з іх муж. 1696 і жанч. 1853) [1]). Параўнаўча з даваенным часам лік насельніцтва Парыч зьменшыўся блізка на палавіну, хоць Парычы зараз і зьяўляюцца адміністрацыйным і культурным цэнтрам раёну. Тут знаходзіцца Раённы Выканаўчы Камітэт, тут таксама знаходзяцца дзьве поўныя сямігодкі і адна школа сялянскай моладзі. Зьмяншэньне ліку насельнасьці Парыч трэба бадай цалком аднесьці к абмежаваньню прыватнага гандлю, які тут да вайны ішоў вельмі бойка, асабліва ў часы асеньняга кірмашу, „на Параскімку" (з 14 кастрычніка па 1 лістапада). З надворнага выгляду Парычы з часоў рэволюцыі трохі нават выйгралі: пароблены тротуары, папраўлены вуліцы, праведзена электрычнасьць. Электрычная энэргія нават падаецца ў суседнія вёскі Казлоўку і Высокі Полк. Да вайны Парычы былі злучаны тэлефонам толькі з Бабруйскам, а цяпер яны злучаюцца з усімі сельсаветамі раёну. Куды меншае ад Парыч м. Шацілкі. Усе іншыя паселішчы раёну — гэта большыя ці меншыя вёскі, значны лік якіх, як гэта відаць з інвэнтару 1639 г., старадаўнія [2]). Цікава тут будзе адзначыць, што пры параўнаньні сучасных прозьвішчаў сялян вёсак Чэрніна, Кнышэвіч, Казлоўкі і м. Парыч з прозьвішчамі жыхароў гэтых вёсак, паказаных у інвэн-

---

[1]) Па нацыянальнаму складу насельнасьць м. Парыч падзяляецца: беларусаў 794, яўрэяў 2535, рускіх 112, палякоў 61, укр. 8, латышоў 4, татараў 1, немцаў 1 (Весткі пададзены настаўнікам Парыцкай школы І. Корбутам).

[2]) Згодна інвэнтару 1639 г. (Акты Вилен. Ком., т. XXV) у Парычах быў скарбовы двор, які падлягаў Бабруйскаму старостуу. Пры гэтым двары была вёска Парычы, у якой было 15 хат. Да Парыцкага двара належалі в.в. Кнышэвічы, Чэрнін, Сакерычы, Лашэвічы, Паганцы, Здудзічы, Чыркавічы і Шацілавічы (Шацілкі). Па інвэнтары 1765 г. ў Парычах ужо адзначаецца м. Парычы і вёска Парычы. У мястэчку Парычах лічыцца сялян 85 (мужч. 33, жанч. 52) і яўрэяў 106 чал. (мужч. 49 і жанч. 57). У в. Парычах лічыцца 254 чал. (117 муж. і 147 жанч.). У мястэчку лічылася 22 кані (4 у сялян і 18 у яўрэяў) і 29 валоў (у сялян). У вёсцы Парычах лічылася: коняй 33 і валоў 114. Па інвэнтары

і ваколічных вёсак.[1]) Аднак у Парыцкіх гаворках ёсьць ці мала і іншых рысаў, уласьцівых выключна гэтым гаворкам.

Праўда, блізка што ўсе адзначаныя тут асаблівасьці Парыцкіх гаворак ужо раней зафіксаваны ў досьледах акад. Е. Ф. Карскага і другіх па матар'ялах з іншых масцовасьцяй Беларусі. Тым ня менш апошняя абставіна не пазбаўляе Парыцкія гаворкі іх цікавасьці і ня можа служыць перашкодай для іх дасьледаваньня, бо дыялектолёгія кожнай мовы павінна ня толькі выявіць усе асаблівасьці данай мовы, але і паказаць разьмяшчэньне моўных зьяў на тэрыторыі гэтай мовы.

Перш чым прыступіць да разгляду гаворак Парыцкага раёну, лічу патрэбным даць кароткі географічна-этнаграфічны і эканомічны нарыс, каб паказаць уплыў прыродных умоў і эканомікі на мову раёну, склад насельнасьці раёну і тое месца асноўнай групы насельнасьці — сялян-беларусаў, якое яны займаюць адносна культурных уплываў на сваю мову.

Парыцкі раён ляжыць у паўднёва-ўсходнім кірунку ад акруговага г. Бабруйску і займае плошчу ў 1532 кв. вярсты. 30,8% гэтай плошчы занята лясамі[2]). Цэнтрам раёну зьяўляецца м. *Парычы*. Адлегласьць м. Парыч ад Бабруйску 45 в. Бліжэйшымі чыгуначнымі станцыямі раёну зьяўляюцца: на ўсходзе *Красны Бераг*, на поўдні *Рацьміравічы* і на паўднёвы-ўсход *Шацілкі*, усе Зах. чыг., прыблізна ў 30 в. кожная ад м. Парыч. З гэтых станцый і чыгуначных ліній першыя дзьве знаходзяцца ў суседніх раёнах (Жлобінскім і Глускім), і толькі трэйцяя лінія са ст. Шацілкамі, пабудаваная перад самай імпэрыялістычнай вайной, праходзіць па невялікім кавалку тэрыторыі раёну. Такім парадкам чыгунка сколькі-небудзь значнага ўплыву на мову насельнасьці ня робіць.

Большы ўжо ў гэтым сэнсе робіць уплыў вялікая суднаходная рака Бярэзіна (мясцовая назва *Бяроза*), што працякае па тэрыторыі раёну і падзяляе яго на дзьве палавіны. Правы бераг Бярозы высокі, пяшчаны; левы нізкі, лугавы. Вясною ў часе паводкі, калі вада затапляе лугі, шырыня Бярозы дасягае 4-5 в. У такую пору зносіны праваберажнай часткі раёну з леваберажнай слабыя, і калі падтрымліваюцца, то бадай выключна на чаўнох. Дый улетку, калі нават высыхаюць лугі, зносіны абедзьвюх частак раёну таксама неінтэнсыўныя, бо пераправы праз Бярозу магчымы толькі ў некаторых месцах, дый то выключна на паромах. Рака Бяроза ў раёне мае дзьве прыстані: м. Парычы і м. Шацілкі. Навігацыйны пэрыод Бярозы каля 6 месяцаў. За гэты час прыходзяць параходы з Украіны (Кіева) і з Барысава. За гэты-ж час па Бярозе сплаўляецца на Украіну многа лесу і лясных матар'ялаў. Аднак уплыў Бярозы, як суднаходнай ракі на мову насельнасьці ўсяго раёну ўсё-ж невялікі і бадай выключна абмяжоўваецца прыстанямі — м. Парычамі і Шацілкамі, мова якіх нават па іншых прычынах аж да самай рэволюцыі адчувала на сабе моцны расійскі ўплыў (існаваньне ў мястэчках расійскай і зрусіфікаванай яўрэйскай інтэлігенцыі, існаваньне ў м. Парычах жаночай 8 кляс. епархіяльнай школы і вышэйшай пачатковая школы). Ня робячы аднак беспасярэдна значнага ўплыву на мову насельнасьці, як суднаходная рака, Бяроза куды большы ўплыў робіць на мову праваберажнай і леваберажнай

---

[1]) О. В. Воўк-Левановіч. Важнейшыя рысы гаворкі в. Татаркавічы і гаворак вак. вёсак (Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук ІБК, кн. 2).

[2]) Матар'ялы па лясной дасьледчай справе. 1927.

частак раёну, як натуральная перашкода, што падзяляе раён на дзьве часткі. Гэтая перашкода настолькі сур'ёзная, што Бяроза часта зьяўляецца прыроднай граніцай некаторых моўных зьяў.

Гаворачы аб уплыве прыродных умоў на мову раёну, нельга не адзначыць лясоў і балот, якія таксама часта становяць сабою прыродныя граніцы паасобных моўных зьяў.

У адміністрацыйных адносінах раён падзяляецца на наступныя 16 сельсаветаў: 1) Сьцяпскі, 2) Шчадрынскі (яўрэйскі), 3) Дабравольшчынскі, 4) Каралева-Слабодзкі, 5) Казлоўскі, 6) Парыцкі местачковы, 7) Раманіцкі, 8) Чэрнінскі, 9) Пратасаўскі, 10) Гарохавіцкі, 11) Дуброўскі, 12) Любаньскі, 13) Ракшынскі, 14) Чыркавіцкі, 15) Шацілаўскі і 16) Коўціцкі.

Лік насельніцтва раёну, апрача м. Парыч, згодна перапісу 1926 г., складае 44033 чалав.: 21483 мужч. і 22550 жанч. З іх: беларусаў 35784 чал. або 81% (18560 муж. і 18224 жанч.), рускіх 3181 чал. або 7% (1508 м. і 1673 ж.), яўрэяў 3102 чал. або каля 7% (1461 м. і 1641 жанч). і палякоў 1769 чал. або 4% (903 м. і 966 ж.). Аднак лік палякоў у раёне трэба лічыць значна ніжэй, бо беларуская каталіцкая шляхта па прычынах, аб якіх будзе сказана ніжэй, залічае сябе да палякоў, хоць польскай мовы ня ведае. Дзеля гэтага пры вылічэньні больш-менш запраўднага ліку палякоў трэба выходзіць з ліку асоб, якія карыстаюцца польскай мовай, як роднай. А такіх асоб у раёне будзе толькі 328 або каля 1% (141 м. і 187 ж.). Такім чынам лік беларускай групы ў раёне трэба лічыць у 37325 чал. або 85%.

Самым населеным пунктам раёну зьяўляецца м. Парычы (3548 чал.; з іх муж. 1696 і жанч. 1853) [1]). Параўнаўча з даваенным часам лік насельніцтва Парыч зьменшыўся блізка на палавіну, хоць Парычы зараз і зьяўляюцца адміністрацыйным і культурным цэнтрам раёну. Тут знаходзіцца Раённы Выканаўчы Камітэт, тут таксама знаходзяцца дзьве поўныя сямігодкі і адна школа сялянскай моладзі. Зьмяншэньне ліку насельнасьці Парыч трэба бадай цалком аднесьці к абмежаваньню прыватнага гандлю, які тут да вайны ішоў вельмі бойка, асабліва ў часы асеньняга кірмашу, „на Параскімку" (з 14 кастрычніка па 1 лістапада). З надворнага выгляду Парычы з часоў рэволюцыі трохі нават выйгралі: пароблены тротуары, папраўлены вуліцы, праведзена электрычнасьць. Электрычная энэргія нават падаецца ў суседнія вёскі Казлоўку і Высокі Полк. Да вайны Парычы былі злучаны тэлефонам толькі з Бабруйскам, а цяпер яны злучаюцца з усімі сельсаветамі раёну. Куды меншае ад Парыч м. Шацілкі. Усе іншыя паселішчы раёну — гэта большыя ці меншыя вёскі, значны лік якіх, як гэта відаць з інвэнтару 1639 г., старадаўнія [2]). Цікава тут будзе адзначыць, што пры параўнаньні сучасных прозьвішчаў сялян вёсак Чэрніна, Кнышэвіч, Казлоўкі і м. Парыч з прозьвішчамі жыхароў гэтых вёсак, паказаных у інвэн-

---

[1]) Па нацыянальнаму складу насельнасьць м. Парыч падзяляецца: беларусаў 794, яўрэяў 2535, рускіх 112, палякоў 61, укр. 8, латышоў 1, татараў 1, немцаў 1 (Весткі пададзены настаўнікам Парыцкай школы І. Корбутам).

[2]) Згодна інвэнтару 1639 г. (Акты Вилен. Ком., т. XXV) у Парычах быў скарбовы двор, які падлягаў Бабруйскаму старостве. Пры гэтым двары была вёска Парычы, у якой было 15 хат. Да Парыцкага двара належалі в.в. Кнышэвічы, Чэрнін, Сакерычы, Лашэвічы, Паганцы, Здудзічы, Чыркавічы і Шацілавічы (Шацілкі). Па інвэнтары 1765 г. ў Парычах ужо адзначаецца м. Парычы і вёска Парычы. У мястэчку Парычах лічыцца сялян 85 (мужч. 33, жанч. 52) і яўрэяў 106 чал. (мужч. 49 і жанч. 57). У в. Парычах лічыцца 254 чал. (117 муж. і 147 жанч.). У мястэчку лічылася 22 кані (4 у сялян і 18 у яўрэяў) і 29 валоў (у сялян). У вёсцы Парычах лічылася: коняй 33 і валоў 114. Па інвэнтары

тары 1639 г., ні аднаго супаданьня ў прозьвішчах няма. У інвэнтары 1765 г. такое супаданьне маем, напр., па м. Парычах прозьвішчы *Гасак, Гаравы, Мірончык* і інш.

Несупаданьне сучасных прозьвішчаў з інвэнтарнымі 1639 г. трэба хутчэй за ўсё тлумачыць не выміраньнем ранейшага насельніцтва гэтых вёсак і перасяленьнем сюды новых жыхароў, а проста зьменай сялянскіх прозьвішчаў. Ранейшыя сялянскія прозьвішчы на *-іч, -овіч,* падобныя на шляхецкія, замяняліся прозьвішчамі—мянушкамі, якія, на погляд панства, больш стасаваліся да сялянства. Запрыгоненага рабаселяніна пан ня лічыў нават патрэбным называць па яго запраўднаму прозьвішчу, а па мянушцы, „як яго дражняць", каб гэтым яскравей падкрэсьліць клясавую розьніцу. Такім чынам сялянскія прозьвішчы 1639 г., напр., в. Чэрніна, *Кандратовіч, Грыневіч, Супруновіч* замяняліся сучаснымі *Бусел, Доўгі, Лапата* і інш.

З папярэдняга відаць, што карэннаю насельнасьцю раёну зьяўляюцца беларусы. Беларусы па соцыяльнаму стану падзяляюцца на сялян і шляхту. Калі прыняць лік беларусаў у 85% агульнага ліку насельнасьці раёну, то на долю сялян прыпадае 75% і на долю шляхты да 10%. Аб шляхце будзе гаварыцца ў сваім месцы. Што-ж да сялян, то яны жывуць шчыльнаю масаю на тэрыторыі ўсяго раёну.

Хоць у этнографічных адносінах здавалася-б ніякой розьніцы паміж сялянамі няма, аднак народная памяць такую розьніцу захавала. Сяляне ўсходняй часьці раёну (паляшукі) называюць сялян некаторых вёсак заходняй часьці (Майсееўкі, Міхалоўкі, Краснаўкі, Васілёўкі) „літашамі". Тлумачэньне гэтай розьніцы знаходзім у гісторыі раёну. Жыхары як раз гэтых і некаторых другіх вёсак належалі да прыватнаўласьніцкага, тады як усе іншыя вёскі (большасьць) належалі да скарбовых двароў (Парыцкага, Броскага і Бабруйскага). Цэнтрам літашоў быў прыватна-ўласьніцкі двор Каралеўская Слабада, які ў 1655 г. лічыўся горадам [1]). Бясспрэчна, ужо па аднаму факту прыналежнасьці некаторай часьці сялянства да прыватнага двара з іншымі прававымі і эканомічнымі адносінамі яно выдзялялася, адрозьнівалася ад іншай масы сялянства, што сядзела на скарбовых землях. Вядома, тут у першым выпадку магло быць і перасяленьне сялян з іншых маёнткаў прыватнага ўласьніка, што тады робіць зусім зразумелаю гэтую розьніцу, але аб чым, на жаль, вестак не захавалася. Што-ж датыча самага слова „літашэ", то яно пэўна прадстаўляе народную этымолёгію ад „літоўцы". За пацьвярджэньне такога дапушчэньня гаворыць назва літашоўскай вёскі Майсееўкі, якая завецца Майсееўкай „Літоўськай" ў адрозьненьне яе ад другой Майсееўкі на ўсходзе раёну, якая завецца Майсееўкай „Качаньськай".

Галоўным і блізка выключным заняткам сялян, таксама як і шляхты, зьяўляецца ральніцтва і гадоўля жывёлы. Землі раёну падзолістыя і пяшча-

1765 г. ў Парычах адзначаецца млын і сукнавальня. Апошняе цікава з таго боку, што рэчка, на якой у Парычах мог стаяць млын, цяпер прадстаўляе няпрыкметны раўчачок (каля б. маёнтку). Другі млын па інвэнтары 1765 г. значыцца ў суседняй (3 в.) в. Скалцы.

[1]) Наказны гэтман войска запароскага Іван Залатарэнка даносіў у 1655 г. цару Аляксею Міхайлавічу, што „...на другой день вернулся наш подъѣздъ счастливо, который посылали есмя до Бобруйска и до Королевской Слободы... товарство наше, пришедше до тѣхъ городовъ, оныхъ взяли, въ которыхъ много враговъ и недруговъ вашего цар. вел. пребывало, и тѣхъ всехъ, што было служилого люду, поляковъ и немецъ подъ мечь пустили, а города обадва безъ остатку попалили, штобъ впередъ не было при чомъ держаться врагомъ и недругомъ ваш. цар. вел..." (Акты Южной и Зап. России. Изд. Археогр. Ком. т. XIV, стар. 533-534).

ныя. Часта спатыкаюцца запраўдныя пяшчаныя выдмы (Раманішчы, Чыркавічы, Пакалічы), з якіх пры моцным ветры падымаюцца цэлыя хмары пяску. Гэты пясок наносіць вялікую шкоду ральніцтву, бо пераносячыся ветрам, ён засыпае добрыя кавалкі зямлі, іншы раз нават з пасевамі. Для ўмацаваньня выдмаў у апошнія часы іх сталі засаджваць лазою (Чэрнін, Чыркавічы). Вялікую плошчу ў раёне займаюць багатыя торфам і жалезнаю рудою балоты. Для пераапрацоўкі руды ў раёне, відаць на месцы цяперашняй вёскі Рудні, была гамарня, або, як яна тады звалася, рудня [1]). Распрацоўкі торфу раён яшчэ ня ведае. Не праводзілася яшчэ таксама ў раёне і мэліорацыя, у якой аднак адчуваецца вялікая патрэба.

Што да ўраджайнасьці зямлі, то яе наагул трэба лічыць сярэдняю. Ураджайнасьць зямлі падтрымліваецца галоўным чынам натуральным гноем і сыстэмай аблог (папару). Штучнае ўгнаеньне яшчэ не практыкуецца. Форма землякарыстаньня ў раёне пераважна трохпалятковая. Апрацоўку зямлі наагул трэба прызнаць блізка здавальняючай. Прадзедаўскую саху і дзеравяную барану ўжо ўсюды замяняе плуг і жалезная барана. „Смык"—барана з яловага сучча—цяпер ужываецца толькі на ляднай гаспадарцы, дзе шмат пнёўя і дзе запраўды смык зьяўляецца больш зручнаю бараною. Уводзіцца травасеяньне. Рацыяналізацыя сельскай гаспадаркі сказваецца і ў замене валовай сілы, якая гадоў 20 таму назад была пераважнаю, на конскую. Аднак разьвіцьцю сялянскай гаспадаркі істотна перашкаджае малазямлельле, што наглядаецца блізка ва ўсіх вёсках. Не магло сялянства павялічыць плошчу свайго землекарыстаньня і за кошт б. панскіх маёнткаў, бо апошніх ва ўсім раёне было толькі тры (Парычы, Бяльчо, Стужкі), дый то ў першых двох організаваны сельска-гаспадарчыя колектывы. Абрэзка кулацкіх гаспадарак таксама дала малы эфэкт, бо, папершае, такіх гаспадарак у раёне мала, а падругое і сама абрэзка была пастаўлена нездавальняюча.

Такім чынам сялянства раёну стасоўна да тых форм землекарыстаньня, якія яно ўжывае, малазямельна, а малазямельле ў сваю чаргу зьяўляецца прычынай, што ў значнай часткі сялянства свайго хлеба да новага ўраджаю не хапае. Недахоп хлеба галоўным чынам замяняецца бульбай, пасевы якой у сялянскай гаспадарцы займаюць віднае месца. З іншых зерневых культур, апрача жыта, у раёне сеюць ярыцу, пшаніцу, авёс, грэчку, гарох, ячмень, проса (звычайнае і чорнае „бор"), „сачыўку" (сачавіцу). Лён сеецца ў разьмеры, неабходным для патрэб сялянскай гаспадаркі. Таксама для патрэб кожнай гаспадаркі на агародах сядзяцца капуста, гуркі, рэдзька, рэпа, бручка, цыбуля, морква, буракі, гарбузы, боб, „квасоля", „кіяхі" (кукуруза).

Значнаю дапамогу экономіцы сялянскай гаспадаркі прыносіць гадоўля жывёлы. Сяляне разводзяць коняй, „тавар" (быдла) — кароў і валоў (на апошніх аруць, а калі няма каня, то барануюць і езьдзяць), авец, сьвіней, курэй, а ў апошнія часы гусей і качак. Коз сяляне ня дзержаць. Жывёла ня толькі задаваляе нескладаныя патрэбы натуральнай сялянскай гаспадаркі, але зьяўляецца і тым фондам, з якім селянін выступае на рынку. Тут асабліва важна адмеціць гадоўлю кароў у сувязі з адкрыцьцем у апошнія гады збыту малака ў малочныя арцелі, лік якіх у раёне дасягае 10. Праўда, жывёла ў сялян вельмі дробная і з гэтага боку можа ня зусім рэнтабэльная, аднак Парыцкі раён,

[1]) Акты Вил. Ком., том XXV.

будучы багатым у прырэчных мясцовасьцях заліўнымі лугамі, мае ў далейшым для жывёлагадоўлі самыя цікавыя пэрспэктывы.

Варта таксама адзначыць пчалярства, якое таксама зьяўляецца значнай падмогай у сялянскай гаспадарцы. Пчалярства пашырана ва ўсім раёне, і ў кожнай вёсцы можна налічыць некалькі „вотчычаў“ (бортнікаў). Вульлі для пчол робяцца з калод. Пчолы дзержаць або дома, або ставяць у лесе на дрэвах, на „подкурах“ (палацях). У дзяржаўных лясох яшчэ трапляюцца „сьлепаты“ (дзікія пчолы).

Садоўніцтва ў сялянскай гаспадарцы займае нязначнае месца. Сады ёсьць толькі ў некаторых вёсках дый то не ва ўсіх гаспадароў. Звычайна-ж сялянская вёска ні садоў ні наагул дрэў ня мае.

Таксама нязначнае месца ў сялянскай гаспадарцы ў сувязі з высечкай лясоў і зьнішчэньнем дзічы займае і паляўніцтва. Калісьці лясы раёну, відаць, багаты былі ўсякім зьверам. Аб гэтым сьведчаць назвы такіх вёсак і ўрочышчаў, як Куннае, Медзьведаў, Бабровік, Барсукі, Зубрэц і інш. Але крупныя зьвяры ўжо даўно перавяліся. Ня было ўжо іх і ў 1639 г., аб чым гаворыцца ў інвэнтары Бабруйскага староства: „zwierza wielkiego acz w tym starostwie nie masz, asz tylko czasem przechodem, gdy się iednak trafi...“. Пераходам і цяпер яшчэ трапляюцца ласі, кабаны, сарны. Аднак у раёне яшчэ многа водзіцца ваўкоў, якія зьяўляюцца запраўдным няшчасьцем для селяніна. Трапляюцца таксама куніцы, лісы, гарнастаі, тхары, белкі.

Варта яшчэ ўрэшце адмеціць рыбалоўства, пашыранае ў прырэчных мясцовасьцях раёну, якое таксама займае некаторае месца ў бюджэце сялянскай гаспадаркі.

Рамёствы на вёсках пашыраны мала, і аб іх гаварыць бадай ня прыходзіцца.

За выключэньнем ральніцтва і жывёлагадоўлі, апошняя група заняткаў селяніна часта мае больш аматарскі, чым запраўды эканомічны характар. Але селянін, гаспадарка якога ня можа задаволіць самых элемэнтарных жыцьцёвых патрэб, кідаецца ва ўсе бакі, каб зарабіць лішнюю капейку. Ён дзеля гэтага бярэ і сенакос на расьцяроб, і поле на засеў за трэйці сноп і інш.

Што-ж датыча наагул сялянскіх заработкаў, то іх у рэёне мала. Больш заможныя кулацкія гаспадаркі, па вядомых прычынах, стараюцца абыйціся без староньняй рабочай сілы. Няма прыстасаваньня рабочай сілы і ў м. Парычах. Дзеля гэтага сялянскія заработкі можна сказаць выключна абмяжоўваюцца валкай лесу і „траляваньнем“ (даставай) яго „на рум“ (прыстань), а таксама зьвязкай лесу ў плыты і сплавам іх на Ўкраіну. У паўднёва-заходняй частцы раёну, дзе яшчэ захаваліся вялікія дзяржаўныя лясы (Крукаўскае лясьніцтва), якія зараз эксплюатуюцца, лясныя заработкі займаюць даволі віднае месца ў сялянскім бюджэце. У паўночна-ўсходняй частцы раёну з прычыны зьнішчэньня лясоў і вялікай конкурэнцыі ў рабочай сіле лясныя заработкі нязначныя.

Характарызуючы-ж сялянскую эканоміку наагул, трэба сказаць, што сялянства раёну ў значнай сваёй масе жыве бедна. Здавалася-б, што апошняя абставіна павінна была-б спрыяць самай чыннай сялянскай эміграцыі. Аднак гэтага не заўважваецца. Калі яшчэ перад імпэрыялістычнай вайной мела месца перасяленьне ў Сібір, то цяпер яно блізка зусім спынілася. Няма таксама месца і так званым адходным промыслам, адходам на фабрыкі і заводы. Сялянства раёну покуль

што яшчэ моцна сядзіць на зямлі, бачачы ў ёй выключны сродак свайго існаванья.

У этнографічных адносінах сялянская вёска хавае ў сабе яшчэ многа цікавага..

Сялянскія вёскі ў большасьці вялікія, двароў па 100—200. Выдзяленьне на пасёлкі ні да рэволюцыі ні посьле ў раёне не праводзілася. Будоўлі ў вёсках скучаныя, адна хата пры аднэй паабапал вуліцы. Хаты злучаюцца пад адну страху з „варыўнёю" (істопкай) і хлявамі. Трохі з боку на дварэ перад хатай стаіць „клець" (сьвіран). За хлявамі на некаторай адлегласьці ў адну шарэнгу стаяць гумны і „азяроды". Такім чынам звычайна сялянская вёска мае чатыры рады будоваў, што зьяўляецца вялікаю небясьпекаю на выпадак пажару. Для барацьбы з пажарамі на грошы ад самаабкладаньня сталі заводзіць пажарныя машыны, бочкі, багры, а ў в. Пакалічах нават пабудавалі спэцыяльны пажарны хлеў і зрабілі каланчу. Хаты, сьвірны і хлявы ў большасьці крыюцца „дорам" (дранкамі), гумны—саломаю. Гонтавыя стрэхі на хатах спатыкаюцца радзей. Сялянская хата да рэволюцыі, нават заможнага селяніна, мела адзін пакой і халодныя „сенцы", іншы раз „з камораю". У такіх хатах, як звычайную зьяву, можна спаткаць гліняную падлогу, „лучнік", які служыць для асьвятленьня хаты лучынаю і замяняе ролю коміна, „пол" (нары) заместа ложка ў адзін або два ярусы (верхні ярус завецца „палацямі"), на якім сьпіць уся сям'я, уключаючы жанатых сыноў і нявестак. Калі сям'я вялікая і полу не хапае, то некаторыя члены сям'і сьпяць на „лавах", што стаяць каля дзьвюх сьцен на ўсю іх даўжыню ў хатах, і на „заслонах". У сенцах стаяць дзежкі, кублы. Тут яшчэ дзе-ні-дзе можна пабачыць і „жорны".

У пасьлярэволюцыйныя часы, у сувязі з новымі культурнымі ўплывамі на вёску, галоўным чынам праз чырвонаармейцаў, што пабывалі на франтох і ў палоне, сяляне пачынаюць будаваць хаты на шляхецкі манер,—з двох пакояў, з якіх адзін з рускаю печчу служыць кухняю і сталоваю, а другі з галяндзкаю печчу або „грубкаю" зьяўляецца „чыстаю хатаю". У чыстай хаце стаяць ложкі, на якіх сьпіць пераважна моладзь, і куфры. Тут ужо ня рэдкасьць пабачыць шафу, крэслы і гадзіньнік, набытыя галоўным чынам ад „крупнікаў" (інтэлігенцыі), калі яны ў 18—20 гадох у пошуках харчовых продуктаў рабілі „хаджэньне ў народ".

Што да чыстаты, то сялянская хата яшчэ далёка ня можа гэтым пахваліцца. Падлогі (там дзе яны ёсьць) ня мыюцца, або мыюцца толькі разы два на год, к вялікім сьвятам. Сьцены ня толькі ня тынкуюцца, але і ня беляцца. Калі к гэтаму яшчэ дадаць, што ў хаце коркмяцца сьвіньні, а зімою пад печчу дзержаць курэй і ў вялікія маразы дробную жывёлу (ягнят і нават маладых цялят), то адсюль зразумела, што сялянская хата часта зьяўляецца спагадным месцам для пашырэньня ўсялякай пошасьці. Само сабой зразумела, што тут знаходзяць сабе прыстанішча клапы, прусакі, блохі, на ўкусы якіх запрацаваны селянін мала зварачае ўвагі. У 1924 г. ў в. Раманішчах я спаткаў старую жанчыну, у якой усе рукі і шыя былі ў струп'ях. На мае запытаньне аб прычыне яе хваробы яна адказала, што яе „пагрызьлі" прусакі. Я пацікавіўся паглядзець хату старое, на што яна ахвотна згадзілася. Як толькі мы адчынілі ў хату дзьверы, прусакі паднялі моцны шум. Гэта яны ўцякалі ад нас з падлогі і стала, дзе жыравалі, у свае шчыліны. Пэўна не пераўменшу, калі скажу, што ў гэтай хаце

прусакоў было з добрую мерку. Аказваецца яны ня толькі пагрызлі старую,—яны паабгрызалі ў хаце ўсе сьцены. „Як-жа вы сьпіце з такім роем прусакоў?“ пытаюся я ў старое. „Прывуклі“, проста адказвае яна. Паколькі гэта было ўлетку, і сям'і старое дома ня было, я ня мог бачыць дзеяньня прусакоў на іншых членаў сям'і, лік якой быў штосьці 11 ці 12 чалавек. Бязумоўна апошняя прычына—скучанасьць сялянскай сям'і—зьяўляецца аднэй з галоўных прычын неахайнасьці сялянскага жыльля.

Сялянскія сем'і спатыкаюцца іншы раз у 20 і больш чалавек. Тлумачыцца гэта тым, што ажаніўшы сына, бацька не выдзяляе яго на сваю гаспадарку, як гэта робяць яўрэі ў раёне, а дзержыць пры сабе, аж покуль падгадуюцца яго дзеці. А з дарослымі дзяцьмі, аддзяліўшыся ад бацькі, сын адразу, што называецца, можа стаць на ногі і наладзіць сваю гаспадарку. Зразумела, тут значэньне мае і аўторытэт бацькі. Рана ажаніўшыся, бацька, як работнік, яшчэ ня траціў сваёй працаздольнасьці ня толькі тады, калі жаніў сваіх сыноў, а нават іншы раз і ўнукаў. А будучы працаздольным работнікам, што ў працоўнай сялянскай сям'і больш за ўсё цэніцца, бацька мог захоўваць свой аўторытэт галавы сям'і і не дапускаць яе да распаду. Аднак, калі бацька траціць свой аўторытэт, і ў сям'і пачнецца калатня і сваркі, бацька дзеліць па ліку сыноў сваю гаспадарку і сам астаецца жыць з „меншым“ (малодшым) сынам, якому такім чынам дастаецца і бацькава хата.

Аддзеньнем селяніна зьяўляюцца дамашняга палатна штаны, іншы раз з учкуром, і доўгая да кален сарочка („кашуля“), надзетая паверх штаноў і падпяразаная каляровым даматканым поясам. Паверх сарочкі надзяецца камзэлька. На нагах лыкавыя ці лазовыя лапці з вераўчанымі аборамі, а ў сьвяточны дзень боты; на галаве шапка з шырокім верхам і казырком. У халодную пагоду надзяецца сьвітка. Зімою селянін на палатняныя штаны надзяе „суконьнікі“—штаны з сукна дамашняга вырабу, ногі ўкручвае „суконкамі“ і надзяе тыя-ж лапці, праўда іншы раз сьплеценыя з дуба; пад сьвітку падапранае белы кажух, а на галаву надзяе цёплую шапку.

Жаночае адзеньне складаецца з даматканай доўгай кашулі з брыжастым стаячым каўняром з натыканымі чырвонымі „палікамі“ (наплечнікамі) і рукавамі, на якую надзяецца „кохтачка“ і спадніца, а зімою „андарак“. На нагах жанкі носяць лапці або чаравікі, на галаве—хустачку (дзяўчаты) і чапец і намітку (замужнія). У халодную пору жанкі апранаюць сьвітку і кажух, як і мужчыны. У некаторых вёсках старыя жанкі заместа кофты носяць „кабат“. Усе жанчыны носяць простыя ці натыканыя „хвартухі“.

Сьвяточнае адзеньне селяніна тое-ж самае, толькі чысьцейшае. У такія дні заместа будняе „зрэбнай“ сарочкі ён надзяе „кужэльную“ (больш тонкага палатна); ён апранае і новую сьвітку і новыя лапці з чыстымі белымі „анучамі“, з „аборамі“ ў „елачку“, а калі ў яго ёсьць боты, то ў сьвята ён іх абавязкова носіць. Сьвяточнае адзеньне жанчын і моладзі выдзяляецца яшчэ больш ярка.

За апошнія 15—20 гадоў у адзеньні сялян адбыліся значныя зьмены. Белая сьвітка з „вусамі“ як у мужчын, гэтак і ў жанок, такога-ж крою кажух, якія раней лічыліся характэрнымі для адзеньня сялян усяго раёну, цяпер ужо выходзяць з ужываньня, замяняючыся шэрымі і больш кароткімі сьвіткамі і кажухамі шляхецкага крою. Белая сьвітка, як пераважнае сялянскае адзеньне, засталася толькі ў не-

калькіх вёсках паўднёва-усходняй часьці раёну (Сакерычы, Стракавічы, Якімаўская Слабада). У вёсках-жа, радыусам у 10—15 вёрст ад Парычаў, белую сьвітку можна хіба толькі знайсьці ў кубле якой старой бабы. Таксама за апошнія гады вывеўся чырвоны колер сялянскага адзеньня. А раней чырвоныя андаракі, чырвоныя кофтачкі і кабаты, чырвоныя хусткі, чырвоныя мужчынскія „крамныя" сарочкі, якія насілі хлопцы па сьвятах, зьяўляліся ўлюбёнымі і можна сказаць выключнымі колерамі. Цяпер усё гэта зямняецца на фабрычныя матэрыі шэрых, бледных колераў.

Рэдка ўжо спаткаеш у раёне магерку. Заместа даматканых парток пашлі розныя крамныя галіфэ.

З паасобных частак раёну старасьвецкая адзежа найбольш захавалася ў усходняй часьці раёну. Тут яшчэ ўлетку на сенакосе і цяпер можна пабачыць старога дзеда ў доўгай па калені сарочцы з характэрным кроем, з засьцежкай заместа гузікаў, у штанох з учкуром, з „валёнкай" (магеркай) ці кучомкай, ня гледзячы на жару, на галаве, у лазовых лапцях на нагах. На поясе, што падпяразваецца сарочка, у такога дзеда вісіць „капшук" з табакай, „шабета" з люлькаю, вогнівам, крэменем і „цэраю" (губкаю) і нож,—атрыбуты, якія часткова, па сьведчаньні археолёгіі, насіў беларус курганнага пэрыоду.

Аднак яшчэ ва ўсім раёне мужчыны, як і раней, ня брыюць ні барады ні вусоў, носяць доўгія валасы або стрыгуцца, як кажуць, „пад макацёр".

Ежа селяніна самая простая, але здаровая. На абед у гадзін 9-10 падаецца капуста ці буракі з мясам або заскваранымі толькі салам і забеленыя іншы раз сьмятанай; на другую страву падаецца затоўчаная салам бульбяная, прасяная ці якая іншая каша і на трэйцюю страву—малочны „крупнік" (суп). У полудзень, у гадзіны 2, селянін есьць гародніну (квашаную капусту, агуркі, цыбулю), сала, сыр, малако. На вячэру падаецца агурочны расол з печанай ці варанай бульбай і крупнік. У посныя дні варыцца грыбны квас, каша і крупнік з алеем, „саладуха" (солад з жытняй мукі), бульба і інш. У сьвяточныя дні пякуцца блінцы, смажыцца сала з мясам; як далікатэс, пражэцца яечня і гатуецца „верашчака", хоць праўда, апошняя страва зьяўляецца пераважна прыналежнасьцю шляхецкай кухні. Улюбёным піцьцём селяніна зьяўляецца дрэўны квас—„бярозавік" і „кляновік", які загатаўляецца раньняй вясной і часта захоўваецца да позьняга лета. Для моцы ў гэты квас іншы раз дадаецца хмель. Наогул-жа селянін любіць пад'есьці. Што году ён коле 2-3 кормных сьвіней, якіх спажывае сам; для сябе-ж ён коле парасят, рэжа ўвосень барана, „перадок" якога часамі прадае яўрэям, а „задок" спажывае сам. Зразумела, беднаta корміцца куды горш. У весну, калі выходзіць хлеб, а часта бракуе і бульбы, яна галоўным чынам прабаўляецца рознай зелянінай (варыць шчавель, лебяду, крапіву).

Што-ж да талерак, нажоў, відэльцаў і іншых прылад гарадзкой кухні, то іх сяляне ня ўжываюць. Уся сям'я есьць з аднае міскі, дастаючы яду ложкамі ці, калі яна ў кавалах (мяса), проста пальцамі (па прыказцы — „пярвей бог стварыў палцы, а посьля відэлцы").

Гаворачы аб ежы, нельга не адзначыць адсутнасьці правільнага гадавога разьмеркаваньня продуктаў у сялян. У іх, як кажуць, „часамі бувае густа, а часамі пуста".

Асабліва шкодна на сялянскіх запасах сказваюцца рознага роду ўрачыстасьці, як напр., радзіны, хрысьціны, запоіны, вясельле, хаўтуры,

памінкі і абавязковы ў кожнай вёсцы „чупрыньнік“ (залажэньне, фэст), калі сходзіцца і зьяжджаецца многалічная далёкая і блізкая сялянская радня („сваты“, „кумы“, „сябры“), і калі варацца цэлыя чыгуны мяса і сала і наагул зьнішчаецца столькі продуктаў, што іх хапіла-б на некалькі месяцаў. У дадатак да гэтага гаспадар яшчэ ня мала траціцца і на гарэлку для гасьцей. А ў выніку трапляецца, што напіўшыся, госьці ці суседзі бяруцца і за чубы, чаму між іншым апошняму сьвяту і дадзена цікавая з этнографічнага боку назва „чупрыньніка“.

У буднія-ж дні селянін цьвярозы. Алькаголікі наагул сярод сялян спатыкаюцца рэдка. Тут, вядома, вялікую ролю адыграе псыхолёгія працавітасьці селяніна, не дазваляючы яму марна скарыстоўваць свой рабочы дзень. Ад цямна да цямна селянін дома, у полі ці ў лесе за працай. А ў восень і ўзімку ён і ночы прыхопіць: „досьвіткамі“ селянін малоціць сваё збожжа. Сялянская жанчына ня ўступае ў працавітасьці мужчыне. Увесь дзень дома ці ў полі яна за працай. У весну яна садзіць гародніну, поле, улетку жне жыта і іншае збожжа, у восень выраблye ільнянае валакно, узімку прадзе кудзелю, тчэ кросны.

Тут цікава адзначыць адносіны селяніна да самай працы. Хоць селянін, як кажуць, і працавіты, як мурашка, хоць ён і любіць працаваць, аднак цяжкая праца селяніна, калі ён, па мясцовай прыказцы, „працуе, як чорны вол“, ужо ня ўцеха, ня радасьць для селяніна, а „гараваньне“. А таму і зразумела, што надмерная на працягу ўсяго гістарычнага жыцьця селяніна праца няўхільна асоцыявалася з паняцьцем „гора“, „гараваньня“, і „працаваць“ у сялянскай лексыцы замянілася словам „гараваць“.

У сьвяточны дзень селянін „аддыхае“. Моладзь у гэтыя дні наладжвае ігрышча, дзе пад скрыпку і бубен, або „гармонік“ „таўкуцца“ да позьняй ночы: скачуць польку, кадрылю, мяцеліцу, качана, казачка. За апошнія часы моладзь пачынае аддаваць перавагу модным сучасным танцам: „дзірыжабу“, „грэйц-польцы“ і інш.

Новы савецкі быт ужо патрохі сказваецца ў сялянскіх вёсках, асабліва ў прыместачковых. Як агульную дадатную зьяву, можна адзначыць павышэньне ў сялянскіх масах соцыяльнай самасьвядомасьці і, як вынік гэтага, зьніканьне ранейшай прыніжанасьці, запабяганьня перад кожным, хто так ці інакш стаяў вышэй селяніна. Апошняе відаць хоць-бы з такога факту: калі раней пры спатканьні з кожным, нават незнаёмым чалавекам, які быў лепш апрануты за селяніна, апошні першым здымаў перад ім шапку, то цяпер ён гэтага ня робіць. Аднак, як і раней, селянін ветлы, калі з ім загавораць. Таксама, як беспасярэдны ўплыў новага быту, трэба адзначыць агульнае падзеньне рэлігійнасьці, слабае наведваньне царквы, нярэдкія выпадкі заключэньне шлюбаў без царквы, незахаванье пастоў, якія раней так шчыра пасьціліся, страту веры ў розныя забабоны, чуды, знахароў і знахорак і інш.

Трэба таксама адзначыць павышэньне нацыянальнай сьвядомасьці сялянства. Калі раней селянін называў сябе „тутэйшым“, а сваю бацькаўшчыну „Забраным Краем“, то цяпер ужо кожны ведае, што ён беларус і жыве ў Беларусі.

У першых радох па руйнаваньню цёмных, асьвечаных царквою бакоў сялянскага быту ідзе, бязумоўна, моладзь. Аднак тут трэба адзначыць, што ў сваім руйнуючым процэсе моладзь раёну не пераходзіць у другую крайнасьць — хуліганства, якое наглядаецца ў паў-

ночнай частцы БССР; хуліганства ў сялянскіх вёсках Парыцкага раёну ня мае месца.

На пашырэньне новых форм быту мае вялікае значэньне хата-чытальня, якая ахвотна наведваецца старымі і моладзьдзю, і школа.

Лік школ, параўнаўча з дарэволюцыйным часам, значна ўзрос. Цяпер у раёне лічыцца дзьве сямігодкі (адна беларуская і адна яўрэйская), адна школа сялянскай моладзі (беларуская), адна чатырохкомплектовая школа, адна трохкомплектовая, 11 двохкомлектовах і 43 аднакомплектовых—усяго 59 школ, з іх: беларускіх 44 (77 комплектаў), яўрэйскіх 4 (18 комплектаў), расійскіх 6 (6 комплектаў) і польскіх 5 (6 комплектаў). Пры параўнаньні насельнасьці раёну з лікам існуючых школ трэба сказаць, што нацменшасьці раёну, за выключэньнем рускіх, у адносінах задаваленьня іх школай знаходзяцца ў лепшых умовах, чым беларусы, значны процант дзяцей якіх яшчэ не ахоплены школаю. Агульная граматнасьць беларусаў складае 24%, з іх мужчын 37% і жанчын 8% [1]). Аднак у раёне ёсьць вёскі, дзе процант граматнасьці падае да 5, дзе ў вёсках няма ніводнай граматнай жанчыны (Данілоўка), або з дарослых адна, хоць там-жа старая валасная школа (Чэрнін). Але з другога боку спатыкаюцца вёскі, у якіх ужо ёсьць звыш дзесятка студэнтаў вышэйшых школ і тэхнікумаў (Дабравольшчына каля Парыч). Найбольш культурна-адсталаю трэба лічыць б. Чэрнінскую воласьць (сельсаветы: Чэрнінскі, Дубровўскі, Раманіцкі і Пратаскі), дзе граматнасьць ва ўсіх сельсаветах ніжэй 10% [2]). А таму і зразумела, што хоць на тэрыторыі гэтай б. воласьці і адкрыта з часоў рэволюцыі некалькі новых школ, аднак насельнасьць яшчэ не ўсьвядомілася ў патрэбнасьці вучыць сваіх дзяцей далей, па сканчэньні імі пачатковых школ. Вядома, тут вялікую ролю адыграе і аддалёнасьць на 15-20 клм. мясцовасьці ад культурнага цэнру раёну — м. Парыч і экономіка селяніна, што не дазваляе ўтрымліваць свайго сына ў Парычах або ў іншай школе. Такім чынам у гэтай мясцовасьці (в.в. Раманішчы, Вуглы, Сямак, Вяжны, Чэрнін, Сакерычы і інш.) вучняў ні профэсіянальных школ, ні тэхнікумаў, ні ВНУ блізка зусім няма. Грамадзкага жыцьця тут таксама мала. Камуністы і камсамольцы рэдкасьць. У цэлым Раманіцкім сельсавеце (процант граматнасьці 8½%) няма аніводнага камуніста, ніводнага камсамольца.

Затое з другога боку, як ужо вышэй і адзначалася, гэты куток зьяўляецца найбольш цікавым у этнографічных адносінах: тут у найбольшай чыстаце захоўваецца мова і звычаі селяніна. Хаця трэба сказаць, што наогул мова сялян усяго раёну, з прычыны адсутнасьці на яе да самай рэволюцыі культурных уплываў і цэламу шэрагу эканомічных і географічных фактараў захоўваецца ў чыстаце. Толькі за часы вайны і рэволюцыі заўважаюцца досыць значныя русыфікацыйныя ўплывы. Іх падтрымлівалі салдаты, што варочаліся з царскай арміі, чырвонаармейцы, якія доўга стаялі ў раёне, паколькі тут праходзіў фронт у часы вайны з палякамі, і ўрэшце савецкія служачыя і работнікі, якія, ня ўмеючы пабеларуску, праводзілі тут розныя кампаніі на расійскай мове. Цяпер бадай у кожнай вёсцы пачуеш і расійскую песьню, і расійскую брыдкую частушку, пачуеш і беларуска-расійскую жаргонную гаворку. Праўда, гэтая зьява абмяжоўваецца толькі моладзьдзю дый то ня ўсёю. Што-ж датыча старэйшага па-

---

[1]) Всесоюзная перепись населения 1926 г.

[1]) Вынікі адміністр. сьпісу паселішчаў і гаспадарак БССР на 1 студзеня 1925 г.

каленьня, то яно гаворыць чыстаю, багатаю і цікаваю беларускаю гаворкаю.

Робячы параўнаньне паміж моваю старэйшага і малодшага пакаленьняў, нельга не ўпамянуць аб умоўнай мове, якая складае пераважную прыналежнасьць мовы малодшага пакаленьня (хлапцоў). Ня то тоячыся ад старэйшых, а галоўным чынам ад дзяўчат, ня то проста жартуючы, хлопцы ў гутарках паміж сабою часта зварачаюцца да ўмоўных моваў, на якіх яны гавораць дасканала. Праўда, умоўная мова ў раёне можна сказаць выключна абмяжоўваецца тыпам *херавых* моваў, прадстаўляючы ў гэтым сэнсе некалькі варыяцый. Найбольш пашыраным тыпам зьяўляецца прыбаўленьне пасьля кожнага складу часьціны *ку*. Такім чынам, напр., „хадзі сюды“ скажуць: „ха-ку дзі-ку сю-ку-ды-ку“, „дай мне вады“ будзе вымаўляцца „да-ку-ймне-ку ва-ку-ды-ку“. Больш ужо складаным тыпам зьяўляецца прыбаўленьне пасьля кожнага апошняга складу слова часьціны *ца*, а перад складам слова складу з гукам *ш* і галоснаю наступнага складу. Такім чынам „хадзі сюды“ будзе вымаўляцца: „ха-шы-дзі-ца сю-шы-ды-ца“, „дай мне курыць“—„шай-да-ца шэ-мне-ца ку-шыць-ры-ца“, „я пайду гуляць“—ша-я-ца пай-шу-ду-ца гу-шаць-ля-ца“. У гэтым мовах цікава, як разьбіўка няграматнымі сялянамі слоў на склады, гэтак і пэўная заканамерная перастаноўка гукаў (ку-шыць-ры-ца, гу-шаць-ля-ца) і зьмена галоснай у папярэднім прыстаўным складзе адпаведна да галоснай наступнага складу.

Другою групаю беларускай часьці насельнасьці раёну зьяўляецца *шляхта*. Шляхта (па мясцоваму вымаўленьню „шляхты“) расьсеяна па ўсяму раёну і жыве адасоблена ад сялян. Паселішчы яе носяць назву „засьценкаў“, „ваколіц“, „фольваркаў“ і „хутароў“.

У мінулым шляхта гэта служылы стан, пазьней зямяне і баяры, якія сядзелі на дворных землях, пляцячы пану чынш і адбываючы ў дварэ некаторыя павіннасьці (талокі і інш.)[1]. Як вольная кляса, шляхта ў пошуках лепшага месца часта мяняла сваіх паноў, пераяджаючы часта ў другі павет і нават ваяводзтва. І толькі пасьля ліквідацыі прыгону ў 1861 г., калі панскія двары, пазбавіўшыся дарэмнай сілы, не маглі прыстасавацца да новых эканомічных форм гаспадаркі і сталі шырока распрадавацца, шляхта раскупіла некаторыя маёнткі і праз гэта стала замацавалася ў раёне. Тая-ж частка шляхты, якая зямлі ня купіла, прымушана была, як безьзямельная, па ранейшаму вандраваць па арэндзе. Праўда, лік апошняй шляхты быў нязначны.

Такім чынам, шляхта раёну зьяўляецца некарэннаю, прышлаю і неаднароднаю часткаю насельнасьці. Мне вядома, што дзяды і прадзеды некаторых шляхецкіх засьценкаў (такіх большасьць) перасяліліся з Случчыны (па мясцоваму вымаўленьню з „Случызны“ або „с поля“. Майсееўка), з Слонімшчыны (Істопкі), нават з Валыні (Медзьведаў). Ня гледзячы аднак на гэта, уся шляхта раёну гаворыць аднэю моваю, блізкаю да літаратурнай мовы. Нават мова перасяленцаў з Валыні (каля 100 гадоў таму назад) нічым ня розьніцца ад мовы іншай шляхты. Тут трэба дапусціць або паўнейшую асыміляцыю мовы прыежджай шляхты або нават некаторае адзінства шляхецкай мовы наогул, на што да апошняга часу не зварачалася ўвагі, і што ў сваю чаргу патрабуе далейшых досьледаў.

Адзінству мовы шляхты спрыяла існаваньне раней самых шырокіх зносін паміж сабою шляхты. Гэтыя зносіны не абмяжоўваліся

---

[1]) Т. Забела. Панская гаспадарка. Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук. кн. 3.

толькі раёнам, але пашыраліся на цэлую акругу. Што году шляхта ў акрузе мела некалькі зьездаў („фэстаў"), на якія здалёк прыяжджала „палюцкавацца" моладзь. Тут спатыкаліся знаёмыя, сваякі, тут заводзіліся новыя знаёмствы; тут дзяўчаты выбіралі сабе жаніхоў, а хлопцы нявест; тут, урэшце, падтрымлівалася моўнае адзінства.

Адзінству шляхецкай мовы таксама спрыяе самае шырокае перакрыжаванае сваяцтва шляхты. Як адасобленая група, шляхта ня зьмешвалася з сялянскай масай і ня ўступала да рэволюцыі з яе прадстаўнікамі ў шлюб. Каб знайці сабе нявесту да яшчэ з пэўным пасагам, шляхціц езьдзіў „у сваты" ў шляхецкія засьценкі часта за 100 і больш вёрст. У выпадку дасягненьня згоды і заключэньня шлюбу ўстанаўляліся зносіны з новай раднёй, а праз гэта падтрымлівалася імоўнае адзінства.

Падобнага роду шырокія зносіны паміж сабою шляхты, бязумоўна, не маглі ня спрыяць павышэньню яе культурнасьці. Мужчынскае насяленьне шляхты бадай усё граматна. Моцная лаянка рэдка чуваць у шляхты. Шляхта больш гасьцінная, больш далікатна ў абыходжаньні, чысьцей утрымлівае сваё памяшканьне, хоць разам з тым яна і больш консэрватыўная.

Вядома, большая культурнасьць шляхты залежала ад яе эканомікі. У эканомічных адносінах шляхта найбольш заможная частка раёну. Сярэдняя шляхецкая гаспадарка, параўнаўча з такой-жа сялянскай, стаіць вышэй: яна мае і лепшы дом, звычайна з дзьвюх „хатаў", і лепшыя гаспадарчыя будовы, і большы лік зямлі і „тавару" (быдла). Праўда, ужо да рэволюцыі некаторыя шляхецкія гаспадаркі шляхам падзелу і перападзелу дзедаўскіх зямель паміж сынамі і ўнукамі здрабнелі і нічым ня розьняцца ад сялянскіх гаспадарак. Але ўсё-ж найбольш моцнымі ў раёне лічацца шляхецкія гаспадаркі, чаму яны ў значнай частцы і аднесены да кулацкіх гаспадарак.

Як этнографічны тып, шляхціц трохі розьніцца ад селяніна. У вопратцы, прынамсі да рэволюцыі, была наступная розьніца: шляхціц насіў чорную сьвітку дамашняга сукна, а селянін такую-ж белую; шляхціц яшчэ і цяпер убірае сарочку ў штаны, а селянін носіць паверх штаноў (самая пэўная адзнака адрозніць шляхціца ад селяніна); у сьвяточны дзень шляхціц убіраецца ў крамнае, тады як сяляне ў крамнае сталі ўбірацца толькі пасьля рэволюцыі, дый то маладыя. Апрача таго, шляхціц у большасьці коратка стрыжэ валасы, брые бараду, пазьней жэніцца, часта гадоў у 30-35; сяляне-ж, прынамсі да рэволюцыі, жаніліся маладымі, „як толькі выйдуць гады". Аднак рознага роду забабоны і прымхі ў шляхты і сялян у большасьці агульныя.

Па рэлігіі шляхта падзяляецца на праваслаўную (большасьць) і каталіцкую (меншасьць). Як тая, гэтак і другая шляхта гаворыць добраю беларускаю гаворкаю,[1]) якая аднак у параўнаньні з сялянскімі гаворкамі мае цэлы шэраг сваіх асаблівасьцяй, што будзе паказана на сваім месцы пры разглядзе гаворак раёну.

Вышэй ужо гаварылася (стар. 161), што толькі $^1/_5$ каталіцкай шляхты раёну карыстаецца польскаю моваю, як матчынаю, і што добрых $^4/_5$ яе часткі ня толькі гаворыць пабеларуску, але, апрача беларускай мовы, ніякай іншай і ня ўмее, тым ня менш, у сувязі з уплывам польска-каталіцкага касьцёлу і асабліва белапольскай окупацыі, уся каталіцкая шляхта залічае сябе да палякоў.

[1]) Мова найбольш кулацкай верхавіны шляхты яшчэ да рэволюцыі падупадала русіфікацыі (гаворка кулака Нікандара Беразоўскага каля 60 г. і яго сям'і з хутара Чмялёўніцы каля Коўцічаў).

Адносіны сялян да шляхты, з якімі іх яднае мова і агульнасьць заняткаў, можна назваць дабрасуседзкімі, хоць сяляне і сузнаюць сваю соцыяльную розьніцу і абразьліва дражняць шляхту „шаршнямі“ і „ляхамі“.

Што-ж датыча ўплыву шляхецкай мовы на сялянскую, то ён, бязумоўна, калі і ёсьць, то самы нязначны: па 1) таму, што шляхты ў раёне параўнаўча з сялянамі мала, а па 2) таму, што шляхта жыве ў паасобных ізоляваных ад сялян вёсках і наогул з сялянскай масай ня зьмешваецца.

Апрача беларусаў і палякоў, у раёне жывуць яшчэ дзьве нацыянальнасьці—яўрэі і вялікарусы (**с**тараверы). Іншыя нацыянальнасьці, як украінцы, цыганы, літоўцы, латышы, татары і немцы, прадстаўлены толькі малымі адзінкамі.

Яўрэі жывуць у мястэчках, галоўным чынам у Парычах (2535 чал.), Шчадрыне і ў некаторых вёсках (Коўцічы, Печышчы). Час зьяўленьня першых яўрэйскіх колёністаў у раёне трэба аднесьці к пачатку XVIII в., паколькі ў палавіне XVII в., згодна інвэнтару 1639 г., яўрэяў няма ня толькі ў м. Парычах, але нават і ў Бабруйску.

Да рэволюцыі галоўным заняткам яўрэяў быў гандаль і дробныя рамёствы. У м. Парычах, пераважна з лесапрамыслоўцаў, гуртавалася даволі такі буйная яўрэйская буржуазія. А побач з ёю мадзела ў вялікай нэнзе і ўбостве значная частка яўрэйскай насельнасьці мястэчка. Гэтая як раз частка пастаўляла балаголаў на рэйсы Парычы—Бабруйск і Коўцічы—Бабруйск, „круталозаў“ на плыты і дробных гандляроў на вёску— „каравачнікаў“, што на „караўкі“ (анучы) і збожжа мянялі селяніну патрэбныя для яго ўжытку рэчы: іголкі, дзёгаць, газу і інш. Пераважная частка гэтых гандляроў хадзіла пешкі, носячы на сваёй сьпіне і ў руках продукты памену і вымену.

У пасьлярэволюцыйныя часы, у сувязі з абмежаваньнем прыватнага гандлю і пашырэньнем сеткі коопэратываў, яўрэйская насельнасьць пачынае займацца ральніцтвам, у большасьці ўтвараючы с.-г. колектывы (Парычы)[1]. Але яўрэйская вёска Коўцічы займалася ральніцтвам і да рэволюцыі. Гэтая вёска лічылася колёніяй і мела сваю землю. У 1920 г. ў Коўцічах шайка белабандыта Булак-Балаховіча ўчыніла над яўрэйскаю насельнасьцю самы зьверскі пагром.

У этнографічных адносінах яўрэі Парыцкага раёну не становяць чаго-небудзь выключнага ад яўрэяў іншых беларускіх мястэчак. Тое-ж адзеньне, той-жа быт, тая-ж рэлігійная закараняласьць, з якою яўрэйскі камсамол вядзе вялікае і пасьпяховае змаганьне.

У культурных адносінах яўрэі, бязумоўна, стаяць вышэй за беларусаў. Сярод іх і большы процант граматнасьці (60%); сярод яўрэяў бадай што няма месца п‘янству, крадзяжу, разбою; сярод яўрэяў сама больш пашырана і грамадзкае жыцьцё. Жывучы ў мястэчках і часта бываючы ў горадзе (Бабруйску), яўрэі заўсёды інформаваны ў падзеях бягучага жыцьця, што асабліва цэніцца беларусамі. „Калі жыды кажуць, то ета мусіць праўда“, гаворыць беларус. Наагул-жа беларус цэніць яўрэйскі розум, і слова „жыдоўськая галава“ ў гаворках раёну зрабілася сынонімам разумнага чалавека. Тут да рэчы заўважу, што беларусы звычайна яўрэяў называюць або па імю, або словам „жыд“. Слова „яурэй“ у сялянскіх гаворках хоць і вядома, аднак ня ўжы-

---

[1]) Што да колектывізацыі ў раёне наагул, то трэба адзначыць, што тут справа стаіць слаба, хоць пры адсутнасьці хутароў і концэнтрацыі насельніцтва ў вялікіх вёсках, а таксама пры значна пераважаючым ліку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі пэрспэктывы ў раёне для колектывізацыі самыя спагадлівыя.

ваецца. Такім чынам слова „жыд“ у сялянскіх гаворках ужываецца выключна ў этнічным, а не ў абразьлівым сэнсе*).

Уся яўрэйская насельнасьць разумее і гаворыць пабеларуску, праўда з захаваньнем асаблівасьцяй свайго вымаўленьня. Аднак мова яўрэйскіх сем'яў, што адзіночкамі жывуць у сялянскіх вёсках, нічым ня розьніцца па вымаўленьню ад мовы беларусаў сялян. Што-ж датыча ўплыву яўрэйскай мовы на беларускую, то з прычыны рэзкай адасобленасьці яўрэйскай насельнасьці аб гэткім уплыве гаварыць ня прыходзіцца. Тут можна толькі адзначыць нязначны ўплыў яўрэйскай мовы на беларускую лексыку, дый то агульны для ўсёй беларускай мовы.

Да групы вялікарусаў трэба аднесьці стараверaў, што гадоў 50—70 таму назад пасяліліся ў вёсках Каралеўскай Слабадзе, Дражні, Малімонах, Завіччы і некаторых іншых, і малалічную служылую расійскую інтэлігенцыю (м. Парычы), якая ў сувязі з беларусізацыяй пераходзіць на беларускую мову.

Беларусы стараверaў называюць „сталаверамі“, „стараверамі“, „руськімі“ або зьняважліва „кацапамі“. Стараверы ў сваю чаргу зьняважліва называюць беларусаў „еретиками“.

Як і беларусы, стараверы галоўным чынам займаюцца ральніцтвам. З прычыны малазямельля часта ходзяць на падзённыя работы да больш заможных гаспадароў. Побач з гэтым стараверы займаюцца рознымі промысламі, з якіх найбольш пашыраным зьяўляецца дрэваапрацоўчы (бандарства, выраб гонту, пілаваньне, цясьлярства і інш.). Сьмелы пракідкі характар стараверaў, някультурнасьць (граматнасьць 20%), цяжкія ў сувязі з малазямельлем эканомічныя ўмовы жыцьця былі прычынай, што стараверская вёска да рэволюцыі ці мала выкідала з сябе рознага злачыннага элемэнту, з якога найбольш адказным лічыліся канаводы. Канаводы з Завічча ў дарэволюцыйныя часы карысталіся благой славай на цэлую акругу. Быць можа апошняя абставіна і паслужыла прычынай, што беларус унёс у сваю лаянку слова „кацап“, як сынонім шкоднага чалавека, „разбойніка“.

Пры ўсім тым адносіны беларусаў з стараверамі, ня гледзячы нават на рэзкую сэктанскую адасобленасьць стараверaў, дабрасуседзкія. Пасьля рэволюцыі гэтыя адносіны яшчэ больш узмацніліся. Цяпер ужо стараверы пасылаюць сваіх дзяцей вучыцца ў беларускую школу (хоць маюць і свае рускія школы), жэняцца з беларусамі, ня чужаюцца есьці з імі з аднэй пасуды і інш. Вядома, сярод стараверaў яшчэ ці мала трапляецца і „законьнікаў“, якія, напрыклад, нізашто не дадуць „еретику“ напіцца з сваёй пасуды вады. Але моладзь пад уплывам камсамолу і новых форм быту, што паступова прасочваюцца ў стараверскую вёску, рашуча разьбівае старое закарэлае сэктанства, якое адгароджвалася мураванай сьцяной ад усяго культурнага сьвету.

Аднак, дзякуючы ранейшай ізоляванасьці стараверaў, яны больш-менш захоўваюць у чыстаце сваю вялікарасійскую гаворку і з трудом паддаюцца асыміляцыі. Праўда, у лексыцы мова стараверaў падпала досыць значнаму беларускаму ўплыву, аднак фонэтыка іх мовы захоўваецца ў чыстаце. Тут мною пры беглым знаёмстве заўважаны толькі самы нязначны ўплыў (цеканьне ў Дражні). Што-ж датыча адваротнага ўплыву, уплыву мовы стараверaў на беларускую, то аб ім бадай што

*) Слова „жыд“ перанесена, як уласная назва, і на яўрэйскае паселішча Коўцічы, якая вёска звычайна завецца „Жыды“ або „Коўцічы-жыды“ (афіцыяльна Коўцічы I). Апошняя назва дана ў адрозьненьне ад другога аднайменнага сялянскага паселішча Коўцічаў, якія называюцца „Коўцічы-мужыкі“ (афіцыяльна Коўцічы II).

гаварыць ня прыходзіцца; нядаўнасьць перасяленьня стараверaў на тэрыторыю раёну, малалічнасьць іх вёсак і ўрэшце рэзкая ранейшая адасобленасьць стараверaў ад беларусаў — усё гэта, бязумоўна, такія фактары, якія павінны рашуча перашкаджаць пашырэньню сколькі-небудзь значнага ўплыву мовы стараверaў на беларускую.

Такім чынам карэнная група насельнасьці раёну — сяляне беларусы, ня гледзячы на сужыцьце з імі насьбітоў трох іншых моўных груп, з якіх некаторыя (шляхта, стараверы) больш ці менш блізка стаяць да іх па мове, усё-ж не падпадаюць у сваёй мове пад уплывы гэтых моўных груп, бо паміж гаворкамі сялян і іншых моўных груп увесь час стаяла вялікая перагарода, — з аднаго боку соцыяльная ізоляванасьць шляхты, а з другога боку нацыянальна-рэлігійная ізоляванасьць яўрэяў, рускіх і часткова палякоў. Калі прыняць пад увагу, як аб гэтым гаварылася вышэй, што культурна-эканомічныя, геаграфічныя і іншыя фактары ня ўплывалі або ва ўсякім выпадку мала ўплывалі на сялянскія гаворкі раёну, то з гэтага боку апошнія гаворкі могуць захоўваць у цяперашнім сваім стане шмат цікавых і характэрных для беларускай мовы зьяў, атрыманых у спадчыну ад глыбокай старасьветчыны, дзеля чаго патрабуецца іх усебаковае вывучэньне, пакуль яшчэ школа і рознага роду культурна-эканомічныя ўмовы ня сьцерлі іх характэрных асаблівасьцяй.

Вышэй ужо гаварылася аб старажытнасьці сялянскіх паселішчаў раёну. Я ня маю даных каб прасачыць сялянскія паселішчы ў раёне ў больш раньнюю эпоху. Не захавалася ў нас таксама старажытных актаў і матар'ялаў, па якіх можна было-б даць разгляд сялянскіх гаворак раёну ў гістарычным аспэкце. Аднак тут нельга не дапусьціць, што сяляне раёну спрадвеку жывуць на сваёй тэрыторыі, і калі правільна дапушчэньне некаторых вучоных, што прарадзімай славян зьяўляецца басэйн Прыпяці, то тут само сабой напрошваецца дапушчэньне, што сяляне раёну аўтохтоны сваёй краіны. Вядома, тут сьвет праліць павінна археолёгія. Археолёгічныя раскопкі ў раёне яшчэ не праводзіліся, калі ня лічыць археолёгічных разьведак проф. Завітневіча, хоць у раёне ёсьць ці мала памятак мінулага. Нават некаторыя паселішчы носяць археолёгічныя назвы (Гарадзец Казл. с с. і Курганы Коўціцкага с с.).

Даючы характарыстыку беларускіх гаворак Парыцкага раёну, я само сабой зразумела кладу ў аснову сялянскую або правільней сялянскія гаворкі. Аднак было-б вялікай хібай, характарызуючы ўсе беларускія гаворкі раёну, нічога не сказаць аб шляхецкай гаворцы. А таму кожны раз, калі шляхецкія гаворкі ў той ці іншай моўнай зьяве даюць адхіленьне ад сялянскіх гаворак, я гэтыя адхіленьні і адзначаю.

———

Для паўнаты досьледу звычайна бывае цікава, не абмяжоўваючыся разглядам гаворак тэрыторыі, што дасьледуецца, даць важнейшыя рысы гаворак суседніх раёнаў, але Парыцкія гаворкі, як аб гэтым я гаварыў і ў пачатку, не прадстаўляюць чагосьці выключнага ад іншых беларускіх гаворак, а тым больш ад гаворак суседніх раёнаў (Бабруйскага, Броскага, Глускага, Азарыцкага і Жлобінскага). Усе азначаныя ў Парыцкіх гаворках моўныя зьявы, як ізоглёсы, пераходзяць у суседнія раёны, што ў найбольш характэрных выпадках мною і паказваецца. Калі ўсё-ж у Парыцкіх гаворках спатыкаецца ня мала цікавых асаблівасьцяй, то гэты факт толькі сьведчыць аб тым, што мы яшчэ не належна ведаем свае гаворкі, што для вывучэньня іх трэба разгарнуць большую працу.

Прыводзячы назвы вёсак, у якіх заўважана тая ці іншая моўная зьява, у мэтах скарачэньня месца, падаю наступныя скарочаныя назвы гэтых вёсак:

Бял.	Бяліца	Пак.	Пакалічы
Вас.	Васілёўка	Пал.	Палянкі
Дабр.	Дабравольшчына	Панк.	Панкратавічы
Дан.	Данілоўка	Пар.	Парычы
Дубр.	Дуброва	Прат.	Пратасы
Зааз.	Заазер'е	Рам.	Раманішчы
Іст.	Істопкі	Слаб.	Слабодка
Казл.	Казлоўка	Чырк.	Чыркавічы
Кныш.	Кнышэвічы	Чэрн.	Чэрнін
Коўц.	Коўцічы	Шац.	Шацілкі
Красн.	Краснаўка	Язьв.	Язьвінцы
Майс.	Майсееўка	Як. Сл.	Якімаўская Слабада
Медзьв.	Медзьведаў		

——

У акустычных адносінах гаворка сялян мае свае пэўныя характэрныя асаблівасьці, чым яна выразна адрозьніваецца, напр., ад расійскай гаворкі стараверaў. Тэмп гаворкі сялян павольны, працяглы; інтонацыя аднастайная; голас мае невялікі дыяпазон, звычайна павышаючыся на націскных складох, якія вымаўляюцца з большай сілай экспірацыі, і пасьля паступова спадаючы. Таксама трэба адзначыць як-бы некаторую вяласьць артыкуляцыі, што выражаецца ў слабай змычцы моўных органаў, і што ў сваю чаргу зьяўляецца прычынай асабліва моцнай рэдукцыі ненаціскных галосных, нявыразнасьці ў вымаўленьні некаторых зычных і пропуску цэлых складоў слова („я таэ, бра, ску" Слаб. — я табе, брат, скажу). Слабасьць экспрэсіі ў вымове сялян нельга не паставіць у сувязь з аднастайнасьцю ў географічных адносінах ляндшафту і мернасьцю клімату раёну, монотоннасьцю сялянскага жыцьця і цяжкім гістарычным лёсам беларускага селяніна, якія прычыны не маглі не зрабіць свайго дэпрэсыўнага ўплыву як на ахарактарызаваную вымову сялян, гэтак і на іх песьню ў сэнсе аднастайнасьці і глыбокай смутнасьці яе мотыву.

Шляхецкія гаворкі ў акустычных адносінах трохі розьняцца ад сялянскіх, больш набліжаючыся да літаратурнага вымаўленьня.

——

Ф О Н Э Т Ы К А.

Ненаціскныя галосныя.

Аканьне. Ненаціскныя *о, а,* як агульная зьява, блізка ва ўсіх гаворках раёну супалі ў адным гуку, блізкім да гуку *а,* якою літараю яго я і буду азначаць. Толькі ў вымаўленьні сялян в. Чыркавіч, пераважна сярэдняга веку, выступае ненаціскное *о,* праўда, у некаторых асоб больш выразна, у другіх менш выразна. Больш выразнае, аднак небязумоўнае вымаўленьне ненаціскнога *о,* з некаторай яго лябіялізацыяй я запісаў ад сялянкі 35 гадоў, родам з Чыркавіч: г*оло*вóю, х*о*рòшай п*о*гòды, г*о*вóрыць, к*о*сіць; у прыстаўках: п*о*стòйце, п*о*двóду, п*о*жылі, п*о*бéгці, п*о*дцікóўваюць, пр*о*кòрмім, п*о* тры рáзы; у канцы слоў: цíхо, на нéб*о*, аднак лèт*а*м. У другіх асоб той-жа вёскі вымаўленьне

о выступае менш характэрна, але ўсё-ж яно заўважаецца (мо*о*рòз, змо*о*рòзь), праўда, часта пераходзячы ў рэдукаваныя гукі: къня̀, хъръшò. У іншых вёсках раёну вымаўленьне ненаціскнога *о* адмечана мною ў адзінкавых выпадках, як суб'ектыўнае і быць можа эмоцыянальнае вымаўленьне; гэтак, у в. Пакалічах ад Адар'і Шынкевіч 70 г. я заўважыў у канцовых адкрытых складох: на́до, аддàймо, забалѐло, хоць ад тэй-жа асобы я запісаў і усы̀пма, ніякага; у в. Дуброве: усе ро́ўно, а у в. Чэрніне: у мого́ ба̀цькі, у в. Васілёўцы: боюся, у в. Пратасох: жы̀то, сѐно (паведамленьне наст. Бараноўскага). Само сабою зразумела, што я пакідаю ў баку гаворку тых замужніх жанчын, якія паходзяць родам з іншых раёнаў і акруг, і ў вымаўленьні якіх ненаціскное *о* падпарадкуецца іншым законам (тàто, мàмо — з Мазыр акр.), а таксама гаворку прыежджай шляхты, дзе ў родн. скл. прым м. р. знаходзім ненаціскное *о*: дòбраго, благòго.

Што-ж да гуку, які замяніў ненаціскное *о, а*, то ў вымаўленьні яго пры ўважлівым назіраньні можна замеціць наступную розьніцу: у стане перад націскнымі галоснымі, што розьняцца ад *а*, гэты гук вымаўляецца, як выразнае *а*: нагí, ваду́, паѐду, маўчы̀; у стане-ж перад націскным *а*, ён вымаўляецца, як рэдукаваны гук з набліжэньнем яго да вымаўленьня а-э-ы (азначым яго ɑ): пɑда̀ў Красн., ɑдна́ Медзьв., дɑчкà Чэрн., мɑя̀ ib., у кɑря̀вая Дубр., пɑ̆ надзе́ла ib., пɑд акѐнца Чэрн. [1]). Толькі ў вымаўленьні в. Васілёўкі заўважаецца ў гэтым выпадку выразнае *ы*: пыкусàе, выдà, пыдавàю, пыдыйдзí. Праўда, і ў гэтай вёсцы па маіх назіраньнях, а таксама па назіраньнях мясцовага настаўніка т. Атраховіча падобнае вымаўленьне не прадстаўляе чагосьці сталага і часта ў гэтай-жа вёсцы хутчэй можна пачуць у вышэй пададзеных прыкладах рэдукаваны галосны з набліжэньнем яго то да *ы* (у гаворцы старых жанчын), то да *а* (у гаворцы мужчын і маладога пакаленьня).

У м. Парычах ад мясцовага жыхара (мешчаніна) я запісаў „хлѐб дыы вадà". Звычайна аднак усюды ў Парыцкім раёне заместа *ды, дык* гавораць да, дак: хлеб да вада, дàлі ямý вясло́ ў рýкі дак ён і паéхаў Пак.

Дысыміляцыйнае аканьне тыпу ныга, як мне перадавалі, існуе яшчэ ў гаворцы з. Ліпнікаў, заселенага прыежджай шляхтай, але, на жаль, гэтых вестак мне не ўдалося праверыць.

У пасьлянаціскных складох на месца *о, а* таксама заўважаюцца рэдукаваныя гукі: прà ўдɑ Медзьв., пà чкɑмі ib.

Што-ж датыча гуку, што замяніў ненаціскное *е* пасьля зацьвярдзелых зычных, то ён у большасьці гаворак супаў з тым гукам, які ўтварыўся з ненаціскных *о, а*: жɑна Пак., за жɑнý Чэрн., на цɑпý Вас., Гɑрасіма Слаб. мòжɑ Дабр., пішɑ Вас., ягòднічак Дубр., чаўно́чак Чэрн., на днішчɑ Як. Сл. Праўда, гэты пераход не абсолютны, і тут, падобна да захаваньня *е* (ненаціскнога) пасьля мяккіх зычных, часта знаходзім *э* або гук ірацыянальны ў напрамку а-э: дзе́рэва Чэрн., го́рэ ib., ві́шэнькі ib., на ру́чэньках ib., закру́чэны ib., ву́хварэць Слаб., на рэкý Чырк.; жɑнìцца Чэрн. стрɑля̀лі Чырк., за лясо́чɑк Дабр.; сарашò чɑк ів., кà жɑ Рам. Калі параўноўваць гаворкі раёну ў адносінах да захаваньня пасьля зацьвярдзелых зычных *э* або гуку ірацыянальнага,

---

[1]) Існаваньне дысыміляцыйнага аканьня ў Бабруйскай акрузе першы раз было заўважана М. Дурново і П. Бузуком і пацьвярджаецца гаворкамі Парыцкага раёну (гл. працу М. Дурново ў гэтай кнізе: „Увагі да белар. фонэтыкі").

то трэба канстатаваць, што апошняя зьява больш пашырана ў паўднёва-ўсходніх гаворках раёну, гэта зн. як раз у тых мясцовасьцях, дзе найбольш выразна выступае і еканьне. У гаворках-жа паўночнай часткі раёну гэтая зьява заўважецца рэдка.

Ня менш складана стаіць справа і з вымаўленьнем ненаціскнога *е*. Вымаўленьне гэтага гуку мяняецца ня толькі ў дзьвюх асоб з адной вёскі, але і ў адной асобы і нават іншы раз у адным і тым-жа слове. Агульнага, што можна сказаць аб ненаціскным *е*—гэта рэдукаваны гук, які ў паўночнай частцы раёну мае большае набліжэньне да *я*, а ў паўднёвай—да *е*, не супадаючы аднак поўнасьцю ні з адным з гэтых гукаў. Дзеля гэтага ненаціскное *е* больш правільна будзе азначаць ɛ, гукам у напрамку 'а-'е-і. Гэтай сваёй вымовай ненаціскное *е* ў гаворках раёну, як і ненаціскное *о*, набліжаюцца па акустычнаму ўражаньню да літаратурнага вымаўленьня ненаціскных *е, о*. Аднак пры ўважлівым нагляданьні вымаўленьня ненаціскнога *е*, можна заўважыць розьніцу ў вымаўленьні гэтага гуку ў залежнасьці ад наступнай галоснай у націскным складзе: у стане перад націскнутымі галоснымі, рознымі ад *а* ('а), вымаўляецца даволі выразнае *я:* цяпе́р Пак., мядзьвѐдзя Дабр., пяю̀ць Вас., нясі́ ib., пяём Красн., бярэ̀ Слаб., дзярэ̀ўні Чырк., пяе́ Чэрн., бярёза Дубр., зямлі́ ib., ляці́ Зааз. Праўда, пераважна ў паўднёвай частцы раёну ў гэтым выпадку можна пачуць і *е:* пеецé Чэрн., лецìць ib., серпо̀к ib., зеленéнькі Дубр., ребéнькі ib., за рекóю ib., чернíца ib., цепе́р Чырк., пеюць ib., Петро̀ ib., белéньку Дабр., прылецéў Пак., лебёдкамі Красн. У стане-ж перад націскнутым складам з *а* ('а) ў паўночнай частцы раёну пераважаюць выпадкі з рэдукаваным *е* (ɛ), якое вымаўляецца зусім блізка да *я*, іншы раз па акустычнаму ўражаньню супадаючы з гэтым гукам: палɛжа̀ў Пак., дзɛся̀тую ib., сɛм'я̀ Дабр., сɛстрà Пал., мятлà Пак., янà ib., вялà Дабр., а ў паўднёвай частцы *е:* на Петрà Слаб., сестрà Чэрн., венчà́цца ib., рекà Дубр., павелà ib., енà Чырк., зеленà́я траўка ib., цеплà ib., веснà Прат., целя́ ib.

У другім і трэйцім складох перад націскам вымаўляецца *е* або ɛ: з лебядзь Пак., селавь Дан., зелянéнькі Даб., зьнɛбылà́ся ib., нɛхрышчóны Слаб., не даказà́лі ib., верацянò Дан.

Пасьля націску ў закрытых складох у паўднёвай часьці раёну звычайна вымаўляецца *е*, а ў паўночнай *е,* ɛ: па сéнечках Чэрн., дзéлечка ib., дробненькіе ib., хлóпец Слаб., пѐсенькі сьпɛвалі[1]) ib., бўсɛл ib., чóвен Пак., аглéдзела ib., мя̀кеньку Дабр., у за̀печку ib., лíсьцейкам ib., пѐсень Як. Сл., ні знà́ɛм Казл., падымɛцца Дабр., атлɛтà́ɛм ib., гà́ɛм Пак., жнéɛк Сл., бацɛчка Дабр., аднак бўсял Пак., на пасьцѐляццы Дабр. У *е* (ɛ), асабліва ў паўднёвай часьці раёну, пераходзіць і *я* (з ѧ): рòбець Чэрн., дзéсець Рам. пà́мець Прат., пà́метлівые Вас., гòнець Прат., кòрмець ib., хóдзɛць Чэрн.

Пасьля націску ў адкрытых складох пераважаюць выпадкі з *е*, ɛ ў паўднёвай часьці і з ɛ, *я* ў паўночнай: зéрне Чэрн., сінее мора ib., с пóлɛ ib., сьпéе Чырк., ні пужà́йце ib., дáйцɛ ib., грэ̀ɛ Красн., вéя ib., лѐтуɛ Слаб., бýдзя Дабр., Дан., марнѐɛця Дабр., дà́йця Пак. У паўночнай часьці раёну пасьлянаціскное *я* ў адкрытых складох звычайна спатыкаецца ў складох, суседніх з націскным (бўдзя Казл., лéзя Бял.); у больш далёкіх ад націску складох будзе *е* або ɛ: прынòсіце Пак.,

[1]) У левабераж най часьці раёну „сьпяваць песьні" ня ўжываецца; замест а гэтага гавораць „пець песьні". „Сьпяваюць", сказалі мне дзяўчаты ў Дабравольшчыне, „толькі ў цэркві".

шукàɛцɛ ib. У паўднёвай часьці раёну ў *е* таксама пераходзіць і *я* (ѧ) зваротнага займеньніка *ся:* удалòс*е* Чэрн., рàдуйс*е* ib., пазабуàлас*е* ib., баіськ*е* Прат., задȕмаесьс*е* ib., асталóс*е* Дубр., навуч*и*ліс*е* Чырк.

Такім чынам з папярэдняга мы бачым, што ў паўночнай часьці раёну ў вымаўленьні ненаціскнога *е* пераважаюць выпадкі з ɛ, *я*, а ў паўднёвай і паўднёва-ўсходняй з *е*, ɛ. Граніца ў праваберажнай часьці раёну праходзіць па канаве, якая працякае па досыць шырокаму балоту, у напрамку вёсак Качай-Балота, Слабодка, Кнышэвічы, Скалка і р. Бяроза, захопліваючы і в. Казлоўку. Насельнасьць направа ад канавы—паляшукі, налева, за выключэньнем Коўціцкага сельсавету,—літашы.

Што-ж датыча адмоўнасьці *не,* то яна звычайна ва ўсім раёне вымаўляецца, як *ні*: ні бáчыў Пак., ні дàл*а* ib., ні абéдалі ib., ні пасóбіць Дабр., нічóга ні дапамагàюць Слаб., ні пісàў ib., ні хóча Дан., нішчàсная Чырк., ні жаніўся ib. Адмоўнасьць *не*, *н*ɛ вымаўляецца вельмі рэдка: не здòлею Дубр., не пускàе Слаб., нɛ былó ib., нɛ кȕпяць ib. Таксама ва ўсім раёне гавораць н*і*мà, н*і*хàй. Толькі ў в. Дуброве я раз пачуў ад старой сялянкі н*е*мà.

Калі вышэй гаварылася, што вымаўленьне ненаціскнога *е* ў гаворках раёну даволі нявыразнае, што дысыміляцыйнасьць яканьня як-бы толькі намячаецца, то ў в. Васілёўцы, што знаходзіцца на правым беразе р. Бярозы, у адлегласьці прыблізна роўнай паміж Парычамі і Бабруйскам, заўважаецца выразнае дысыміляцыйнае яканьне ікаючага тыпу. Тут мною запісана: б*і*дà, кал*і*дà, дз*і*лà, п*і*тнàццаць, в*і*снà, в*і*лà, гл*і*дзяць, Сьц*і*пàн, ц*і*ля̀, дз*і*разà, п*і*рапéчка, п*і*равòз, дз*і*разé, але бя̀ды, вя̀сны. Выпадкова можна пачуць і вɛснà, п*е*рапѐчка, в*і*снóю, вɛсьнé, дз*е*разé. Пасьля націску: вясёл*і*нькі, спакóйн*і*нькі, вы̀с*і*куць, знà*і*ш, умѐ*і*ш, разьбігà*і*цца; пя*і*цé (магчыма па аналёгіі з ста*і*цé, таксама як знà*і*ш па аналёгіі з ста*і*ш), німà̀шика (*и* з прычыны паўмяккіх шыпячых). Характэрна, што апошняе слова мною таксама запісана ў суседняй вёсцы Краснаўцы, якая знаходзіцца ад Васілёўкі ў $1^1/_2$ вярстах, як німà̀ш*а*ка. Наагул у Краснаўцы дысыміляцыйнага яканьня ікаючага тыпу не заўважаецца, за выключэньнем суфіксаў: чаўнòч*и*к, шнурóч*и*к, тапарóч*и*к, у лɛсòч*и*к, дзе можна бачыць і аналёгічныя ўтварэньні.

Як відаць, прычынамі іншага характару тлумачыцца вóс*і*м (ст.-сл. **осмь**), вòс*і*мдзесят, *і*шчэ (яшчэ), пашыраныя ня толькі ў гаворках усяго раёну, але і ў значнай частцы недысыміляцыйных (няікаючых) беларускіх гаворках наагул. Сюды-ж аднясу „тàк*і*к“ (так *як*—„зрабі такік я“ Дан.).

Параўноўваючы Васілёўскі тып яканьня з аканьнем, трэба сказаць, што яканьне тыпу в*і*снà, вя̀сны ў Васілёўскай гаворцы прадстаўлена больш характэрна, і што наадварот, аканьне тыпу в*ы*дà, в*а*ды̀ зьяўляецца менш характэрным і наглядаецца толькі ў гаворцы паасобных індывідаў. Апошняе сьведчыць, як гэта ўжо адзначалася і іншымі дасьледчыкамі, аб несупаданьні граніц дысыміляцыйнага аканьня і яканьня [1]).

Існаваньне ў Васілёўскай гаворцы характэрнага дысыміляцыйнага яканьня наводзіць на пытаньне, якім парадкам яно зьявілася ў гэтай гаворцы, тым больш, што ні ў суседніх вёсках, ні наагул у гаворках раёну і суседніх з ім мясцовасьцях падобнага тыпу дысыміляцыйнага

[1]) Е. Карский. Белоруссы, т. II, ч. I, і інш. (П. Бузук, О. Воўк-Левановіч).

яканьня не наглядаецца. Калі-ж прыняць пад увагу існаваньне ў Васілёўскай гаворцы і некаторых іншых рысаў, якія даволі рэзка выдзяляюцца сярод гаворак раёну, прыходзіцца дапусьціць, што прэдкі сучасных жыхароў Васілёўкі (вёска мае каля 200 двароў) калісьці былі пераселены сюды з тэрыторыі дысыміляцыйнага яканьня ікаючага тыпу ў суседні з Васілёўкай маёнтак Каралеўскую Слабаду. Аднак ні самага факту перасяленьня ні часу яго ў памяці жыхароў не захавалася.

Шляхецкія гаворкі ў адносінах да яканьня больш падобны да сялянскіх гаворак паўночнай (леваберажнай) часьці раёну. У некаторых шляхецкіх паселішчах, населеных у больш позьнія часы, спатыкаецца і дысыміляцыйнае яканьне ікаючага тыпу (Сяліба, Шацілкі).

Іншыя ненаціскныя галосныя.

Адносна іншых ненаціскных галосных адзначу:

а) *а* на месцы *ы*: у Тўрц*а*і Пак., сьпе́ў-б*а* ib., ён-б*а* мо й жыў Слаб., іх-б*а* Вас.; (гэта зьява стаіць у сувязі з тым-жа аканьнем[1]);

б) захаваньне старога *і* ў словах цьв*і*сьці (ўсюды), сьв*і*та̀ць ус., до́сьв*і*так ус.;

в) *і* на месцы *ы*: каро́м*і*слам Дабр., в*і*со̀ка Бял., в*і*со̀кі Пак., Дан. і блізка ва ўсім раёне (аднак вы̀шай). Цікава, што вымаўленьне *і* зам. *ы* ў слове „вісокі" нават заходзіць на тэрыторыю, дзе пасьля губных зам. *ы* вымаўляецца *у*: з в*і*со́кага гаю Чырк., аднак в*у*со̀кі Чэрн.;

г) *ы* пры літ. *у*: с*ы*бо̀та (ва ўсім раёне);

д) *у* зам. *а*, *о*: м*у*л*ы*х Дубр., м*у*л=ва̀ць ib., м*у*зо́ль Дан. (аднак мы̀ліца). У слове „музоль" магчыма і аналёгія слову му̀ляць;

е) *а* на месцы стар. **ь**: ж*а*ры̀ ўс. (ад жраць), ж*а*нцы̀ ўс.;

ж) *і* на месцы стар. **ь**, як і наагул у беларускай мове, у слове зьв*і*не́ць;

з) *ы* ў выніку контамінацыі ў слове зас*ы*на́ць ус.; пар. укр. засинати.

і) *у* зам *ы* ў слове с*у*равэ̀жка ўс., дзе трэба бачыць асобную народную этымолёгію;

к) *у* (з ж) у слове *слук*а̀ побач з *он* (ан), *ом* (сл*он*ка, сл*ан*э̀ц, сл*о́м*ка) у гэтым слове ў іншых беларускіх гаворках (Мат. Слоўн. Кам. Б.А.Н., гл. таксама *С. Некрашэвіч* і *М. Ьайкоў*. Рас.-Бел. слоўнік пад словам „Вальдшнеп").

л) паўнагалосныя формы: вò*бал*ак ус., пан*ара̀*віцца ўс., што сялцэ̀, то н*ара*ўцэ̀ Чэрн. З непаўнагалоснах форм, як славянізмы, усюды ўжываюцца ст*ра*м, ст*ра̀*мнік з устаўным *т*, хоць с*аром=*цца ўс., пабойся с*арам*а́ ўс.;

м) галосныя пры плаўных (з ранейшай глухой): прагл*ы*нўла Пак., я̀бл*ы*чка ib., гл*ы*та̀ць Дабр., бл*ы*ха́ Дан. (звычайна ўжываецца *ско́чка*), бл*і*шча̀ць ib., *дры*жа̀ць, *дры*во̀тнік Коўц., *дры*васе́к і *дры*васкэ̀п ib., пакр*ы*шы̀ла Казл., хр*ы*сьці̀ць Майс., кр*ы*ві̀ ib.; у чужаземных словах: а̀р*ы*шт ус., а*ры*шта̀нт ус., *ры*со̀ра Пар., бр*ы*нзалэ̀т Майс. Пад націскам *ы* (і) можа захоўвацца: пл*ы*т ус., пл*ы*тнік ус., л*ы*жка Дан., др*ы*жыкі прадае́ ўс., чарнабр*ы*вы Слаб., бл*ы*таць Дан., гл*ы*кнуць ус., бл*і*снуць ус. (і бл*я*ск Майс., п. blask), аднак дро̀вы, гло̀тка і інш. Выпадкі з адваротным парадкам гукаў (глухі + плаўны): ч*ыр*во́ны ўс., ч*ыр*ці̀ць Дан., ч*ыр*та̀ ib., т*ыр*ча̀ць ус., ч*ы*рка (качка) ус. (пад націскам). З вы-

[1]) Гл. Шахматова „Русское и словенское акание", Сборн. ст., посвящ. Фортунатову, 1902, ст. 87.

падкаў, у якіх галосны пры плаўных ня з глухой, адзначу г*лы*бо́кі Майс. (ст.-сл. **глжбокъ**), сь*лі*нà' і сь*лю*нà Майс., х*лі*стàць ib. Цікава адзначыць, як полёнізм, у шляхецкіх гаворках с*ло́*нца пры с*о́н*ца, с*о́н*ейка, с*о́ў*нюшка Пак. ў сялянскіх (ст.-сл. **слъньце**, у слоўніку І. Насовіча с*ло*нца).

Правільна ўжываюцца састáралася Дубр., ва*ра*ўнѝ Чэрн. (ад *варево*), аднак і ў гэтых выпадках у большасьці гаворак раёну будзе састà*ры*лася Дан., ва*ры*ўнѝ Красн., вà*ры*ва ib.

н) рэдукаванае *у* на пачатку слова: ᵘдава, ᵘнука ўс., аднак з добрым *у*нукам Дан.

Прыстаўныя галосныя. З прыстаўных галосных у пачатку слова найбольш пашыраным зьяўляецца *і*: *і*ржà Дан., *і*ржы̀шча ib., *і*льня̀ны Майс., *і*мшàк (дождж) ib., *і*мша́рына ib., *і*рзàць Казл., *і*зно́ў Дубр., *і*злò́мяць Вас., *і*гру́ша Дан. (аднак стýжка, скры̀пка, рвàць), конь *і*здò́х Слаб., нехàй мене́ зьве́р *і*зье́сь Чырк. (у апошніх двох выпадках пасьля зычнай). Прыстаўное *і* зрэдка спатыкаецца і перад прыйменьнікамі *к, з*: пашо́ў *і*к jім Дан., гуляў *і*з' ёй ib., ішо́ў Тò дар *і*с Тадò рай, нашлі лàпець *і*з абò рай ус. Прыстаўное *а* (з *о*) спатыкаецца рэдка (*а*ўторак ус.). Тут-жа адзначу гурке́ Язьв. і *а*гуро́к Дан.;

Прыстаўное *і* знаходзім і пры аднаскладовых словах, у якіх ъ і ь не разьвіліся ў *о, е*. Такім чынам *лоб, лòбу, лòбам*, на *лòбе*, але побач з гэтым *і*лба́, *і*лбу́, *і*лбòм, *і*лбы̀, ілбо́ў і г. д. Падобнае-ж прыстаўное *і* знаходзім і ў слове *лёд*, дзе маем *лёду, лёдам*, на *лёдзе* (ў адзін. ліку) і *і*льды́, *і*льдòў і г. д. (у мн. ліку). Слова *леў* усюды мае прыстаўное *і*: *і*львà, *і*львў, *і*львы̀ і г. д. Што-ж датыча слова *лён*, то яно ўжываецца і з прыстаўным *і* (*і*льну́, *і*льно́м, *і*льны̀, *і*льно́ў і г. д.) і без яго: *лёну, лёнам, ляны̀, лянòў* і г. д. Слова *мох* звычайна ўжываецца, як м*òху, мòхам*, в *ымхў, імхі, імхо́ў*. Словы р*от*, р*оў* прыстаўнога *і* ня маюць; такім чынам р*от*, р*оту*, р*ову*, р*аты̀*, р*авы̀*, р*ато́ў*, р*авòў* і г. д. Таксама ня мае прыстаўнога *і* і слова в*ош* (в*ошы*, в*ошай*, в*ошам* і г. д.). Адзначу яшчэ прыстаўное *і* ў слове *і*клы ўс.

Нельга ня бачыць адбіцьця прыстаўнога *і* ў слове не́йдзе Слаб. (ад *і*дзе=дзе). У слове *айдзе* Медзьв. трэба бачыць, побач з прыстаўным *і*, і прыстаўное *а* [1]).

Устаўка. Устаўное *і* (й) знаходзім у словах трэ́йці (ва ўсім раёне), во́йстры Дан. **(остръ)**, вò йстраў ib., ва́йстры̀ць ib. Ад кораня *ід і* заходзіць і ў словы за́йшлà Слаб., зна́йшòў Дан., усе лужке́ абы́йшлà Чырк., аднак прышòў Пак., вы̀шаў Дан.

Цікава яшчэ адзначыць словы пач*а*нì Чэрн., нач*а*нè (ст.-сл. **почьнеть**) Пак., пасòхла Дан. пры больш пашыраных пасхлò Слаб., схне ib. **(съхнѫти)**.

У песеннай мове, як звычайную зьяву, знаходзім устаўку паміж зычнымі *ы* (і): ру̀ч*ы*кі Чэрн., галу́б*ы*чык Пак., нòж*ы*кі Чырк.

Варта яшчэ адзначыць устаное *а* ў чужаземным злучэньні *тр*: мініст*а*р ус., лі́т*а*р (і лі́тр*а* — ж. р.) Чэрн., а таксама ма́р*а*ц („Màрац атмарó́зіць пàлɜц". Дан.).

Страта галосных. Страту *а* (я) бачым у словах (усюды): йшчэ, шчэ, нèйкі (не́які), èткі (е́такі), а таксама 'да'днагò, па'бедàлі, па't'ядàлі, па'ràў, зàчы. У словах *і*гràць, *і*грà *і* захоўваецца.

З страты іншых галоснах адзначу: страту *у*: селі, - па́лі на вадзè (гусі) Чырк., *і*: дзя̀дна ад *дзя̀дзіна* Майс., *й*: могó Чэрн., да̀ле Слаб. У выніку выпадзеньня j паміж галоснымі, далейшай асыміляцыі, а

[1]) Е. Карский. Белоруссы. Т. II, ч. 1, стар. 320.

пасьля сьцягваньня маем: купіў до́бру каро́ву Слаб., зна̀-це Чырк., здэ̀цца (здаецца) Дан.

Страчвацца могуць ня толькі паасобныя галосныя, але і цэлыя склады: сёлета ўс., баславі́ць ус., глянь на̀ ба' (на бога) Дубр., ску' (скажу) Рам., мо' (можа) ус., ліха вед (ведае) што Медзьв.

Націскныя галосныя.

Дыфтонгі. Адною з найбольш цікавых зьяў гаворак раёну ў галіне націскных галосных зьяўляюцца на месцы націскнога ѣ і старых *е* і *о* ў зачыненых складох дыфтонгі *іе, уо*. Ужо Н. Янчук, першым вынайшаўшы дыфтонгі ў бабруйскіх гаворках, так характарызуе апошнія: „... в восточной и юговосточной (часьці) Бобруйского у. ударение в названных дифтонгах, или двугласных, ставится уже не на первой, а на второй части: *сіено, вуол, мюод,* и таким образом дается перевес первоначальной, основной гласной, между тем, как первая часть дифтонга остается только в виде слабого призвука; еще далее— и этот призвук совсем исчезает..." [1]). Згаджаючыся з Н. Янчуком адносна пераносу націску на другую частку дыфтонгу, які складае адну фонэму [2]), трэба аднак катэгорычна констатаваць, што ў гэтай часьці Бабруйшчыны (усходняй) дыфтонгі бязумоўна існуюць, складаючы самабытную зьяву гаворак Парыцкага раёну, як і іншых беларускіх гаворак [3]). Прывяду прыклады дыфтонгічнага вымаўленьня на месцы ѣ: лі͡эс Дабр., гры͡эх Чэрн., гары͡элкі Пак., бі͡эдны ib., ры͡эдка Чырк., мі͡эста ib., тры͡эба Вас., Дубр., бі͡элы Дабр., лі͡этам ib., у лі͡эсі ib., і͡эхаць Дубр., пасьні͡эдаўшы Чэрн., бясі͡эдачка Красн., гуркі͡э Язьв., маі͡э вали͡э Дабр., ени͡э Чырк., сваты͡э Пак., ляны͡э ib., лугі͡э Панкратавічы, грыбы͡э Дан., жанкі͡э Слаб., клапаты͡э ib., гады͡э Чэрн., аццы͡э Рам., камары͡э Чэрн., тараны͡э Чырк., халады͡э ib., харашы͡э Чэрн., сустры͡эў ib., ні͡экаму Дабр., не ўмі͡эю ib., квэткі͡э Пак. На месцы *е*: пі͡эч Пак., сі͡эм Дубр., мі͡эч Дан. На месцы *о*: ку͡онь Дабр., мару͡ог ib., ну͡оч ib., му͡ост Пак., бу͡ор Красн., бу͡ог Слаб., жу͡онка Пак., Слаб., нару͡од Вас., плу͡откі Дабр., ру͡одны Чэрн., гу͡орш Чырк., бу͡ольшы Дабр., Красн., Вас., Дубр., ву͡ось ту͡олькі Дубр., ву͡осьмы ib., шту͡о Дабр., ту͡ой Слаб., му͡ой Красн., Чэрн., валу͡ом Дабр., вясну͡ою Пак., на ту͡ом сьві͡эці Чэрн., прышу͡оў ib., запрагу͡ом Чырк., прынюос Пак., м'ю͡од Дан., вю͡оз Дабр.

На дыфтонгічнае вымаўленьне іншы раз падобна *о* (ня з ō) з моцна лябіялізаваным прыступам: сало̀дкая Пак., на паро̀г Дабр., каро̀вачкі Слаб.

Характарызуючы наагул Парыцкія дыфтонгі, трэба сказаць, што яны мала выразныя, асабліва ў першым компонэнце дыфтонгаў, і іх можа ўспрымаць толькі добра напрактыкаванае вуха дасьледчыка, дый то выключна пад націскам: на месцы ѣ, як правільна падмеціў М. Дурново („Увагі...") пад націскам у закрытых і адкрытых складох і на месцы асноў-

---

[1]) *Н. Янчук.* По Минской губернии. Труды этнографического отд. о-ва любителей естествознания, антропологии и этнографии. Книга IX. 1889 г.

[2]) *В. Ганцов.* Характеристика поліських дифтонгів. Записки історично-філологічного відділу. Кн. II-III. 1923.

[3]) *А. Шахматов.* Курс истории русского языка (лит.) ч. 1, 1911 г., стар. 138.

ных *е, о* толькі ў закрытых складох У ненаціскных складох рэфлексы дыфтонгаў бадай што не адчуваюцца [1]), як і ў паўн.-украінскіх гаворках.

Іншыя зьявы націскных галосных. З іншых зьяў у галіне націскных галосных адзначу: а) пераход *а* ў *о*, выкліканы гэтак званай хібной аналёгіяй: штóнікі Дан., лес здаюць у кóзну Рам., закóціцца Дан., утóйваць Майс. (аднак пасáдзіш, падáрыш), зóйме Майс., знóйдзе (але знáхадка) ib., нóйме ib. У вымаўленьні Адар'і Шынкевіч з в. Пакалічаў адчувалася моцна лябіялізаванае *а*, блізка што *о* (*о*ª) ў злучэньнях *аў, яў:* журóªў, займóªў, капóªў, казóªў, напісóªў, назóªўтра, узёʲў. Нідзе ў іншых мясцох раёну падобнага вымаўленьня не спаткаў.

Побач з пераходам *а* ў *о* адзначу і адваротны пераход (пад націскам) *о* ў *а*: стáйла ўс., выгавáруваць (ва ўсіх сялянскіх гаворках), упрáшуваць. У шляхецкіх гаворках у падобных выпадках *о* захоўваецца: выгав*о*рваць, падск*о*кваць, упр*о*шваць.

б) Пераход а у *е* (ё): пацéгла Слаб., пацёг Дан., запрог ус., апрóгся ўс., падглéдзець пчолы Дан., глéдзячы ўс.

в) Пераход *е* ў *ё*: м'ёд Дан., ёмка ib., ёўня ib., хрóсны бацька Слаб., хрось (у выражэньні „хрось сьветы") Рам., зап'ёр ib. (аднак запер—частка гумна). У Шацілках, дзе насельнасьць прышлая, заўважаецца пераход і *ѣ* ў *ё*: палёз, пасёк, пабёг; тое-ж у в. Чэрніне ў слове хлёў. У першых выпадках *ё* аналёгічнага пахаджэньня, у апошнім магчыма выклікаецца лябіяльным уплывам наступнага *у*.

Найбольш характэрнымі для гаворак раёну зьяўляюцца адваротныя выпадкі—неператход *е* ў *ё* пры пэўных фонэтычных умовах; такім чынам: шчэлка, шчэдрык ус., чарэмха ўс., жэрдка ўс., стрэмка ўс., падзеж ус., крадзеж ус., тасёмка ўс., сьпёка ўс., ёлка ўс., цяцёра ўс., пес (шляхта) адзежа ўс., цёшча ўс., апёнькі ўс., вузёльчык ус., Алена ўс., Матрэна ус., Хведар ус., яйцэ Чэрн., плячэ ib., ліцэ Рам., касьсé ib., гальлé Дубр., гаршчэчак ус., мяшэчак ус., сьветым днём Чырк., урачэм Слаб., аццэм Чэрн., плячэм Дан., душэю Рам., гульнёю Майс., чарэн, ужэ ўс., няўжэ ўс., далёка ўс., дзёшава ўс., усё (=усё) ўс., харашэ Рам., улёгцы ўс., наўцёкі ўс., чыё дзіця Чэрн., дарагёнькі ўс., чацьвёрты Дан. (і чацьвóрты Чэрн.), маё бýдзе Слаб., тваёй сьмёрці Дабр., маёй дóлі Чырк., хоць і ў сваёй галаве Бял., на ёй Пак. (выпадкі з *е* пераважаюць), мёрзьне ўс., зачэсана ўс., папёрла ўс., апёрлася ўс., памёрла ўс. (аднак пам'ёр Дан.), уцёрла ўс., *е* ус., *е*сь (сял.), ёсɜка (сял.), *е*ст (шляхта), вядзёш ус., бярэш ус., вядзем ус., бярэм ус. Адзначу тáксама асьлёп ус.

г) *е* на месцы **jь:** яёчка ўс., траёцкі ўс., заёчы ўс.

д) У асновах дзеясловаў пасьля шыпячых з старога ё звычайна маем *а*: маўчáць ус., крычáць ус., гірчáць ус., аднак даражэць ус., крапчэць ус.

е) Усеагульнае захаваньне *ы* з *ы* няпоўнага ўтварэньня: мы́ю, кры́ю, вы́ю, малады́. Таксама шы́ю, шы́я, напі́ся, бі́ё, бі́юць Вас. (звыч. б'е, б'юць), бры́юся, налі́, аднак лéяць, налéю, налéɜш Дан. (сял.). Шляхта ў апошнім выпадку гаворыць лíць, нальлю́, нальлéш.

ж) Устаўное *е, о:* карабéль ус. (і карáб Пак.), журавéль ус., акенца **(окно)** ўс., але вóкан, хадзіць пападвóканьню Дан.; агéньчык ус.,

---

[1]) У далейшым выкладзе, у мэтах практычнасьці, дыфтонгаў я азначаць ня буду. Аднак трэба памятаць, што ўсякае ненаціскное *е, о* ў вышэйпамянёных умовах вымаўляюцца больш ці менш выразна, як дыфтонгічныя.

але аг*о*нь **(огнь),** сьцяг*ё*нца **(стьгно)** ўс., хаця ў апошніх трох словах магчыма *е*<*о* (ўстаўнога) па аналёгіі. Устаўное *о* можа пераходзіць у *а* і пад націскам: вўгаль і вугàль, вугàльчык, вугáльле ўс.

з) *і* на месцы *е* (ѣ): сьвідз*і*цэль [1]) ус., с*і*вэр ус., адс*і*дка (пры агульнабел. с*я*дзéць) Дан., аднак адл*ё*га ўс. пры літар. адл*і*га.

і) *э* на месцы *а*: дрэнь ус., старэ̀нны ўс.

к) Правільнае ўжываньне маем у слове дз*і*рка (ст.-сл. **дира,** польск. dziura) ўс.

л) *э* на месцы *о:* трэ̀сьнік Слаб. („тростник").

м) Захаваньне *я* ў слове за*я̀*длы (заўзяты) ўс., аднак за*ё*ўся на яго Дан.

н) Адзначу таксама націскныя галосныя ў наступных словах: аглў̀хла ўс., хм*а̀*ра ўс., неба хм*а̀*рыцца ўс., хмў̀рны твар ус., скў̀рчыцца Дан., гў̀ра (гурба, сумёт; полёнізм) Дан.

Полёнізмаў у галіне вокалізма ў сялянскіх гаворках зусім няма. Няма іх і ў шляхецкіх гаворках, за выключэньнем паасобных запазычаных слоў з польскай агаласоўкай. Упамяну аб польскіх насавых галосных у словах: сьв*ян*цо̀ная вада̀, дз*ен*ькава́ць, кс*ёнж*ка, м*ѐн*ца (мяса), н*э̀н*дза (аднак дзесяці́на ўс.) і лаянкі: псякрэ̀ў, пся*ю̀*ха. Адзначу таксама выпадак у песьні польскага *я* зам. е (ѣ) для рытмы: „памалю̀ся сьвятому спа́су, што ніко̀лі ні пайду̀ да л*я̀*су" Дабр. Сюды-ж можа трэба аднесьці і шляхецкая „бр*о*нь божа" пры больш пашыраным „баранí бо́жа", хоць у першым выпадку можна бачыць і сьцяжэньне.

Пераход пасьля губ- ных *ы* ў *у*.

Вельмі характэрнаю асаблівасьцю Парыцкіх гаворак, што не стаіць у сувязі з націскам, зьяўляецца пераход пасьля губных *ы* ў *у*. Ізоглёса гэтай зьявы супадае з ізоглёсай еканьня, гэта знач. яна ідзе па канаве на вёскі Качай·Балота—Кнышэвічы—Казлоўку, дзе ўпіраецца ў Бярозу; далей ізоглёса накіроўваецца ўніз па Бярозе, пераходячы ў суседні Азарыцкі раён. З паўднёвага боку ізоглёса пераходзіць у Глускі раён. Прывяду прыклады: вў̀дась Слаб., вў̀звалі ib., пута̀лі ib., з бука̀мі ib., м*у* ib., в*у* ib., мў̀лі Прат., пута́ць ib., бук („да чаго бук прывў̀к, аб тым і рыка̀цьме") Прат., вў̀страіў Кныш., прывў̀кла ib., м*у* Чэрн., в*у* ib., з бў̀льбу (з бульб*ы*) ib., вў̀піла Казл., несправедлі́в*у*е Дубр., вў̀целасе ib., дамавў̀й ib., кабў̀ла ib., пашо̀ў ў грібў̀ ib., ад зім*у* ib., в*у* Чырк., привў̀чка ib., булі́на ib., бў̀стра ib., по вусо̀кам ib., м*у* ib., не ўпулі́ўся ib. Адносна пераходу *ы* ў *у* пасьля іншых зычных мною заўважаны толькі выпадкі з *у* на месцы *ы* пасьля сонорных *л, н*: плу̀ўе Чэрн., заўнў̀лае ib.. Зразумела, на ўсёй гэтай тэрыторыі гавораць буў̀, була́, буў̀ала—зьявы, як вядома, іншага паходжаньня. Быць можа ў сувязь з лябіялізуючым уплывам губных трэба паставіць і адмечаныя мною вышэй выпадкі пераходу *а* ў *у* пасьля губнога *м*: м*у*лэваць Дубр., м*у*лых ib.

З іншых мясцовасьцяй раёну, што знаходзяцца па-за мяжой ізоглёсы пераходу пасьля губных *ы* ў *у*, гэта зьява трапляецца, дый то ня поўна, толькі ў в. Васілёўцы, дзе існуе пераход *ы* ў *у* пасьля *в:* в*у*, в*у*піў, а таксама б*у*ў, б*ува́*ла. Праўда і тут апошняя зьява вытрымана непасьлядоўна. Большасьць, а малодшае пакаленьне выключна, гаворыць в*ы*, в*ы*мазаў, б*ы*лі.

Адмечаны мною пераход *ы* ў *у* ў прыстаўцы *вы* ў леваберажнай часьці, у вымаўленьні Адар'і Шынкевіч з Пакалічаў: *в*уплюнула, *в*урваць, хоць, як і ў Васілёўцы, у Шынкевіч вымаўленьне *у* пасьля *в*

[1]) Аб гэтым слове гл. ў папярэднім арт. О. Воўк-Левановіча ў гэтай кнізе і маім „Мова кнігі Касьяна Рымляніна". Запіскі Аддз. Гум. Нав., кн. 2, стар. 94.

(на месцы *ы*) непасьлядоўнае, — ад яе я запісаў *выцɛглі*, *выйду*, *вышаў*. Таксама, як і ў Васілёўцы, Шынкевіч гаворыць *буў*, *була*. У іншых мясцовасьцях леваберажнай і паўночна-заходняй часьці раёну гавораць *пытáе* Пак., *вы̀йшаў* Дабр., у *бы̀стру* ракў Бял., *мы* Дан., *пыл* ib., *былà* Майс., *вы* Коўц.

Прымаючы пад увагу, што пераход пасьля губных *ы* ў *у* часткова знаходзіць месца і ў леваберажнай часьці раёну, трэба дапусьціць, што раней гэтая зьява была пашырана на тэрыторыі ўсяго раёну.

З ы ч н ы я.

Гук в. Разгляд зычных пачнем з гуку *в*, які ў Парыцкіх говорках як-бы стаіць на мяжы паміж зычнымі і галоснымі. Губназубнога *в* ў говорках раёну зусім няма, як гэта для паўднёва-беларускіх говорак адзначана ўжо і іншымі дасьледчыкамі. Тут мы знаходзім або білябіяльнае *в* або гук, падобны на нескладовае *у*, які аднак з ім не супадае. Білябіяльнае *в* (w) найбольш выразна чуецца пасьля зычных: carwí Чэрн., xwáціць ib., cwàтка Бял., на dwarэ̀ Слаб., xwóры Дан., ўwécь ib. Гук, блізкі да нескладовага *у*, больш чуецца на месцы *в*, калі яно стаіць пасьля галоснай або на пачатку слова (не пасьля зычнага): галаўà Чэрн., траўў Казл., пèўень ib., чуўàла Дубр., буўáюць Чырк., плуўè ib., дзіця ўўтнулася Слаб., дзéўка ўады не набрàла Чэрн., гані ўалы̀ Дан., буўàла Вас. Дзякуючы блізкасьці ў вымаўленьні гука *в* да *ў*, *в* можа зусім зьнікаць: буàла Слаб., Дубр., пад гóлаў Дубр. (зам. пад голаўу), ᵘпіць (зам. ўупіць) Прат., паўгрэ̀бувалі Чэрн., пазабуáлася ib., паўмéтаю ib., éльмі (зам. *в*ельмі) ib., стрэць Дабр., стрэ̀ціць ib. Калі *в* стаіць паміж галоснымі, то яно перад ётаваным *о* (ё) і націскным *я* пераходзіць у выразнае *ў*: заўёз Язьв., заўёў Дан., аўёс ib., сто ўёрст ib., дзɛўя̀тка Майс., саўя̀ла Казл., саўя̀ў ib. У іншых выпадках пераход *в* у нескладовае *у* такі-ж, як і ў літаратурнай мове. Адзначу толькі слова „юшка“ (рас. *в*ьюшка), дзе маем зьнікненьне *в* (ў). Праўда, тут магла здарыцца падстаноўка слова другога вядомага значэньня *(юшка)* ў значэньні вадкасьці („хто зɛваɛ, той юшку хлɛбáɛ Прык.).

Прыстаўное *в* (ў) знаходзім усюды перад націскнымі *о*, *у*: wóйстры Дан., wòзɛра Пак., wógніва Слаб., сюды *ўо* Дубр., *ўоцéта* ib., у ўòсень Чэрн., wóсɛнскі Дан., wòбмɛшка Бяз., wỳсɛнь ib., wỳгаль Майс., wỳж ус., wосы ўс., wуха ус. Гэтае *в* звычайна захоўваецца і бяз націску: wакнó ўс., wушу́ла ўс., wужàка ус., wазёры ўс., wòсы ўс., wугáльчык, аднак *а*сяньчу̀к Дан., *а*сà ib.

Пасьля галоснай перад наступнымі *а*, *у* ў сярэдзіне слова ўстаўляецца *в* (ў): пawỳк ус., пawуціна, па тратуwàру Пак.

Прыназоўнік *у* перад *а* (о) пераходзіць у *ув*: уw аднагò ус., уw адры̀ні або у w'адрыні ўс. Калі-ж наступнае пасьля прыназоўніка *ув* слова пачынаецца двума зычнымі, то *ув* пераходзіць у *ува* (*а*<ъ): уwа сьне ус., уwа ўсіх ус., уwа мне ўс.

Побач з прыстаўным *в* разгледжу і іншыя прыстаўныя зычныя. Прыстаўное *г* (h), калі ня лічыць такіх агульных для ўсёй говоркі слоў, як *гуж*, *гаплік*, *Гàнна*, знаходзім яшчэ пры слове *адзін* (нігòдзін з' іх ні пойдзе Дан., нігóднага німá Рам.), а таксама зрэдка пры слове *еты*: гéтага Слаб., гэ̀така Вас., гэ̀та-ж табе ні хàхінькі Майс. Блізка аднак усюды, але асабліва ў сялянскіх говорках, *èты* мае прыстаўное *j*. У говорках, якія замяняюць пасьля губных *ы* на *ў*, замест *еты* кажуць

wацéты Чэрн., Дубр., Чырк. Прыстаўное j маем у такіх словах, як jана, jон, jіх, jім, jімі (ўс.). У песеннай мове можна пачуць прыстаўное *j* і перад іншымі галоснымі: у далìні jарэшòк Чэрн., Дубр. Аднак апошняе j напэўна зьявілася з *й*, якое наагул у песеннай мове, як асобны прыём, вельмі часта ўстаўляецца: „да *й* у той карчмè да *й* тры харо́шых п'е". У Е. Карскага знаходзім трохі іншае тлумачэньне гэтаму *j* [1]).

Звонкія перад глухімі і на канцы слоў у гаворках усяго раёну захоўваюць сваю звонкасьць, што складае адну з найбольш характэрных асаблівасьцяй гаворак гэтага раёну. Для няпрывычнага вуха, узгадаванага на літаратурным вымаўленьні, парыцкая вымова звонкіх здаецца нават утрыраванай, бо тут пасьля звонкіх перад наступнымі глухімі як-бы чуецца слабы глухі галосны (во́дъка або во́дыка) [2]). Прывяду прыклады: ла́*дз*ьцеся Пак., дзя́*дз*ька ib., лу́*б*ку ib., а*б*ску́*б*ся ib., ка́*з*кі ib., во́*д*ка Дабр., ро́*д*ка ib., ка́*з*ка Вас. ця́*ж*ка Красн., дзе́*ж*ка Дан., каро́*б*ка ib., во́*д*ка ib., мало́*д*ка Чэрн., дро́*б*ные ib., дзя́*д*зька Дубр., ка́*з*ку ib., кру*ж*ка́ ib., бліzка Чырк., дру*ж*ка́ ib., во́*д*ка ib., дзя́*д*зька Як. Сл., ка́*з*ка ib., аднак усюды лу*с*ка́; на канцы слоў: ду*б* Пак., Дабр., Чэрн., Дубр., во*з* Дан., заўёз ib., но*ж* Красн., на-*ж* табе Чэрн., го*д* Рам., гра*д* ib., што*б* ib. Толькі слова *бог* у Васілёўцы мною запісана з вымаўленьнем на канцы *х* (бох), а таксама *п*ро́вар пры літар. *б*ровар (n. browar), *д*рапа́к ус. (укр. *т*репак). Цікава адзначыць слова сто́*б*ка (варыўня) Дубр. з звонкім *б*, хоць назва суседняй вёскі Істо́*п*кі мае іншае вымаўленьне, праўда ў другой асобы. У шляхецкай гаворцы звонкія перад глухімі і на канцы слоў вымаўляюцца з значна меншаю сілаю звонкасьці ў апошняй часьці гуку: во́дтка, Майс., дубп ib. [3]).

Прыйменьнік *ат* (от) захоўваецца: на во́*т*шыбі Дабр., а*т* лесу ib., а*т*куль Красн., а*т*сяку́ ib., а*т*ва́жыцца Вас., а*т*ка́зуесься ib., а*т* нас Дубр.; дзеля гэтага а*т*арва́цца Пак., а*т*арву́ Чырк., а*т*'ɛ́жджа́ɛм Дабр. Толькі перад *д* і звонкімі прыйменьнік *ат* зьмяняецца ў *ад*: не а*д*да́сь Вас., а*д*да́й Пак. Прыйменьнік *аб* захоўваецца: а*б*ску́бся Пак., а*б*расьці ib.

З другога боку глухія перад звонкімі па закону рэгрэсыўнай асыміляцыі пераходзяць у звонкія: а*г*за́мінт Дан., э*г*за́мент Чырк., пашоў *г* дзя́дзьку Дан., я*г*-жа Дубр., про́*з*ьба ўс., сва́*дз*ьба Чэрн., маладзьба́ ўс., хрэ́зьбіны ўс., казьба́ ўс., ко́*д*ла (ад ко*т*ла) Дан., *з*ьбіць ус., *з*ьвіць, *з*ьмірны Дан. (звычайна гавораць *рахманы*), *з*ьняць, *з*ьліць, *з*мыць, вы́раз' зямлі Красн.

Глухія перад глухімі захоўваюцца: ўлі́*т*ку ўс., сьві́*т*ка ўс., нарэ́*ш*це ўс., *с*паць, *с*кінуць, *с*хіліць, *с*са́ць. Прыйменьнік *з* перад глухімі пераходзіць у *с*, а перад звонкімі застаецца, або пераходзіць у адпаведны звонкі. Такім чынам усюды гавораць: вы́шаў *с* ха́ты, але *з* бо́лю, *ж* жа́лю, *зь* дзе́рава. Перад шыпячымі *ш*, *ч* прыйменьнік *з* (с) усюды

---

[1]) Е. Карский. Белоруссы, т. I, ч. 1, стар. 479.

[2]) Аб захаваньні ў паўднёва-беларускіх гаворках звонкіх перад глухімі і на канцы слоў сьцьвярджае ў сваёй Лінгв. Геогр. П. Бузук. Аб гэтым-жа трохі раней у рэдакцыйнай увазе да артыкулу П. Растаргуева „Гов. вост. уездов Гом. губ. в их соврем. сост." пісаў і я; гаворыць урэшце аб гэтым у сваёй справаздачы аб паездцы па Магілеўшчыне ў 1928 г. і Я. Лёсік. Такім чынам цяпер можна лічыць канчаткова даведзеным, як няправільнасьць поглядаў ранейшых вучоных (Е. Карскага, А. Шахматава) на адсутнасьць у беларускай мове захаваньня звонкіх перад глухімі і на канцы слоў, гэтак і памылковасьць погляду П. Растаргуева, які апошнюю зьяву прыпісвае выключна северска-беларускай гаворцы (П. Расторгуев, Северско-белорусский говор. 1927).

[3]) Запазычаю гэты спосаб вызначэньня (*дт*, *бн*) з працы А. Курыло „Спроба пояснити процес зміни *о*, *е* в нових закритих складах у півд. групі українськ. діялектів". Гэткім чынам дасьледчыца вызначае этымолёгічна звонкія зычныя, якія ў другой сваёй палове страчваюць звонкасьць.

пераходзіць у *ш*: *ш* чалавѐкам, рой *ш* шапку, *ш* чужы̀наю, *шч*э̀па, са-*шч*апіць, а перад афрыкатай *ц* у *с*: *с* цэ̀пам, *с* цэ̀ркаўкі.

Побач з гэтым пакажу і на іншыя выпадкі рэгрэсыўнай асыміляцыі зычных. Усюды гавораць: вѐрне*с*ься, астане́*с*ься, ву́чы*с*ься, аткà-зуе*с*ься, наберэ̀*с*ься Чырк., наживѐ*с*ься, ib., адзінà*цц*аты, с∈мнà*цц*аты (адзінà*нц*аць, с∈мнà*нц*аць зрэдку спатыкаецца толькі ў гаворцы шляхты), галу̀ба*цц*ы, па ягà*цц*ы, у дубрò*ва цц*ы, балò*цц*а, брà*цц*ы, дà*цц*ы (і да*цц*э̀ Вас.), мà*цц*ы, у пля́*с*цы, на нб́*з*(*с*)цы, у дзѐзцы (шыпячы перайшоў ў сьвісьцячы, але звонкасьць захоўваецца), забіў глу*с*ца́ (апошнія чатыры прыклады частковай рэгрэсыўнай асыміляцыі), а*чч*ы̀м (і айчым), ху*чч*э̀й, вò*чч*ыч (бортнік) Чэрн., аднак усюды а*дн*а́, абе́*дн*я, сяго́*дн*я, ро̀*дн*ы, спа*дн*і́ца, а*бм*а̀н, гу*мн*ò, дро́*бн*ы.

Рэгрэсыўнаю асыміляцыяй нясумежных гукаў тлумачыцца (ўсюды) ка*нп*à*н*я за*лò*за, за*ле́*за, за*лѐ*зны, зе*л∈*зьня̀к (і *ж*а*л∈*зьня̀к), *б*à*б*іць (ва́-біць — „хадзе́м ваўкò*ў* *ба́б*іць“) Слаб. Цікава адзначыць „пр*у*гмѐнь“ Дан. ад „прыг*у*ме́ньне“, „г*у*мно“, дзе *ы*, асымі*л*яваўшыся *у*, выклікала адпадзеньне апошняга гука, а таксама *т*о́ргаць ус., с*у̀т*арга.

Прогрэсыўную асыміляцыю суседніх гукаў маем у шляхецкай гаворцы: мы̀ць*ц*я, бра̀ць*ц*я, стара̀ць*ц*я; у сялянскіх гаворк. адзначу яшчэ выпадак асыміляцыі гукаў нясумежных: жы̀*ж*ня Рам., Чэрн., Як. Сл., Дабр., ша*ш*а́. У слове лу̀*чч*ай адбыўся падвойны асыміляцыйны працэс (гл. Сабалеўскага, Лекц. по истор. русск. яз., ст. 106).

Як прыклады рэгрэсыўнай дысыміляцыі зычных, агульныя для ўсяго раёну, адзначу ка*л*ідо́р, ста*л*аве́р (і ста*р*авѐр), *з*ы̀чыць (п. życzyć), паз*ы̀*чыць, дзеся*нц*ì*р*ам Дабр., *л*еварвэ̀р (у гэтым слове дзейнічае і асыміляцыя), аднак усюды цы*р*у̀лік, та*л*ѐрка, се*р*адò*л*ьшы.

Прогрэсыўную дысыміляцыю маем у слове „г губэрнà та*л*ю“ Слаб., а таксама ў індывідуальным вымаўленьні А. Шынкевіч з Пак., ад якой я запісаў: баісь*ц*я, асыпа́*∈*сь*ц*я, сабірà*∈*сь*ц*я (тут перш дзейнічала рэгрэсыўная асыміляцыя). Ад іншых асоб гэтай вёскі і ў іншых мясцовасьцях раёну падобнага вымаўленьня я не спаткаў.

Прогрэсыўнай асыміляцыяй тлумачыцца і гэтак званае падваеньне зычных або асыміляцыя j папярэдняму зычнаму. Апошняя зьява агульна для ўсяго раёну. Падам некалькі прыкладаў: пашò*ў* у лу́*ць*це Язьв., хò*д*зіць па завугò*л*лю Дан., скў*л*ля, мў*л*ля ib., Натà*л*ля Вас. (і Натà*л*я Дан.), га*л*ле́ (Чэрн., Дубр., Як. Сл.), аднак гб́*л*ейкам Як. Сл. і і гò*л*ле*й*кам Дабр., Ам∈*л*ля̀на Слаб., на вясѐ*л*ле Казл., І*л*ля̀ наробіць гні*л*ля̀ Пак, ка*с*сё Дан. (і ка*с*сé Рам.), вы̀мазаўся гра́*з*зю Дан., с по́-ма*чч*у ib., саба́*чч*а дò*л*я Слаб., ужыва́*нь*не Дан., сьві*нь*ня (наз. мн.), з ру*ж*жа Пак. Падваеньня няма ў словах імѐ*н∈* Пак., сьві*н*я̀ ус., сьві-*н*я̀м Бял., Дубр., Чырк., Та*ц*я̀на Дубр., Узьвìжа*н∈* Дан., у вачў ib., збб́*ж*а ib., а таксама ў прыстаўках перад наступным ётаваным галосным: ра-*з*я̀віць Дан., раз*я̀*ва ib., раз∈ва́ка ib., за*з*ь*я̀*ць ib., *з*ь*я̀*е Слаб. Цьвёрдыя зычныя ў вышэйназваным стане не падвойваюцца: надвò*р*'е Майс., пѐр'е ib., зў*б*'е Дан., зьвя*р*'ё Казл., Пала̀*г*'я ib. Адзначу выпадак няпоўнага прыпадабленьня — „шча́ў*л*е“ Як. Сл. (па запісу проф. П. Бузука).

Іншага характару падваеньне маем у словах па*дд*а́ць, па*дд*ур̀ыць ус., *сс*аць (з прычыны выпадзеньня ъ; ст.-сл. **съсати**), вы̀*сьс*і („вы̀сьсі, вы̀сьсі да й паля́пай“. Прык.) Дан., а таксама вымаўленьне некаторых слоў пад уплывам эмоцыі: на яго ў*сс*ѐ ліха (апошняе слова свайго націску ня мае і падлягае націску папярэдняга слова), тра̀сца тва̀ёй ма̀*тт*ары Чырк. на*сс*., ў̀ тваѐй ма̀церы Чэрн.

Тут-жа, у сувязі з асыміляцыяй, разгледжу і замену ў паасобных словах шыпячых на сьвісьцячыя і наадварот. *Ж* у гаворках раёну, як аб гэтым ужо часткова гаварылася і вышэй, зьмянілася ў *з* у наступных сло́ва*х*: *з*але́за, *з*ало̀зы, *з*алазава̀ць, *з*бан, памізь людзей. Незалежна ад зьмены *ж* у *з* усюды ўжываецца рзаць (ст.-сл. **рзати**), дра*ж*ніць, Дра*ж*ня (назва вёскі); з другога боку кало́дзе*ж*.

У наступных словах знаходзім *ч* побач з *ц* ў іншых гаворках: *ц*ыбу́к, *ц*ур, *ц*ура̀цца (і *ч*ура́цца Пак.), *ц*от, *ц*і („*ц*от *ц*і лішка"), вала*ц*у̀га. *Ц*мо̀каць (з *ц*) пэўна самастойна ўтварылася ад выклічніка *ц* м о к. *Ч* заўсёды захоўваецца ў словах *ч*уда, *ч*уд, памо̀*ч*нік.

Іншы раз *ч* пераходзіць у *ш*: суні*ш*нік Чырк., брусьні*ш*нік ib., лу*ш*нік Пак., ру*ш*нік Дан. і агульнае *што*. У большасьці аднак выпадкаў такога пераходу няма: сма́*ч*ны Дан., Прат., руч*н*ік Прат., я̀*ч*ны Пак., *ч*мель ус., нач*л*е́г ус.

З другога боку зам. *ц*, што ў іншых гаворках, маем *ч* у наступных словах: *ч*апля̀ць, *ч*э̀пік, *ч*аплѐя̀, *ч*а̀пля, прыча́пка, по̀*ч*апка (аднак *ц*эп), *ч*алѐсьнік, зача̀сць, абча́сць пале́на (аднак „*ц*ёска"—трэска). *Ш*, побач з *с* у іншых бел. гаворках, спатыкаецца ў такіх словах, як *с*іпе́ць, *с*іпі́ца. Адваротная зьява з *ш*: до́*ш*ка, да*ш*о́к, *ш*а̀бля, *ш*трахо́ўка, кры*ш*та̀л, *ш*э̀ры (і *с*е́ры Дубр.), *ш*арак. *Ш* заўсёды захоўваецца ў словах *ш*кўра, *ш*куранькі, *ш*кура̀т, *ш*нуро̀к, *ш*мо̀ргаць, за*ш*маргам; аднак *с*ква̀рыць, *с*ква̀рка, за*с*ква́раны.

Як дробную зьяву, адзначу кія*ш*ї Дубр. пры больш пашыраным (і літар.) кія*х*ї Дан.

Дзеканьне і цеканьне, як агульная зьява, пашыраны ў гаворках усяго раёну (сялянскіх і шляхецкіх) і выступаюць выразна. Цьвёрдае *дз* спатыкаецца ў такіх словах, як *дз*ылі̀н-*дз*ылі́н, *дз*ылі́нкаць, *дз*о̀гаць, нэ̀н*дз*а (апошняе слова пераважна ў шляхецкай гаворцы).

Гук дж ужываецца ў гаворках раёну ў тым-жа стане, што і ў літаратурнай мове: ха*дж*ў́ Дан., пабу*дж*а̀е Слаб., пагля*дж*ўся Пак., ат'ɛ*ждж*а́ɛм Дабр., ра*дж*а́лася ib., ра*дж*а́ліся Дубр., ха*дж*ў Чырк., напрў*дж*аны Дан. Адмечу таксама ў р а *д ж* а̀ й Дан., *дж*у́пла (цыганскі бізун) ib., *дж*гут (гульня) ўс. кін*дж*а̀л ус., *дж*ы̀гнуць ус., барж*дж*э̀й ус., аднак не знаходзім *дж* у слове „*жа́*ла". Злучэньне *ждж* пераходзіць у *ждж*: прыɛ*ждж*а́ць ус., аб'ɛ*ждж*а̀ць ус.

Гук ф спатыкаецца толькі ў гаворцы шляхты: Ста*ф*а́н Іст., шў*ф*ель ib., *ф*эст Майс., *ф*арсу́н ib., *Ф*э̀лікс Буда. Праўда, і ў шляхецкіх гаворках у большасьці *ф* замяняецца іншымі гукамі, што і ў сялянскай мове, якая бліска што выключна знае на месцы *ф* гукі *п, х* або *хв:* *х*унт Слаб., *П*ілі̀п ib., *Хв*э̀дар Дан., *х*ў̀рман Пак., *Х*ама̀ Рам., *х*аўраля̀ Пак., Мітра*хв*а̀н Слаб., *хв*артў*х*, люцы*п*ар ib., *Т*аклю̀ся Майс. Цікава аднак *ф*ў̀тар Слаб., Дан. з *ф* зам. *х*.

Гук ц у гаворках раёну асаблівасьці не складае. Адзначу толькі вымаўленьне *с* зам. *ц* у словах мо̀*с*на Чэрн., ма*с*нѐй Дубр., а таксама *с*кава̀ць сабак Дан.[1]), у*с*кую̀ць Дубр. Побач з *цьв*ісьці, *цьв*ет ўжываецца *кв*ѐтка, *кв*ет. *К в* і с ь ц і, *к в* і т н у ц ь у раёне не гавораць.

Гук г фрыкатыўны гартанны: *г*ара́, *г*арбў̀з, *г*аварыць. Толькі ў запазычаных словах можна пачуць вы̀буховае г (g): *г*валт., ц*ў̀г*лі, *г*е́стка, *г*ў̀зік, А*г*а́та, *г*ў̀з, *г*ізава̀ць, мар*г*і, *г*ергѐтаць, *г*вінтў̀ль, *г*а̀рнɛц, *г*а́нкі. Апошнія два словы часьцей вымаўляюцца з фрыкатыўным *г*. З фры-

---

[1]) Магчыма, што ф. *скав*—ранейшыя, гл. Бузука, Украінські етимології, Зап. Іст. Ф. В. УАН., VII-VIII, ст. 71.

катыўным *г* таксама вымаўляюцца словы го́ран, магàзын, а́гант. У беларускіх словах выбуховае *г* спатыкаецца ў злучэньнях *зг, дзг, гн:* мазгі́, мазгаўня́, разга́ты, рэ̀дзгіны, джы̀гнуць. *Г* (гартаннае) іншы раз злучаецца з *ы*: гы̀ля, гы̀ль („гыль дадо́му на сало̀му Дан.), гы̀ркнуць (і гірча́ць). З *ы* таксама злучаецца і *к:* кы̀ш! кы̀ркнуць (раптоўна памерці, здырдзіцца).

Памякчэньне і зацьвярдзеньне.

Гук р, што складае адну з характэрных асаблівасьцяй беларускай літаратурнай мовы, у Парыцкім раёне прадстаўлены даволі цікава. Большасьць гаворак раёну мае цьвёрдае *р*, некаторая частка гаворак мае паўмяккае *р* і частка—мяккае. Пачну з апошніх. Выразнае мяккае *р* мною заўважана ў вёсцы Дуброве і часткова ў в. Васілёўцы, адлегласьць паміж якімі прыблізна каля 35 вёрст. Запазычаньня мяккага *р* адной вёскай ад другой тут бязумоўна не магло мець месца, бо суседнія вёскі, як Чэрнін каля Дубровы і Краснаўка каля Васілёўкі ня зняюць мяккага *р*. Калі для в. Васілёўкі, як аб гэтым зазначалася вышэй, можна прыпусьціць перасяленьне, то цяжка гэта сказаць пра Дуброву. Гаворка апошняй вёскі, за выключэньнем мяккага *р,* розьніцца ад гаворак суседніх вёсак Чэрніна і Чыркавіч, дзе мне давялося пабываць, толькі некатораю мяккасьцю шыпячых і адсутнасьцю ў мн. л. наз. скл. м. р. канчаткаў пад націскам на ы̀э (валы̀э). Сама па сабе Дуброва вялікая вёска, двароў з 200. Ад суседніх вёсак на поўначы яна ізолёвана балотам і вялікім лесам. Як відаць з інвэнтару 1789 г., гэта вёска належала да Рачыцкага староства. Прывяду прыклады ўжываньня мяккага *р* у Дуброўскай гаворцы: п*р*я́сьці, ка*р*я̀вая, г*р*язь, *р*ека́, га*р*э̀лка, т*р*э̀ба, не п*р*іе́халі, у г*р*е́чку, добр*е*, т*р*э̀йці, цепе́*р*ека, цепе́*р*ь, цэ̀*р*ькаўка, к*р*іва́я, свар*і*цца, стар*і*нная ка̀зка, бе*р*і, ку*р*і̀ць, бэ*р*ёза, чэ*р*ёпка, гава*р*ю̀, аднак *р*ы̀ба. Наагул мяккае *р* у Дуброўскай гаворцы стаіць на сваім асноўным месцы. У суседняй вёсцы Чыркавічах за 15 в. на поўнач гавораць: у г*р*азі, бе*р*о̀за, г*р*а̀ды; у Чэрніне (10 в. на поўдзень): з го́*р*а, ст*р*апэнў̀лася, упе*р*о̀д, д*р*ыжа̀ць, гаво̀*р*аць, п*р*а́сьці. Праўда, іншы раз перад *і* чуваць і *р* паўмяккае: тава́р*и*ши, пр*и*казуе, у мо́*р*и, стар*из*ные казкі.

У Васілёўскай гаворцы мяккае *р* мною адмечана ў наступных словах: ку́*р*іца, ста*р*і́е, у во̀зэ*р*і, т*р*ёх, Ма́*р*ью, цэ̀*р*ькаўка, т*р*і͡э̀ба, рі͡э̀дка, аднак гаво̀ра (=рыць), бя*р*э̀, ні набя*р*э̀ш, до́бр*а*. Паўмяккае *р* чуваць у леваберажных гаворках (Пакалічы).

Гук л, параўнаўча з літаратурнаю моваю, таксама становіць асаблівасьць у гаворках раёну. Асаблівасьць гэта выяўляецца ў тым, што перад цьвёрдым зычным, які раней меў перад сабой глухі галосны (ь), *л* асымілявáўся наступнаму цьвёрдаму зычнаму. Такім чынам сі*л*на Воземля, весѐ*л*ны Зааз., па́*л*цаў, вэсе́*л*ны ib., сі́*л*на Чэрн., весѐ*л*ныэ песьні ib., ба*л*на̀ Дубр., ся*л*цэ̀ ib., весе́*л*ныэ Чырк., пі*л*нў̀юць ib., відэ*л*цы Дан., сі*л*не́йшы Пак., бяздо́*л*ны ib., во̀*л*нась Вас. Апошняя зьява пашырана бадай ва ўсім раёне, але выключна ў сялянскіх гаворках; шляхецкія гаворкі яе ня знаюць, за выключэньнем слова пі*л*наваць. Уплыў мястэчка, шляхецкіх гаворак і іншы сказваецца ў сэнсе зьнікненьня гэтай зьявы і ў сялянскіх гаворках больш маладога пакаленьня. Цяпер можна пачуць па́*ль*ца Дабр., сі*ль*ненька, па*ль*ца Казл.

Пасьля галоснага перад зычным і ў прошлым часе адз. л. м. р. *л* пераходзіць у ў: воўк бегаў ус., аднак да*л*жон Дубр. (пэўна запа-

зыч. з рас.). Калі пасьля *л* быў ъ, тады такога пераходу *л* у *ў* няма: па̀*л*ка, са̀жа*л*ка Дан.; паасобна стаіць Высо̀кі По*л*к.

Словы чужаземнага пахаджэньня маюць у большасьці *л* мяккае: ба́*л*ька, бака*л*я̀р, дак*л*яра̀ваць, п*л*яц, х*л*ёрка, аднак *л*а́мпа, п*л*анэ̀та, п*л*а́нка (ўс.).

Адзначу агульныя для ўсяго раёну дупл*ё*, дупл*ɛ*на́ты і м*л*і̀н, м*л*і̀нішча пры літар. м*л*ын.

Шыпячыя ў гаворках раёну цьвёрдыя і паўмяккія. Паўмяккія мною констатаваны: ле*жи*ць Дубр., *че*рні́ца ib., *чё*рненькі ib., *ши*е ib., *шчи*пле ib., до̀*жджи*к Чэрн., *жи́*та Чырк., ле*жи́*ць ib., *жи*ў Як. Слаб., награ*ши́*ла Вас., *жи́*та ib., чаўно̀*чи*к Красн., шнуро*чи*к ib. Такім чынам паўмяккае вымаўленьне шыпячых спатыкаецца блізка ва ўсім раёне, за выключэньнем шляхецкіх гаворак.

Зацьвярдзеньне п маем у прыстаўцы *пера*. Апошняя зьява галоўным чынам пашырана ў зарэчнай часьці раёну: *п*аравоз Пак., *п*арахрысьці̀лі ib., *п*аравязо́м ib., *п*аравò̀зілі ib., *п*араэ̀хаў ib., *п*арад жнівò̀м Дабр., *п*арамéніцца ib., *п*арагаварьі Чырк., *п*арахо́дзіць ib., *п*ара*в*адзі̀, *п*ара*в*ала́ (нават з зацьвярдзеньнем *в*), парабɛро́м Рам., аднак *п*еразімава́ць Слаб., *п*ераxò̀д ib., Дан. (параход), *п*ередалí Дубр., *п*ерайна̀чуваццa Вас.

Агульным для ўсяго раёну зьяўляецца зацьвярдзеньне *в* у словах чаць*в*ò̀рты Слаб., Рам., Дубр., Пак., чаць*в*ò̀ра Рам.; сь*в*ò̀кар Чэрн., дзь*в*ох ib., д*в*ана̀ццаць ус., бро́*в*ы ус. [1]). У шляхецкіх гаворках чацьвёрты вымаўляецца, як чацьв*ɛ́*рты і чацьв*ò*рты.

З іншых выпадкаў зацьвярдзеньня зычных адмечу: 1) агульнабелар. зацьвярдзеньне губных і *д* на канцы слоў (перад ранейшым ь): дро*б*, голу*б*, сы*п*, се*м*, го́спа*д*, гвозд (ус.); 2) зацьвярдзеньне губных перад j: б'ю, п'ю, п'я̀ны, нап'ю̀цца, п'я̀ўка, сям'ѐю (ус.) і перад націскнымі *я*, *ё* (jo): *п*'яць Рам., Дубр., Дан., Чэрн., *м*'ёд Рам., *м*'я̀ккі ib., і*м*'я̀ Слаб., *м*'я̀ла Дан., шу*м*'я̀ць Чэрн., *п*'я̀тніца Дан., за*п*'ёр (але па̀*м*ɛць ib., прыв*ɛ*за̀ў ib.), па*м*'ёр Дубр. (пам'ёр, пам'ёр, — трасцу ўстане" Дан.), але памéрла ус. Апошняя зьява характэрна для екаючых і шляхецкіх гаворак. У зарэчнай часьці і на поўначы раёну мною запісана *м*ёд Дабр., *п*яць ib., Казл., *м*я̀са Пак., Вас.

У слове „сэрца" ў сялянскіх гаворках *с* мяккае: *с*е́рцу Чэрн,, к *с*ѐрцу Чырк., у *с*е́рцы Бял. У шляхецкіх гаворках у гэтым выпадку *с* цьвёрдае.

Таксама ў сялянскіх гаворках маем мяккае *п* у слове „пэўна": нɛ *п*е́ўна Дубр., *п*е́ўне Чэрн., Казл. Праўда, у першых дзьвюх вёсках *п* у гэтым слове, а таксама і *б*, *м* у словах „лазь*бе́*нь", „па*м*ѐрла" Дубр., вымаўляюцца да некаторай ступені, як паўмяккія. У шляхецкіх гаворках *п* у слове „пэўна" цьвёрдае.

Тут-жа адзначу слова а*дò*нак Дан. (подсьціл для стога) побач з а*дзё*нак Слаб.

Цьвёрдае *н* маем у асновах: я̀сɛ*н* ус., я̀блы*н*а Дан., я̀блы*н*ка ib., жы̀т*н*ы ib., здзе́ш*н*ая Чырк., по̀з*н*ая Дабр. (аднак ра̀*нь*ня̀я ib.), а таксама *н*амала́ду ад *няма ладу* („намала́ду за што набіў" Чэрн.). У іншых мясцовасьцях гавораць *н*емала́ду Дан.

Больш цікавымі зьяўляюцца выпадкі ўжываньня мяккага *н*: ка-мѐ*нь*чык Чэрн., рамѐ*нь*чык Дан., па̀*нь*шчына ib., сɛля̀*нь*ям Слаб., мі*нь*ю̀та

---

[1]) Тлумачэньне гэтай зьявы гл. ў кнізе проф. П. Бузука: Спроба лінгвістычнае географіі, ч. 1, вып. 1, стар. 40.

Дан., г*н*юс ус., г*н*юсіць ус., кане́ш*н*я („ні кане́шня папу́ яе́шня“ Майс.), пѐў*н*е Чэрн., ма́р*н*е Дан., го̀*н*і ўс., дабры*н*я̀ („еты чалавек дабры*н*я̀“) ус., вышы*н*я̀ ўс., даўжы*н*я̀ ўс., гарачы*н*я̀ ўс., ман*ѐ*р, ман*е́*рка, каў*н*ѐр, міліца*не́*р, інжы*не́*р (ус.).

Зацьвярдзеньне зычных параўнаўча з літаратурнаю моваю маем усюды перад асабовымі канчаткамі 1 ас. множн. ліку цяп. часу: вядо̀*м*, нясо̀*м*, грабо́*м*, вѐр*н*амся, нарво̀*м*, ідо̀*м*, прыбяро̀*м*, таўко́*м*, мо̀га*м*, хоць тут можна бачыць і морфолёгічныя формы 1 ас. мн. л. з тэмат. *о* [1]). Зацьвярдзела *м* і ў дзеясловах буд. часу мн. л.: рабіці*м*ам Дубр.

Зацьвярдзеньне *с* у зваротным займенніку *ся* спатыкаецца толькі ў в. Заазер'і, жыхары якой „wўселіліса з Зубарэ̀віч“ (Глускага раёну). У іншых мясцовасьцях раёну гэтай зьявы не наглядаецца. Мяжа яе можна сказаць праходзіць па паўднёва-ўсходняй мяжы Парыцкага раёну, бо суседнія вёскі, як Шкава, Зубарэвічы, Воземля Глускага р., ужо сакаюць. Наадварот Пратасы, Чорныя Брады Пар. р., адлегласьць якіх ад вышэйназваных вёсак Глускага р. 10—15 в., саканьня ня знаюць.

Гаворачы аб зацьвярдзеньні *с* варта адзначыць зацьвярдзеньне гэтага гуку ў словах *с*айча̀с Пак., Дан. (пэўна русіцызм., бел. „зараз“), *с*ыча̀с Вас., *с*ыйча̀с Чырк., *с*аке́ра ўс. пры літарат. *с*якера, хоць ст.-сл. *сокыра*.

Вельмі характэрнаю асаблівасьцю Парыцкіх гаворак зьяўляецца вымаўленьне мяккіх сьвісьцячых, трохі нагадваючы сабою польскае вымаўленьне падобных гукаў. Зьява гэта пашырана ва ўсім раёне, аднак больш выразна яна адчуваецца ў вымаўленьні старэйшага пакаленьня: пе́ś̀ьня Зааз., дз̑е Рам., казаць̀ Дубр., у Мінс̀ьку ib., не с̀ьмѐюць̀ ib., знаць̀ ib., ус̀я̀к ib., ус̀е́ Вас., ба́ць̀кавы ib. Наагул-жа зубныя і сьвісьцячыя (*з*, *д* (дз), *с*, *ц*) перад наступнымі мяккімі памякчаюцца. У вёсках Васілёўцы і Палянках спаткалася памякчэньне сьвісьцячых і перад наступнымі задняпаднябеннымі: с̀ькі́нуць Вас., с̀ьхіліць̀ ib., с̀ькіпе́ць Пал., с̀ьхіліць̀ ib., з̑ьгі́нуць ib.

Агульным для ўсяго раёну зьяўляецца памякчэньне *с* у суфіксе *ск:* Баранó*с*ькі Прат., Трацэ̀*с*ькі ib., сара̀та*с*ька Чэрн., отцо́*с*ькая дачка̀ ib., Бабру̀*с*ьк Слаб., васілёў*с*ькія Вас., ру̀*с*ькая Пак., дзераве́*нь*ську (жонку) ўзяў Слаб. У шляхецкіх гаворках азначанага памякчэньня няма.

У словах чужаземнага, пераважна пазьнейшага пахаджэньня, перад галоснымі *е, і* ў сялянскіх гаворках у большасьці наглядаюцца выпадкі з мяккімі зычнымі: ва*п*ераці̀ў Вас., позіцыя Чырк., хв*е́*ршал Слаб., *дзех*ця̀рык Дан., рых*ц*і̀к ib., *ц*і̀х (тыфус) ib., аньц*і́*хрыст Майс., паньс*і*ён ib., муньдз*е́*р ус., каманьдз*е́*р ус. У словах ранейшага запачыцца зычаньня, а ў шляхецкай гаворцы ў гэтым стане наагул пераважаюць выпадкі з цьвёрдымі зычнымі: гу*б*арна́тар, *м*аха̀нік (механік) Дан., *в*э̀нгар ib. („вэнгар кароценькі“—гэтак сьмяюцца з тых, хто носіць, падобна да вэнграў, кароценькія сьвітачкі), Зынò*ў*, Сымо́*н*, Сынклѐта, Сарафі́на, гу*б*э̀рня, І́м*п*ат, кар*с*э̀т, раз*б*э̀сьціцца, *в*э̀кс*а*ль, пла*н*э̀та, люс*т*э̀рка, вава*д*э̀ньне (сьв. Введение—рус.), а таксама ў сваіх: мяс*т*э̀чка, ту*т*э̀йшы, узд*э̀*чка. Толькі задняпаднябенныя г(g), к, х, перад чужаземным *е, і* заўсёды мяккія: *г*е́стка, цы̀нгель, шва́*г*ер, *к*е́пска, *х*е́ўра, *г*ішэ̀фт, *г*інара̀л, *г*імо́*р*ы, *к*ілішак, *к*ішэ̀ня, Кірнажы̀цкі, ша́*х*ір-ма́*х*ір (у

[1]) П. Бузук. З лінгвістичних роскопин на Білорусі (Зап. іст.-філ. відділу УАН. ст. 13-14).

сувязі са зьменай пасьля задняпаднябенных ненаціскнога чужаз. *е* ў *і*, што зьяўляецца агульным для ўсёй беларускай мовы).

Устаўка зычных: прык*м*ѐта, прык*м*е́ціў Дан., з*д*ра̀да ib., з*д*рок Майс., с*т*рам ус.

Адпадзеньне зычных. Адпадзеньне j: шчэ Дубр., *а*к Чырк., Чэрн., Дубр., Слаб., Бял., -аны Дубр., Чырк.; лепша-а Дубр., стара-а ib., трò-э Чырк., пускà-э ib., старà-а ib., заўладзе́-а Пак., ма-à ib., у то́-а^э сяло ib., та-а жонка ib., пакідà-а Чэрн., вѐда-а^э Казл., ніўсѐка-а Вас., ні сьме́-а ib. Адпадзеньне іншых зычных: трэ̀*а* (трэба) Пак., памагà̀й бо (бог) Дан., прадà̀сь Дубр., ізье́сь Чырк., прò̀пась (многа) Чэрн., ў вò̀лась Слаб., есь ib., ста́рась Пак., падà̀сь Дабр., хо-жа („аддай дачку да панѐначку хожа (хоць-жа) на'дзін дзень" Бял.), матка з*д*рà-а (здарова) Рам., жандà̀р-Пак., у хў*с*-цы ус.

Адпадзеньне складоў: мо̄ (можа) ўс., тр$\bar{э}$ (трэба) ус., бра̄ (браце; ужываецца ў паўднёва-ўсходняй часьці раёну), палѐ (паглядзі) Чэрн., ск$\bar{у}$ (скажу) ib., ка̄ Пак., цягло ў сьвет Дан., та^э (табе) Дабр.

Выпадзеньне зычных: т: распў̀с-ную ўс., хрос-ную, завіс-на ўс.; *д:* по̀з-на ўс.; *ч:* гарш-ка́ пры гаршчок; *г:* па-лядзі ўс.

Націск.

Характарызуючы Парыцкія гаворкі з боку націску, трэба сказаць, што яны ў большасьці маюць усе тыя асаблівасьці, якія ўласьцівы беларускай літаратурнай мове. Адхіленьняў спатыкаецца параўнаўча мала. Для характарыстыкі гаворкі можа-б было даволі толькі і абмежавацца гэтымі адхіленьнямі. Аднак, паколькі націск у беларускай літаратурнай мове мала дасьледаваны, а ў некаторых выпадках і не ўстаноўлены, лічу тут карысным падаць ня толькі адхіленьні ў націску ад літаратурнай мовы, але і тыя асаблівасьці, што характэрны для беларускай мовы наагул, а для Парыцкіх гаворак у частковасьці.

Націск у іменьніках. Аднаскладовыя іменьнікі м. р. ў родн. скл. звычайна пераносяць націск на канчатак: конь-канѧ̀, вол-вала́, цесьць-цɛсьцѧ̀, сьця Сл. Аднак тут мы маем і ці мала адхіленьняў: воўк-вò̀ўка (мн. л. ваўкі), вуж-вў̀жа, лін-лі́на, сом-сò̀ма, сьлед-сьлѐду, човɛн-чò̀ўна, пол (палаці)-по̀лу, полк-по́лку („з Высокага по́лку"), пост-по̀сту. Іменьнікі ж. р. з аснонай на мяккую зычную могуць мець у родн. скл. націск на канчатку: часьці́ Слаб., да касьці́ ib. (у сялян. гаворках), аднак ма̀сьці Майс., ко̀сьці ib. (у шлях. гав.).

Аднаскладовыя іменьнікі мужч. рода з асноваю на j маюць у месным скл. націск на канчатку: рай-у раю̀, гай-у гаю̀, уся хата ў маю̀, (аднак у ма́ю месɛцу); але *рой*, *крой* у месн. скл. маюць націск на перадапошнім складзе: у ро̀ю, у кро̀ю.

У назоўным скл. мн. л. наступныя аднаскладовыя іменьнікі маюць націск на канчатку: дзед-дзяды̀, дух-духі́, бог-баѓі, два разы̀, тры браты̀, аднак вў́сы, ро́гі, бо́кі.

У двохскладовых іменьніках у наз. скл. адзначу націск у наступных словах:

1) на першым складзе: ба̀гна, ба̀хур, бру́шка, во́раг (мн. л. варагі́), во́рваль, во̀рчык, ву́галь, грэ̀бень, до̀шка, до́ўбня, жо̀нка (мн. л. жо̀нкі і жанкі̀ (жанчыны), зло́дзей (мн. л. зладзѐі), зна́хар, Зьмі̀цер, ка́чур, кі̀шка, ко̀ршак, крэ̀мень, ку̀фа, на́йміт, но́здра, па̀ха, пѐрун, плѐмя, про̀цант, рэ̀мень, са̀жань, Сі̀дар, сло́ва (мн. л. славы̀ Вас., пры етых слава́х ib.), ста̀рац (мн. л. старцы̀), фа́рфар, ху̀рман, цы̀цка, цы̀ган

(мн. л. цыганы̀), шча́вель. Некаторыя з гэтых слоў у родн. скл. пераносяць націск на канчатак: со̀рам-сарама̀, пе́рун-пе̯руна̀, але зна́хар-зна́хара і г. д.;

2) на другім складзе: абру̀ч, абу̀х (тв. скл. абу̀хам), арэх (мн. л. арахі(е́) (сяляне) і арэ̀хі (шляхта), бітва́, вальлё, вуда̀, ве̯рба́, губа̀, дачка̀, дружба́, дума̀, жальба́, злаба̀, імя̀, кура̀ Чэрн. (звыч. ку́ра), канюх, мякі̀ш, ні пад наро̀ў Дабр., паля̀к (мн. л. палякі́), Прахо́р, раўня́, ручà̀й, радно́ (ўраджайна), быў такі случà̀й Пак., сталя̀р, стату́й, сьлюна̀, тварбо́г, хвала̀, шата́н.

Адзначу таксама родн. скл. адз. л. наступных слоў: балва́н-балвана̀, бара́н-барана̀, каба̀н-кабана́, качà̀н-качана̀, але буя́н-буя̀на, шатà̀н-шата́на.

У вінав. скл. адзін. л. ж. р. ў двохскладовых словах у большасьці заўважаецца націск на першым складзе: но́гу Зааз., зе́млю Рам., Слаб., аднак і землю̀ Дубр., узяў го̀ру Дан. У трохскладовых словах у гэтым выпадку націск заўсёды бывае на канчатку: старану́, галаву̀, баладу̀, баранў, а таксама скаварады́ і інш.

Адзначу найбольш цікавыя выпадкі націска ў трохскалад. іменьніках усіх радоў:

1) На першым складзе: блісканьне, бо̀льніца, вы̀гада, до́лата, кла̀дбішча, мѐзе̯нец, мѐшалка, мо̀гілкі, мо̀ркаўка, на̀ймічка, по́лудзень, по̀рхаўка, рэ̀шата, спà̀се̯ньне („грэх у мех, а спà̀се̯ньне ў торбу“), тру̀шанка, фо́льварак, шэ̀зьдзесе̯т.

2) На другім складзе: Астро̀ўкі (ўрочышча), духо̀ўнік, жаўці́зна, званíца, зано̀за, знахо̀рка, каля̀ды, крапі̀ва, крывізна, магà̀зын, музы̀ка, пало̀са, Рачы̀ца (гор.), рукà̀вы, сівізна, тава̀рыш (мн. л. тава́рышы), тавары̀шка.

3) На трэйцім складзе (на канчатку): балаўні́к, грамада̀, дурно́сьць, калашà („адна калашà поўна, а другая як заве̯за́ць“ Дан.), каталік, маладо̀сьць, маланьня̀, навіна̀, раўніна̀, семяйство́.

Трохскладовыя іменьнікі ж. р. з націскам у адз. ліку на канчатку ў мн. л. ў большасьці пераносяць націск на другі склад: барана̀-баро́ны, барада̀-баро́ды, баразна́-баро̀зны, галава̀-гало̀вы, памяло-памёлы, а таксама скаварада̀-скаваро́ды, аднак сіратà-сі̀раты-сі̀рат.

Варта адзначыць націск у наступных многаскладовых словах: адзінà̀ццаць (і адзіна́нцаць), бра́тава̀я, вакене́ліца, яго̀днічак, сярэ̀дзіна.

Утвораныя ад дзеясловаў іменьнікі ніякага роду з суфіксамі *-ен, -ан* (ян) захоўваюць націск дзеяслоўнай асновы: хвалі́ц — хвале́ньне, сядзѐць—сяджэ̀ньне, хадзі́ць—хаджэ̀ньне, капà̀ць—капà̀ньне, таўха́ць—таўхà̀ньне, куля̀ць—куля̀ньне, купля̀ць—купля̀ньне, выхваля̀ць—выхваля̀ньне, але кі̀даць—кі̀даньне, гла̀дзіць—гла̀джаньне.

Адзначу яшчэ націск ускосных склонаў наступных слоў: гру̀дзі—у гру̀дзях, сà̀ні—сà̀ням—на сà̀нях, сынажà̀ць — сыно̀жаці — сыно̀жаце̯й і г. д.

Прыйменьнікі, далучаючыся да іменьнікаў, як прыстаўкі, у большасьці захоўваюць на сабе і націск, асабліва пры іменьніках першатворных. Пакажу найбольш цікавыя выпадкі захаваньня націскаў на прыйменьніках пры іменьніках і прыслоўях, разам з тым зазначаючы і адхіленьні.

без: бе́зьліч, бе́здараж.

вы: вы̀ган, вы̀гін, вы̀дра, вы̀жар (але выжà̀ры), вы̀куп, вы̀пал, вы̀пас, вы̀скіць, вы̀хрыст; у вытворных іменьніках націск на *вы* захоўваецца тады, калі іменьнікі канчаюцца на суфіксы-*ак,-ек,-ак,*

-кі і інш., як і ў літаратурнай мове: вы̀кідак, вы̀радак, вы̀сɛлак, вýмɛтка Слаб., вы́перадкі, вы̀біркі, вы̀сеўкі.

до (да) ў большасьці націску на сабе не захоўвае: дабо̀р, даéдкі, у дагò̀н, дадà̀так, дазо̀р, дазвà̀ньня, дажы̀нкі, дамалò̀ткі, дашчэ̀нту, аднак до̀гляд, до̀сьвіткам, нɛдóімка (з прыстаўкай *не*), до̀сьціп.

а, аб, ад, ат, во, воб, вот таксама рэдка маюць на сабе націск: агрэ̀х, амéці, аці̀ры, абрà̀з, абсéў, адгò̀н, аткі́д, адрэ̀з, але во̀бруб, во̀ступ, во̀б зɛмлю, вóтхлань, вóчап, вы̀узгалаўе (частка калёсаў).

за. Першатворныя іменьнікі, зложаныя з прыйменьнікам *за*, у большасьці маюць націск на асноўнай часьці слова: забо̀й, завà̀л і завà̀ла, завò̀д, завò̀з, загà̀д, загò̀н, зажы̀н, закáз, закò̀л, залò̀м, закò̀н, замѐр, зарэ̀з, запà̀л, засéк, запà̀с, затò̀р, Заці̀шша (назва вёскі), аднак зà̀хад, зà̀скак, зáсаб, зà̀варат, зà̀пар, замаладу, залаб, загрудкі, нізà̀даўга. Калі-ж іменьнікі маюць суфікс *-ка* ў значэньні памяншальным, то націск звычайна бывае на прыйменьніку *за:* зà̀гадка, зà̀гарадка (і зà̀гарада), зà̀гваздка, зà̀вɛзка, зà̀баўка (але забà̀ва), зáкрутка, зà̀ламка, зáсаўка (і зà̀саўкі), зáрубка, зà̀клепка, зáсланка (але заслò̀на) зà̀тычка, зáсьцежка, зáстаўка, зà̀чапка, зà̀чынка, зà̀таўка, зà̀шчапка, аднак заці̀рка, закýска, запà̀лка. У іншых беларускіх гаворках, як вядома, і гэтыя словы могуць мець націск на *за* [1]).

Пры іншых суфіксах націск на прыстаўцы *за* спатыкаецца рэдка: забывà̀ка, загáна, завò̀ркі, зажы̀нкі, завà̀да, завірýха, залёты, зазі́мак, замò̀рак, заплà̀та, запрà̀ва, зарóдак, застà̀ва, зарабò̀так, зарýчыны, заці́шак, аднак зà̀рабаткі, зà̀ткала, зà̀варацень, зà̀пɛчак.

на. Націск на прыстаўцы (прыйменьніку) *на* пры іменьніках і прыслоўях спатыкаецца рэдка; часьцей ён бывае на іншых складох слова: нà̀сыпка, нà̀рачна, нáварат, нáдаўга, нà̀зіркам, нà̀крыж, нà̀маразьні, нáўскась, нáўза, нà нач, нáліха, глянь нà ба (бога), унà̀начкі, аднак наро̀дак, наўлéчка, набі̀лкі, назо̀ла, напɛрóд і г. д. (большасьць).

не. Таксама і на прыстаўцы *не* націск бывае рэдка. Адзначу найбольш цікавыя выпадкі націску на прыстаўцы *не*: нéвук, нéжань, нéлюд, нéмарасьць, нéмач, нéльга, нéмɛрач, нѐпладзь, нéпрыяцɛль, нéслух, нéўдаль, нѐхрысьць, нѐчысьць, нéаткуль, нéпаварацень, аднак нячы̀сьцік, небарà̀ка, нɛбò̀ж і нɛбò̀га, нɛбò̀жчык, недавéрак, недамéрак, нɛнà̀вісьць, непрытò̀мнасьць, ніўмéка і г. д. (большасьць).

па, по, под маюць на сабе націск у наступных словах (пераважна пры іменьніках з суфіксам *-ка* ў знач. памянш.): пáзалкі, пáмɛтка, пà̀пляска, пà̀ранка, пáсɛка, пáтчарка, пà̀церка, пáсака, пà̀рабак (але парабчà̀нка), пóгань, пóклад, пóкатам, пò̀жня, пò̀даўна, пò̀варатка, пóгаласка, пóкуць, упò̀пɛрак, пò̀плаў, пóтырч, пò̀прадкі, пò̀сьпех, пò̀туль, пò̀сьцілка, пò̀цɛраб, поўха, пóкрыўка, пò̀ліўка, пóчапка, пò̀двɛзка, пò̀дбіўка, пò̀ткур, пóдруб (але падрýба), пò̀тплетка, пóтпіс, пò̀тсьвінак, пò̀дмазка, пóтшыўка, пò̀тскакам, аднак памò̀ст, патпɛрà̀зка, памы̀лка, памò̀л, папáс, паўрò̀зы, павóдка, падрэ̀з, патпáска, паддà̀ны, патпéчак, патскрэ̀бак, патпò̀ра і інш.

пера. Адзначу націск на другім складзе прыстаўкі *пера*: пярэ̀бары, пярэ̀бірка, пярэ̀вɛсла (і перавя́сла), пярэ̀дайка, пярэ̀звы, пярэ̀зімка, пярэ̀ймы, пярэ̀летка, напярэ̀кар, пярэ̀карм, пярэ̀куп, пярэ̀ліўкі, пярэ̀плат, упярэ̀мешку, пярэ̀рва, пярэ̀смык, пярэ̀хрыст, аднак пе-

[1]) Е. Карский. Белоруссы, т. II, ч. 1, стар. 539.

равóз, перавòд, перадня̀, перала́з, ператрýска, пералòм і інш. Націск можа быць і на першай часьці прыстаўкі *пера:* пѐраварацень (і пярэ̀варацень), пе́рапалах.

про (пра) з націскам: прóдаж, прòкл=ць, ніпрóм=нны, прòпась, прòрва, прòскурка, прòслух, аднак прабóй, прадýха, прагля̀д, прачýтка і інш.

пры. Адносна прыстаўкі *пры* трэба сказаць тое-ж самае, што часткова гаварылася аб прыстаўцы *за*: націск на прыстаўцы *пры* пераважна спатыкаецца ў словах з суфіксам *-ка* ў значэньні памяншальным: пры̀вэзка, пры̀дзірка, пры̀казка, пры̀чапка, пры̀ступка, пры̀пражка, упры̀пражку, пры̀тычка, пры̀кладка, упры̀куску, прышыўка, а таксама пры̀мы (але прымàк, прыма́чка [1]), пры̀дан=(але прыдàнка), пры̀клад, пры̀гаршчы, пры̀сяга, упры̀с=дкі, прып=чак, пры̀дача, пры̀цемкам, аднак прыгàнак, прыбòр, прымýс, прына́да, прыпòл, прысма́кі.

роз (рос) пад націскам: урòскід, рòсьпіска, ро́шчап, аднак Растані (назва паселішча).

су пад націскам: пашоў у сýгляды, сýкравіца, сýпрадкі, сýчаскі, насýп=рак, сýтарга.

Націск прыметнікаў. Наступныя двохскладовыя прыметнікі маюць націск

1) на першым складзе: бо́сы, дзі́кі, кòсы, лю̀дзкі, нѐмы, сьме́шны;
2) на другім складзе: зямны̀, лі̀хі, лясны̀, малы̀, стары̀.

Некаторыя двохскладовыя прыметнікі маюць націск у шляхецкіх гаворках на першым складзе, а ў сялянскіх на другім, напр.: дòўгі і даўгі̀, крýткі і круткі̀ (вёрткі), мя̀ккі і мяккі̀, стра̀шны і страшны̀, тўсты і таўсты̀, цьвòрды і цьвярды̀, ця́жкі і цяжкі́.

Адзначу найбольш цікавыя выпадкі націску наступных трох і многаскладовых слоў: бѐзбòязны, веснавы́, гаваркі̀, зара́зьлівы, калінòва=вѐсе́лечка, каро́сьлівы, кашэ̀чы, ла̀скавы і ласка́вы, маладзѐнькі, міле́нькі, пл=ме́ністы, прыя̀зны, рабе́нькі, фа̀рфаравы, шаўко́вы.

Дзеяслоўныя прыметнікі з суфіксамі *-ан, -ян* падобна да такіх прыметнікаў, як а л а в я̀ н ы, д з е р а в я̀ н ы, маюць націск на суфіксах: абарва̀ны, абмеркава̀ны, абструга̀ны, абшарпа̀ны, зал=йца́ны, зашмальцава̀ны, надрукава̀ны, параскіда́ны, прыгна́ны, аднак адгаро́джаны, абме́раны. Пры суфіксе-ж *-ен* (ад дзеясл. на *-іць*) націск блізка заўсёды пераходзіць на папярэдні склад (або склады): абвѐз=ны, аблýпл=ны, жа́раны, змòраны, заве́дз=ны, дагавòраны, про́шчаны, ствòраны, упрэ̀жаны, паса̀джаны, аднак *пасаджòны* бацька, *куплёны, пахавалёны* (полёнізм). Адзначу таксама націск у слове *брана̀* („Атсюль я брана̀ Дубр.).

Займеньнік. Як і наагул у беларускай мове, у словах *нікòга, ні ў кòга, нічòга* націск на перадапошнім складзе.

Націск дзеясловаў. Адзначу націскі ў наступных дзеясловах: абýрыцца, бýрыць, забýрыць, застрэ̀ліць, кле́іць, крòіць, лýхціць, се́рдзіць, се́рдзіцца, расьсе́рдзіцца, стра́шыць, чмýціць; ба́лавацца, бòраць, бòрацца, бра̀тацца, здýжаць, ка̀рхаць, кі́даць, кі́дацца, ла̀саваць, ла̀скаць (і ласка́ць), лётаць (і л=та̀ць), пы̀рхаць, сòваць. У іншых формах гэтыя дзеясловы націску не мяняюць; такім чынам абýруся, застрэ̀лю, кле́ю, пасѐрдзіліся, настра̀шу, ба̀лаваліся, бо́раюцца, здýжаю, лётa=, кі̀даў, сòвалі.

---

[1]) У слоўніку І. Насовіча *пры́мачка.*

Варта таксама адзначыць націск у дзеясловах кілзàць, ржавéць, заржавéць, варсàць, зубіць, памятáць, падаўжэ̀ць, шкандыбáць.

Група дзеясловаў закончанага трываньня з канчаткам у інфінітыве на *-іць*, маючы націск на карэннай галоснай, не мяняе яго ў цяпер. і прошл. часе: прывòзіць—прывòжу—прывóзілі, прывòдзіць—прывòджу—прывóдзілі, прыхóдзіць—прыхòджу—прыхóдзілі, прынòсіць—прынòшу — прынòсілі, выхóдзіць — выхóджу — выхòдзілі, звóзіць — звóжу—звòзілі.

Дзеясловы з націскам у інфінітыве на канчатак *-іць* заўсёды ў 2 ас. цяп. ч. пераносяць націск на папярэдні склад: варажыць—варажу̀—варòжыш, гаварыць—гаварý—гавóрыш, гасьціць—гашчý—гóсьціш, грозіць—гражý—грòзіш, дзівіцца—дзіўлюся—дзівіся, дружыць—дружý—дрýжыш, званíць—званю̀—звòніш, крывіць—крыўлю̀—крывіш, муціць—мучý—мýціш, палíць—палю̀—пàліш, пагадзіць—пагаджý—пагóдзіш, прасьціць—прашчý—пròсьціш, радзіць—раджý—рóдзіш, тварыць—тварý—твòрыш [1]).

Ад дзеяслова „хацець“ першая асоба цяп. часу па аналёгіі з іншымі формамі гэтага часу будзе х о́ ч у (ў сялянскіх і шлях. гаворках). Таксама па аналёгіі з іншымі дзеяслоўнымі формамі 3 ас. адз. л. ад дзеяслова „магчы“ будзе м а ж э̀.

Двохскладовыя дзеясловы з карэннай галоснай *е* і канчаткам у інфінітыве *-ці* захоўваюць націск на галоснай *е* кораню: вéсьці, вéзьці, грэ̀бці, клѐсьці, мéсьці нéсьці, пéкці, плѐсьці, прэ̀гці, сéкці, трэ̀сьці, цéгці, цéрці, лéгці, сéкці, пéрці, памѐрці. Зрэдку ўжываецца ў гэтых дзеясловах, за выключэньнем апошніх пяці, націск і на канчатку: вясьці̀, грабці, клясьці і г. д. У 3 ас. адз. ліку прошл. часу ж. і н. р. і ў мн. л. ўсіх радоў гэтыя дзеясловы захоўваюць націск на карэнным *е* ў закрытых складох; такім чынам вéзла — вéзьлі, грэ̀бла — грэ̀блі, нéсла — нéсьлі, папéкла — папéклі, трэ̀сла — трэ̀сьлі, пацѐгла — пацѐглі, цéрла — пацѐрлі, папрэ̀гла — папрэ̀глі, пасѐкла — пасéклі, лѐгла — палѐглі, сéкла — пасéклі, папéрла — папéрлі, пéрла — пѐрлі, апéрлася. Некаторыя з гэтых слоў маюць націск і на канчатку: павязьлі̀, папяклі̀, пацяглі̀; іншыя выключна на карэннай *е*: пасѐкла, памéрла, пацѐрлі. Калі-ж карэнная галосная *е* адкрытая, то націск заўсёды будзе на канчатку: вɛлà, мɛлà, клɛлà—клялí.

Аднаскладовыя дзеясловы 3 ас. прошл. ч. ж. і н. р. і ў мн. л. ўс. р. маюць націск на асноўнай галоснай: жàла, мыла—мылі, гнáла—гнàлі, дрáла, ждáла, брàла, здàлі, рвàла, звàла, клàла, спàла, піла, ліла, але былá, былò, былі.

Адзначу яшчэ націск у дзеясловах канчы̀лася, канчы̀лі, асталіся.

Прыстаўкі, злучаючыся з дзеясловамі, звычайна націску на сабе не захоўваюць; такім чынам аджы̀ў, нажы̀ць, пажы̀ў, задàў, падáў, паднáў, прадàў, панѐў, наняць—наняў—нанялі, пам'ёр—памѐрлі і г. д., аднак зóйдзеш (зайдзеш), зóйдзе, зòйдзем, знòйдзеш, знòйдзем, нòймеш (наймеш), пóймеш, пóйдзеш, вóзьмеш.

Націск у прыслоўях: альбò, агýлам, блі̀жай, бóязна, віднò, высóка, вы̀шай, вядòма (але „німа вѐдама, куды ён дзеўся“), галарýч, глыбóка, глы̀бɛй, гòласна, гóрача, жàлабліва, кóлісь, кры́ху, лéпɛй, ні̀жай, старэ̀й, сьмéшна, сілкóм, шырóка, цалкóм.

Зьмена значэньняў слоў у залежнасьці ад націску. Не гаворачы аб такіх вядомых словах, як мукá і мýка, прывяду больш рэдкія: нéмы

---

1) У расійскай мове гэтыя дзеясловы маюць у 2 ас. націск на канчатку: ворожи́ш, говори́ш, гости́ш, грози́ш. (гл. Ив. Синяков. Ударение в русском языке. Вильно).

(страшны, замагільны) голас і нямы чалавек, адлéжаць руку (пераляжаць) і адлɛжàць усю зіму (многа паляжаць), падглéдзɛць пчолы (дастаць мёд) і падглядзéць што-небудзь, пагукàць (паклікаць) і пагýкаць (папаляваць; гаворыцца аб сьвіньні), падыхаць (лёгкімі) і вецɛр падыхàе.

МОРФОЛЁГІЯ.

Суфіксы. З найбольш цікавых і пашыраных суфіксаў, агульных для ўсяго раёну, адмечу наступныя:

-ак (-як): вɛтрáк, жабрàк, сьлімàк, сɛдáк, ɛдàк, ганчàк, ладýнак, нарòдак, кавàлак, пàсак, лɛжàк, асìлак, бурàк, хадáк, дзівàк; казьлякь, мɛрзьлякь, вальлякь, трухлякь, басякь, смалякь, трацякь, хмызьнякь, касякь.

-ар (-яр): знáхар, гаспадàр, бòндар, вɛдзьмàр, бляхар, штукàр, сьцèжар, нóсар; смаляр, мýляр, шкляр;

-ач: пузàч, маркàч, плɛскàч, рагáч, карпáч, калàч, смаркáч, сɛкàч, таўкàч, трапкàч, папіхàч, саўгàч;

-ік(-ык), *-нік,-ч-ык,-аль-нік, шч-ык:* вòгнік, цырýлік, жэ̀ўжык, цызбрык, крàмнік; касьнік, плы́тнік, сяўнік, пранік, балаўнік; кíпцік, лісьцік, кòнік; дýбчык; вìльчык, вóжык, малòйчык, аб'éжчык, нɛбóжчык, палавìншчык, пíльшчык; падавàльнік, накладáльнік; Дубрóўшчык, Старжы́ншчык (шл. гав.).

-ок (-ёк): стралòк, гаварòк, прутóк, каўтòк, жаўтòк, лістòк, скрылёк;

-ук (-юк), *ю-ка*: відýк, хайлýк, карчýк, капшýк, парабчýк, хлапчýк, зладзяйчýк, краўчýк, пацýк; асьцюк, сьмярдзюк, кіньдзюк, сьвінюк; манюка, зладзюка;

-очак (-ечак): лістòчак, братòчак, сватòчак, парабéчак, мяшэ̀чак;

-ка, (ко): сва́рка, жы́тка, стýжка, ляжка, жычка, пстрычка, сьвíтка, вìлка, цэ̀лка, гамóнка, пасэ̀сарка, вýлка, пóлка, ёмка, рóўка, малàнка, жарòбка, лы́ска, хвалькò, дружкó;

-ак(а), -як(а): чытàка, пісáка, верашчáка, забывáка, вужàка, нібарàка, сьпɛвàка, разɛвáка, чарцяка;

-ачк(а): дзéвачка, жэ̀рдачка, лайдàчка, ямачка;

-анк(а), -янк(а): выхаванка, бляшàнка, трýшанка, абɛцàнка; крывянка, прасянка, бусьлянка, шлɛхцянка, пісарàнка;

Карбыцянка, Муравіччанка (назвы дзявок—шлях. гаворкі).

-аўк(а), -еўк(а): бліскаўка, мìгаўка, ляскаўка, Стàсɛўка (вёска);

-ушк(а), -юшк(а): кадýшка, галýшка, калìнушка, рабìнушка, сòўнюшка, вòлюшка;

-аньк(а): нòчанька (ні на 'дну ночаньку Чырк);

-ечк(а): лéцɛчка, мéсɛчка, зяўзюлɛчка, бабýлɛчка, вясèльлɛчка;

-ейк(а), -ейц(а): салавèйка, сòнейка, пугавéйца;

-ец (-эц), *-ɛнец:* лавéц, капèц, дубèц, глушэ̀ц, курэ̀ц, маладзéц, сьляпèц, грабéц, касéц, юрэ̀ц, пасланéц, грабянèц.

-іц, -іц(а), -ыц(а): шляхціц, жывìца, маладзìца, каплìца, сырыца, залвìца, глìца, самíца, жарабíца, званíца, капанìца, дóхліца;

-ічк(а), -ычк(а): жарабìчка, званíчка, сырычка, зàтычка, нàймічка;

-цы: людцы, сéнцы, красёнцы, дзьвéрцы;

-ух, -юх, ух(а), -юх(а): сьвінтýх, каўцюх; квактýха, лапатýха, рагатýха, пахàтуха, сьпɛвýха, сіпýха, сьмярдзюхà;

-іх(а), -ых(а): кавалìха, Сьцɛпáніха, Івàніха, Васілíха, Сымòніха, пìсарыха. дзячы́ха, бòндарыха;

-ох(а): раскідòха, ласòха;

-н(я), -н(а): брахня̀, хлусьня̀, басэ́чня̀; скры̀ня, ба̀гна, ба̀бна;
-ун, (-юн): каўту̀н, рагату̀н, шляхту̀н, сьвісту́н, браху̀н, сысу́н, балбату̀н, кілу̀н, клышу̀н, брыку̀н, дзыгу̀н, жаўту́н, ўюн;
-ін(а): трысьці̀на, навіна́, цалі̀на, рашэ̀ціна, садавіна̀, гаро̀дніна, апо́ўзіны, галѝна, азыры̀на, павуці̀на, аўчы̀на, прасьціна́;
-ен': валасе́нь, лазьбе́нь, целяпѐнь, пе́вэнь, авадзе́нь (мн. л. авадні і авады̀).
-ян(-ан): буя̀н, траяны̀, качан̀;
-онк(а), -ёнк(а): скарбо̀нка, машо́нка, галёнка, пляцёнка;
-ухн(а), -юхн(а): бра́тухна, до́чухна, маладу̀хна, бо́жухна, та̀тухна, сьме́ртухна, ба̀цюхна, дзя̀дзюхна;
-л(-ла,-ло): м'я̀ла, ды̀ла, кубло̀, ўшу́ла, за̀ткала, матаві́ла, сука́ла, се́дала, краса̀ла;
-ул(я), -юл(я), -улък(а), -юлък(а): крыву́ля, бабу̀ля, Ганю̀ля, зяўзю̀ля, дзядзю̀лька, зяўзю̀лька;
-ел': круце́ль, гі̀бэль, мардзе́ль, курду̀пэль, гамзе́ль, мудраге́ль;
-алк(а): кача̀лка, ве́элка, мѐшалка;
-ал': гі̀цаль, ша̀шаль, чарава̀ль, бруха̀ль, ку́хталь, ганта̀ль, марка̀ль, бэ̀нцаль, гаршка̀ль;
-ыл': бабы̀ль, маты́ль, мармы̀ль;
-ілк(а): цадзі́лка, насі̀лка;
-ілн(а): каси́лна, грабі̀лна, дзэржа̀лна, цапі̀лна (сял. гав.);
-оўл(я): дарагоўля, будоўля, галадо̀ўля;
-дл(а): страшы̀дла, кава́дла, прасьці̀ра̀дла, мы̀дла (у шляхецкіх гаворках);
-ізн(а): стары̀зна, сівізна, сыры̀зна, жаўці̀зна, крывізна, глупізна, Случы̀зна, пальшчы̀зна;
-ішч(а), -нішч(а): глі̀нішча, дні́шча, сьні̀шча, тапары̀шча, ігры̀шча, пѐчышча; жы̀тнішча, прася̀нішча, грача́нішча, картапля́нішча;
-ошч(ы): любо̀шчы, радо́шчы;
-ыр: багаты̀р, павады̀р, бабзды̀р;
-ур: дзяўчу̀р, ка̀чур, учку̀р, пячу̀рка;
-в(а),-ів(а): мо́рква, цэ̀рква, дра́тва, чырва̀, сьце́рва, жарства̀; мл̀іва, мало́дзіва, ва̀рыва;
-м(о): прызьмо́, вязьмо̀, пераймо̀;
-аня(-яня),*-ят:* качаня̀, кураня̀, шчаня̀, ваўчаня̀, гадзэня̀, панэня̀; цэля̀ты, кацэня̀ты;
-а: печая̀, чаплэя̀, заве́я;
-от(а): гало̀та, бядо́та, блазно́та, клапо̀ты, сухо́ты, дуро̀та, басо́та; сту́кат, гру̀кат;
-ат: пэрна̀т, шкура̀т;
-іт: на̀йіміт, про̀зьбіт, маладзьбі́т, казьбі́т;
-б(а), -об(а): бажба́, гро́зьба, маладзьба̀, сэўба́, варажба̀, худо̀ба, ло̀ба;
-уг(а),-юг(а), -юган, -яг(а): вятру́га, зьвяру̀га, дзяру̀га, зладзю̀га, валацу́га, сталю̀га, мэтлюга́, пісю̀га, мацюгі́, зладзюга̀н, праварня̀га;
-ульг(а),-альг(а): мітульга̀, пустальга́;
-еж: крадзе́ж, гусьце́ж, кало̀дзэж, мяце́ж;
-яш: звадыя̀ш, завадыя̀ш, Масія̀ш;
-ыш: галы̀ш, тава̀рыш;
-еч(а),-эч(а): галѐча, малѐча, даражнѐча, камарэ̀ча;
-с,-ус: кры̀ксы, ві̀сус, ба̀йбус;
-ыжнік,-аз: карты̀жнік, кно́раз;
-яньн(е): выдумля̀ньне, вырабля̀ньне, выхваля̀ньне;

ЦНБ НАН Беларусі

-ечк(і): кòлечкі, стòлечкі;
-утк(і): нічагýткі, нікагýткі;
-ов(ы),-ёв(ы): смалóвы, бураковы, вішнёвы, шаўкòвы;
-ськ(і): рýскі Пак., Казл., зèмскі Слаб., у Мінскую ib., кóнскі Дубр., свòйскі ib., васілёўскі Вас., бàбскі ib. і наагул ва ўсіх сялянскіх гаворках раёну; у шляхецкіх гаворках *-скі:* рýскі Майс., кóнскі Дан.;
-ізн(ы), -эзн(ы), -энн(ы), -ізазн(ы), -ізарн(ы), -эразн(ы), -енечк(і), -енечачк(і), -юсеньк(і), -ёсеньк(і): вялізны, вялічэзны, вялічэнны, старэнны, даўжэнны; вялізазны, вялізарны, таўшчэразны, малènечкі, малènечачкі, сінечачкі, навюсенькі, калюсенькі, маладзёсенькі і інш.
-ал(ы): нідбàлы, пазападàлы;
-іст(ы): камяністы, шчацініcты, касьцісты, пакóцісты;
-ат(ы): рагàты, багàты, дупленàты;
-ав(ы): гаркàвы, дзірáвы, белявы, маладжáвы, палавы;
-ів(ы): праўдзівы, шалудзівы;
-ел(ы),-кл(ы): пасівèлы, згрыбèлы; пажóўклы;
*-ан(ы),-ян(ы):*дзераўяны, алаўяны; пабеляны;
-юсеньк(і): п'янюсенькі, мілюсенькі;
-ёсеньк(і): маладзёсенькі Красн.;
-еньк(а): ціхенька, нічагèнька;
-ецк(і): здаравèцкі, шляхéцкі і шляхòцкі, дзявóцкі.

Ва ўсіх гаворках раёну таксама пашыраны дзеяслоўныя суфіксы *-ткі, -тачкі, -танькі:* спàткі, éсткі, пíткі; спàтачкі, естàчкі, пітачкі; спàтанькі, èстанькі, пítанькі Чырк. Апошнюю катэгорыю дзеясловаў проф. А. Томсон называе памяншальнымі інфінітывамі [1]).

Складаныя словы. Складаньне слоў у гаворках раёну, як і наагул ва ўсёй беларускай народнай мове, характарызуецца стройнасьцю і лёгкасьцю; нязграбных пабудоў тут зусім няма.

Складаньне слоў можа ўтварацца або спосабам іх беспасярэдняга зьліцьця (Качàй-Балóта, на Пéтры-Пáўла, трысьцéн, шасьціпáл, абéручкі, дабрыдзень, дабрàнач), або спосабам злучэньня іх пры дапамозе галоснай *о (а):* самасéйка, казалýп, сьвінапàс, канавàл; у слове п о́ л у д з е н ь *у* належала аснове. У складаных словах націск можа стаяць на першай часьці слова (кòламазь, Вялікаднe), на злучальных галосных (курòдым, велікóдны, палýднуваць) і на другой часьці слова (звычайна): шкурадзёр, курашчýп, кірнавýхі. Ненаціскныя *о, е* ў складаных словах падпарадкуюцца тым-жа законам, што і ў нескладаных словах; такім чынам в*а*лапàс, в*а*шапрýд, г*а*лапýпец, д*а*брадзéй, д*а*ўгагрывы, гр*а*хавòднік, ч*а*рназèм, ч*а*рнабрывы, в*е*рбалòз, б*е*лабóкі, ч*ы*рватòчына, кр*ы*в*а*смòк. Ненаціскнога *о* ў складаных словах няма. Зам. літаратурнага ш т о д з ё н н а, гавораць ш т о д н я, ш т о т ы д н я.

І м е н ь н і к.

Асаблівасьці ў катэгорыі роду. Апрача такіх агульна-беларускіх слоў мужч. роду, як г у с ь, ж а л ь, б о л ь, ц е н ь, л і н, б я р л ò г, п ы л, да мужч. роду належаць: сàжань (цэлы сàжань вытралевáў), сьмерць (сьмерць прышóў Пак.), вòбалак ус., лóжак ус., прòдаж ус., пàчак ус., музóль ус., прарэ́х ус., комін ус (у Я. Коласа—кòміна (Нов. Зямля), ахàпак.

---

[1]) *А. Томсон.* Общее языковедение, стар. 358.

Да катэгорыі жаночага роду належаць: слугà (вéрн*аю* слугóю Чэрн.), лі-тр*а* (каб лíтру вýпіла, то мо-б і сьпѐла Чырк.); Мікòла (памалю́ся я сьвятòй Мікòлі Дабр.), шýм*а* (бéлая шýма на бѐразі ўс.), меч (сѐкчы залатòю мéччу Дан.), пàр*а* (гарàчая пàра ўс.), стàд*а* (ўсю стáду прыгнàў ус.), пстрычк*а* ўс., пасàг*а* ўс., папѐр*а* ўс. (у грамат. Я. Лёсіка „папер"), картòпл*я* ўс., хад*а* ўс., пáйк*а* ўс., падпàск*а* ўс., камòд*а* ўс. Варта адзначыць канчаткі наступных іменьнікаў жан. роду: раскòш*а*, пасьцѐл*я*, кішэ̀н*я*, лàн*я*, пàн*і*, мàц*і*.

Некаторыя іменьнікі маюць канчаткі (суфіксальныя) для мужч. і жан. роду: ліс і лісіца, цецярýк і цяцéра, самéц і самíца.

Склоны. *Клічны* склон з канчаткамі *у* (ю), *е* (а) асабліва пашыраны ў песеннай мове: ты, казàч*э*, ясьнéнькі сакóл*ю* Чэрн., ах ты, каравà*ю*, мой рà*ю* ib., наш пан, сакóлік*у* Слаб., кòн*ю*, мой кòн*ю* Дабр., кóзьл*ю* Як. Слаб., берì-ж ты, вóўч*а*, сéрую гýску Дубр. Клічны склон спатыкаецца і ў размоўнай мове: свáц᷉ Пак., кýм*е* Дан., бòж*а* ib., брàц*е* Слаб., сы̀нк*у* Майс. Канчатак *ю* клічнага склону муж. р. адзін раз спаткаўся і ў слове жан. р.: чыé, дòн*ю* („доня"), дзіця́ нᵉсéш? Чэрн. Цікавую форму мае слова „сёстрык" у клічн. скл. ж. р. („Гáнна, сёстрык, хадзѐм на йгрышча" Рам.). Канчаткі клічнага склону іншы раз заходзяць і ў наз. скл.: там арàў казàч*а* вóлікам чарнѐнькім Пак. (песьня пашырана ва ўсім раёне).

З канчаткаў *назоўнага склону* адзначу *я* ў катэгорыі такіх іменьнікаў ніякага роду, як цᵉля́, ᵉгня̀, куран*я̀*, ваўчан*я̀*. Канчатак *ё* ў памянёнай катэгорыі іменьнікаў ня ўжываецца. Варта таксама адзначыць канчаткі такіх уласных іменьняў, як Есіп, Цімóх, Пятрó, Сьцёп, Гаўры̀ла, Мікіціха, Ладымᵉрыха, Грысіха [1]).

Родны скл. на *у*(ю) маюць іменьнікі, што азначаюць масу: назьбірàў лі́ст*у*, пýх*у*, налíў алѐ*ю*, насыпаў пòпᵉл*у*, кала агн*ю*, напусьцíлі курòдым*у*, баíцца грóм*у*, намалаціў ячмéн*ю* (але аўс*а*), ат лѐс*у*, ад дажджý, лёд*у*, вéтр*у*, гòлас*у*, жвір*у*, гòд*у*, з вòз*у*, з дóм*у*, с плòт*у*, з Бабрýськ*у*, з Глýськ*у*, з Высóкага Пóлк*у*, з высòкага гà*ю*, сь сьвѐт*у* згубíла, але дн*я* таго німà, каб яны ні пасварыліся, ат Вялíкадн*я*, ат сталà і інш.

Давальны скл. іменьн. жан. р. з асновамі на *а* мае *э* ня толькі пад націскам (пашоў к рацэ́, г даццэ́), але пераважна ў шлях. гаворках і без яго: дзéўцэ Іст., мáццэ Майс., жы̀ццэ ib. У тых-жа гаворках пад уплывам аканьня ненаціскное *э* можа пераходзіць у *а:* дзѐўц*а* Дан., шàпц*а* ib. У сялянскіх гаворках звычайна *ы:* дзéўц*ы* Пак., Дабр., мàцц*ы* Чэрн. (і мàццэ Слаб.), жы̀ццы Чэрн. Пасьля шыпячых і *р* абедзьве гаворкі маюць *ы:* мяжы̀, кýчы, кáшы, гары̀, гаргàры; магчыма аднак і *э:* г гарэ́ Чэрн.

Асаблівасьці вінавальнага склону будуць разгледжаны ў разьдзеле сынтаксу.

У творным скл. ў сувязі з адсутнасьцю пераходa *е* ў *ё* адзначу такія канчаткі, як атцэ́м Чэрн., урачэ́м Слаб., плячэ́м, Дан., душэ́ю Рам., канём ib., гульнёю Майс., зямлёю ib., сям'ёю Казл. Праўда ў аналёгічных выпадках, асабліва ў гаворках маладога пакаленьня, ужы-

[1]) Тут дарэчы заўважу, што сялянскія ўласныя імёны і шляхецкія ў большасьці не супадаюць. Адпаведна да такіх шляхецкіх імёнаў, як Сьцёп, *Ю*зя, Ясь, Грысь, Даніель, Міхась, Базыль, Прузына, Марціся, Таклюся, Марыля, Гануля, Настуля маем сялянскія імёны: Сьцᵉпан, *Е*сіп, Іван, Рыгор, Даніла, Міхаль і Міхалка, Васіль, Прося, Марта, Тэкля, Ганна, Мар'я, Настася. Частка імёнаў, як Ладымер, Нічыпар, Мікалай, Кацᵉрына у сялян і шляхты супадаюць.

ваюцца канчаткі і *-ом* (ём),*-ою*(ёю): нажо̀м Дан., канём Дабр., душо̀ю ib.

Як відаць з папярэдніх прыкладаў, іменьнікі жан. р. маюць у тв. скл. поўныя формы *-ою,-ею:* за дурно̀ю галаво̀ю дай нага̀м бэда̀ Дан., ча̀сам—с ква̀сам, а паро̀ю—з вадо̀ю Майс., с кудзе́лею Чэрн., дачко̀ю ib. Радзей спатыкаюцца канчаткі-*ой,-ей:* с аўцо̀й Пак.

Іменьнікі жан. роду з асн. на *і* маюць у тв. скл. канчаткі *-у,-ю* (ўсюды): ко́сьцю, со́ллю, з ра́дасьцю, ноччу.

Месны скл. пры адсутнасьці націску на канчатку пры цьвёрдай аснове мае для ўсіх радоў канчатак *і*: ў прыпо̀лі Чэрн., ў до́мі ib., на рабо̀ці Вас., на гасьцінi ib., пры добрай гадзінi Красн., Дабр., ў далінi Пак., ў сало̀мі ib., на бярозi ib., на сьпінi Дабр., на е́там ме́сьці ib., ў ха̀ці ib., ў арэньдзі Слаб., ні па пра̀ўдзі Чэрн., ў службі Чырк., а таксама на хво̀і Дан., на по́куці ib., ў по̀лі Майс. Пры гэтым, як і ў давальным склоне жан. р. задняпаднябенныя асноў *г, к, х,* пераходзяць у *з, ц, с:* ў ро̀зі Дан., ў лузі Чэрн., Чырк., ма̀чысі Дабр., на бе́разі Пак., гадзіць сьвякрусі ib., на даро́зі Дан., на руцэ ib. Пераважна ў шляхецкіх гаворках мне даводзілася чуць у мужч. і ніякім р. і канчаткі *е* (ɛ): ў ле́се Майс., ў вусе ib., ў ро̀зе ib., на бру̀се Дан., лепш у лѐсе на ве́расе, чым у до́мі на сало̀мі ib., загру̀з у бало̀цɛ ib.

Асновы з канчаткамі на шыпячыя, *ц* і *р* маюць, як і ў дав. скл. жан. р., канчатак *ы*: на нажы́, на душы́, ў се́рцы Бял., на саке́ры Дан., на зары́ ib., на гары́ Пак. і на гарэ́ Чэрн. (аднак на дварэ́ ўс.), ў мѐсɛцы Слаб., на пасьце́лɛццы Дабр., на мура̀ўцы Пак., аб дзѐўцы Пак. Таксама, як і ў дав. скл., пасьля *ц* іншы раз можна пачуць *э* і нават *а:* ў Слабо̀дцэ Слаб., на ша̀пца Дан., ў ло̀жца ib.

Асновы на задняпаднябенныя ў мужч. і ніяк. р. пад націскам маюць канчатак *у:* на пескў Чырк., на лужкў Чэрн., ў лажкў Дан., ў лескў Дубр., в ымхў ус., ў духў, на пастухў, на кажухў, ў берлагў, на стагў, на рагў, але ў вўху, ў во̀ку, ў са̀дзіку Пак. Пры адсутнасьці націску на канчатку у апошніх прыкладах будзе *і* або е (ɛ): на сто́зɛ Дан., ў кажу́сɛ ib., ў лу́зі, ў ро̀зі, ў гаро̀сі, ў вўсе.

Канчатак *у* пад націскам дапускаюць асновы і з іншымі зычнымі: ў пылў Пак., ў се́рцу Слаб., ў мо̀ру Чэрн., на бру́су Дан., на вазў ib., на гваздў ўс., на лядў ўс. (але на лёдзɛ́ Дан.).

Іменьнікі мужч. р. з мяккай асновай маюць звычайна канчатак *-ю*: на каню, на ласю, на дню, ў раю, ў гаю. Магчымы аднак у гэтым выпадку і канчатак *і:* на кані („Буў на кані й пат кане́м“ Прык. Коўц.), на дні, але пры асновах на *j* канчаткі бываюць толькі на *-ю:* ў раю, ў ма̀ю.

Іменьнікі мужч. р. з асновамі на *а* зьмяняюць свае канчаткі наступным парадкам: *родн. скл.:* та̀ты, ста́расты, ба́цькі, дзя̀дзькі, саба̀кі; *дав., він., месн.*: та́ту, ста̀расту, ба̀цьку, дзя̀дзьку, саба̀ку; *творны скл.:* та́там, ста̀растам, ба́цькам, дзя̀дзькам, саба́кам, з Ыльлём (з Ільлём).

Ад *парнага* ліку ў гаворках раёну захаваліся наступныя формы: наз.-він. скл.: дзьвѣ бабі (з бабѣ) Рам., дзьвѣ сялѣ Слаб,, тры зімѣ Чэрн., дзьвѣ капѣ Дубр., тры бядзѣ Чырк., дзьвѣ ба́бе Вас [1]). Падобныя формы пануюць блізка ва ўсіх сялянскіх гаворках; у шлях. гаворках гэтых форм я не спатыкаў. З фор родн.-месн. скл. адзначу агульныя для ўсяго раёну: замітусілася ў вачу́ Дан., стаіць перад ачу̀ ib., зазьві-не́ла ў вушу̀ Майс. Больш пашыраны формы дав.-творн. скл.: ба̀чыў

---

[1]) ѣ тут азначае дыфтонг ie̯.

сва*іма* ач*ы̀ма* Дан.. уш*ы̀ма* Слаб., плячы̀*ма* ўс., дзьвяр*ы̀ма* ўс., грашы̀*ма* ўс.

Множны лік. У *наз. скл.* ў мужч. і жан. р. бяз націску існуюць канчаткі *-ы* (-і): сьвірны, ро́гі, я̀мы, цэ̀рквы. Пры націску на канчатках, апрача тых-жа канчаткаў, у сялянскіх гаворках пашыраны канчаткі *е* (ѣ), *э*(ыэ). Тэрыторыя апошніх канчаткаў ахоплівае блізка ўвесь раён за выключэньнем в. Дубровы і некаторых вёсак у ўсходняй часьці раёну. Такім чынам: луг*ъ* Панкр., ляны̀э Пак., думы̀э ib., стаг*ъ* ib., арах*ъ* Дабр., сады̀э ib., маѣ валы̀э ib., званы̀э ib., палік*ъ* Казл., брыжы̀э ib., грыбы̀э Дан., гурк*ъ* Язьв., жанк*ъ* Рам., ваўцы̀э ib., аццы̀э ib., клапаты̀э Слаб., гады̀э ib., дачк*ъ* ib., шаўцы̀э да краўцы̀э ib., бук*ъ* Прат., валы̀э ib., пеўн*ъ* Чэрн., камары̀э ib., хадзяіны̀э ib., мураў*ъ* Чырк., сыны̀э ib., леск*ъ* ib., тараны̀э ib., рыбак*ъ* ib., усѣ луж-к*ъ* абыйшла ib., еныэ Красн., гады̀э ib. На поўначы гэтая зьява заходзіць у суседні Жлобінскі раён, што мне ўдалося констатаваць па гаворцы адной жанчыны з в. Побалава. На поўдні зьява пераходзіць у Бабруйскі раён (Броскі сельсавет) і Глускі. З другога боку прышлося констатаваць адсутнасьць апошняй зьявы ў в. в. Якімаўскай Слабадзе (малайц*ы̀*, два брат*ы̀*—па запісах проф. П. Бузука) і Дуброве (палякі, буракі, кіяші, суд*ы̀*, касц*ы̀*, жанц*ы̀*, шэсь гад*ы̀*). Але апошнія вёскі, відаць, ляжаць на тэрыторыі па-за ізоглёсай ваўке, братэ (Параўн. П. Бузук. Спроба лінгв. географіі, ч. 1, в. 1., карта № 13). У індывідуальным вымаўленьні некаторых асоб, дзе гэтая зьява пашырана, заўважаюцца адхіленьні: гад*ы̀* Вас., маргі ib., сват*ы̀* Бял., цьвят*ы̀* ib., палякі Рам., вал*ы̀* Чырк. Ня знаюць гэтай зьявы таксама і ўсе шляхецкія говоркі раёну.

Стары канчатак *і* пры цьвёрдай аснове захавалі гоні ўс., сусѐдзі, чэ̀рці, хоць часта кажуць і суседы, чарты̀ Дан. Суроцы, кадуцы ў раёне не гавораць; зам. іх уро́кі, кадукі („каб цябе кадукі́ ўзялі“ Дан.). Па аналёгіі з асн. на *о* муж. р. спатыкаецца ле́ці („вы̀йдуць ле́ці—будуць дзеці“ Дабр.).

Іменьнікі мужч. р. з суфіксам *-анін* (-янін) маюць у наз. скл. мн. л. канчатак *-е* (ɛ): мɛшча̀нɛ Дан., сɛля̀нɛ Майс., дваро̀нɛ ib. Характэрна, што мяккасьць асновы захоўваецца і ў другіх склонах: селя̀няў Слаб., дваро́няў ib., селя̀ням і г. д. Ад слова *цы̀ган* множны лік будзе цыганы̀э (ў сялян) і цыган*ы̀* (ў шляхты). Ад хадзя̀ін (хаджа̀ін) мн. л. будзе хадзяіны̀э (сял.) і хадзяін*ы̀* і хаджаіны̀ (шл.).

У шляхецкай мове ў клічным скл. ўжываецца пано̀ве, сват*о̀ве*, брат*о̀ве*, што становіць спадчыну ранейшага наз. скл. асноў на *-и*.

Іменьнікі ніяк. р. маюць канчатак *-ы* (-і): варо̀т*ы* Вас., Дан., сёлы ib., я̀йц*ы* і яе́чкі ib., слав*ы̀* Вас., во́кн*ы* Як. Сл., варо̀т*ы* Прат., во̀кн*ы* ib., вазёр*ы* Пак., дзɛўча̀т*ы* па грыбы̀э хадзі̀лі Дабр. Спаткалася варо̀та Рам., а таксама сена̀, жыта̀ Дан. (у знач. „збожжа“) [1]).

Ад слоў *по̀ле, зо̀лата, серабро̀* множны лік не ўтвараецца.

Зборныя іменьнікі ніяк. р. ў значэньні множнасьці звычайна маюць формў адзін. ліку: абламáў гальлѐ Дубр., асыпа̀лася лі́сьцɛ Майс. Аднак яны могуць прымаць і формы множн. ліку з канчаткам *-я:* карэ̀ньня, ко̀льля, гво̀зьдзя. Такі-ж канчатак маюць і каза́ньня Дан., стварэ̀ньнɛ і інш., а таксама бра̀цьця ўс. (пры агульна пашыраным братыэ, брат*ы*).

[1]) Апошняе слова ў мн. л. адзначана і О. Воўк-Левановічам. (Важн. рысы... Зап. А. Г. Нав., кн. 2).

Родны скл. ва ўсіх радох звычайна мае канчаткі *-оў* (-ёў),*-аў* (-яў): валòў, краёў ус., мешча́няў Слаб., салда́таў ib., са́жняў ib., ба̀баў Чырк., сакéраў Чэрн., вярстóў Пал., капы̀таў ib., я̀йцаў ib., музы̀каў Дан., пéсьняў Пак., лéцɛў Чэрн. Аднак (асабліва ў шляхецкіх гаворках) пашыраным таксама зьяўляецца родны склон і без канчаткаў: сажòн Майс., да тых час Дан., з усіх сёл па сабáку ib., п'яць ўёрст ib., п'яць іграуш ib., мура̀шак Слаб., партòк („папок не згубі сваіх парток" Дан.), канапéль Рам., п'яць баб Казл., пéсень Дубр., дзевòк ib., дачóк Чырк. Пры зьбегу зычных у канцы асновы іменьнікі маюць абавязкова канчаткі: вéрбаў ус., вéдзьмаў ус., шля̀хтаў ус., стáрастаў, ца̀рстваў.

Іменьнікі мужч. р. з мяккай асновай пры націску на канцы слова маюць канчатак *-ёў:* зяцёў Дан., ласёў ib., акунёў Пар., карасёў ib., цясьцёў ib., рублёў Прат., аднак *лапцэ́й* Дан., *караблэ́й* Пак. (і каблёў Дан.,), *рублэ́й* Як. Сл., а таксама *людзэ́й* ус. Іменьнікі жан. р. з канчаткам на мяккі зычны пры націску на канцы слова заўсёды маюць канчатак *-ей:* касьцэ́й, начэ́й, мышэ́й, а таксама санэ́й, дзьвярэ́й, курэ́й. Пры націску не на канцы слова маем для ўсіх радоў *-яй* (ай): вòша*й* Дан., далòня*й* ib., радасьця*й* Прат., нòча*й* Чэрн., мýсьлɛ*й* Чэрн., а таксама кóнɛй, гóнɛй, грóшай.

Падобных канчаткаў у родн. скл. м. р., як кòні, грòшы (зам. коні*й*, грошы*й*), у гаворках раёну не спатыкаецца.

Давальны скл. у мужч. і ніяк. родзе пад націскам мае канчаткі *-ом* (у͡ом),*-ём* (ю͡ом), а бяз націску *-ам* (-ям): жанцу͡ом Красн., валу͡ом Дан., брату͡ом Як. Сл., зяцю͡ом Майс., кавалю͡ом ib., краю͡ом Дубр., каню͡ом ib., аднак людзя̀м. Жан. р. у тым-жа склоне мае толькі канчаткі *-ам, -ям:* ха̀там Слаб., вéрам Дан., дачка̀м Слаб., касьця̀м ib., саня̀м ib., кішэ̀ням.

Таксама і *месны скл.* мужч. і ніяк. р. мае пад націскам канчаткі *-ох* (-у͡ох), *-ёх* (-ю͡ох) а бяз націску *-ах,-ях:* ў кусто̀х Вас., па куско̀х Пак., па садо̀х Дубр., ў садо̀х Як. Сл., жывé пры бацько̀х Дан., ў другіх краёх ib., ў Растанёх Коўц., у варóцɛх Дабр. (ў песьні), ў бóтах, на калéнах, ў сéнцах, ў ла̀пцях, аднак „хо̀дзіць на часа̀х" Дан. (гаворыцца аб цяжарнай жанчыне перад родамі). Жан. р. незалежна ад націску мае канчаткі *-ах, -ях:* па старана̀х, Дубр., ў галава̀х Дан., пры жанкáх, у саня̀х (і ў сáнях), ў гру̀дзях (і ў грудзя̀х).

У *творн. скл.,* побач з канчаткамі для ўсіх радоў *-амі, -ямі,* яшчэ спатыкаюцца канчаткі *-мі,-ыма,-іма:* з кóньмі, з дрыўмí Дан., плячмі ib., дзьвярмí, сьлязьмí, з курмі, са̀ньмі, плечы̀ма Прат., пад дзьверы̀ма ib., грашы̀ма Дан. У в. Васілёўцы маем канчатак *-амы*: рука̀*мы,* нага̀м*ы,* дзéўка*мы*. У суседняй в. Краснаўцы падобнай зьявы не наглядаецца: гу̀ска*мі*, лɛбёдка*мі*.

Разгледжу ўрэшце зьмены пры скланеньні іменьнікаў ніякага роду з канчаткамі на *-а* ('а),*-мя,-яня* (ɛня). Наз. скл.: дзіця̀, ɛгня̀, куран*я̀*, ваўчан*я̀*, гусɛня̀, шчаня̀, а таксама курча̀, дзɛўча̀. *Родны, дав., месн. скл.:* дзіцяці, ɛгняці, кураняці, гусɛняці, ваўчаняці, шчаняці, курча̀ці, дзɛўча̀ці. *Творны скл.:* дзіцем, ягнём (і ɛгня̀м), куранём (і куран*я̀м,*) гусянём (і гусен*я̀м*), ваўчанём (і ваўчан*я̀*м), дзɛўча̀м [1]). *Мн. л., наз. скл.:* ɛгнятыі, куранятыі і г. д. Словы імя, полы*мя*, зернɛ зьмяняюцца наступным парадкам: *родн. скл.:* ім'я̀, по̀лымя, зѐрня., *дав. і месн. скл.:* ім'ю

---

[1]) Пар. укр. *дівчам, ягням* і т. п.

по́лымю, зѐрню, *тв. скл.*: ìмем, по́лымем, зе́рнем. *Мн. л., наз. скл.*: зɐрня̀ты (*ímя, полымя* ў мн. ліку ня ўжываюцца), *р. скл.* зе́рнят і зɐрня̀т і г. д.

Слова *сын,* як і наагул у белар. мове, у мн. л. мае сын*ы,* сынòў і г. д.

Варта яшчэ адзначыць скланeньне такіх слоў, як м а̀ ц і і а р г а н і́ с т ы. Наз. скл.: мà ці, р., д. і м. мà цɐры, тв. ма́цɐраю. Мн. л., н. с.: мацяркì, р. мацяро́к, д. мацɐрка́м [1]) і г. д.

Арганíсты таксама, як і К с а в э̀ р ы, Г і л я̀ р ы (шлях. імёны) скланяюцца па ўзору іменьнікаў, а ня прыметнікаў; р. с. арганíст*а*, Ксавэ̀р*а*; д. арганíсту, Ксавэ̀ру; мн. л., н. с.: арганíст*ы*, Ксавэ̀р*ы*, р. с. арганíст*аў*, Ксавэ̀р*аў* і г. д.

Слова к а м у н і с т ужываецца без канчатку *ы*.

Займенькі. Асабовыя займеньнікі *я, ты* ў родн.-вінав. склонах маюць мɐне (мяне́, менѐ), цɐбе́ (а таксама сɐбѐ). Толькі ў в. Васілёўцы можна пачуць м*і*не́, ц*і*бѐ, с*і*бѐ. Адзначу скарочаныя формы *к се* (к себе) Дан. побач з *к са* (к сабе) Медзьв. — воклiк на валоў пры араньні, працілежны *бліж* (бліжай). Пры адсутнасьці ў жывых беларускіх гаворках у дав. скл. формы с*е*бе энклітычнае *к се* (з с*е*бе) набывае вялікую цікавасьць для гісторыі беларускай мовы, бо гэта форма, як традыцыйна-тэхнічнае слова, магла вякамі перадавацца з пакаленьня ў пакаленьне ў земляробчай краіне, якою зьяўляецца Парыцкі раён. [2]).

Займеньнікі *ён, янà, янò* ў месн. скл. маюць ў *і*м (м. і н. р.) Медзьв., ў *ём* Дан., ў *ёй* ib., і ў *ей* Чэрн.

Паказальны займеньнік *гэ̀ты* ва ўсім раёне вымаўляецца, як *э̀ты, э̀та*. Праўда зрэдку спатыкаецца і варыянт *э̀сты* Слаб., гэ́тага ib., гэ̀такага Вас., гэ̀ты Майс. Апошняя форма ў шляхецкіх гаворках спатыкаецца часьцей. Г э н ы ў раёне зусім ня ўжываецца. Займеньнік *еты,* служачы ў сказе азначэньнем, можа мець і поўную форму: э̀ т а я хà та Дан., э́ т а ɐ дзіцѐ ib., аднак „я э́ т *а* сказà ў“ Майс. Вельмі пашыраным у паўднёвай часьці раёну зьяўляецца займеньнік *вацѐты,* зложаны з *вот+еты:* в а ц э́ т а е яйцэ̀ Рам., му в а ц э́ т а пашлí ў грыбў Слаб.

Займеньнікі *э̀ты, вацѐты* скланяюцца наступным парадкам: родн. скл.: э́тага чалавэ́ка Красн., э́тɐ Юстыні Бял., етай дзэ́ўкі Дан.; він. скл.: э̀ты, э̀тага, э́ту, э̀тую, вацѐтую; тв. э̀тым, э́таю, вацэ́таю: месн. ў э̀тым дòмі Дан., ў э̀там сà дзі Прат., ў э̀тɐм по́лі Дубр., ў э̀тай ха́ці Пак., ў э́туй сва́ці Прат.

Займеньнік *той* (тà я, то́ɐ) ў родн. скл. мае таг*ò*, с таé пары Дан., тэй ib., той; таéй; дав. тамў, той; він. таго́, ту́ю; творн. тым, тòю, тэ̀ю, таéю; месн. тым Дан., на том ре́зу Дубр., ў той ха́ці Слаб. Кароткія формы займеньніка *той* ужываюцца толькі ў выражэньнях: а-то („маўчы, а-то яг дам, дак і крòўю ўмыесься“ Дан.), такí-то, нікалí-то, тò-бо-тò (то-ба-то), тò-бо-тò-што (то-ба-то-шта). Апошнія два выражэньні ўжываюцца ў пацьвярджальным сэнсе. „Ў по́ру я скìдаў стажо́к се́на, а-то гнілó-б у кòпах“, кажа адна асоба. „То́-бо-тò“ (то-ж-бо-то, то-бо-то-што), пацьвярджае другая.

---

[1]) У грам. Я Лёсіка ў дав. скл. мацярк*ам*.

[2]) Форму *к се* нельга не паставіць у сувязь з прызыўным воклікам на быдла *псе, псе*, дзе *к* зьмянілася на *п*, уступаючы лёгкасьці артыкуляцыі і імкненьню мовы ўнесьці розьніцу ў значэньне, хоць, як прызыўны воклік на валоў, існуе і *ксё, ксё!* Дан.

Займеньнік *сей* ўжываецца толькі ў выражэньнях „то́ɛ-сёɛ“, „ні то̀ɛ-ні сёɛ“, а таксама ў слове „сайча́с“, „сɛйча̀с“, „сыча́с“.

Прыналежныя займеньнікі *мой* (мо̄й, маѝ, маѐ і маё), *твой, свой* скланяюцца наступным парадкам: родн. майго́, твайго́, свайго́ (зрэдку можна пачуць і магó, твагò, свагó Дубр.): маé, твае́, сва́е хаты, маéй, твае́й свае́й; дав. маймў, твайму̀, свайму̀; маéй, твае́й, свае́й і маёй, твaёй, свaёй; творн. маім, твaім, свaім, маéю, твае́ю, свaю̀ (і свaёю); месн. маéм, маём (і маім), твaю̀м, твaём (і твaім), свае́м, свaём (і свaім); маю̀й, твaю̀й, свaю̀й (і маёй, твaёй, свaёй — у маладога пакаленьня). Назоўны скл. мн. л. для ўсіх радоў *маѐ*, родн. маіх і г. д.

Займеньнікі *наш, ваш* у жаночым і ніякім рад. маюць, побач з кароткай, і поўныя формы: на́шая ха́та Дан., ва̀шаɛ по́лɛ ib. Поўная форма спатыкаецца і ў наз. скл. мн. л.: на̀ш*ы* хло́пцы і на́шыя хло̀пцы Майс.

У паўднёвай часьці раёну можна пачуць *на̀ські, на̀ськая, ва̀ські, ва̀ськая* Слаб.

Спатыкаецца таксама *jіхны, jіхная, jіхнаɛ* Пал.

З пытальных займеньнікаў адзначу *чый* (чыя, чыé, чыё). Родн. адз. л. чыйго̀, чыé, чыю̀й; дав. чыймў, чыéй; тв. чыім, чыéю (-ёю); месн. чыім, чыéм (чыём), чыю̀й (чыёй). З форм іншых пытальных займ. адзначу: па чо̀м прадаю̀ш абара́нкі, у ка̀го̀ ты буў Слаб. побач з ні ў ко̀га („ні ў ко̀га німа̀ агню̀“ Дан.). Ад пытальнага займ. *хто* ўтвараецца азначальны *хто̀цкі* (гл. Слоўнік).

Займ. *като̀ры* звычайна ўжываецца, як пытальны, для азначэньня ліку: к а т о р ы дзеўцы год? Як адносны, апошні займеньнік блізка зусім ня ўжываецца, — яго заступае займ. *які*.

Адзначу таксама займ. *чы̀мся:* ч ы м с я сядзѐць, пашо̀ў бы лепш дро̀вы сѐкці Дан.

Азначальныя займ. *ўвесь, ўся, ўсе*. Форма *ўсё* для ніяк. р. адз. л. ня ўжываецца. Родн. склон: ўсяго́, ўсяе́ („ўсяѐ таé тугі, што жо̀нка ня дў̀жа“ Пак.), ўсей, ўсёй. Наз. мн. для ўсіх радоў *ўсѐ*. Адзначу таксама ка̀жны і ко̀жны. Займ. „усɛля̀кі“ ўжываецца рэдка. Ад займ. „сама̀“ він. адз. л. будзе „самў̀ю“. Займ. „сам“ дапускае вытворныя формы *самѐнькі, самю̀сенькі*.

З неазначальных займеньнікаў адмечу *нѐхта, нѐшта,* нѐйкі (нéйкая, нѐйкаɛ), нѐйчы (нéйчая, нéйчаɛ). Першыя два займеньнікі дапускаюць вытворныя формы: нéхтачка, нѐштачка („хадзі сю̀ды, я табе нéштачка пакажў“ Дан.). Падобныя-ж вытворныя формы дапускаюць і адмоўныя займеньнікі *нікòга, нічòга:* нікагýтка, нічагýтка, нікагў̀ткі, нічагýткі, нікагéнька, нічагѐнька, нікагў̀сенькі, нічагў̀сенькі („Ўсе кро̀шкі пазьбіра̀ў — нічагў̀сенькі ні пакінуў“ Майс.).

Лічэбнікі. Лічэбнік *адзін, адна̀, адно̀* скланяецца, як займ. *той, тая, тое,* а менавіта: родн. скл. адз. л. аднаго́, аднаé, аднóй, аднэ̀й; дав. скл. аднаму̀, аднòй, аднэ̀й; він. аднаго̀, аднў̀; тв. адны̀м, аднòю, аднэ̀ю; месн. на аднòм гаду̀ Дубр., аднымы̀ (шл.), аднòй, аднэ̀й. Наз. мн. л. для ўсіх родоў аднымы̀, р. аднымы̀х і г. д.

Пры адмоўнасьці *ні* ў знач. азначальнага займ. ўжываецца *нігòдзін, нігòдны, нігòдная, нігòднаɛ*. Родн. нігòднага, нігóднаɛ, нігòднай і г. д.

Два, дзьве. Родн. і месн. скл. двох, дзьвох, дзьвёх і дзьвюх (шл.); дав. двом, дзьвом, дзьвём, дзьвюм; він., як наз. або родны; тв. двама́ дзьвама̀, дзьвюма̀.

Абòдвы, абòдва, абымдва, абѐдзьве, абёе (Слаб.). Родн. скл. абóдвых, абымдвух, абéдзьвіх, абéдзьвюх, абéдзьвух, абéіх; дав. абòдвым,

абы́двум, абе́дзьвім, абе́дзьвюм, абе́дзьвум, абе́ім, тв. або́двымі, абы́двумі, абе́дзьвімі, абе́дзьвюмі, абе́дзьвумі, абе́імі.

Тры, чатыры. Р. і м. трох, чатыро́х; д. тром, чатыро̀м; він., як наз. або род.; тв. трымà, чатырмà.

П'яць, шэсь, восім, дзесѣць, дваццаць. Р. і м. скл. пяцёх, шасьцёх, дзесяцёх, дваццацёх; дав. пяцём, шасьцём, дзесяцём, дваццацём; тв. пяцьмà, шасьмà, дзесѣцьмà, дваццацьмà. Формы р., д. і м. скл. пяцì, шасьцí, дзесяцí, дваццацì пераважна ўжываюцца ў жан. р., як прыметнікі.

Сорак, дзевяноста (ад старых людзей можна пачуць і дзе́вѣцьдзесят Слаб., Дан.), *сто.* Р. скл. сарака̀, саракí[1]) („німà саракì гадо́ў" Чэрн.), дзевяно̀ста, ста; д. сарака́м, сарака̀, дзевяно̀стам, дзевяно̀ста, стам, ста; тв. сарака́мі, саракма́, дзевяно́стама, ста̀ма, ста̀мі; м. сарака́х, дзевяно́стах, стах.

Лічэбнікі адзіна́ццаць, дзвана́ццаць і пад. ў шляхецкіх гаворках часта вымаўляюцца, як адзінà*н*цаць, дзванà*н*цаць і г. д. У сялянскіх гаворках вымаўленьне літаратурнае.

З *дробных* лічэбнікаў варта адзначыць паўтраця̀, паўпята́, паўсема́ і інш.

Адзначу таксама *зборныя* лічэбнікі дво̀е, тро́е, тро̀ечка, чэцьвера, п'я̀цера, п'я̀церка, шѐсьцера, шѐсьцерка („А-а, а-а, Не́сьцерка! А на лета шэ̀сьцерка" Дан.), се́мерка і г. д. Ужываюцца таксама чацьвёра, пяцёра, шасьцёра; дво̀йчы, трэ̀йчы.

Парадкавыя лічэбнікі пѐршы (сяляне звычайна гавораць пе́рвы, а шляхта пѐршы), другí, трэ̀йці, чацьво̀рты (чацьве́рты), п'я̀ты скланяюцца, як прыметнікі.

Прыметнікі. Прыметнікі няпоўнай формы звычайна ўжываюцца ў прэдыкатыўнай ролі: до́бры сват сабакі варт ус., і ты ні дабёр Дан., мая́ до̀ля дабрà Чэрн., ўсе ро̀ўна, ці ѐнà (песьня) но̀ва, ці ѐнà стà ра Казл., ўсяѐ ма́е загу̀дачкі, што до̀ля нішчà сна Пак., калì вíнен, аддà ць павíнен Іст., што-ж я вінава́т, што мой ба̀цька кілавà т Коўц. У гэтых выпадках, асабліва ў шляхецкіх гаворках, можа ўжывацца і поўная форма: хібà я вінавà ты? Майс.

Радзей няпоўныя формы выступаюць у ролі атрыбутыўнай. У гэтым сэнсе адмечу: дро̀бен дож Чэрн., мне маладзе́ спà ці ні даю̀ць Пак., а таксама нявѐшчын, дзе́ўчын, сьвякрўшын, ба́цькаў ус., Верындà р (назва мясцовасьці — Верын дар), Сà вíны ляскì Дан. Аднак апошняя катэгорыя няпоўных прыметнікаў у іншых склонах ужываецца ў поўнай форме: Рыго́равага валà Чэрн., ў нявé шчыным кўфры Дан., цёччынага канѣ Слаб. Толькі ў вінав. скл. маем Мікалà ева бо̀ты Майс., бà цькаву ша́пку ib., хоць *у* ў апошнім прыкл. магло зьявіцца фонэтычным шляхам з поўнага канчатку.

Ужываюцца няпоўныя формы і як эпітэты ў песеннай мове: не хадзì ты бел-кудрà вы Пак., чо̀ран во̀ран Зааз.

Цікава яшчэ адмеціць захаваньне няпоўных форм пры назвах валоў у знач. імёнаў уласных: Бур, Лыс, Раб, Рыж, Падлà с, Палó ў (палавы), Сіў, Гнед (усюды), хаця ўтварыліся гэтыя формы відаць з поўных форм; у час ворыва, як каманда, няпоўныя формы зьяўляюцца найбольш простымі для аратага.

У канчатку поўных форм мужч. р. на-*ый* у наз. і вінав. скл. адз. л. м. р. адпала *й*: до́бры, благí, ахво̀чы, сіні (ўсюды). Аднак у

---

[1]) Утварылася гэта ф. па аналёгіі з дваццаці, трыццаці і г. д.

тых гаворках, дзе пасьля губных *ы* перайшло ў *у*, канчатковае *й* захоўваецца: ах ты, сва́це, дамаву*й*, да несі́ ты лазьбѐнь медаву*й* Дубр. У жан. і ніяк. р., з прычыны выпадзеньня *j*, што для гаворак гэтага раёну зьяўляецца характэрным, наглядаецца сьцягваньне дзьвёх аднакіх галосных у адну: у наз. скл.: чуж*à* ха́та ні сваѝ Пак., яго ро́дн*а* мàці ib.; у він. скл.: купіў до́бру каро́ву Дан., ў бы́стру ракў Бял., дзераве́ньську ўзяў Слаб., забалѐла цѐла ясне́цка*ɛ* бѐл*а* Чэрн. Зьява гэтая не абсолютная, — побач з сьцягнутымі формамі могуць ужывацца і поўныя: сьцѐлюць пасьцѐль бе́леньку*ю* і трунў цясо́ву Дабр., узяў сабе бе́лую лябёдачку ib.

Скланеньне поўных прыметнікаў. Наз. скл.: кленó вы лісточак Чырк., баговò*ɛ* со́нейка Пак., атцòўськая дачка Чэрн., р. скл. кленó вага лістóчка Чырк., дòбраго чалаве́ка (шл.), з нóвае хàты Дан., нѝма нàшай бе́лае лябёдачкі Дабр., з дòбрай аўцы́ во́ўна Слаб., дав. до́браму чалаве́ку Майс., бе́лай лябёдаццы Дабр., багàтуй гаспады́ні Дан.; він. дòбру ха́ту паста́віў Дан., сінюю хўстку Казл. Раз спаткалася (ў песьні) „халоднўю-то (расу) сьвёкарку, салóдка*ю*-то тàтачку“ Пак.; тв. з дòбрым чалавѐкам ус., залатòю ме́ччу Дан.; месн. скл. м. і н. р. У шляхецкіх гаворках заўважаецца канчатак-*ым* (-ім), а ў сялянскіх-*ом* (-ам), *-ем*: у Вялѝкім По́лі Майс., у бе́лым сьве́ці Медзьв., ніхто па том це́лу па ясьнѐцкам бе́лам, ніхтò не пажўрыцца Чэрн., ў вішнёвенькам садў ib., по вусо́кам бѐразі Чырк., на ко́ніку варанòм Дабр., на нашам на шыро́кам вòзɛры ib. ў глухòм лѐсе Прат., аднак на сàхарным заво́дзі Чэрн., на цісо́вум мо́сьце Зааз., дзе *ў* пасьля *в* зьявілася з *ы* фонэтычна. У жаночам р. пераважаюць канчаткі *-ой* (-ай): ў старо́й хàці Казл., на чо́рнай карòві Пак. Толькі ў паўднёвай часьці раёну і ў шляхецкіх гаворках пры адсутнасьці націску на канчатку маем *-уй* (-юй): ў бага́туй гаспады́ні Майс., ў дòбруй хàце Прат., ў сінюй ху́сцы ib.

Ступені прыраўнаваньня. Звычайным спосабам утварэньня ступеняў прыраўнаваньня зьяўляецца даданьне да прыметнікаў слоў *вельмі, самы*: вѐльмі до́бры, сàмы то́нкі. Пашыраны таксама формы ўтварэньня ступеняў прыраўнаваньня пры дапамозе суфіксаў *-ейш(ы), -эйш(ы), ш*: любѐйшы Майс., цежэ́йшы Чэрн., крапчэ́йшы Дан., ляхчэ́йшы ib., старэ́йшы Коўц., молòдшы Слаб., харо́шшы Рам., шы́ршы Пар. Утварэньне ступеняў прыраўнаваньня пры дапамозе прыстаўкі *най*(на) мне спаткаўся толькі адзін раз—напрамѝлы бог Коўц.

Дзеяслоў.

Дзеяслоўныя асновы. З асаблівасьцяй дзеяслоўных асноў адзначу наступнае.

а) Дзеяслоўныя асновы інфінітыву з суфіксам *-ава* пры націску на апошнюю галосную асновы ў сялянскіх і шляхецкіх гаворках: шанавàць, ратавàць, плɛвàць, злавàць, кава́ць, таварышава́ць і інш.

б) Асновы інфінітыву ў сялянскіх і шляхецкіх гаворках з суф. *-ува* пры націску перад суфіксам: дзя́куваць, пе́туваць, ве́руваць, палу́днуваць, завíдуваць, зьдзѐкуваццa, прòбуваць, камàндуваць, падвячо́ркуваць, бясе́дуваць, дзе *у* з *а* магчыма зьявілася фонэтычным парадкам пад уплывам наступнага *в*, які гук, як вядома, у гаворках раёну зусім блізкі да *ў*. Адмечаныя ў іншых мясцовасьцях Беларусі асновы з суфіксам на *-ува* пры націску на апошнюю галосную, як, напр., кувàць,

сну*в*а̀ць, зл*ув*а́ць, ша*н*ува̀ць у гаворках Парыцкага раёну не спатыкаюцца [1])

в) Аналёгічнае ўтварэньне ў сялянскіх гаворках асноў папярэдняму на *-ува* пры суфіксе *-іва (-ыва)* з пераходам націскнога *о* асновы ў *а:* падгава́руваць Слаб., зака̀шуваць ib., раска́зуваць Пак., пера-кру̀чуваць Вас., патпі́люваць Чэрн., падгу̀люваць ib. і наагул ва ўсіх сялянскіх гаворках раёну.

г) Асновы ў шляхецкіх гаворках, як і ў літаратурнай мове, на *-ва* пры суфіксе *-іва* (-ыва) з захаваньнем націскнога *о* асновы (усюды): падгаво̀рваць, зако́шваць, прыно́шваць, раска̀зваць, перакру̀чваць, патпі̀льваць, падгу̀льваць і інш.

д) Пры зьбегу некалькіх зычных перад суфіксам асновы *-ва* ў шляхецкіх гаворках зрэдку спатыкаюцца асновы і з суфіксам -і*ва* (-ыва): завò*стр*ываць, перадра̀жніваць, аднак завѐршваць. У сялянскіх гаворках і ў гэтым выпадку будзе суфікс асновы *-ува* (зако́струваць).

е) Асновы ў сялянскіх і шляхецкіх гаворках з суфіксам *-оўва* (з *-овыва)*: распытò*ў*ваць, зако́*ў*ваць, прыслухò*ў*вацца. У шляхецкіх гаворках спатыкаецца і прысл*ў*х*ва*цца ад прыслух*іва*цца. У сялянскіх гаворках суфікс *-оўва* відаць утварыўся з прычыны асыміляцыі *в* наступнаму *у;* такім чынам прыслуховуваццa > прыслухowуваццa > прыслухоўуваццa > прыслухоўваццa.

ж) Дзеясловы з суф. асноў на *-ва (-ува), -оўва* часта замяняюцца дзеясловамі блізкімі па сэнсу з суфіксам *-а̀* (-я̀) (націскнымі): прыслухо́ў*в*ацца—прысл*ў*хваццa—прыслуха̀ццa, выдў̀мваць—выдумò*ў*ваць—выдумля̀ць, упрò*ш*ваць—упра̀шуваць—упрашà̀ць, выхва̀льваць—выхва̀люваць—выхваля̀ць, а таксама запэ*ў*ня̀ць, перабля̀ць, вынішча̀ць, запада́ць і г. д.

з) З іншых асаблівасьцяй дзеяслоўных асноў адзначу: п'явак налав*а̀*ла Дубр. (пэўна па аналёгіі з іншымі дзеясловамі), напав*а̀*ці Чэрн., прашчава́й ус. (прашчай), па́сьвіць і па̀сьціць, стрэць, мяне пацѐгла, лес загў̀ў і інш.

Інфінітыў пры аснове на галосны канчаецца на *-ць*: спаць, пісà̀ць, рабі́ць і г. д. У песеннай мове, як звычайную зьяву, можна спаткаць у гэтым выпадку інфінітыў і на *-ці*: спà̀ці Пак., бу́дуць бі́ці гультая̀ ib., ён пі̀ці ні п'е Красн., узя̀ці Чырк., ні бу̀ду тугі́ задава̀ці Чэрн., пѐці Рам. Пры аснове на зычны інфінітыў канчаецца на *-ці*: не́сьці, вѐсьці, скў̀бці, раў̀ці, памѐрці, пабѐгці, се́кці, лѐгці, стры̀гці, пякці́, магці̀. У апошніх выпадках, калі апошняя зычная асновы інфінітыва будзе *к* ці *г,* мягчымы, хоць і радзей, канчаткі на *-чы*: се́кчы Дан., прыле́гчы Майс., магчы̀ ib.; пры гэтым *к, г* у іншых дзеяслоўных формах перад тэматычнымі *е, і* пераходзяць у *ч, ж*: пя*ч*э̀ш, пя*ч*ы̀, ся*ч*ы̀, бя*ж*ы̀ш, бя*ж*ы̀, ля*ж*ы̀ш, ля*ж*.

Зваротны займеньнік *ся* разам з папярэднім канчаткам інфінітыву даюць *-цца* ў сялянскіх гаворках (мў̀цца Слаб., прасі̀цца ib.) і *-цьця, цьцɛ* ў шляхецкіх: мы̀цьця, прасі̀цьця, стара̀цьцɛ, што становіць істотную адзнаку апошніх гаворак. У іншых формах дзеяслова *ся* пад уплывам еканьня можа пераходзіць у *сɛ, се* (ра̀дуйсɛ Чэрн., пазабуа̀ласе ib., баі́сьсе Прат.), не скарачаючыся аднак, як і ў літаратурнай мове, у *сь.*

Спражэньне нетэматычных дзеясловаў *даць, есьці.* Адз. лік. 1 ас. дам, ем; 2 ас. дасі́, прадасі̀, ясі̀; 3 ас. дась, прада̀сь, есь. Мн. л. 1 ас.

---

[1]) Е. Карский. Белоруссы. т. II, ч. 2, стар. 70.

дадзім, прададзім, ядзім; дамо́, ямо̀ (шл.); 2 ас. дасьцѐ, прадасьцé, ясьцé; 3 ас. дадуць., ядзя̀ць ус.

Дзеяслоў *ёсьць* у сялянскіх гаворках не сустракаецца: замест гэтага маем *ё* Бял., *е* Пак., есь ib., éсɛка ib., Слаб. Чэрн., Дубр. Шляхта звычайна гаворыць *е,* ест.

Дзеяслоў *мець* спрагаецца наступным парадкам: маю, ма́ɛш, ма̀ɛ, ма̀ɛм, ма̀ɛцɛ, ма̀юць; маў, ма̀ла. Мéў, мɛ́ш і г. д. спатыкаецца радзей.

Пры асновах з суфіксам *-ів* дзеясловы ў цяперашнім часе ў сялянскіх і шляхецкіх гаворках спрагаюцца наступным чынам:

	Сялян. гаворкі.	*Шлях. гаворкі.*
Інфін.	раскà̀зуваць, патпíлюваць	раскà̀зваць, патпìльваць.
	Адзіночны лік.	
1 ас.	расказую, патпілюю	расказваю, патпìльваю
2 ас.	расказуеш, патпілюеш	расказваеш, патпільваеш
3 ас.	расказуɛ, патпілюɛ	расказваɛ, патпільваɛ.
	Множны лік.	
1 ас.	расказуем, патпілюем	расказваем, патпільваем
2 ас.	расказуɛцɛ, патпілюɛцɛ	расказваɛцɛ, патпільваɛцɛ
3 ас.	расказуюць, патпілююць	расказваюць, патпільваюць.

Дзеясловы з асновамі на *-ува* ў шляхецкіх гаворках спрагаюцца падобна да папярэдняга ўзору дзеясловаў на-*ува* ў сялянскіх гаворках: зьдзéкувацца, зьдзéкуецца, зьдзéкуесься і г. д.

Спражэньне тэматычных дзеясловаў *нѐсьці, вѐсьці, крычà̀ць.* Адз. л. 1 ас. нясу̀, вяду́, крычу̀; 2 ас. нясі, вядзі, крычы̀; 3 ас. нясе́, вядзе́, крычы̀ць. Мн. л. 1 ас. вядо̀м, чаўпо̀м Красн., нясо́м Пак., дажно̀м ib., жыво́м Вас., Чырк., паля̀гам Чэрн., бу́дам Дубр., за̀ймам Чырк., адзѐнамся Дан., мо́гам Вас., вѐрнамсɛ Зааз., по̀йдам Слаб., крычы̀м, маўчы̀м, баímся, стаім ус. Можна пачуць і стаім*о̀* Дан., лажы̀м*а*ся Дабр., асабліва ад старых людзей; 2 ас. несяцé, ведзяцé, крычыцé, стаіцé; 3 ас. нясу́ць, вядуць, крыча̀ць, стая̀ць. Адхіленьне спаткалася ў в. Васілёўцы: гавòра, ко́нча, ро́бɛ, бу̀дзіш, пяіцѐ, ко́с*ю*ць, но́с*ю*ць. Форма тыпу „гавора“ спаткалася яшчэ ў в. Палянках.

Дзеясловы ды̀хаць, шчыпа̀ць спрагаюцца падобна да дзеясловаў капа́ць, іграць: ды̀хаю, шчыпа́ю, ды̀хаеш, шчыпа̀еш; заг. л. ды̀хай, шчыпа́й („ні шчыпа̀йся!“).

У *будучым часе,* побач з формамі бу̀дам рабіць, пачнѐ клéсьці, хо́чу ѐсьці, спатыкаюцца формы і рабі̀ціма̀м Дубр., калòцьмецца Рам., пѐцьмем Чэрн., жа̀цьму Дан., касіцьмеш ib., рабіцьме Слаб., дзе вы касíцьмɛцɛ? Майс., калі йці̀муць дзѐўкі, скажы̀ мне ib. [1]).

Адзначу рэшткі даўномінулага часу (plusguamperfect'у): но́жык быў загíнуў, але знашо̀ўся Дан., ɛна̀ була̀ захварэ̀ла, а по̀сьлɛ ачу̀нɛла Слаб., ямў было прынакўчыла завіва̀ючы (кудзеркі) Бял.

З асаблівасьцяй умоўнага ладу спаткалася падвойнае *бы* (б): я еў бы-б, штоб далі Дан., каб прымѐў, дак разарва̀ў бы-б ib., хадзіў бы-б ib.

---

[1]) Значнае пашырэньне гэтых фф. на тэрыторыі Беларусі гаворыць як супроць думкі Шаровольскага аб румынскім пахаджэньні гэтых фф., так і супроць думкі аб украінск. пахаджэньні гэтых фф. на белар. глебе, гл. Зап.-Іст.-Філ. Відд. УАН., XIII-XIV ст. 284—293 і рэц. Дэм'янчука, id. XVIII, ст. 313—317.

Загадны лад. У дзеясловах 2 ас. адз. л. адхіленьняў ад літаратурнай мовы бадай няма. Пры асновах на зычны канчатковае *і* не пад націскам адпала, і такім чынам тут канчаткаў зусім няма: еж, рэж, ляж, кінь, дунь, разяў, адды̀ш, вы̀жань, вы̀ведзь, вўедзь Слаб., сустрэ̀нь, павéнь, ні руш, аднак зрабі, атступі, палажы̀ (пад націскам). Канчатак 2 ас. *й* ад асноў на галосны можа зусім зьнікаць: пі, бі, ві, лі.

Мн. л. 1 ас., як і ў літаратурнай мове, пасьля галосных мае канчатак *-м* з папярэднім *е* (дыфтонгічным або з *ъ*): хадзем, скажэ̀м, нясéм, вядзéм, пячэ̀м, лажэ̀мся, а пасьля зычных *-ма*: пéйма Вас., усы̀пма Пак., запéйма Як. Сл., пастраля̀йма Дан., рэ̀жма ib., э̀жма Вас., éдзьма ib. Нетэматычныя дзеясловы ў шлях. гав. канчаюцца на *-мо*: паямо̀ Дан., аддамó ib., прадамо̀ ib.

Канчаткамі 2 ас. зьяўляюцца *-іцɛ* (-ыцɛ) ў сялянскіх гаворках і *ецɛ* (з дыфтонгічным *е*) ў шляхецкіх. Канчатак *-іцɛ* ў сялянскіх гаворках строга вытрыманы: скажицɛ Вас., глядзіцɛ Пак., ідзíцɛ Дабр., садзіцɛся Слаб., жніцɛ ib., пíцɛ ib., сɛдзіце Рам., ведзіце Чэрн., ву пасɛдзíцɛ Дубр., ні ржы̀цɛ Чырк., разьнесі̀цɛ ib., накажы̀це Як. Сл., занесі̀це ib. Толькі ў в. Заазер'і можна пачуць канчатак *-еце* (сечы̀эце), але жыхары гэтай вёскі высяленцы з другога (Глускага) раёну. З другога боку ў шляхецкіх гаворках, асабліва ў старэйшага пакаленьня, зьяўляецца вытрыманым канчатак -ецɛ́ (-ѣцɛ): скажы̀эцɛ Майс., вязѣцɛ ib. Маладое пакаленьне шляхты пад уплывам расійскай мовы ўжывае канчатак і *-іце*.

З ас. адз. і мн. л. ўтвараецца пры дапамозе апісовых форм: ніхáй прынясé, ніха̀й прынясýць, каб цябе кадўк узяў Дан., каб твой род пераўёўся ib., н і х а й б ы в ы п р ы ш л і к нам пагуляць Майс.

Дзеяпрыслоўі на *а* спаткаліся: бяжы̀ як м а г á хуччэ̀й Дан., с м а т р а̀ як зро̀біш Чырк. Дзеяпрыслоўі на *чы, шы* ў ролі прэдыкатыўнай: ён быў п а д п і ў ш ы Дан. Цікавы такі зварот: „Ой морóз, морóз! не зморо̀зь менѐ с похо̀ду й д у ч ы̀, коня в е д у ч ы̀, збро́ю н е с у ч ы̀“ Чырк. Гэты зварот вядомы і ў украінск. мове (гл. О. Курыло. Уваги до сучасн. укр. літер. м., 3 выд., 1925, 34 ст., у якой знаходзім нават гэты самы песенны ўрывак).

Дзеяпрыметнікі на *чы, шчы, шы* ўжываюцца ў ролі атрыбутыўнай, як звычайныя прыметнікі: лɛжáчы ўс., стаячы ўс., с л у ж а̀ ч ы хлеб сабачы Дан., т р у д з я̀ ш ч а я жэ̀ньшчына Пак., завалячы Майс., праклятýшчы ib., р а б а ц я̀ ш ч ы хлапѐц Дан., ɛнá ўжэ дзéўка н а с т а я̀ ш ч а я ib., н а с т а я̀ ш ч ы дож пашóў ib., н е п é ў ш ы ɛ дзѐўкі Чэрн.

Дзеяпрыметнікі залежнага стану могуць ужывацца з канчаткамі *-ты* і *-ны*: р а с к о́ л а т а ɛ палéна Дан., расьцягнуты ib., набіты ib., палòманы ўс., папсавàны Майс. (з націскам на суф. *а*).

Нязьменныя часьціны мовы.

Прыслоўі. Кудыы̀, тудыы̀, сюдыы̀ ўс., кудэ̀ю, тудэ̀ю, сюдэ̀ю ўс., нігдзé Дубр., дзе Рам., Дабр., Дан. (ў большасьці бяз *г*), дадóлу ўс., дадо̀му ўс., далóў ус., дамóў ус., ўпрóчкі ўс., нарўжку Пак., аткýль ус., аттўль ус., атсю̀ль ус., калі ус., калі̀сь ус., нéкалі ўс., дакўль ус., пакуль ус., пасю̀ль ус., патýль ус., дасю̀ль ус., тадыы̀ ўс., сьпɛрвà Дабр., ўжэ ўс., баржджэ̀й ус., сягóдня ўс., ўзíмку ўс., ўлéтку ўс., лѐтась ус., пазалéтась ус., сяго̀лета ўс., ра̀ньшай Чырк. і наагул у сялян. гав.; у шляхецкіх раньш, ранéй Мас.; цѐперся ўс., цяпéрака ўс., по̀тым Дубр., іно̀ды Медзьв., ўза̀ўтры ib., напасьлéдак Слаб., по̀ўначы ўс., дармà і дармо̀ ўс.,

лѐжма ус., сѐдма сядзѐць ус., вàлма вàліць Майс., стойма стаѐць Дан., кéпска (шл.), гóдзі ўс., наўгадьі Дубр., нігàткі Дан., німалàд за што набіў Казл. (намалàду Дубр.), мне й ніўпàмкі Дан., нібынàмкі ib., пéшкі ўс., стрàшка ўс., бò=зка ўс., трэ̀ба ўс., багàта людзéй сабрàлася Дан., шмат Красн., харашэ̀ Слаб., нѐльга ўс., ўмѐсьці Дабр., насýп=рак Дан., абѐруч ус., абéручкі, трòхі ўс., дагарьі ўс., дýба ўс., басанòж ус., вéльмі ўс., дўжа ўс., моцна ўс. (мосна Чэрн.), ўпрьіс=дкі ўс., ўпѐрак Чырк., ўлéгцы ўс., слàбка ўс., зноў Пак., ізнòў Дан., канéшне ўс., вѐрне ўс., мáрне Майс., жалòсьне ib., папàньську Слаб., гаварыў-бы папòльску, да язьік кóнскі Дан., памужьіцку ib., паціхýсеньку Слаб., памалéньку Рам., вўшай ib., даўжэ̀й ус., багачэ̀й ус., багацéй Дан., таўсьцѐй ib., больш ус., бòлей ус., малóджай ус.; саўсім ус., сусім Дан. (зусім не гавораць); навьіп=радкі ўс., наўздагòн ус., навьіскачкі Дан., эгé (аге) па ўсіх вёсках (сял.); шляхта гаворыць агà або алѐ. Сяляне іншы раз перадражніваюць: алé—паéхалі на валѐ Слаб.; маўляў сял.; шляхта ў гэтым значэньні гаворыць бок (ён бок і не падума=е к табé прыці Майс.); альбò шл.; =йжа бòгу сял., не ýс., німà ўс., німàшака ўс., дзя̀куй, спасíба (рэдка; хто гаворыць спасíба, таму жартаўліва адказваюць: „пасі да й маíх займí“ (валоў, кароў) Дан.), мўсіць ус., відàць ус., змàлку дзён ус., нацянькі ўс., напрасьцікí ўс., бьідта Майс., наскрóзь ус., карчòм Дан., цалкòм ib., сілкòм ус., жыўцэ̀м Рам., нàшча ўс.; нòгцам ус., дабрáнач ус.

З *прыйменьнікаў* адзначу *праз* пóл= ус., *ля* шкòлы Чэрн. (звыч. гавораць кала, каля), брат да сястрьі піша Дан., паміж jімі ib., буў пада мнòю брат Дубр., каб із намі нí стракàліся Дан., сò сьмеху пакацілася Пак., аб яе ib., сувечара Дабр. Прыйменьнікі, як прыстаўкі: узгадавала ўс., адмалююць Майс., сакалéць (пар. літ сарганізаваць, а не з'арганізаваць), спаймàць Дан., спарадзíла Пак., спадманíць Майс.

Злучнікі: штоб ус., дак ус. (памрэ жòнка тáя, дак бýдз= другàя Пак.), алé ўс., як, ці (ці ты, ці і я), што (=каторы, які: а Салена—Магдалена, што за Юду пашла) і інш.

Часьціны: нàвет (шл.), нáват (сял.), ажнò ўс., аж ус., дайжа Чэрн., німа ў яго а нічога і інш.

Сынтакс.

Калі вышэй гаварылася, што ў фонэтычных і морфолёгічных адносінах сялянскія гаворкі як паміж сабой, гэтак і ў параўнаньні з шляхецкімі гаворкамі прадстаўляюць даволі такі відную розьніцу, то ў сынтаксычных адносінах гэтая розьніца самая нязначная, дзеля чаго можна гаварыць аб адзіным сынтаксу для ўсіх гаворак раёну. Дробныя адхіленьні будуць паказаны на сваім месцы.

Разгляд сынтаксычных зьяў пачну з безасабовых сказаў, пашыраных у мове раёну. Адзначу наступныя конструкцыі: пачалò мнé с чóўна выкідàць Красн., яго ўжэ пачалò забірàць Дан., чалавѐка зацíснула дзéравам ib., ну й распладзíлася ў Рыгòра прусакòў Майс., усюды пазмувала дажджэ̀м Слаб., саўсім нéшта разьнягòдзілася Іст., каб табе ні бà̀чыць дабрà, ні дзѐткам тваім Чэрн., годзí табé плàкаць Пак., ў ягò грóшай—куры ні клююць Пар.

Адмечу ў сьлед за Е. Карскім [1]) такія безасабовыя сказы, як прышлò пяцёх жанцоў, ішлі ў двòх ус., а таксама формальна асабовыя

[1]) Е. Карский. Белоруссы, т. II, ч. 3, стар. 49 і 56.

сказы: янò мòжа й дóбра былò паèхаць Дан., як той казàў, мòжа й прàўда Дубр.

Выказьнік можа выражацца дзеясловам ёсьць—быць: у яго éсɛка грòшай Слаб., буў тры днi ib., быў конь, да зьéзьдзіўся Дан. Як зьвязка, дзеяслоў ёсьць апускаецца: у мяне багáта клòпату Дан., маé дзіцятка забрàна Слаб., ў яго сiлы, як у камарà ib.

Адмечу таксама выражэньне сустаўнога выказьніка прыслоўем і інфінітывам: я качàна гýшкі-гýшкі, качáн мɛнé у падўшкі; я качàна абнімаць — качан мɛнé цалавàць Бял., я кажу яму стой, а ён наўцèкі Дан.

Прыметнікі сустаўнога выказьніка ў большасьці выпадкаў ставяцца ў поўнай форме: чалавéк ты йшчэ дýжы Красн., Рыгòрка саўсім малы Дан., ўвесь лес сьсéчаны ib., ты дзяўчына гожая Дабр., вострая ў цɛбе, бра, касà Чэрн. Няпоўныя формы ўжываюцца больш рэдка: хiцер Зьмiцер, да й Сàўка ні дурàк ус., і ты ні хвор паèхаць па сéна Дан., ён шыбɛніцы варт ib.

Адносна дапасаваньня дзейніка да выказьніка пакажу на наступныя выпадкі ў дапасаваньні па ліку:

1) Выказьнікі, выражаныя дзеясловамі зваротнага стану ўзаемнага дзеяньня, ужываюцца ў множн. ліку пры дзейніку адз. л.: Іван с Кузёмкам пабiлiся Майс., Агàта с Праксэдай пасварыліся Дан., аднак жыў дзядзька с плямéнікам Пак.

2) Выказьнік ўжываецца ў адз. л. пры дзейніку, выражаным лічэбнікамі пяць, шэсьць: с пàшы прыбéгла п'яць парасятак Дан., iшло дзесɛць чалавек Пар. Падобна да гэтага і пры дзейніку танок, які мысьліцца, як зборны іменьнік або колькасны лічэбнік, выказьнік ставіцца ў адз. л. і нават у ніякім родзе: па вýліцы гуляла танóк крàсных дзéвачак Дабр.

3) Выказьнікі ставяцца ў множн. л. пры дзейніках адз. л., калі апошнія азначаюць бацьку, матку, дзядзьку, цётку: тàта прыéхалі Майс., мама пашлi на пòле Іст. Апошняя зьява ўласьціва, як і назва бацькоў на *вы*, шляхецкім гаворкам. Сяляне яе ня знаюць, як і ў абыходжаньні з бацькамі ў большасьці ўжываюць *ты*.

Гаворачы аб асаблівасьцях у ўжыванні станаў дзеяслова, адзначу наступныя дзеясловы зваротнага стану: мой мiлы ў Тýрцаі іс тýркамі ваюецца Пак., слýхайся, хлòпча, бацькóў Майс., мы ўжэ трóхі абсéɛлiся Дан., карóва пабéгалася (папалявала) ib., грабiся, брàтка, на берэжòчик Красн., вот урэзаўся галавóю Коўц., папрасiся ў тàты, нiхàй цɛбе ў лес вòзьме Іст., папытàйся дарòгі Казл. З другога боку адзначу дзеясловы незваротнага стану: мɛне ні пазьнiце Слаб., рàна вы (сады) цьвілi, позна й асыпàлi Пак.

З асаблівасьцяй дзеяслоўных трыванняў адзначу катэгорыю дзеясловаў шматразовага трыванья, пашыраных ва ўсім раёне і ўтвораных пры дапамозе прыстаўкі *пана*: панавóдзіць, панабiрàць, панакрадàць, панасыпàць, панахóўваць, панiскубàць, панавàльваць (і панавàлюваць (сял. гав.), панамаўлячь, панабывáць і г. д. Адмечаных у слоўніку І. Насовіча дзеясловаў шматразовага трыванья расійскага тыпу „понамóвіць, понаваліцца, понабыць“ у гаворках раёну не спатыкаецца.

Варта таксама адзначыць пашыраныя ва ўсім раёне дзеясловы шматразовага трыванья, утвораныя пры дапамозе прыстаўкі *папа:* лéтась грыбны быў год: папанасiлi й папанасўшвалі людзі грыбóў Дан., папаéсьці, папабiць, папабiвàць, папакрàсьці, папрасiць і інш.

Асаблівасьці ў ужываньні склонаў.

Назоўны склон. Адмечу *прэдыкатыўны* назоўны скл.: Амєльля́н буў такі́ гультà́й, яко́го мо другóга й на сьвéці ні булò Слаб., Амєльля̀на дражні́лі Брьіцік ib., яго завýць Мікалà́й ус., касéц ён быў дòбры ўс.

З асаблівасьцяй выражэньня наз. склону пры *дзейніку* адзначу выражэньне яго лічэбнікамі пяць, шэсьць і г. д. з пастаноўкай пры іх назоўнага склону: дзèсєць гады́ Дубр., п'яць браты́ ib., дзевєтна̀ццаць гады́ ib., шэсь мéсєцы́ ib., дзесець вєрсьцé Рам., а таксама шмат гадэ́ Красн., аднак дзьве штук Дубр. У шляхецкіх гаворках пры дзейніку, выражанаму лічэбнікам, стаіць родны склон: п'яць валòў Майс., трына́нцаць авéц ib.

У *клічным* склоне цікава адзначыць парадак слоў: а мой ты, божа, літасьцівы! Майс.

Гаворачы аб *вінавальным* склоне, трэба адмеціць пашыраны ва ўсім раёне падвойны вінавальны склон: атпрà̀валі дачкý саўсім гòлую. Майс., мяне ўсягò нейк скаланýла ib., яго ўжэ прывéзьлі нішывóга Дан., любі мяне гóлага Дар.

Падобна да літаратурнай мовы вінавальны склон у назвах розных жывёл падобны да назоўнага склону: жыта жне, валэ́ пасé Пак., пасе авéчкі Дан., пà̀сьціў валы Дубр., запрагóм валэ̀ Чырк., прыгнà̀ў кòні ўс., пабрà̀ў птўшкі ўс., гані єгня̀ткі ў хлеў Майс. Спатыкаюцца канчаткі назоўнага склону і ад асоб: ён піці ні п'е, да за мной паслы шле Красн., вы̀шаў у лю̀дзі Дан. Апошняя зьява асабліва пашырана пры колькасных лічэбніках: Парà̀ска радзіла дзьве дачкі́ й тры сыны̀ Слаб. Падобна да гэтага—прайшлò мо сòрак гады̀ Дубр., даў яму рублі́ са два Дан., Іван слýжыць два гады̀ Пар., ў кòлькі ніты̀ нанічуюць Дубр.

З непераходных дзеясловаў, якія патрабуюць вінавальнага склону, адмечу дзеясловы дахòдзіць зéмлю Дубр., ён сваè дахóдзіць Дан., мяне апанавáлі сабакі Майс.

Родны склон[1]). 1. Асаблівасьці ў ужываньні гэтага склону пачну з разгляду роднага часьці або часовасьці пры дзеясловах напìцца, наéсьціся, накрóіць, купìць і інш.: напіўся вады̀, наèўся кісєлю̀, хòчу сáла, пазы̀ч рубля̀, набіраэ сі́лы Дан., нарабіў шкòды Слаб., сабрáлася нарóду аж кішы̀ць Красн., поўнá хà̀та сьмéцьця Дан., бі, пòкуль сі́лы стаé ib., укараціць вèку ўс., дадáць ахвòты, паддà̀й пáры, задà̀ў клóпату, гвà̀лту крычà̀ць, нарабіў гà̀часу, набрà̀ўся стрà̀ху, зазнáў гóра, даў хáбара, даў вòза (пры гульні ў карты), сьсек дўба, прыўёз лёма (ільма), грà̀ба, зà̀єц ат мяне хòду Пак.

2. Родны пры дзеясловах для азначэньня догляду, чаканьня, пільнаваньня, забываньня, імкненьня і інш. (ўсюды): дагляда̀й хà̀ты, дагляда̀й тавà̀ру, паглядзі сена,—мо ўжэ пасхлò Дан., пілнуй зà̀йца, кабы̀лы, шукáй куні́цы, сачы̀ тхарá, бèлкі, жду Праксэ̀ды, зрòкся сы̀на, дастўкаўся свайгò, захацèлася дзі́ва, прà̀гне шчасьця, знашòў падасìнавіка, асавєкà, слýхайцэ брахні̀, забы̀ўся рукавíц, папытà̀й Кулìны (аднак „пытà̀э дзявòк").

3. Родны для азначэньня якасьці: ён быў харóшага роду Пак., Кóсьцік высòкага рóсту Пар., вялíкай вагí чалавéк Дан.

---

[1]) Рознастайныя выпадкі родн. скл. прыблізна адпавядаюць розным катэгорыям родн. скл. ў украінск. мове, разгледжаныя проф. Тымчэнкам у яго працы „Функции генетива в южно-русск. языковой области", РФВ. за 1913 г.

4. Родны прыналежнасьці, як „гусі Праксэ̀ды“, блізка што зусім ня ўжываецца. Замеcта яго маем прыналежны прыметнік: Праксэ̀дзіны гу̀сі, ба́цькава касà, нявѐшчын ку̀бɛл, швà граў конь, зьвежджà лася Марцí нкава радзíна і інш. Спатыкаецца толькі родны прыналежнасьці з прыметнікам пры ім: старэ̀йшага сы̀на бо̀ты, нà шага бра̀та дзѐці.

5. Калі пры дзеясловах стаіць адмоўнасьць *не* (ні), то пры дапаўненьнях зам. вінавальнага звычайна бывае родны склон: галав*ы́* ні крушы̀ў Дан., ні бу̀ду тугі задава́ці Чэрн., я лапа́т*ы* ні далà Пак. Аднак зьява гэта не абавязковая, і тут часта трапляюцца выпадкі захаваньня вінав. скл.: ні пляці̀ ла̀пц*і* Дан., калі хо̀дзіш, дак хадзí—лю̀дзɛм сла̀в*у* ні рабі̀ Чэрн., німà сорак гады̀ Дубр.

Давальны склон. Найбольш цікавыя выпадкі яго ўжываньня: а) ям ў шко̀дзіць гарэ̀лка, кары̀сны лю̀дзям, што табѐ сонейка вінава́та Слаб., вінава̀т табе сьво̀карка ib., жыў сабе́ аніга́ткі Дан., сам сабе пан Красн., ям ў баліць галава́ Майс., ён ім наградзíў Пак. б) ям у карці̀ць, што кам ў ру̀піць, той тоɛ й жу́піць Майс., вучы̀ць дабру̀, ро̀зуму (аднак навучыўся рамɛства̀ Пар.), дзя̀кваць бо̀гу, хваліць богу (аднак бо́га хвалі̀, да й чо̀рта ні гняві́ Майс.), прабà чыць дў рню, вы̀бач мне, цяпе́рашнім малады̀м жы̀жні заві̀дую Дабр.

Захаваліся ў раёне і рэшткі давальн. самастойнага: вядо́ма, само̀й зрабíўшы, ні на ко̀га наракà ць ні бу̀дзɛш Дан.

Асаблівасьці ў ужываньні *творнага склону*):*

1. Творны месца: ідзе ле́сам ус., едзɛ чы̀стым полɛм ус., іду бе́рагам Пак., е́халі даро́гаю, плылі вадо̀ю ўс.

2. Творны часу: тым чà сам, пе́ршым ра̀зам ле́пшым ча́сам (гавораць пры замовах Дан.), сьветы̀м днем можна й аддыхну̀ць Слаб., вечарà мі дзѐўкі хо́дзɛць на вячо́ркі Дан., до́бра сухі̀м лѐтам сена касі̀ць Красн., гасьцɛвà ў цэ̀лымі ты̀днямі Іст. (аднак по̀ўначы прые́хаў—прыслоўе з месн. скл.).

3. Меры: рублé́м больш, рублé́м меньш Слаб., галаво̀ю вы̀шай ус.

4. Адносін: ба́цька прыслà ў гро́шы Ігна́там Майс.

5. Прыладны: арэ̀ валà мі, е́дзɛ ко́ньмі ўс., сьнег узя̀ўся вадо́ю Чэрн., луг заня̀ўся паво̀дкаю Дабр., налажы̀ць галаво́ю ўс., як пры̀скам сы̀пнула ў во̀чы ўс., прышо́ў як мала́нкай спаліць ус.

6. Параўнаньня і спосабу дзеяньня: сьляпі̀цаю ле́зɛ ў во́чы Дан., як сьпі́цаю ў во́чы Слаб., вà лам вà ліць ус., жыта сьцяно́ю стаíць ус., ніхай ён про̀падам прападзе́ Дан.

7. Іншыя выпадкі: ні тваім ро̀зумам жыво̀м ус., ўпікà ɛ мне сà лам ус., сама лí чанькам крà сна Пак. Першы з іх адпавядае творнаму соцыятыўнаму ў Потэбні.

Асаблівасьці ў ужываньні прыйменьнікаў.

Тут пакажу асаблівасьці ў ужываньні прыйменьнікаў і тыя ўзаемаадносіны ў сказе, якія яны, дзякуючы дзеясловам, азначаюць.

на. 1. Для азначэньня месца: а) *з вінавадьным склонам*: пашоў на сялб ўс., хадзе́м на мястэ̀чка Пар., пашоў на го̀лас ус., паéхаў на цёплыɛ во́ды Дан., вы̀біўся на даро̀гу ib., ўзьлез на са́мы шчыт (на верхавіну дрэва) ib., іграà ɛ на дў дку, на

*) Усе прыведзеныя выпадкі прыблізна адпавядаюць выпадкам творн. скл., прыведзеным у Потэбні. Из зап. по русск. гр., I (II), ст. 443 і наст.

скрыпку Майс.*); б) з *родн. склонам:* ўзьлез на дуба, на граба, аднак на елку, на бярозу; в) з *месн. скл.:* жыў на выгодзі Дан., быў на кані й пат канём ib., ці-ж ты мяне, мамка, на месьці купіла Дабр., сядзь на лаві, на заслоні ўс., я ляжу на ложку ўс. (пры *ложак*), куры сядзяць на сядалі ўс.; спатыкаецца таксама іграе на скрыпцы, на клярнэці Майс.

Блізка да азначэньня месца стаіць ужываньне прыйменіка *на* ў вінав. скл. ў наступных прыкладах: стаць на службу ўс., вол занепаў на ногі Дан., Цімоха абрáлі на старшыню ib., вучыцца на каваля, на шаўца ўс., ласы на грошы ўс., ласы на чужыя прыпасы Дан., зайздросны на чужыя грóшы Майс., захварэў на сухоты ўс., лежаў на запаленьне ўс., выстраліў на зайца, на воўка ўс., ўзьбіўся на худóбу ўс., ні мáю на цябе вéры ўс., прабáчце на слове Дан., як на мянé, дак я вот так бы зрабіў Коўц., ні жаль жа мне ні на кога, як на каня варанога Дабр., éты дабранач ні на мянé маладýю—на ўвесь сьвет Чырк., забыўся на яго Іст., памятай на бога Майс., ні ўспомніўшы на пакуту, бóгу ні малюся Добр. Нельга згадзіцца з Е. Карскім, які апошні выпадак лічыць полёнізмам (Белоруссы, т. II ч. 3, стар. 180). Прыклады на апошнюю зьяву гл. таксама ў О. Воўк-Левановіча (Важ. рысы... Зап. Аддз. Гум. Н., кн. 2).

2. Для азначэньня часу з вінав. і месн. скл. : на той час ус., на ліхую гадзіну ўс., на Вялікадне ўс., двойчы на дзень зьбéгае Майс., прóсіць прыці на аўтóрак ib., на ўвесь век ib., спадзяюся на пагоду ўс., на весьне Слаб., на тым тыдню ўс.

3) Для азначэньня прычыны з вінав. і родн. скл.: мешэчак на сыр Медзьв., торба на хлеб Майс., мука на каравай Казл., вазьмў аўцу на расплóд ус., на лíха ты яго ўзяў ус., на якóга кадука набрала ты étых зялепух (зялёных ягад). Дан., пашóў на качкі, на зайцы (на паляваньне) ўс., Ёўга пашлá на копанку Дан.

4. Для азначэньня спосабу дзеяньня і параўнаньня з вінав. і месн. скл.: як на сьвет нарадзіўся Казл., прóсець на прамілы бог Коўц., снá ўсе рóбіць на кáпась Дан., на гразь зьмясíў, на парашок сьцёр ib., забіўся на сьмерць Красн., старэй, на дзéсець гадóў Майс. (Магчыма і другая канструкцыя: старэй, як дзесець гады Дубр.), злáеў яго́ на чóм сьвет стаíць ус., на маé стала ўс., на вóка ўс., на сваé вóчы бачыў, на сваé вушы чуў ус., страціў на карóві п'яць рублёў Дан.

5) Для азначэньня якасьці з вінав. скл.: востры на язы́к ус., на éта ён дасьціпны Дан., здатны на прыказкі, як чорт на прывезкі ib., багаты на грошы ўс., бедны на дзеці ўс., конь хворы на залóзы Майс., горкі на смак ib., высокі на рост Пар., год ўрадлíвы на грыбы ib.

у. 1. Для азначэньня месца а) з *вінав. скл.:* пашлі ў лўцьце Крукі, пашóў ў грібў Дубр., паехалі ў госьці ўс., пашоў ў прымы ўс., дзéўкі йдуць ў варахе Слаб.; б) з *месн. скл.:* палíць у пéчы, картопля ў варыўні ўс., пáшла ўпрóчкі (прысл.) ўс. 2. Для азначэньня часу: ў дзень, ў вóсень, ўзімку, ўлетку, ў дож толькі грыбы браць Дан. 3. Для азначэньня адносін з він. і месн. скл.:

---

*) Па вусн. паведамленьню М. Гарэцкага гэта канструкцыя спатыкаецца і ў Горацкім раёне Арш.

жыць у згòдзі, ў пáры ус., касцы́ прышлí ў ч а т ы р ò х, насíлі ў пяцёх ус., ў к а г о ён удáўся? Красн., абярнуў яго ў м ɛ д з ь в ѐ д з я Слаб., лéзɛ ў бòркі, ўрòжкі, вазьмíся ў клубы́ Дан., ўзя́ўся ў бòкі ib.

за. 1. Для азначэньня месца: плыць за вадòю Бял. 2. Для азначэньня параўнаньня з вінав. скл.: бòльшы з а м я н é Слаб., з а м ɛ н ѐ адным годам старэ́й Дубр., за панібрáта Майс. 3. Для азначэньня стану рэчы з вінав. скл.: Мікíта ў нас з а п а с т у х à Дан., ён у іх з а п à р а б к а Майс., Тры́зна ў нас з а с т а р ш ы н ý Пар., поп Ахвòньські стàвіў чалавéка з а с а б á к у Казл., адзін жывѐ з а к а р а л ѐ в і ч а, а другі́ з а п а с т у х á Пак. 4. Для азначэньня часу з вінав. і творн. скл.: ні з а м а ѐ й п à м е ц ь ц ю ѐта булó Слаб., з а т ы́ д з ɛ н ь Вялíгдзɛнь Дан., з а п а г ó д у прыбрàлі жы́та ib., за карóткі час ус. 5. Для азнач. прычыны з творным скл.: з а д у р н ò ю г а л а в ò ю і нагà м б ɛ д á Дан., з а б à ц ь к а в а ю г а л а в ò ю добра жыць ib., з а п р à ц а ю сьвéту ні бáчыць Іст. 6. Для азначэньня адносíн: ўзяў дòбры ɛ грошы з а в а л à ўс., пагані́ з а м я н ѐ тавàр ус.

З (с). 1. Для азначэньня руху ў простым і пераносным значэньні з родн. скл.: спусьці́ць з вачэ́й ус., мàла с ь ц я б ѐ шкýры злупíць Красн., вéрнɛ з душы́ Дан., с п р ы б ы́ т к у галавà ні балíць ib., сь сьвѐту згубíла Чырк., які́ сь ц я б е гаспадáр Казл., сьмяю̀цца з дýрня ўс., цѐшыцца зь бяды́ ўс., марнéɛ с каханьня Майс., рàдуецца зь бяды́ ўс., зьдзéкуецца зь яé ус., кпіць зь яго ўс. 2. Для азнач. часу з родн. скл.: з р ò д у ні бáчыў ус., змàлку дзён ус., спрàку вéку Дан., з дàўных вякòў, с пѐрваɛ стрэ́чы Красн. 3. Для азнач. спосабу дзеяньня: сéна кóсɛць с п а л а в і н ы Бял. 4. Для азнач. параўнаньня з вінав. скл.: сòнца с а р а ш ò ч а к Пак., цэ́рькаўка з бýльбачку Дубр. 5. Для азнач. дзеяньня ўзаемнага характару з творн. скл.: Лявóн пабрàўся з А ў д ò ц ь ц ɛ ю Коўц., ажані́ўся з удавóю Дан., Есіп лю̀біцца з М а т р ý н а ю Слаб., аднак Міхáлка свáтаɛцца г Г à н ь н ɛ Красн.

па. Для азначэньня пэўнай мяжы і мэты: а) з вінав скл.: стаіць п а п ó ɛ с у вадзé Красн., п а к а л é н ɛ ч к і ў крывì, п а п á ш а ч к і ў пылý, а п а в ò ч а ч к і ў дымý Пак., èзьдзіў па гарòх, па аўёс Майс., пашлá па вòду, па мукý ўс., паслàў па Прузы́ну ўс., па дань прыслáў Пак.; б) з давальным скл.: разьнесíце цѐла бéла да п а ц ё м н а м у л у г у Чырк., сеў я да п а п а к а н ю̀, да п а к а н ю̀ Дан., ён ні п а н à ш а м у гавòрыць ib.; в) з месн. скл.: жýрыцца па бацькòх ус., ці спагадáеш па мне Слаб., шах-мах п а г у б à х Дан., відàць пàна п а х а л я̀ в а х Медзьв., мамачка п а м а é й к а с é жалѐɛ Бял.

да 1. Прыйменьнік *да* ўжываецца з родн. скл. для азначэньня руху ў простым і пераносным значэньні ў сэнсе дасягальным: пастáў гаршчóк д а ж à р у Дан., дайшоў я д а б р ò д у ib., èхала Матрýна д а в ɛ н ц à Дабр., даўнó я д а ц я б ѐ дабіра̀юся Майс., ні да цябе́ ка́жуць, ні да цябе́ п'юць ib. 2. Для пасіленьня дзеяньня: вы́скублі барадѝ д а в ò л а с а Пар., кóні здрасава́лі грэ̀чку д а з в à н ь н я, д а ш ч э̀ н т у Дан. 3. Для азнач. якасьці: да смàку ўс., да тва́ру ўс., д а ч а г ó ты здáтны? Дан., падобны да яé ib. (побач з *на*), лáсы д а ж а н ó к (побач з *на*).

к. Прыйменьнік *к* ўжываецца для азначэньня руху, звычайна з няпэўнай мяжой, з дав. скл.: патхòдзіць к лéсу Пак., хадзі́ к нам ус., прышлòў ка мне ўс., к сѐрцу Чырк., чаго ты к а м н е прыстàў? Дан.,

карова ні патпускáɛ к сàбе бугая́ ib., прысланíўся к сьцянé Чырк., пашòў к Ігнàту Красн. (аднак падышòў да Ігнàта ўс.), к Парàсцы прыéхалі сваты́ Дан.

над а) з вінав. скл.: над ягò німá лèпшага гаспадарà Дан., над сілу ib.; б) з творн. скл.: буў багàты над усíмі панáмі Пак.

пад а) з вінав. скл. ў значэньні часу: пад вéчар ус., пад ранíцу ўс., пат пóўдня ўс.; б) з вінав. і творн. склонамі для азнач. месца: буў пат канём Слаб., ніхáй яно згарыць, як мы пагàна жылі пат палɛкáмі Чырк., дай мне цябé ўзяць пат сíлу (пад пахі), дак мо тады й збòраю Дан.; в) для азнач. старшынства з творн. скл.: Яўхім пад Агàтаю Іст.

праз з вінав. скл. для азнач. 1) месца: праз лес ус., бачыў праз сон Дан.; 2) прычыны: праз вас яны́ пасварыліся Дабр.; 3) адносін: ні праз тваю ласку жывòм Майс.

пра з вінав. скл.: пра Міхаля́ пагáнага ні скàжаш Рам., ні пра што ні дбàɛ Дан., пра што ты кàжаш? Слаб.

пры з месн. скл.: ні пры сталé гавòрачы Майс., ні пры вас кàжучы ib.

скрозь выключна з вінав. скл.: як скрозь зéмлю праваліўся Казл..

край з родн. скл.: сьцялí пасьцéль край вакòнца Дабр.

ад (ат) з родн. скл.: ат чаго пачàць? Слаб., шчасьлівèйшы ат цябé Медзьв., ат сíлы тут воз сéна назьбіраеш Дан., засèк ад зьвéра ib., ат тых пор Чэрн.; старэ́й ад мяне Дан.

проціў з родн. скл.: вы́шаў прòціў нòчы Бял., проціў вéтра Майс.

поўз (паўз) з вінав. скл.: йдзі паўз плот ус., паўз гумны, паўз хàту, паўз лéс, паўз стог ус., паўз бярóзу, паўз éлку Пак., але паўз дýба ўс., паўз грàба ўс. (з родн. скл.).

аб з месн. скл.: аб нас людзі гавóраць Пак., аб étай пары́ Пар.

па-за з родн. скл.: чаго ты туля́ɛсься па-за плóцьцю? Дан.

Наступных прыйменьнікаў у гаворках раёну не заўважана: кром, акром, вобак, вобач, дзеля, канец, канцы, подле, водле, паводле, подлуг, водлуг, паводлуг, пераз.

СЛОЎНІК.

Для таго, каб фіксаваць усё багацьце лексычнага матар'ялу, патрэбавалася-б улажыць тоўстую кнігу. Ня ставячы сабе такой мэты, я абмяжуюся толькі фіксацыяй тых слоў, якіх няма ў вядомым беларускім слоўніку І. Насовіча, або калі яны там і ёсьць, то ў іншым значэньні.

Што-ж датыча лексычнай розьніцы паміж шляхецкімі і сялянскімі гаворкамі, то яна ў некаторых выпадках заўважаецца. Сяляне, напр., гавораць *клець, запóіны, скàцерка, вòжкі, шчань* капусты, *спаймàць, шмат*, а шляхта *сьвіран, заруўчыны, абрýс, лèйцы, дзèжка* капусты, *злавіць, багàта*. Звычайна-ж лексыка ў сялян і шляхты агульная.

Абабр*а*ць, *д.*—1) зьняць роя з дрэва ці з іншага месца, дзе ён саўецца*). Раман сягодня добрага роя абабраў; 2) аграбіць. Непадалек ад гораду разбойнікі мяне дазваньня абабралі; 3) здымаць лушпайку з яйца, бульбы. Абяры картоплю. *Дан.*

Аб*е*ручкі, *прм.* — абедзьвюмі рукамі. Аберучкі ўзяўся за біла. *Дан.*

Абібок *м.* — гультай, лежань. Дакуль ты, абібок, йшчэ будзɛш спаць? *Дан.*

Абп*о*лваць, *д.* — прачышчаць збожжа на ветры. *Дан.*

Абрызкл*ы*, *прм.* — напаўзакіслае малако. Абрызклоɛ малако. *Дан.*

Абс*е*яцца, *д.* — засеяць. Мы ўжэ трохі абсеɛліся. *Дан.*

*) Номэнклятура слова і тлумачэньне даецца ў літарат. мове; націскі азн. курсывам.

Абуячыцца, *д.* — ап'янець, бяручы буякі, ад багуну, што расьце разам з буячнікам. Ў буякох я сусім абуячылася. *Коўц.*

Абячэйка, *н.* — вобад у рэшаце ці ў сіце. *Дан.*

Агінацца, *д.* — гультаяваць, туляцца, хадзіць без работы. Агінаєцца цэлы дзень, як сабака. *Дан.*

Агністы, *прм.* — тэмпэрамэнтны. Агністая ў дзеўкі натура. *Медзьв.*

Агнёвы, *прм.* — пільны, старэнны. Ён агнёвы чалавек на работу. *Дан.*

Агоўтацца, *д.* — заспакоіцца, апрытомніцца. Посьлє чупрыньніка тры дні ні мог агоўтацца. *Казл.*

Адгаварыць, *д.* — адрадзіць. Сідара адгаварылі жаніцца з Грыпінаю. *Майс.*

Адзёнак, *м.* — насьціл для стога, каб зьнізу не зацягвалася сена вадою і не загнівала. *Слаб.*

Адкінуцца, *д.* — адмовіцца. Цімох аткінуўся ад Ганны. *Дан.*

Аднаяй, *м.* — з адным яйцом. *Дан.*

Адонак, *м.* — гл. **Адзёнак.**

Адчыніць, *д.* — адкрыць, раскрыць. Атчычні вароты. Атчыні рот. *Дан.*

Акалот, *м.* — трохі абабітыя (цэпам ці пранікам) на насеньне снапы жыта. Трэба перамалаціць акалот. *Дан.*

Акрàвак, *м.* — абрэзак ад луцьця, сукна ці якой іншай матэрыі. *Коўц.*

Амеці, *ж. мн.* — задні апад пры веяньні, мякіна. Запар карові амецєй. *Дан.*

Анігадкі, *прс.* — добра, без клапот. Далі Міхалку паў надзела зямлі, а цяперака ён жыве сабе анігаткі. *Дан.*

Апоўзіны, *ж. мн.* — перакладзіны з апушчанымі канцамі для ўмацаваньня страхі ці верха стога. Стог зьвяршылі й палажылі апоўзіны. *Дан.*

Апрануць, *д.* — надзець верхнюю адзежу. Апрані сьвітку. Падапрані кажух. *Дан.*

Архіба, *ж.* — архіў. Вынєў ета я дакуманты з архібы. *Іст.*

Аскірзацца, *д.* — агрызацца, пярэчыць. Калі вінаваты — лепш маўчы й ні аскірзайся. *Дан.*

Асмолак, *м.* — смольнае палена, карчук. Палажы асмолак на камінак.

Асьцюк, *м.* — вус у ячменя ці іншага збожжа. Ячмень з асьцюкамі. *Дан.*

Аўчарнік, *м.* — авечы хлеў. Воўк паткапаўся к Мірону ў аўчарнік і выцєг п'яць авец. *Дан.*

Ачамярэць, *д.* — абрыднуць, апрыкрыць. Ачамярэлі мне етыє дзеці; сьвету за jімі ні бачу. *Дан.*

Ашлàпіць, *д* — асядлаць, абняць нагамі. *Дан.*

Аціры, *ж. мн.* — абабітае пры малацьбе калосьсе. Аціры запарваюць кіпятком, абмешваюць мукою й даюць коням. *Дан.*

Бабёла, *н.* — пуп, часьць жывата ў абсягу пупа. Бярыцє венікі, пам'ёла, біцє яго па баб'ёла. *Коўц.*

Багата, *прс.* — многа, шмат. За нач багата сьнегу нападала. *Дан.*

Бансюк, *м.* — байструк, бэнцаль. Дзеўка прывєла баньсюка. *Дан.*

Баўтуха, *ж.* — таптуха; канусаватая, сплеценая з дубцоў рыбалоўная снасьць. Баўтухай ловєць рыбу ў малой вадзе. *Дан.*

Баявая гавара — вострая, дасьціпная гавара. *Чэрн.*

Бель, *ж.* — нізкаслы бярэзьнік на балоце. Загнаў тавар у самую бель. *Слаб.*

Біла, *н.* — 1) поручы. Каб ні зваліцца з мосту ў воду, робєць білы; 2) верхняя перакладзіна ў калёсах. Дзяржыся за білы, а то выскачыш з калёсаў; 3) рэйка. Стараверы звоняць у біла. *Дан.*

Бі*т*кі, *мн.* — гульня на Вялікадне ў яйцы. Хто разаб'е партнёра яйцо, той і атрымлівае яго. Яйцы, вядома, варацца крута. Давай пагуляєм у біткі. *Дан.*

Блі*з*кі сьвет — далека. Блізкі сьвет ехаць у Цябусы! Ета-ж будзе пат Слуцак. *Майс.*

Бо*ж*каць, *д.* — часта ўздыхаць і казаць „божа". Божкай ні божкай, а бяды ні паправіш. *Дан.*

Бок, *прс.* — моў. Што, бок, ты ляжыш целаз раньнє? *Дан.*

Бо*н*да, *ж.* — кусок выразанага ў сьвіньні каля задняга праходa мяса з салам. Бондаю мажуць калёсы. *Дан.*

Бра*м*ка, *ж.* — штыфтык у стрэльбе, на які надзяецца пістон. Корак б'е па брамцы. *Майс.*

Брыд*а*, *ж.* — погань. Атчаліся, брыда! Чаго прыстаў? *Дан.*

Бу*л*ьба, *ж.* — „Бульба" ўжываецца ў леваберажнай часьці раёну. У праваберажнай гавораць „картопля" (шляхта) і „кардоплі" (сяляне); слова „бульба" тут хоць і вядома, аднак ня ўжываецца, за выключэньнем в. Чыркавіч.

Бурачко*в*ы, *прм.* — фіолетавы, фіялкавы. Бурачковы колєр. *Дан.*

Бу*р*балка, *ж.* — баўдыр. На вялікі дож на вадзе ўсхватваюцца бурбалкі *Дан.*

Бу*р*ка, *ж.* — дзіцячая гульня. Кароценькую костачку прывязваюць па сярэдзіне шнурка і накручваюць. Калі цягаць за канцы шнурка, то костачка раскручваючыся і зноў накручваючыся бурчыць. *Дан.*

Бурклі*в*ы, *прм.* — той хто заўсёды бурчыць. Кіла ты бурклівая! *Майс.*

Буяк, *м.* — дурніца, галубіца (ягада).

Пашла я ў буякі —
Абуячылася.
Прышла я дадому —
Раскірачылася. *Дан.*

Валап*а*с, *м.* — валовы пастух. Хто ў вас сягодня за валапаса? *Дан.*

Валасьн*я*, *ж.* — леса. Прычапі на валасьню кручок. *Казл.*

Валяв*а*ха, *ж.* — бугай, бухала (птушка). Сь пелі вылєцєла валєваха. *Дан.*

Варыць, *д.* — моцна грэць (аб сонцы). Сягодня варыць, як у гаршку. *Дан.*

Васкав*і*ца, *ж.* — ароматная вадкасьць, якою спырскваюць пры „тварэньні" вульлі. *Майс.*

Ваўкатр*у*б — рас. „волкомтруд". Народная этымолёгія. *Пар.*

В*е*даць, *д.* — ведаць што-небудзь у абстрактным значэньні. Я ведаю, калі ета было. *Дан.*

В*е*лка, *ж.* — прыбраная на вясельлі ў каляровую паперу і стужкі дуга. *Чэрн.*

Верабе*й*ка, *н.* — назва ўсякай дробнай птушкі. Хлопцы ў лесі пабралі верабейкі (птушаняты). *Слаб.*

Верхав*о*д, *м.* — правадыр, пачынальнік. Міхалка на ўсе сяло верхавод. *Дан.*

Весялуха, *ж.* — вясёлка. Весялуха воду на неба цєгає. *Дан.*

В*е*трам падш*ы*ты — легкамысны. Еты хлопєц ветрам патшыты. *Дан.*

В*е*чка, *н.* — крышка. Накрый дзежку вечкам. *Дан.*

Відук, *м.* — мак з раскрытымі пры пасьпяваньні галоўкамі. Відук, калі пасьпеé, дак і высыплєцьця. *Майс.*

В*і*лы, *ж. мн.* — вілы ног, пояс. Сымон загруз па самыє вілы. *Дан.*

Вільчык, *м.* — верх будыніны. Алёкса ўзьлез пат самы вільчык (хаты). *Дан.*

Віша, *ж.* — скошаная па лёдзе сухая трава, пераважна асака. Мы з бацькам накасілі п'яць коп вішы. *Дан.*

Волак, *м.* — верхні брус у будынку, на які накладаюцца кроквы. Калі волак згніе, дак уся страха абурыцца. *Дан.*

Вольнасьць, *ж.* — слабасьць жывата. Хвершал даў нейкага зельля на волнась. *Слаб.*

Выжар, *м.* — запоўненая вадою яміна на балоце, дзе выгараў торф. Як скочыу ў выжар, дак ледзьва ні схаваўся *Майс.*

Вызьверыцца, *д.* — прыняць зьверскі выгляд, лаяцца. Чаго ты на яе вызьвэрыўся? *Дан.*

Вылегчы, *д.* — палегчы. Ячмень посьлэ дажджу ўвесь вулег. *Рам.*

Вылупак, *м.* — хлопчык з вылуплеными вачыма, наагул лаянка хлопца. Што-ж ты, вулупак, нарабіў? *Слаб.*

Вымятка, *ж.* — даведка, выпіска, спраўка. Ўзэла я ў натаруса вуметку. *Слаб.*

Выпас, *м.* — папас. Сёлета я аддаў швагру жарабка на выпас. *Дан.*

Выскіць, *ж.* — выварат, прыпаднятае паваленым ад буры дзеравам карэньне з зямлёй. Ваўчыха пад вускіцьцю вувела ваўчанят. *Слаб.*

Выслаўляцца, *д.* — выражацца. Як табе ні брыдка так выслаўляцца. *Дан.*

Выстарацца, *д.* — дастаць, выклапатаць. Цімох вустараўся сыну йльготу. *Слаб.*

Вытнуць, *д.* — ударыць, стукнуць. Вытні сабаку палкаю. Цалюсенькі дзень палэц аб палэц ні вытнэ. *Дан.*

Выхвараць, *д.* — многа пахварэць. Каб табе вухварэць да вустагнаць, як ты мой аўёс пабіў (выпасьвіў коньмі). *Слаб.*

Выходны, *прм.* — спорны, прыбытны. Выходнаэ сёлэта жыта, — с капы 7 пудоў намалацілі. *Дан.*

Выясьніцца, *д.* — праясьніцца, разьясьніцца. Неба выэсьнілася. *Дан.*

Вычвараць, *д.* — вытвараць, выраблять усякія штукі. Чаго наш пан толькі ні вычвараў. *Вас.*

Вязка, *ж.* — вязка. Нёс дзед сена ўязку,
Абнёс кругом калёс
Да й шусь пад нос.

Дан.

Вяршаліна, *д.* — верхняя частка дрэва з суччам. Вэршаліны пасеклі на дровы. *Казл.*

Вяршальнік, *м.* — верхаўё лесу. Насек вэршальніку на дровы. *Дан.*

Вярэнька, *ж.* — торбачка на хлеб, сплеценая з бяросты. У вэрэньцы хлеб ні сохне. *Рам.*

Вярэпаўка, *м.* — 1) земляная жаба, рапуха. На што ты етую брыдкую вярэпаўку чапаэш? 2) тоўстая, непаваротная і неахайная жанчына (лаянка). Чаго ты стаіш, вярэпаўка? *Дан.*

Гавара, *ж.* — 1) гаворка, гаварэньне. Ў яго ні наша гавара. Благая твая гавара. Дан.; 2) чутка. Ходзіць па селе гавара, што хутка будзэ вайна. *Медзьв.*

Гаварок *м.* — гаварун. *Дан.*

Гадзіць, *д.* — 1) дагаджаць. Гадзі яму, як ліхой скуле, 2) шанцаваць Яму ва ўсім годзіць. *Дан.*

Галайстра, *аг.* — голы, бедны. Ужываецца ў зьняважлівым сэнсе. Той галайстра нічога ні мае. *Майс.*

Галамоўза, *аг.* — хлапчук з коратка астрыжанымі валасамі. *Дан.*

Галапупец, *м.* — галапупак; птушаня, якое яшчэ не абрасало пер'ем *Дабр.*

Галашчок, *м.* — галалёд. Галашчокам паехалі па сена. *Слаб.*

Галіна, *аг.* — вісус, шыбенік. Юзік — ета такі галіна, што й блізка такога німа. *Дан.*

Галуза, *ж.* — 1) у аг. зн. сваволынік; 2) абгарэлая паляняка, галавешка. Патсунь галузу ўв агонь; 3) чорны. Чорны, як галуза. *Дан.*

Гамзель, *м.* — гугнівы, гомза, гамзаты. Таго гамзеля ні разьбярэш, што ён кажа. *Дан.*

Гамарня, *ж.* — надзвычайны крык у хаце. Што ў вас тутатка за гамарня? *Дан.*

Ганталь, *м.* — гвозд, якім прыбіваюць ганціну. *Дан.*

Ганьня, *ж.* — стада сабак, ваўкоў у час паляваньня („течкі"). Па вуліцы бегла ганьня. *Дан.*

Гараваць, *д.* — працаваць. Гаруеш, як той чорны вол. Гаруеш і смаку ні чуеш. *Майс.*

Гардаваць, *д.* — пагарджаць, грэбаваць. Багаты гардуе бедным. *Слаб.*

Гарэніць, *д.* — аддаваць елкасьцю. Масла гарэніць. *Дан.*

Гейка, *ж.* — прыяцелька, імостачка. Хадзі, гейка, к нам гуляць. *Рам.*

Гестка, *ж.* — від шва, кокетка. Дрэнную ты мне, маці, пашыла гестку ў кашулі. *Дан.*

Гібель, *ж.* — многа. Немцы ў Бабруйск гібель войска нагналі. *Слаб.*

Гізаваць, д. — гл. **Зыкаваць.**

Гілэхтар, *м.* — бяда, няпрыемнасьць. Каму сьмех, а каму гілэхтар. (Узята з яўрэйскага. Ням. gelächter — сьмех). *Дан.*

Гіры, *ж. мн.* — кудлы, патлы. Учапіўся яму аберучкі ў гіры. *Дан.*

Глушыць, *д.* — біць рыбу абухам, калі яна стаіць пад лёдам. *Майс.*

Гнілец, *м.* — заразьлівая хвароба на пчолы. Калі ў вульлі заўёўся гнілец, то ета ўжэ прапашчые пчолы. *Майс.*

Гнілы, *прм.* — мокры. Ў гнілыя дні ні можна сеяць картоплі, а то пагніе. *Дан.*

Гніляк, *м.* — 1) гнілая, звычайна макраватая, дзеравяка. Ні кладзі ты етага гнілека ўв агонь, — ўсе роўна гарэць ні будзе; 2) стары, слабасільны і хваравіты чалавек. Некалі буў чалавек, а цепер што ён? Гніляк! *Слаб.*

Гнюс, *м.* — 1) абпэцканы калам. А, гнюс! Ты ніколі ні папросіься да ветру; 2) блазьнюк. І ты, гнюс, хочаш йці ўв арэхі? 3) партач, псавач. Гнюс ты, а ні майстар. *Дан.*

Гнюсіць, *д.* — 1) выпаражняцца. Дзіця гнюсіць; 2) псаваць, партачыць. Пакінь! ты ні робіш, а толькі гнюсіш *Дан.*

Гонкі, *прм.* — высокі, стройны, падгалісты. На бару расьце гонкі лес. *Дан.*

Гразкі, *прм.* — які мае многа гразі. Гразкая дарога. *Дан.*

Гранка, *ж.* — кісьць, гранка. Ў гранцы было чатыры арэхі. *Дан.*

Грачанішча, *н.* — поле з-пад скошанай грэчкі. *Дан.*

Грачанка, *ж,* — грэцкая салома. Тавар любіць грачанку. *Дан.*

Грымнуцца, *д.* — бразнуцца, упасьці са стукам. Раман як пасьлізьнецца да як грымнецца аб лёд! *Дан.*

Гузаты, *прм.* — які мае гуз, шышку. Гузаты хлопэц. *Дан.*

Гура, *ж.* — гурба, сумёт. На дварэ панадувала гуры роўна с хатаю. *Дан.*

Густы, *прм.* — насычаны вільгацьцю. Падуў густы вецер, — будзе дож. *Медзьв.*

Гушканка, *ж.* — арэлі. Дзеўкі гушкаліся на гушканцы. *Дан.*

Гыркацца, *д.* — лаяцца, спрачацца. Маці з дачкою цэлу раніцу гыркаліся *Дан.*

Дабранач, *м.* — Да ўжэ еты дабранач ні на нач. *Чырк.*

Дабро, *н.* — маёмасьць. Багата маў ён ўсякага дабра. *Дан.*

Даводзіцца, *д. 3 ас. адз. л.* — прыходзіцца. Хведар даводзіцца мне стрэчным братам. *Дан.*

Дападаць, *д.* — пасьпяваць. Сымон ўсюды дападзе. *Іст.*

Датнуцца, *д.* — даткнуцца. Пчала зьвініць, здэцца, поўзае па вульлі, а да яго ні датнецца. *Майс.*

Даць, *д.* — у знач. пагрозы. Пачакай-жа, я-ж табе дам! *Дан.*

Джупла, *н.* — цыганскі гарапнік, бізун. Ні плач, а то як прыдзе цыган, дак вось задась джупла. *Дан.*

Дзераза, *ж.* — 1) паўзучая расьліна ў хваёвым лесе (Licopodium L). Дзеразою прыбіраюць хату; 2) калатлівы, зьвяглівы. Дераза етая да ўсякага прычэпіцца. *Казл.*

Дзётка, *ж.* — 1) сьвінка (ласк.); 2) прызыўны воклік сьвіней. Дзётка! дзётка! дзё, дзё, дзё! *Дан.*

Дзогаць, *д.* — хістаць, калыхаць. Ні дзогайся на дошцы. *Дан.*

Дзялянка, *ж.* — выдзеленая для продажу частка лесу. Ў казьне лес прадаюць дзелянкамі. *Коўц.*

Дзярэўня, *ж.* — вёска. Слова „дзярэўня" ўжываецца ў леваберажнай часьці раёну; у праваберажнай часьці ў большасьці гавораць „сяло".

Дзяржаць, *д.* — 1) трымаць. Падзяржы каня; 2) мець у часовым уладаньні землю, арандаваць. Бацька Загорскага дзержаў двор. *Майс.*

Доня, *ж.* — дачка. Спарадзіла маці доню,
Дай ні дала долі. *Пак.*

Дор, *м.* — дранкі. Хата накрыта дорам. *Слаб.*

Дохліца, *ж.* — сьмерць (зьняв). На яго ніякай дохліцы німа. *Чэрн.*

Дранкулька, *ж.* — адсечаная частка ад кулі. На воўка набіваюць стрэльбу дранкулькамі. *Дан.*

Драпак, *м.* — трапак. Паскачам драпака. *Дан.*

Драпаціньне, *н.* — узор з дробных клетачак на матэрыі. Годзі табе рабіць етае драпаціньне. *Майс.*

Другак, *м.* — другі па ліку, другога адбору што-небудзь. Пчолы пад яблынкай пусьцілі другака. Самагонка-другак. *Дан.*

Дружыначка, *ж.* — жоначка. Не любая дружыначка мне белы сьвет завязала. *Пак.*

Дуды, *ж. мн.* — ногі (гаворыцца ў зьняважлівым сэнсе). Прымі свае дуды. Ні туды ні сюды мае мілые дудзі. *Дан.*

Духам, *прс.* — у адзін момант. Адным духам зьлетаю. *Дан.*

Дыбарам, *прс.* — дыба. Валасы ат страху дыбарам пасталі. *Дан.*

Дыска, *ж.* — дзесятка ў картах. *Дан.*

Дыхавы, *прм.* — дыхальны. Дыхавое горла. *Дан.*

Ёмачнік, *м.* — дзяржальна ёмкі. *Дан.*

Ёмка, *ж.* — чапляя. Ёмкаю дастаюць сь печы скавароды. *Дан.*

Жбурнуць, *д.* — кінуць. Як жбурне каменем у сабаку, дак той толькі яўкнуў. *Дан.*

Жывасілам, *прс.* — сілком. Жывасілам атабралі каня. *Дан.*

Жыжка, *ж.* — сорт пякучай крапівы з дробнымі лісьцікамі. Жыжкаю рукі пап'ёк. *Дан.*
Жыжкі, *пр.* — пякучы. Жыжкая крапіва *Дан.*
Жыр, *м.* — корм, кармленьне. Вуткі паляцелі на жыр. *Слаб.*
Жыраваць, *д.* — карміцца (аб птушках). Качкі жыруюць у пельцы. *Дан.*
Жыры, *мн.* — крэсты, хрысты (картачная масьць). *Дан.*
Жытло́, *н.* — жыцьцё. Якое там нашэ було жытло. *Чэрн.*
Забарыцца — замарудзіцца, спазьніцца.

Я маладая забарылася,
За гускамі, за птушкамі загледзелася. *Красн.*

Забіраць, *д.* — апрача вядомага знач. — прыходзіць у афэкт і наагул у ненармальны псыхічны стан. Яго ад злосьці ўжэ пачало забіраць. Куліну нейкая трасца забірае. *Майс.*
Завадка, *ж.* — загана. Конь ніякай завадкі не мае. *Вас.*
Заварат, *м.* — узьлесьсе, край лесу. Кала заварату пасуцца цяляты. *Дан.*
Заварацень, *м.* — калач, якім прымацоўваецца аглобля да саней. Перарваўся заварацень. *Дан.*
Завея, *ж.* — завіруха, мяцеліца. Выехалі ў такую завею, што й сьвету божага ні відаць. *Майс.*
Завіхацца, *д.* — стараца шчырэй працаваць. Завіхайцеся, хлопцы, грэбці, — бачыце, хмара натходзіць. *Дан.*
Загараваць, *д.* — запрацаваць. Загараваў сабе кусок хлеба. *Майс.*
Загнет, *м.* — „жар у чалесьніку, калі пякуць хлеб". *Дубр.*
Загрудкі, *прс.* — за грудзі. Ўзяліся загрудкі — і пачаў адзін аднаго тузаць *Дан.*
Загудачка, *ж.* — заганка, вада.

Ўсяе мае загудачкі,
Што доля нішчасна. *Пак.*

Закалец, *м.* — хлеб, што сьсядаецца зьнізу ад скарынкі. На хлебе закалец на палец. *Дан.*
Заклінаваць, *д.* — заклініць, увагнаць клін. Заклінуй сакеру. *Дан.*
Залягаць, *д.* — Заходзіць, абходзіць. Залегай ат лесу, каб воўка сюды павярнуць. *Дан.*
Замінаць, *д.* — мяшаць, перашкаджаць. Атлезь, ні замінай прасьці! *Дан.*
Занягодзіць, *д.* — раздажджыцца. Другі тыдзень, як занягодзіла. *Дан.*
Запаветрыцца, *д.* — прапасьці. Штоб ты запаветрыўся (лаянка). *Дан.*
Запар, *пр.* — разам, адзін за адным. Запар тры разы езьдзіў у мястэчка. *Дан.*
Запарваць, *д.* — незаконна што-небудзь набыць. Што запарваў, то й твае. *Майс.*
Запарушыць, *д.* — засурыць. Запарушыў вока. *Дан.*
Запер, *м.* — перагародка ў сярэдзіне гумна, за якою складаюць збожжа. *Дан.*
Запіваць, *д.* — заручаць. Агапу ўжэ запілі. *Коўц.*
Запрадаць, *д.* — атрымаць за прызначаную для продажу рэч задатак. Варывон едзе ў Сібір; ўжэ запродаў і хату. *Дан.*
Зарніца, *ж.* — далекая маланка. *Дан.*
Зародак, *м.* — разьвіты плод, зародак. У яйцах ужэ зародкі. *Дан.*
Засівераць, *д.* — абветрыцца, ад ветру патрэскацца. Рукі засівералі. *Дан.*
Заслон, *м.* — зэдаль. Сядзь на заслоні. *Дан.*
Затакавацца, *д.* — загаварыцца (падобна цецяруку на таку). *Дан.*

Заткала, *н.* — 1) затычка ад лучніка. Заткні заткала, каб холад у хату ні йшоў. *Дан.* 2) папіхач. Заткала ты! нічога сам ні ўмеɛш ні сказаць ні зрабіць. *Дан.*
Захаладаць, *д.* —пахаладзець. Сягодня нешта захаладала. *Дан.*
Захіхлаць, *д.* — заплесьці маладой касу ільном і надзець чапец. *Казл.*
Захлупіцца, *д.* — захапіць дыханьне, задушыцца. Каб ты задушыўся да захлупіўся (лаянка). *Дан.*
Заходзіцца, *д.* — займаць дух. Дзіця крычыць аж заходзіцца. *Дан.*
Зацярушыць, *д.* — засыпаць, запарышыць. Сьнегам дарогу зацɛрушыла. *Дан.*
Збаёдаваць, *д.* — страціць, згубіць. Збаёдуваў мой ножык. *Дан.*
Збаяцца, *д.* — пабаяцца. Чаму-ж ты збаяўся борацца са мною? *Дан.*
Здаравіня, *аг.* — здаровы, здаравец. Здаравіня быў Рыгор, настаяшчы дуб, а нейкая трасца як укасалася, дак і каюкнуў. *Дан.*
Здацца, *д.* — прыдацца. Здаўся на прыказкі, як чорт на прывɛзкі. *Дан.*
Здырдзіцца, *д.* — памерці (ужываецца ў зьняважлівым сэнсе). *Дан.*
Зімнік, *м.* — зімняя дарога. Зімнікам бліжай ехаць. *Дан.*
Зладзіць, *д.* — згубіць. Зладзіў ты мне ножык. *Дан.*
Знаць, *д.* — знаць каго-небудзь або што-небудзь па знадворнаму выгляду. Я знаў нібожчыка Паўла. *Коўц.*
Зраджай, *м.* — ураджай. Ў леташнем гаду буў добры зраджай. *Дубр.*
Зубель, *м.* — запаленае з аднаго канца тонкае паленца. Зублɛм паткурваюць пчолы, калі іх падглɛдаюць. *Дан.*
Зубленка, *ж.* — факел, зубель, запаленае з аднаго канца палена. Пасьвяці зубленкай ў калодзɛжы: я спусьціла вядро. *Дан.*
Зыкаваць, *д.* — бегчы, задраўшы хвост, уцякаючы ад зыкоў (гаворыцца аб быдле і конях). *Дан.*
Зыркі, *прм.* — пламенны, яркі. Зыркіɛ дровы. Зыркі агонь. *Дан.*
Зьвергнуць, *д.* — скінуць плод. Кабула зьвергла жарабя. *Слаб.*
Зьлягацца, *д.* — моцна здружыцца. Зьлёгся ты з етаю шкураю — ні будзɛ дабра. *Дан.*
Зьняць, *д.* — запісаць. Ніхай ɛны зьнімуць голас (з песьні). *Чырк.*
Зяпа, *ж.* — пашча, ляпа. Воўк рашчыніў зяпу. *Дан.*
Іграць, *д.* — спарвацца. Ґаворыцца аб птушках. Гусі ўжэ пайгралі. *Дан.*
Імостачка, *ж.* — галубка. сястрыца. Хадзі, імостачка, пагамонім. *Прат.*
Кабаська, *м.* — ласк. ад **Кабан.** *Дан.*
Кабылка, *ж.* — подстаўка ў скрыпцы для струн. *Майс.*
Кавяня, *ж.* — качарэжка. Прышоў старац с кавянёю. *Дан.*
Кагалам, *прс.* — гуртам. Ўсе кагалам — і бацька з жыгалам. *Дан.*
Кадук, *м.* — чорт. Каб цябе кадукі забралі. *Дан.*
Казінец, *м.* — дрыжаньне ног (хвароба). На мяне нейкі казінɛц напаў. *Дан.*
Кайстра, *ж.* — торба. Сɛляне кажуць кайстра, а шляхты торба. *Слаб.*
Калатуша, *ж.* — месіво, жыжа. Што ты з етай калатушы будзɛш рабіць, —саладуху, ці што? *Дан.*
Калясьнік, *м.* — 1) майстар, які робіць калёсы; 2) воз сена, збожжа, накладзенага на калёсы. Раніцаю мы прывезьлі два калесьнікі мурагу. *Дан.*
Камарэча — зб. ад **Камар.** Ўлетку конɛй камарэча заɛдае. *Дан.*
Камечыць, *д.* — мяць, комкаць. Што ты камечыш хлеб? *Дан.*
Камінар, *м.* — 1) чысьцільнік комінаў. Чорны, як камінар; 2) хлопец, які, седзячы на печы, заўсёды ўпэцкаецца ў сажу. Даволі табе, камінар, на печы сɛдзець. *Дан.*

Капанічыць, *д.* — абгортваць бульбу „капаніцаю". *Майс.*
Капасны, *прм.* — злосны, упарты, шкадлівы. Капасны хлопец. *Дан.*
Капасьць, *ж.* — злосьць. Ена ўсе на капась робіць. *Дан.*
Капеж, *м.* — вадасьцёк. Пастаў цэбар пат капеж, ніхай вады нацячэ. *Дан.*
Каплун, *м.* — пражорлівы. Ты-б, каплун, усе пажраў. *Дан.*
Капцы, *м. мн.* — канец, сьмерць. Тут яму й капцы. *Дан.*
Капыл, *м.* — 1) калодка для шыцьця ботаў. На тваю ногу німа капылоў. *Коўц.;* 2) паўкруглае долата з дзяржаньнем, як у сакеры, для дзяўбаньня ночваў, карыта; 3) устаўка ў полаз, да якой прымацоўваецца вяз. *Дан.*
Карантыш, *м.* — малы, курдупель. *Майс.*
Карла, *м.* — карлік. Ў горадзі паказвалі карлу. *Майс.*
Картаграч, *м.* — картыжнік. Ета-ж такі картаграч, што здэцьця ні піў бы, ні еў, да толькі ў карты гуляў. *Медзьв.*
Картыжнік, *м.* — гл. **Картаграч.** *Дан.*
Карчом, *прс.* — моцна, нязрушна. Карчом сядзіць нат кнігаю. *Дан.*
Кары, *мн. л.* — вялікія калёсы ў маёнтках для важэньня снапоў; 2) маленькія санкі, на якія ўскладаецца другі канец калоды. *Дан.*
Каўтаць, *д.* — глытаць. Узяў у рот, а пракаўтнуць ні магу — назад верне. *Майс.*
Каўтун, *м.* — 1) хвароба—каўтун; 2) лаянка. Гад ты, каўтун! 3) **Каўтуны,** — патлы, гіры. Рашчашы ты свае каўтуны. *Дан.*
Каюкнуць, *д.* — раптоўна памерці, здырдзіцца. Жыў, жыў чалавек да й каюкнуў. *Майс.*
Кідун, *м.* — падучка. Ужываецца ў лаянцы: „Каб цебе кідун кідаў"! *Слаб.*
Кілават, *прм.* — кілаваты, грыжаваты. Хто-ж вінават, што мой бацька кілават, — так яму бог даў. *Дан.*
Кіпень, *м.* — вар, кіпяток. *Майс.*
Кіпець, *м.* — пазногаць. Пазразай кіпці. *Майс.*
Кірмашовае, *пр.* — гасьцінец з кірмашу. Тата прыехаў і кірмашовага прыўёз *Дан.*
Кішачка, *ж.* — памянш. ад **Кішка.** Душачка-б брала, да кішачка мала. *Дан.*
Клінок, *м.* — канусаваты мяшочак на сыр. Ўлі малако ў клінок, да калі сьцячэ, налажы каменем. *Дан.*
Клубы, *м. мн.* — тазавая часьць цела. Ў худой каровы адны клубы тырчаць. *Дан.*
Клыпаты, *прм.* — гл. **Клышун.**
Клышун, *м.* — чалавек з крывымі нагамі. Ў клышуна ногі адна туды, а другая сюды. *Дан.*
Ключні, *ж. мн.* — 1) зьбітыя дзьве жэрдкі для ўмацаваньня верха страхі. Палажы ключні на страху; 2) ногі ў рака. *Дан.*
Кодла, *н.* — род (зьняв). Там жыве іх усе кодла.
Коўзанка, *ж.* — лёд. на якім коўзаюцца. Хлопцы на коўзанцы коўзаюцца *Дан.*
Красала, *н.* — крэсіва. Красалам красаюць агонь. *Слаб.*
Крупнік, *м.* — 1) суп. Сягодня мы елі крупнік; 2) зьняважлівая назва інтэлігента. Панаежджала з гораду на аблаву ўсякіх крупнікаў. *Дан.*
Круцёлка, *ж.* — гіганскія шагі. Хлопцы ў вучылішчы круцецца на круцёлцы *Чэрн.*
Крушыць, *д.* — ламаць. Ён сваю харошую сушыць і крушыць. *Чырк.*
Крыса, *ж.* — пала. Захіні крысу. *Дан.*

ЦНБ НАН Беларуси

Крытнік, *м.* — той, хто крые страху. Крытнікі крыюць гумно. *Дан.*

Крэпка, *прс.* — моцна. Жана мужа крэпка любіла. *Чырк.* Крэпка завяжы вузєл. *Дан.*

Кубло, *н.* — гняздо. Хлопцы спаролі ластаўчына кубло. *Дан.*

Кулдыячыць, *д.* — нявыразна, незразумела гаварыць (гукапераймальнае ад крыку жураўлёў: кулды! кулды!). Ні кулдыяч, а добра гавары. *Майс.*

Кулём, *прс.* — раптоўна, стрымгалоў. Кулём кінуўся бегчы. *Красн.*

Кулідка, *ж.* — баханка (хлеба). Бацька ат цэлай кулідкі аткроіў акраєц. *Дан.*

Кульбака, *ж.* — частка ярма, якая, падобна да хамута, надзяецца на шыю вала. Кульбака засоўваецца занозаю. *Коўц.*

Кульбачыць, *д.* — сядлаць, камечыць. Бачыў, як кульбачыў (воўк парася), а ні ведаю куды панёс. *Дан.*

Кура, *ж.* — курыца. Палажы поклад, курá несьціся хоча. *Дубр.*

Курда, *ж.* — прыгінаньне ног к галаве. Хлопцы Ясю задралі курду. *Дан.*

Курдупель, *м.* — малы хлопец. Куды ты, курдупель, пойдзеш? *Дан.*

Курчыць, *д.* — згінаць пад сябе ногі. Сядзіць, паткурчыўшы ногі. *Дабр.*

Куртаты, *пр.* — куцы, кароткі, бясхвосты. Куртатая сьвітка. Куртаты сабака. *Дан.*

Курыца, *ж.* — родавыя жаночыя часьці. Сарамніца, седзіць — і курыцу вуставіла. *Чэрн.*

Кухталь, *м.* — удар кулаком пад бок. Ну й надаваў я яму кухталёў. *Пар.*

Лагізон, *м.* — легіянер. Нар. этымолёгія. Гэтак сяляне называлі ў 1918 г. польскіх легіянераў корпусу Даўбор-Мусьніцкага, збліжаючы „легіянер“ са словам „лагіза“, што значыць гультай, абібок, прайдзі-сьвет. *Пар.*

Лажбень, *м.* — 1) посуд на мёд. Поўны лажбень м'ёду нарэзалі. *Дан.*

Ах ты, сваце, дамувуй,
Да несі лазьбень медавуй.
Му твайго лазьбеня ні зьедзім,
Толькі ў его мы пагледзім. *Чэрн.*

2) свавольны, упарты хлопец. А ты, лажбень, нікога ні слухаєш! *Дан.*

Ланя, *ж.* — лань. Вывєрнулася, як тая ланя,—годзі табе спаць! *Дан.*

Лапікла, *ж.* — 1) залапленае на адзежы месца; 2) дзірка на адзежы. Якое лапікла прапаліў; 3) гл. **Лапіна.** *Дан.*

Лапіна, *ж.* — праталіна. Сьнег лапінамі параставаў. *Дан.*

Лёля, *ж.* — сарочка, пераважна дзіцячая. Во пашыла лёлю, — па самыя п'яты. *Дан.*

Лемент, *м.* — праразьлівы крык, галашэньне. Падняла дачка лемент па мацєры. *Дан.*

Лементаваць, *д.* — праразьліва крычаць, галасіць. Лементує маці па дзецєх. *Дан.*

Леташні, *прм.* — прашлагодні, прошлага лета. Баюсє я цябе, як леташнєго снегу. *Іст.*

Лескі, *ж. мн.* — лесьвіца, пераважна з шырокімі ступенькамі. *Дан.*

Лёстачка, *ж.* — 1) палачка ў драбінах (калёсах), што прымацоўваецца да біла; 2) лісьлівасьць. Лёстачкамі душу выймає. *Дан.*

Ліса злавіць — падсмаліць сьвітку ці іншую суконную адзежыну, пасьля чаго яна набывае жоўты, як у ліса, колер. *Дан.*

Лісіца, *ж.* — ціскаўка, напаўрашчэпленая дзеравяка. Кошцы ў хвост управілі лісіцу. *Дан.*

Лотак, *м.* — жалабок для сьцёку вады. *Коўц.*

Лоўж, *м.* — куча складзенага гальля. Злажы гальлё ў лаўжы, каб ні замінала араць. *Дан.*

Лучнік, *м.* — прылада для асьвятленьня хаты. Робіцца так: пляцецца адкрыты конус і абмазваецца з абодвух бакоў глінай. Вострым канцом конус прымацоўваецца да столі, а к тупому канцу прывешваецца „жалезка" (жароўня), на якое кладзецца лучына. Лучнік дае ні толькі сьвятло, а й цяпло. *Дан.*

Лушпайка, *ж.* — шкарупа, шалуха, шалупайка. Абяры с картоплі лушпайку. *Дан.*

Лынды біць — гультаяваць, бібікі біць. Даволі табе лынды біць, ідзі на полє. *Дан.*

Любісьнік, *м.* — любчык, корань расьліны з магічнай уласьцівасьцю прыцягваць каханьне. Дай дзеўцы любісьніку, дак пакахаэ. *Дан.*

Ляжак, *м.* — 1) напаўляжачы вулей з пчоламі. Рой вушаў з лежака. *Слаб.;* 2) ляжачая бочка з невялікай дзіркай зьверху. Насып жыта ў лєжак. *Дан.*; 3) дымаходная труба (ўс.).

Ляйчына, *ж.* — вожка. Завяжы ляйчыну. *Дан.*

Ляйцаць, *д.* — завязваць каню лейцы (вожкі). Лєйцай каня й паедам. *Дан.*

Макавішча, *н.* — поле, дзе рос мак.

Малатарка, *ж.* — малатарня.

Мара, *ж.* — страшыдла, здань. Аткасьніся ты, мара! *Дан.*

Маркаль, *м.* — баран-самец, расплоднік. Ў маркаля вялікіе рогі. *Дан.*

Мармыль, *м.* — бурклівы чалавек. Еты мармыль ўсе сабе нешта буркаэ. *Дан.*

Марцаваць, *д.* — спарвацца, паляваць. Гаворыцца пераважна аб катох. Вясною каты марцуюць. *Дан.*

Масёнжнік, *м.* — меднік. Трэба масёнжніку занесьці ложкі, ніхай пабеліць. *Дан.*

Матачнік, *м.* — прылада для ізоляцыі пчалінай маткі ў вульлі. *Дан.*

Маўляў, *прс.* — моў. Такі, маўляў, як і ты. *Слаб.*

Маха, *ж.* — крыло ветрака. Трэба на маху нацягнуць парус. *Дан.*

Махàнік, *м.* — мэханік.

Мацаваць, *д.* — 2) пробаваць моц яйца аб зубы. Дай мне памацаваць твае яйцэ. *Рам*; 2) спажываць. Хто працуе, той і мацуе. *Дубр.*

Места, *н.* — горад. Ці ж-ты мяне, мамка, на месьці купіла? *Пак.*

Мульле, *зб.* — мазольле. Скульля табе, мульля (лаянка). *Коўц.*

Мыцельнік, *м.* — куток у хаце, дзе стаяць вёдры, цэбар, міскі. *Дан.*

Мяжыперніца, *ж.* — хвароба паміж пальцаў, міжперсьніца. Межыперніцу трудна лечыць. *Прат.*

Мянташка, *ж.* — намазаная глінай ці пяском дзеравяная лапатка, якою востраць косы. *Майс.*

Мянташыць, *д.* — вастрыць касу „мянташкай". *Майс.*

Набрацца, *д.* — добра пад'есьці. Набраўся, як чоп. *Дан.*

Наваратам, *пр.* — у першы, другі, трэйці прыём. Другім наваратам, трэйцім наваратам. *Дан.*

Навой, *м.* — цыліндрычны вал, на які накручваецца аснова ў кроснах. Крывы навой. *Дан.*

Нагружаць, *д.* — напакоўваць. Купец нагрузіў караб. *Пак.*

Надал*ы*знуць, *д.* — абрыднуць, апрыкрыць. Як табе ні надалызьнᴇ зь ім гыркацца? *Пак.*

Назьбір*а*цца, *д.* — пад'есьці. Таго, сяго назьбіраўся—і сыты. *Дан.*

Накл*ю*нуцца, *д.* — гаворыцца аб птушанятах, калі яны сядзяць у наклюнутых яйцах. Кураняты ўжэ наклюнуліся. *Дан.*

Нал*і*сьнікі, *м. мн.* — 1) тонкія, з пшанічнай мукі, блінцы. Ў нядзелю маці напᴇкла налісьнікаў; 2) ліштва, б'е. На вокны папрыбівалі налісьнікі. *Дан.*

Напᴇтаваць, *д.* — накласьці, наладаваць. Во напетуваў воз — і каню ні павезьці. *Дан.*

Напрал*о*м, *прс.* — сілком. Напралом лезуць хлопцы ў хату. *Майс.*

Напрасьцік*і*, *прс.* — гл. **Нацянькі**. *Дан.*

Нараўц*о*, *н.* — звычай. Што сялцэ, то нараўцэ. *Дубр.*

Нар*о*дак, *м.* — наседжанае яйцо. Рыгор набраў вуціных народкаў. *Коўц.*

Нар*ы*тнікі, *м. мн.* — набэдрыкі. Справіў на каня добрыя нарытнікі. *Дан.*

Нар*ы*ца, *ж.* — 1) норка. Злавіў нарыцу. *Дан.*

Настая*я*шчы, *прм.* — праўдзівы, рачавісты. Сягодня настаяшчая пагода. Куліна ўжэ настаяшчая дзеўка. *Дан.*

Нас*у*нуць, *д.* — нахмарыць. На небі насунула, як у мяшку. *Дан.*

Натр*у*дзіць, *д.* — зрабіць верад. Натрудзіў руку, ногу. *Майс.*

Нат*у*ра, *ж.* — характар. Натуры ні пераставіш. *Майс.*

Н*а*ўза, *ж.* — прылада, да якой прымацоўваецца воск у вульлі. *Дан.*

Нахм*у*рыць, *д.* — насупіць. Нахмурыў бровы. *Майс.*

Нацянькі, *прс.* — проста, напрасьцікі, бліжэйшай дарогай. Пашоў праз балота нацянькі. *Дан.*

Нашв*е*ркаць, *д.* — шапяляючы нагаварыць. Во я вам і нашверкала песьню. *Дубр.*

Негадз*і*вы, *прм.* — нягодны. Негадзівы чалавек. *Слаб.*

Н*е*гадзь, *ж.* — гл. **Нягода**.

Н*е*жань, *м.* — нежанаты, марцовы кавалер. Нежань еты, дажыў да сівых валасоў, да йшчэ ні 'жаніўся. *Медзьв.*

Н*е*марасьць, *ж.* — прыгнечаны стан духа. На яго нейкая немарасьць напала. *Дан.*

Н*е*мы г*о*лас — страшны, ненатуральны голас, падобны на голас нямога чалавека. Цімох перавярнуў дагары кажух да як загаворыць немым голасам, дак мы ўсе й папужаліся. *Дан.*

Неспадз*е*ўкі, *ж. мн.* — нечаканка. Неспадзеўкі — дзіця ў дзеўкі. *Дан.*

Нешман*а*ць, *д.* — не зварачаць увагі, ня слухацца. Ты яму хоць кол на галаве чашы, а ён нічога нішманаᴇ. *Дан.*

Н*е*штачка, *н.* — штосьці. Хадзі, я нештачка табе пакажу. *Дан.*

Нібын*а*мкі, *прс.* — няважна, пляваць. Сена сухоᴇ ляжыць, а ён сабе нібынамкі, газэту чытаᴇ. *Дан.*

Німал*а*ду, *прс.* — бяз прычыны, няведама за што. Німаладу за што ён на мяне ўсердзіўся. *Майс.*

Ніўп*а*мкі, *прс.* — ня ў памяць. Алена прасіла прыці, а мне за работаᴋ й ніўпамкі. *Дан.*

Нішчымны, *прм.* — посны. Наварыла нішчымнай капусты. *Дан.*

Н*о*гцам, *прс.* — нагой, высьпяткам. Як даў сабаку ногцам, дак ён і зьвіўся. *Дан.*

Н*о*шка, *ж.* — ноша. Ношка цяжкая,—ледзь падняць. *Дан.*

Ну, *прс.* — так, але. — Паедзеш, дзядзька, ў Парычы? — Ну. *Прат.*

Н*у*жа, *ж.* — шасьціножкі (камары, мошкі, сьляпні, авады, зыкі, мухі). Ўлетку нужа тавар заᴇдаᴇ. *Дан.*

Нюхцець, *д.* — нюхаючы вышукоўваць што-небудзь. Сабака нюхціць, мусіць зайца чуе. *Дан.*

Нябожчыца, *ж.* — пакойніца. Матка мая нібожчыца, ні проці ночы душачку яе пабуджаючы, вельмі мяне любіла. *Дан.*

Нявернік, *м.* — 1) недаверлівы. Еты нівернік нікому ні верыць; 2) від гульні ў карты. Хлопцы гуляюць у ніверніка.

Нягода, *ж.* — негадзь, непагода. Другі тыдзень, як ідзе дож. Такая нягода! *Дан.*

Няўмека, *ж.* — няўмелы, які ня ўмее нічога рабіць. Ў ніўмекі рукі калекі. *Дан.*

Няўмечка, *ж.* — няўмека. Ў ніўмечкі ні баляць ні ручкі ні плечкі.

Павітацца, *д.* — прывітацца. Сваты... с аўцой павіталіся. *Пак.*

Пагавор, *м.* — абмова, плёткі. Я атцоўськая дачка—
Пагавору баюся. *Чэрн.*

Пагон, *м.* — месца, у большасьці ўзгоркаватае, па якому звычайна ганяюць тавар. Тавар ішоў пагонам. *Дан.*

Падацца, *д.* — накіравацца. Тодар падаўся вучыцца на дохтара. *Дан.*

Падгалісты, *прм.* — гонкі, высокі, з суччам на версе. Падгалісты лес. Падгалістая хвоя. *Дан.*

Падглядаць, *д.* — выбіраць мёд з вульля. Пчолы падгледаюць у восень. *Дан.*

Паджары, *прм.* — рыжаваты зьнізу. Паджарая сьвіня. *Дан.*

Падласы, *прм.* — бела-рыжай масьці. Падласая карова. *Дан.*

Падмаладзіцца, *д.* — праясьніцца к пагодзе. Неба падмаладзілася. *Дан.*

Падманшчык, *м.* — ашуканец, манюка. Ні слухай ты етага падманшчыка,—брэша! *Дан.*

Падмецца, *д.* — паабяцацца. Калі падмеўся даць, дак давай. *Дан.*

Паднасак, *м.* — падошва, што падбіваецца пад боты. Пад боты прыбілі новыя падноскі. *Дан.*

Паднябеньне, *н.* — 1) неба ў роце. Нешта паднябеньне ў дзіцяці абсыпала; 2) скляпеньне ў печы. Ў печы мулер выводзіць ужэ паднябеньне. *Дан.*

Падосак, *м.* — жалезная штаба, якая падбіваецца зьнізу дзеравянай восі. *Дан.*

Падрэз, *м.* — 1) жалезная палоса зьнізу полаза. Сані с падрэзамі; 2) вылегчаны на адно яйцо конь; нутрэц. *Дан.*

Падсылаць, *д.* — прысылаць для разьведваньня чаго-небудзь. Есіп к Матруні ўжэ сватоў патсылае. *Дан.*

Падсябрыцца, *д.* — падлезьці, падсесьці, каб на правох сябра прыняць удзел у карыстаньні чым-небудзь. Ты, я бачу, хочаш к нам патсябрыцца палуднуваць? *Дан.*

Падцікоўваць, *д.* — падглядаць, выглядаць. Кот патцікоўвае муш. *Чырк.*

Пазалеташні, *пр.* — пазапрашлагодні. Пазалеташні год буў багаты на грыбу. *Чэрн.*

Пазасынаць, *д.* — пазасыпаць. Пазасыналі ўсе, — лежаць, як снапы. *Майс.*

Пайка, *ж.* — доля, частка. А дзе-ж мая пайка ат хаджайства? *Слаб.*

Палавічны, *прм.* — палавінны, які складае палавіну чаго-небудзь. Палавічная земля. *Майс.*

Палік, *м.* — наплечнік. На сароццы паліке. *Казл.*

Паляваць, *д.* — спарвацца. Гаворыцца пераважна аб каровах. Красуля палюе, трэба прыгнаць бугая. *Дан.*

Памацаваць, *д.* — 1) даведацца аб моцнасьці чаго-небудзь. Памацуй, ці крэпка прыўязана вяроўка; 2) даведацца аб моцнасьці яйца, стукаючы яго аб зубы. Дай мне памацаваць твае яйцо. *Дан.*

Панфіль, *м.* — дамка ў картах. *Дан.*

Паняць моду—мець прывычку да чаго-небудзь. Ах ты, соня! панєла моду да паўдня спаць. *Дан.*

Паперападацца, *д.* — пападцягваць ад голаду жываты. Бачыш, валы паперападаліся: адны клубы тырчаць. *Дан.*

Папліска, *ж.* — палкі, якімі ўвязваюць дровы на вазу. Двоє біліся, а трэйці выхапіў з возу папліску да як трахнє аднаму па галаве, дак той, як сноп, і паваліўся. *Пар.*

Парабкаваць, *д.* — быць за парабка. Есіп так усю сваю жытку й парабкаваў. *Казл.*

Парабчанка, *ж.* — служанка, работніца. Сымонавы заўсёды дзержаць парабчанку. *Майс.*

Параван, *м.* — шырма з матэрыі. Параван вешаюць у хаці, калі німа бакоўкі. *Дан.*

Парахня, *ж.* — 1) гніль, збуцьвелае, падобнае на парашок, дзерава. Ат палена асталася толькі адна парахня; 2) стары слабасільны чалавек. Ета ні чалавек, а 'дна парахня; 3) ужываецца ў сэнсе „сьцерці на парашок". Як дам, дак і парахня сь цябе пасыплєцца. *Дан.*

Пасад, *м.* — пакладзеныя на таку ў рад, адзін пры адным, снапы пры малацьбе цэпам. Покуль разьвіднєла, мы п'яць пасадаў змалацілі. *Дан.*

Пасека, *ж.* — месца, дзе нядаўна высечаны лес. Ў казьне пасєкі паўзорвалі й пазасєвалі лесам. *Коўц.*

Пасялуха, *ж.* — пахатуха, пляткарка. Ні кажы етай пасєлусі, а то па ўсєму сєлу разьнєсе. *Рам.*

Патлы, *ж. мн.* — кудлы, гіры. Прычашы свае патлы. *Майс.*

Патраўка, *ж.* — верашчака. *Медзьв.*

Патрымаць, *д.* — падзяржаць. Патрымай рэшата. *Чэрн.*

Патужэць, *д.* — пацьвярдзець. Скула патужэла. *Дан.*

Пахатуха, *ж.* — гл. **Пасялуха.**

Пачковая табака — табака лепшага сорту. Настаўнік курыць пачковую табаку. *Дан.*

Пацыкацца, *д.* — дражніцца. Што ты с сабакам пацыкаєсься? Уцьвеліш— дак укусіць. *Дан.*

Пацярушыць, *д.* — прысыпаць. Дарогу трохі пацєрушыла сьнегам. *Дан.*

Пеля, *ж.* — балотца паміж поля з стаячай вадой. Ў пелі жыруюць дзікіє качкі. *Дан.*

Пераводзіцца, *д.* — зьнішчацца. Штоб твой род пераўёўсє. *Рам.*

Перасыпаць, *д.* — апрача агульн. знач. — перабудаваць, перастанавіць будыніну. Сяголєта Гармон перасыпаэ хату. *Коўц.*

Перасядаць, *д.* — застраваць. Яблыка перасєдаэ ў році. *Дан.*

Пераход, *м.* — параход. Пераход пашоў на Бабрусяк. *Красн.*

Перашушэліць, *д.* — ператачыць. Му самі перашушэлім етае жыта. *Рам.*

Персьці, *ж. мн.* — грудзі ў каня. Здаровыя персьці ў кабылы. *Дан.*

Пець, *д.* — сьпяваць. Як я буду пець колєду, калі цяпер жніво. *Дабр.*

Пёрыць, *д.* — 1) моцна біць дубцом, палкай. Годзі табе перыць каня; 2) біць, пляскаць бялізну пранікам. Матруна на копанцы перыць плацьцє. *Майс.*

Платок, *м.* — хустачка. На чужы раток ні накінєш платок. *Дан.*

Плацьце, *зб.* — бялізна. Мама пашлі на копанку мыць плацьцэ. *Майс.*

Плашка, *ж.* — расколатае надвое доўгае і тоўстае палена дроў. Прыўёз воз плашак. *Дан.*

Плюснуць, *д.* — пацалаваць. Плюсьні дзядзьку ў руку. *Дан.*

Подкур, *м.* — палаці на дзераве, на якія ставяць вульлі для пчол. На поткур усьцягнулі чатыры вульлі. *Майс.*

Подлетак, *м.* — 1) маладая птушка, якая яшчэ не навучылася лятаць. Лявон злавіў п'яць драздоў-подлэткаў; 2) блазен, недарослы. Я йшчэ тады быў подлэткам. *Дан.*

Подмазка, *ж.* — кавалачак сала для падмазваньня скаварады. Падмаж подмазкаю скавараду, штоб ні прыставаў блінец. *Дан.*

Подплетка, *ж.* — калок, швайка, якой робяць у лапці пры пляценьні дзірачку. Потплетка трэба, штоб патплесьці лапэць. *Дан.*

Подсьвінак, *м.* — сьвіньня, якая яшчэ не дарасла да нормальнай велічыні. Рыгор мае сьвіню, кабана й двоэ потсьвінкаў. *Дан.*

Пожня, *ж.* — поле ад зжатага збожжа наагул. Выжань цэлятак на пожню. *Майс.*

Покатам, *прс.* — адзін пры адным. Покатам на падлозі спаць паляглі. *Красн.*

Пол, *м.* — палаці, на якіх звычайна сьпіць уся сялянская сям'я. *Коўц.*

Полаг *м.* — балдахін з палатна з апушчанамі берагамі да ложку. Звычайна вешаецца на лета, каб схавацца ад камароў. Дзеўкі ў сенцах сьпяць у полагу. *Дан.*

Пушчу каня на лужок,
Сам ік дзеўцы ў палажок. *Пак.*

Полка, *ж.* — пялёнка, пялюшка. Ў полкі спавіваюць дзіця. *Майс.*

Поплаў, *м.* — сенакос пры полі, пераважна заліўны, з якога зьбіраюць мурожнае сена. *Казл.*

Порсткі, *прм.* — жвавы, палахлівы. Порсткі конь. *Дан.*

Поўдзень, *н.* — полудзень. Ўжэ было пат паўдня. Слонца рушыла с поўдня. *Дан.*

Поўпрык, *м.* — надуты і ўпарты хлапец. Ну, ты, поўпрык, хадзі вячэраць. *Дан.*

Поцераб *м.* — расьцярэбленае, нядаўна расчышчанае ад лесу поле ці сенакос. На поцэрабі добра родзіць усякая збажына. *Дан.*

Почапка, *ж.* — перавязь у вядра. Вазьмі вядро за почапку. *Дан.*

Правешацца, *д.* — прагуляць. Правешаўся цалюсенькі дзень,—палэц аб палэц ні вытнуў. *Дан.*

Правіць, *д.* — спаганяць. Грошай я не правіла. *Слаб.*

Празрысты, *прм.* — праніклівы. Ў Рыгора празрыстыэ вочы. *Дан.*

Пракаветны, *прм.* — вельмі стары, пракавечны. Пракаветная песня. *Чырк.*

Пракачацца, *д.* — перахварэць. Апанас пракачаўся на запаленьне цэлых п'яць тыднэў. *Дан.*

Пранозаваты, *прм.* — пранырлівы. Пранозаваты хлопец. *Дан.*

Прасьцецкі, *прм.* — просты. Прасьцецкіэ мае песьні. *Дубр.*

Праць, *д.* — мыць, біць пранікам бялізну. Годзі табе праць плацьцэ, йдзі абедаць. *Дан.*

Пропадам, *прс.* — цалком, дазваньня. Ніхай яно пропадам прападзе. *Дан.*

Пругмень *м.* — адгароджаны каля гумна ўчастак зямлі. На пругмені ставэць азяроды, садзэць грушы й яблыны. *Дан.*

Прудкі, *прм.* — сільны, лоўкі, пружыністы. Сяргута прудкі хлопэц,— яго ні збораэш. *Дан.*

Прыасётак, *м.* — прыбудоўка пры восеці (ёўні). Ў прыасётку злажылі пшаніцу. *Казл.*

Прыдбаць, *д.* — нажыць, набыць, прыжыць. Прыдбаў за жонкаю хату. Прыдбаў з ею троэ дзетак. *Дан.*

Прызьмо *н.* — лазовы калач, якім прывязваюць ярмо да рагача. Валы сарваліся с прызьма. *Коўц.*

Прымець, *д.* — мець магчымасьць. Каб прымеў, дак ён бы яго зьеў. *Дан.*

Прынакучыць, *д.* — абрыднуць. Яму было прынакучыла кудзеркі завіваючы. *Бял.*

Прыпінаць, *д.* — прывязваць. Жана мужа шанавала,—
На папары прыпінала. *Дабр.*

Прыстанішча, *н.* — прыстаньне, прытулак. Блытаецца на сьвеці, нідзе яму прыстанішча німа *Дан.*

Прыят, *м.* — прыёмнасьць. Жыве без прыяту. *Слаб.*

Псейка, *ж.* — кароўка (ласк.); паходзіць ад прызыўнага вокліка *псе, псе,* як „шутка—аўца" (ласк.) ад *шу, шу*!

Пстрыкаты, *прм.* — стрыкаты, пярэсты. Пстрыкаты конь. *Дан.*

Пстрычка, ж. — шчаўчок. Даў яму ў лоб п'яць пстрычак. *Дан.*

Птушыная дарога — Млечны шлях. Птушкі лецяць у вырай Птушынай дарогай. *Дан.*

Пуста, *пр.* — бяз сэнсу. Пуста ты гаворыш. *Дубр.*

Пусьціць, *д.* — выдзеліць (аб пчолах). Мае пчолы пат хатай пусьцілі ўжэ другога роя. *Дан.*

Пуха, *ж.* — шырокі канец яйца. Я твае яйцэ пухою паб'ю. *Рам.*

Пушка, *ж.* — 1) бляшаначка на табаку або наагул на дробныя рэчы. Махорку ўсыпаюць у пушку; 2) верхні згін пальца (скуры). На пальцах пушкі пазьбіваў. *Дан.*

Пушыць, *д.* — надуваць. Наеўся сьвежага хлеба, а цяпер жывот пўшыць. *Дан.*

Пылаць, *д.* — палаць. Дровы пылаюць у печы. *Дан.*

Пыса *ж.* — морда ў зьвяроў. Ў ліса вострая пыса. *Дан.*

Пярсьцісты, *прм.* — з тырокай грудзінай. Пярсьцісты конь. *Дан.*

Пярэбірка, *м.* — перабранае граблямі сена для больш зручнага складаньня яго ў капу. Ні ўмеє пярэбіркі перабраць. Набраў пярэбірку, як падняць. Чатыры пярэбіркі — во табе й капа. *Дан.*

Пярэзвы, *ж. мн.* — перазываньне гасьцей для пачастунку. Радня гасьцей зь вясельля запрасіла на пярэзвы. *Дан.*

Пярэзімка, *ж.* — цялушка-аднагодка. *Дан.*

Пярэлетка, *ж.* — леташняга году цяля. Пєрэлєтка цялушка. *Медзьв.*

Пярэсьцігі, *м. мн.* — выперадкі. Пабяжым на пярэсьцігі, — хто каго выпєрадзіць. *Майс.*

Пярэсьціць, *д.* — біць дубцом, палкай, рабіць пісюгі. Як пачаў яго пугаю пярэсьціць, дак усяго сьпісаў. *Дан.*

Пяршак, *м.* — першага адбору зерне, вадкасьць, першы наагул. Самагонка пєршак. *Дан.*

Развáжыць, *д.* — разагнаць, расьсеяць. Ніхто ні разважыць маей горкай долі. *Чырк.*

Разгаты, *прм.* — вілаваты. Разґаты дуб. *Дан.*

Раздабрэць, *д.* — пагладчэць. Раздабрэў на гуляшчым хлебі. *Дан.*

Раздажджылася, *д. 3 ас.* — задажджыла. Нешта раздажджылася неба. *Дан.*

Разжыцца, *д.* — разбагацець, абзавесьціся. Разжыліся трохі, як нам прырэзалі зямлі. Разжыліся на табаку. *Дан.*

Разьвівацца, *д.* — распускаць лісьце, распукваццa. Дуб позна разьвіваецца. *Слаб.*

Разьлягацца, *д.* — раздавацца, разносіцца. Ўвечары добра па лесі голас разьлєгаєцца. *Дан.*

Разьмінуцца, *д.* — разыйціся, разьехацца. Мы зь Яўхімам разьмінуліся каля Чарнецкай лужы. *Майс.*

Разьнягодзіцца, *д.* — раздажджыцца; разуменьне, працілежнае „распагодзіцца". Нешта-ж разьнягодзілася ўжэ другі тыдзень. *Дан.*

Ракам, *прс.* — сагнуўшыся. Жанкі жнуць жыта, стоячы ракам. *Дан.*

Раскол, *м.* — разбой, разбойнік. Еты раскол нікога ні баіцца. *Дан.*

Растаяць, *д.* — таяць. Увесну сьнег растае. *Дан.*

Расхіхлаць, *д.*—зьняць з маладой *захіхланьне* і надзець жаночы чапец, пасля чаго маладая пераходзіць з дзявочага стану ў жаночы. *Слаб.*

Расхлістацца, *д.* — расхрыстацца, мець адкрытую грудзіну. Ці табе горача, што ты расхлістаўся? *Дан.*

Расьцяроб, *м.* — расчыстка лесу пад поле. Лес аддалі на расьцяроб. *Дан.*

Рачкаваць, *д.* — працаваць, стоячы ракам. А тут рачкуй, жыта жні. *Вас.*

Рзаць, *д.* — ржаць. *Коўц.*

Роўка, *ж.* — доўгае тонкае бервяно, абодва канцы якога ўкладваюцца ў рашэціну. Паміж ровак закладаюць (азярэдзяць) снапы. *Дан.*

Рубец, *м.* — рубец. Прамок да апошняга рубца. *Дан.*

Рукаты, *прм.* — зладзейкаваты. За jім трэба сачыць: чалавек ён рукаты. *Дан.*

Ручыць, *д.* — шанцаваць, таланіць. Ему ва ўсім ручыць. *Іст.*

Рушыць, *д.* — 1) падняць, узьняць зьвера. Сабакі рушылі зайца; 2) зрушыцца, узьняцца з месца. Мы рушылі з двара. *Дан.*

Рызыкант, *м.* — адважны. Во рызыкант нашоўся. *Дан.*

Рык, *м.* — 1) рыканьне. Каровы рыкаюць,—мусіць, піць хочуць; 2) *валоў рык*—ужываецца для паказаньня адлегласьці, як можна пачуць рыканьне вала. — Ці далека да села?—пытаецца адзін. — Не, на валоў рык, — адказвае другі. *Дан.*

Рыхцік, *прс.* — як раз, акурат. Рыхцік у бацьку ўдаўся. *Майс.*

Рэдзгіны, *ж. мн.* — прымацованая да дзеравяных дужак пляцёнка, у якую накладаюць сена. Наклаў сена поўны рэдзгіны. *Дан.*

Рэкне, *дз. з ас.* — прамовіць. Маўчыць і слова ні рэкне. *Дан.*

Рэчка, *ж.* — рака. Пушчуся я на Дунай рэчку (ў песьні). *Красн.* Звычайна аднак гавораць *рака.*

Сабакам сена косіць—гультаіць, латруе (зьняв.).
— Што ён у горадзе робіць? — Сабакам сена косіць. *Дан.*

Сабачы вузел—вузел, які цяжка разьвязаць. Працілежны вузел—вузел *зашмаргам. Дан.*

Сагразіць, *д.* — прыстрашыць, учыніць што-небудзь у помсту. Чым ты мне сагрозіш? *Дан.*

Сад, *м.* — верхні і ніжні млынарскія каменьні. Ў млыне малолі на два сады. *Дан.*

Сапсець, *д.* — састарэць падобна сабаку, згрыбець. Сапсеў чалавек. *Дан.*

Сапстрыкацца, *д.* — падупасьці, змарнець. Быў гаспадар, а цяпер сапстрыкаўся. *Дан.*

Саранчук, *д.* — жоўтая махрастая з моцным ароматам кветка. Ў гародчыку цьвітуць саранчукі. *Дан.*

Саўсім, *прс.* — зусім. *Дан.*

Саха, *ж.* — вілаватая падпора, на якую пры будоўлі кладзецца волак. Саху трэба выбіраць дубовую, штоб доўга стаяла. *Дан.*

Сашчапіць, *д.* — сьціснуць. Сашчапіў кулакі. *Дан.*

Серадзіць, *д.* — пасьціць па серадах. Ніхай той серадзіць, хто дома сядзіць. *Красн.*

Сёстрык — гейка, прыяцелька. Хадзем, сёстрык, на йгрышча. *Рам.*

Сібірны, *прм.* — сярдзіты, злосны, капасны. Сібірны вецер. Сібірны чалавек. *Дан.*

Сівер, *м*—1) поўнач. Вецер падуў сь сіверу; 2) рэзкі паўночны вецер. Сівер і праз кажух праймае. *Дан.*

Сіверкі *прм.* — гл. **Сіверны**

Сіла, *ж.* — справа, рэч. Ні ў тым, сіла што кабыла сіва, а ў тым, што воза ні вязе. *Дан.*

Сінюха, *ж.* — лучына з абалоны хвоі. Ўстаў сінюху ў дзядок, а то зараз патухне. *Дан.*

Скаліць, *д.*—1) разьведваць. Пчолы скаляць,—мусіць хутка сядзе рой. Што ты скаліш? Ці ні ўкрасьці што хочаш? *Дан.* (Іншую пчалярскую тэрмінолёгію гл. ў канцы артык. пад заг. „Пчолы").

Скалка, *ж.* — 1) асколак крэменя. Аб скалку вусекаюць агонь. *Слаб.;* 2) каплі тлустасьці ў страве ці на вадзе. Ў крупніку плаваюць скалкі. *Дан.*

Скідаць, *д.*—скласьці сена ў стог. Скідалі стог сена. *Дан.*

Склешчыцца, *д.*—1) злучыцца, зьвязацца; 2) спарыцца. Гаворыцца аб сабаках. *Дан.*

Скрыня, *ж.* — дадатковы зруб на дне калодзежа. Вада ў калодзежы асталася толькі ў скрыні. *Дан.*

Скрып, *м.* — скрыпеньне. Хадзем усе с хаты за 'дным скрыпам. *Дан.*

Скрыпель, *м.* — сухая губка з дрэва, якою падкурваюць пчолы. *Дан.*

Слабкі *прм.* — слабы. Слабкі вузел завязаў. *Дан.*

Слава, *ж.* — пагавор, няслава. Яна мене не набіла,
Толькі славы нарабіла. *Слаб.*
Калі ходзіш—дак хадзі,
Людзям славу ні рабі. *Чэрн.*

Слука, *ж.* — слонка, сланец. Слука ляціць і крычыць:
„Бур-лыс! Бур-лыс!" *Дан.*

Слупа, *прс.* — стаяць падобна слупу. Чаго ты стала слупа, як пень? *Дан.*

Смаркачы, *м. мн.* — саплякі. Утры перш смаркачы, а тады гавары. *Дан.*

Сопкі — рассыпчаты, крохкі. Сопкая картопля. Сопкае яблыка. *Дан.*

Справіць, *д.* — 1) наладзіць. Справіў пляменіцы вясельле; 2) абзавесьціся. Справіў новыя боты. *Дан.*

Сыкаць, *д.* — 1) сіпець. Гадзюка сыкае; 2) выражаць у грубых формах незадаваленьне. Чаго ты на мяне сыкаеш? *Дан.*

Сырамалот, *м.* — малачэньнё збожжа без папярэдняга яго прасушваньня ў ёўні. Ў ёўні печка раскідалася—дак мы ўсе свае жыта сырамалотам і памалацілі. *Дан.*

Сплыціцца, *д.* — шчапіцца. Во хлопцы сплыціліся біцца! *Казл.*

Спляжыць, *д.* — сьсекці дазваньня. Быў лес, да спляжылі. *Дан.*

Спорны, *прм.* — 1) спрэчны. Спорная сена; 2) пасьпяховы. Спорная работа, 3) густы, часты. Спорны дож ідзе; 4) выгодны, які доўга цягнецца. Спорны хлеб. *Дан.*

Стайла, *н.* — гл. **Подкур.**

Сталюгі, *ж.* — прылада, на якую пільшчыкі кладуць калоду. *Дан.*

Стан, *м.* — месца, дзе ў поўдзень аддыхае тавар. Тавар стаяў на стану. *Дан.*

ЦГБ НАН Беларуси

Станавіць, *д.* — будаваць. Рыгор становіць хату. *Слаб.*
Стары, *прм.* — апошняя (чацьвёртая) квадра месяца. На старым добра класьці капусту. *Дан.*
Старызны, *прм.* — вельмі стары, пракаветны. Старызныя песьні Агата знае. *Чэрн.*
Стаць, ставаць, *д.* — хапаць. Як у яго сілы стае несьці такі вялікі мяшок. *Дан.*
Стойка, *ж.* — прылада, у якую ставяць дзіця, каб прывучыць яго стаяць. Дзіця стаіць у стойцы. *Дан.*
Страдаць, *а.* — мучыцца, пакутаваць. Страдае да канца веку. *Дабр.*
Страла, *ж.* — журавель; доўгае бервяно ў калодзежы, па сярэдзіне ўмацованае на сасе. Да прыпаднятага канца прывязваецца *вочап.* *Дан.*
Стрэмка, *ж.* — заноза. Загнаў стрэмку пат кіпець. *Дан.*
Ступа, *ж.* — конская хада шагам. Конь ішоў ступою. *Дан.*
Сумна, *прс.* — страшна. Ў лесі нешта трэснула, і мне зрабілася сумна, сумна. *Дан.*
Сунімацца, — спыняцца. Дож ужэ суняўся. *Чэрн.*
Сусед, *м.* — сусед. Брат сястры далёкі сусед. *Пал.*
Сутарга, *ж.* — сударга. Сутарга руку ломіць. *Дан.*
Сухі, *прм.* — сухі. Сухі вецер. *Дан.*
Сынажаць, *ж.* — сенакосны вучастак, пераважна адасоблены (ў лесе). *Коўц.*
Сьвесь, *ж.* — швагерка, сястра жонкі. *Сапейкі.*
Сьвіднёвы, *прм.* — сьвізінавы. Атсяку сьвіднёвае вяселечка. *Красн.*
Сьвізіна, *ж.* — рас. „Курослеп-дерево". *Дан.*
Сьвіныя галасы — позьні час, калі ўжо сьвіньні просяць есьці. Ўстала ў сьвіныя галасы. *Дан.*
Сьвіньня, *ж.* — від гульні з кіямі. *Дан.*
Сьлепат, *м.* — дзікія пчолы, што жывуць у лесе па дуплях. Гармон нашоў у Казаковым Лесі сьлепата. *Дан.*
Сьляпіцаю, *прс.* — неадчэпна, нахабна. Сьляпіцаю лезе ў вочы. *Дан.*
Сьняжыць, *д.* — падае сьнег. Цэлы дзень сьняжыць. *Дан.*
Сьпека, *ж,* — сонцапёк. Пасеяў грэчку на самай сьпецы. *Дан.*
Сьпяваць, *д.* — сьпяваць царкоўныя песьні. Ў цэркві сьпяваюць, а песьні пяюць. *Дабр.*
Сьцежар, *м.* — жэрдка, якая забіваецца ў адонак для ўмацаваньня стогу. Калі сьцежар крывы, то цяжка стаптаць роўны стог. *Дан.*
Сьцяльнік, *м.* — соты. Тры сьцельнікі м'ёду вуразаў з вульля. *Слаб.*
Сяргітут, *м.* — сэрвітут. Народная этымолёгія. *Слаб.*
Таварачы, *прм.* — быдлячы. Таварачы пастух. Таварачы хлеў. *Майс.*
Такаваць, *д.* — 1) іграць на „таку". Гаворыцца аб цецярукох, бакасох. Ў марцы такуюць цецярукі. *Дан.*; 2) сьпявяць на таку. Калі цецярук такуе, дак к яму лёгка падкрасьціся. *Дан.*
Танец, *м.* — скокі. Ашуканцы пашлі ў танцы,
Абібокі пашлі ў скокі. *Дан.*
Таптаць — апрача агульна-вядомага значэньня—1) складаць на стагу сена, прытоптваючы яго. Колькі я за сваю жытку стагоў патаптаў; 2) спарвацца. Певень топча курыцу. *Майс.*
Тварыць, *д.* — спырскваць вулей васкавіцай, настаўляць у ім воск і ўкладаць зялёны ліст для прывабліваньня пчол. Увесь сакрэт акту „тварэньня" ў васкавіцы. Добра патворыш вулей, дак і пчолы сяduць. *Дан.*

ЦНБ БДПУ Беларуси

Ток, *м.* — месца, дзе „такуюць“ цецерукі, глушцы, бакасы. На таку добра лавіць бакасоў. *Дан.*

Топкі, *прм.* — цьвёрды. Ў рацэ топкае дно. *Дан.*

Точка, *ж.* — колік, які служыць межавым знакам. Пратапчы на поплаві мяжу на точкі. *Дан.*

Трапкачы, *м. мн.* — сорт ручніка, які мае доўгія незатканыя канцы. Ў трапкачы заўязваць гаршкі й гладышы, калі йдуць на поле. *Дан.*

Траціна, *ж.* — трэйцяя частка. Івану дасталося зямлі толькі траціна надзелу. *Казл.*

Трацяк, *м.* — трэйцяга адбору, трэйці па ліку. Пчолы пусьцілі трацяка; 2) трох гадоў. Бычок-трацячок. *Дан.*

Трубакур, *м.* — заўзяты курэц. Еты трубакур усе пакурыць. *Дан.*

Трушанка, *ж.* — ператрэсенае сена з саломаю. Ўзімку ў нас тавару даюць трушанку, а конем сена. *Дан.*

Тугі, *прм.* — 1) напнуты, моцна нацягнуты. Тугая струна; 2) цьвёрды. Тугая скула. — Ў цябе скула тугая? — Тугая. — Дак ніхай сядзе другая. *Дан.*

Тухнуць, *д.* — 1) гаснуць (апошняга слова ў раёне я ня чуў); 2) спаць бяспроспы. Годзі табе, ланя, тухнуць! *Дан.*

Уважыць, *д.* — уступіць, аказаць павагу, пашану. Уваж старому. *Дан.*

Увароткі, *прм.* — вёрткі. Як ўюн, увароткі хлопец. *Казл.*

Уверадзіцца, *д.* — надарвацца, моцна стаміцца. Ўверадзіўся працуючы. *Дан.*

Удавацца, *д.* — быць падобным на каго-небудзь. Сын увесь у бацьку ўдаўся. Мой бацька такі маўся, і я ў яго ўдаўся. *Дан.*

Удача, *ж.* — няўдалы, няздатны. Ну й удача сь цябе, нічога зрабіць ні ўмее. *Дан.*

Узапар, *д.* — адзін за адным, адначасна. Ўзапар усе прышлі. *Дан.*

Узьбіцца, *д.* — 1) напароцца на што-небудзь. Ўзьбіўся на нейкі ражон; 2) абзавесьціся чым-небудзь. Ўзьбіўся на худобу, на хаджайства. *Дан.*

Узяцца ў клубы — палажыць рукі на тазавыя часьці цела. Стаіць, узяўшыся ў клубы. *Дан.*

Укасіць, *д.* — трохі накасіць. Ўкасі конем сена на нач. *Дан.*

Укіпець, *д.* — зварыцца, згатавацца. Вада ўжэ ўкіпела. *Дан.*

Уклясьціся, *д.* — памерці. Ігнат уклаўся, цяпер ужэ яму нічога ні трэба. *Дан.*

Укупе, *прс.* — разам, супольна. Хто робіць укупе, таму ні баліць у пупе. *Дан.*

Улегцы, *прс.* — у парожніх калёсах. Зь мястэчка я выехаў ўлегцы. *Майс.*

Улялюшчыць, *д.* — упякаць. Ўлялюшчыў грошы, як пат хвост сабаку сунуў. *Дан.*

Унаначакі хадзіць — хадзіць да дзяўчат уночы спаць. З-замаладу я часта хадзіў к дзеўчатам унаначкі. *Дан.*

Упаляваць, *д.* — забіць, застрэліць зьвярыну. Добрага зайца ўпалеваў. *Дан.*

Уперак, *пр.* — упоперак. Ён лажыцца спаці
Ўперак караваці. *Чырк.*

Упіткі, *м .мн.* — піцьцё. Прышлі на паньскіе ўпіткі, на паньскіе ўедкі. *Вас.*

Упякаць, *д.* — нерэнтабельна ўлажыць маёмасьць у прадпрыемства, улялюшчыць. Ўпякаў грошы, а цяпер ні вырвеш. *Дан.*

Уродлівы, *прм.* — ураджайны. Ўродлівы год на ягады. *Майс.*

Уручы, *прм.* — здольны, здатны. Сын невехну везе ўручую і рабочую. *Чэрн.*

Утапіць, *д.* — усадзіць. Ўтапіў нож у грудзях. *Майс.*

Уцьвяліць — раззлаваць, раздражніць. Ўцьвяліў хлапца, а цяпер ён плача. Што ты цьвеліш сабаку? *Дан.*

Уцягнуцца, *д* — набыць прывычку да чаго-небудзь. Ўцягнуўся ў гарэлку.

Учамярыцца, *д.* — укараніцца, прыкінуцца. Нейкая трасца ўчамерылася.

Ушкуліць, *д.* — нанесьці боль, задзець за жывое. Ты ўжэ ўшкуліў дзіця, што яно плача. *Дан.*

Ушула, *н.* — 1) слуп з пазамі ў будове, у які ўкладаюцца канцы бярвеньня; 2) тоўстая, нярухавая жанчына. З етым ушулам ні наскачаэсься. *Дан.*

Ушчаперыцца, *д.* — 1) учапіцца. Ўшчаперыўся за гіры, 2) узьлезьці. Ўшчаперыўся на самы шчыт хвоі. *Дан.*

Ушчуваць, *д.* — караць; выхоўваць караючы. Калі ні ўшчуваць дзіцяці, то дабра ні будзе. *Дан.*

Фэст, *м.* — залажэньне, прыстольнае каталіцкае сьвята, на якое зьяжджаецца шляхта з усёй акругі. Палюцкаваліся дзеўкі на фэсьці. *Майс.*

Хайлук, *м.* — гняздо белкі. Куніца спаймала белку ў хайлуку. *Дан.*

Халепа, *ж.* — негадзь, слота. Ну й халепа сягодня на дварэ: дож, вецер, холад! *Дан.*

Характар, *м* — почырк. Есіп што піша можна рашчытаць: ў яго добры характар. *Майс.*

Хахлач, *м.* — калач? Ні плач –
Купім хахлач.
М'ёдам памажам,
Нікому ні пакажам. *Дан.*

Хахол, *м.* — канец меха. Вазьмі мех за хахол. *Дан.*

Хвашчанка, *ж.* — пучок хвашчу, якім шаруюць посуд. Хвашчанкай добра шараваць дзераўяныя міскі. *Дан.*

Хвіля, *ж.* — бура. Усхадзілася хвіля-бура. *Красн.*

Хвоя, хвойнік — „Сасна" ў раёне не гавораць.

Хібетнік, *м.* — здольны, здатны. Воцета чалавек хібетнік,—ўсе ўмее рабіць. *Рам.*

Хібетны, *прм.* — здольны, здатны. Ён хібецен. *Рам.*

Хмурны, *прм.* — 1) хмарны, пахмурны. Хмурны дзень; 2) нудны, смутны. Хмурны чалавек. *Майс.*

Храпа, *ж.* — 1) ножка або качарэжка капусты. Капусту пазразалі й пусьцілі коней на храпу; 2) пераносіца ў каня або зьняважліва ў чалавека. Вазьмі каня за храпу. Маўчы, а то як дам у храпу, дак і кроўю ўмыесься. *Майс.*

Хрось, *м.* — крыж. Матка здрава, хрось сьветы, на гары цэркаўка (ужываецца, як бажэньне). *Чэрн.*

Хтоцкі, *займ.* — хто гаворыць „хто?"—Хто ета паеў сала, пытае Есіп у Кузьмы.—Хто, можа хтоцкі! (значыць Есіп), адказвае Кузьма. *Дан.*

Худоба, *ж.* — быдла, тавар, статак. Ражжыліся на худобу,—малі два валэ й дзьве карове. *Слаб.*

Цахліць, *д.* — аднастайна брахаць па сьледу зьвера. Сабакі цэхляць, мусіць знашлі зайца. *Майс.*

Целяпень, *м.* — целяпайла. Сьвэты целэпень (кажа баба, гледзячы на каталіцкі звон), ні ўбі мэне цэпер; жыла—ні была й умру—ні пайду. *Істоп.*

Ціпец, *м.* — сівец, каманішнік (Succisa praemorsa Aschers). Ціпец і добрая каса ні бярэ. *Коўц.*

Ціўкаць, *д.* — гаворыцца аб гуках птушанят. Верабейкі ціўкаюць у гнязьдзе. *Дан.*

Цубкі, *прм.* — цьвёрды, шчытны, дзябёлы. Цубкаэ сукно. Цубкі ў руках хлопэц. *Дан.*

Цыбук, *м.* — 1) папяросьнік. Зрабіў цыбук на папяросы; 2) мундштук. Калі вужацы даць соку з цыбуку ад люлькі, дак атруціцца. *Дан.*

Цыбульнік, *м.* — цыбульнае націньне. На градах ужэ пасох цыбульнік. *Майс.*

Цынгель, *м.* — кручок для спуску корка ў стрэльбе. Калі пацягнэш цынгэль, дак корак па брамцы й стукнэ. *Дан.*

Цэлка, *ж.* — дзірчастая палачка, на якую на сукале насукваюць для чаўнака ніткі. Насукаў п'яць цэлак. *Дан.*

Цяпло, *н.* — агонь. Пастухі на палянцы разлажылі цяпло. *Дан.*

Чакуха, *ж.* — від доўбні з устаўной ручкай для дзяржаньня. *Майс.*

Чалесьнік, *м.* — вусьце печы. Гаршкі сушацца ў чалесьніку. *Дан.*

Чапляя, *ж.* — чапяла, ёмка. Чапляёй дастаюць сь печы скавароды.

Чарэн, *м.* — 1) ніжняя паверхня ў печы. На хлеб трэба гарачы чарэн; 2) верхняя паверхня печы. Пастаў п'яты на чарэн, мо кашаль пройдзе. *Дан.*

Чацьвярціна, *ж.* — чацьвёртая частка чаго-небудзь. *Казл.*

Чукаць, *д.* — падкідваць на руках дзіця. Пачукай дзіця, каб ні плакала. *Чырк.*

Чэпік, *м.* — птушка з пароды бакасоў. *Дан.*

Шалпатаць, *д.* — шамаць, шастаць, шумець (гаворыцца аб уюнох, чэрвях). Ўюны шалпочуць у рэшаці. *Дан.*

Шальмец, *м.* — машэнік. Што-ж ты, шальмец, нарабіў? *Дан.*

Шанаваццa, *д.* — берагчыся, добра трымацца. Шануйся сам, хлопча, то й людзі шанаваць будуць. *Майс.*

Шарон, *м.* — сьнежная скарынка, сярон. Па шарону добра езьдзіць на лыжах. *Дан.*

Швэндаць, *д.* — хадзіць бяз пэўнай мэты. Ў нас усякі народ швэндаэ. *Майс.*

Шлёгаць, *д.* — сьцёбаць. *Майс.*

Шмат, *пр.* — многа. Шмат я гады на сьвеці пражыла. *Дубр.*

Шолудзі, *ж. мн.* — струпы на галаве, пархі. Была-б галава, а шолудзі будуць. *Дан.*

Шуст, *м,* — ашуканец, падманшчык. Шуст ты пратаскі! *Істоп.*

Шуядзь, *ж.* — малеча, блазнота. Шуэдзі етай назьбіралася, дак аж хату разносэць. *Дан.*

Шлакатаць, *д.* — казлытаць, ласкатаць. Чалавека можна зашлакатаць. Дзіця баіцьця шлокату. *Майс.*

Шчань, *ж.* — дзяжа. Цэлую шчань капусты нашаткавала. *Слаб.*

Шчогла, *ж.* — мачта. На шчоглу сьсеклі самую высокую елку. *Дан.*

Шчоўкнуць, *д.* — высьлізнуцца з гукам. Арэх шчоўкнуў і выскачыў з гранкі. *Дан.*

Шчыт, *м.* — верх, вільчык. Ўзьлез на самы шчыт елкі. *Дан.*

Юр, *м.* — вясёласьць, якая гранічыць з пахатлівасьцю. Сытай бабі юр на ўме. *Майс.*
*Ю*шка, *ж.* — поліўка. Хто зɜваɜ, той юшку хлɜбаɜ. *Дан*
Яглы — Еў ты яглы?—Якія яглы?
— Тыя, што спаць паляглі. *Дан.*
Ялавіна, *ж.* — аблога, гуляшчае поле. Пасей жыта на ялавіні. *Дан.*
Ярчук, *м.* — злы, сярдзіты сабака. Ет ярчук усіх сабак перакусаɜ. *Дан.*
Ярчэйшы, *прм.* — больш сярдзіты, зьлейшы. Наша сабака ярчэйшы за вашага. *Дан.*
Ясьнецкі, *прм.* — ясны. Забалела цела ясьнецкае бела. *Чэрн.*

УЗОРЫ ГАВОРАК РАЁНУ.

Сялянскія гаворкі.

Кàзка.

Жиў дзя̀дзька с плямѐнікам. Пашлí яны̀ пчол глядзѣць *). Плямé-нік пашòў ламàць éльнік, а дзя̀дзька сядзѣў на хwбі, глядзѣў пчол. Wɒт дзя̀дзька спусьцìў лýбку зь мёдам. А другì чалавѣк прышòў да стаў ѣсьці. Кíнуў дзя̀дзька сьнятóк на тагò чалавѣка да й убíў. Што jім тады̀ дзѣлаць с тым чалавѣкам? Ўзялì ягò й панéсьлі к wòзɜру. Там буў рыбàцкі чòwен. Пасадзілі яны̀ забìтага ў чòwен, дàлі ямў wясло̀ ў рўкі — дак jɒн і паѣхаў.

Настаўля̀ў чалавѣк сѣці. Бà̀чыць — нѣхта ѣдзɜ. Jɒн і пытàɜ: „Куды̀ ты, чалавѣк, ѣдзɜш? Заплўтаɜсься ў сѣці, дак ні wы̀бɜрасься“. А той ѣдзɜ. Тады рыбàк даў ямў wяслɒм па галавѣ і забíў ягò другí раз.

Прын'ɒс рыбàк забìтага ў мястэ̀чка й пасадзìў папў на wɒз. Прыхòдзіць пɒп к сваймў wóзу, аж там нѣхта сядзіць. Пɒп як кры̀кне—конь спужа̀ўся й паѣхаў. Дагна̀ў пɒп свой wɒз і забíў тагò чалавѣка ў трэ̀йці раз. А тады̀ й схawа̀ў.

Пакалічы.

Спарадзíла мàці дòню,
Да й ні дàла дóлі,—
Тɒлькі дàла стан харòшы
І чóрныя брówы.
Брówы маѣ, брыwà̀шанькі!
Прапà̀ла я з wамі,
Нѣльга wы̀йці на wў̀ліцу
Ўсё за wарагáмі.
Wарўòжачкі спаць паля̀гуць,
Пайдý пагуля̀ю.
Як wы̀йду я на wў̀ліцу,
Ліцó загары̀цца,
Ліцò маё загары̀цца,
Брòвы замаргà̀юць.

Чаго брòwы замаргà̀лі?
Мíлага wідà̀лі.
Ні хадзì ты, бел-кудрáwы,
Каля майгò сà̀ду,
Ні тапчы ты, бел-кудрawы,
Маёй руты — мі͡аты.
Ні для цябé я садзíла,
Ні для цябé паліwáла.
Для тагò я садзíла,
Каго я любíла;
Для тагó я паліwà̀ла,
Каго цалавá̀ла

Пакалічы

Дў̀рні, сwат͡ыэ, дў̀рні
Да заѣхалі ў гў̀мны.

У салóмі начawà̀лі,
Мы̀шы wýшы па'т'ɜдà̀лі

*) ѣ азначае дыфтонг і͡э, ɒ—у͡о.

Бычкў ў ру́чку да́лі,
С аўцо̀й пawітàліся,
Сь сьwінёй цалawа́ліся.

Сьwіня̀ тàя задзіwìлася,
Сò сьмɛ́ху пакацìлася.

Пакалічы.

Аӣ, ко̀ню, мӯй ко́ню,
Ко́ню wаранѐнькі!
Парàй-жа мнѣ раду
Да мнѣ маладо́му.
Наштò табѣ ра́іць,
Ты й сам до̀бра знаɛ́ш:
Ні любі́ чужы́х жо́нак,
Бо ты cwаю̀ маɛ́ш.
А чужа́я жӯнка,
Як асìна гӯрка,—

Cwая̀ маладзѐнька,
Як мёд саладзе́нька.
Пасьцѐля пасьцѐльку
Мя̀кеньку, бɛлѐньку.
Дзяўчы̀на, сірӯтка,
Не сьцялì шыро́ка.
Пасьцɛлì wузѐнька,
Паля̀гам блізѐнька,
Дай бў̀дам гawары̀ць,
Як на сьwѣці жыць.

Дабравольшчына.

Як жылі пры панох.

Калì жыў тут у Каралѐўскай пан сам стары̀, то ні судзì бò̀жа, як дрэ̀нна жылò̀ся сіля̀нам. Мужчы̀ны хадзі́лі працава̀ць па тры дні да па́на. Дзіўча̀ты хадзìлі мыць падло́гі ў пако̀ях, працава̀лі на гарбо́дзі. Бува̀ла, яка̀я ўкра̀дзе мо́ркву, яе разло̀жаць і акано̀м бі́е бізуно̀м, а з бако́ў стая̀ць два чалавѐкі і трыма̀юць яѐ. Дзе́ці па́сьцілі індыкаў, ка̀чак у двары̀. Увѐсь год працава̀лі для па̀на, а для сябе́ ні было̀ калì. Узìмку галада̀лі, а хлеб, калì быў, дык на̀ват ні высіва̀лі, а пеклì й èлі зь мякìнай. Бувала на рабоце було́ ця̀жка; бірэ̀менныя ба́бы чаго̀ й ні зро̀бяць, застаўля̀ў яе́ акано́м ісьцì і сьпіва́ць, браў на ўцяжку і бìлі. У сіля̀н надзѐлы былì малы̀я, і тых ні было̀ часу абрабіць. Ара̀лі вуала̀мі [1]), а ко̀няй до́бра ні по̀мню, ці былì. У вёсцы кама́ндуваў вуойт, і тады̀ было́ ціха. Жылì вялìкімі сѐміямі, а каб табѐ сва́рка, дык ні пачу̀еш, за́раз бы да̀лі бізуно̀ў. Ні мо̀жна было̀ вы̀нісьці зьдзе́каў, вы̀сікуць цябе́ й трэ̀ба маўча̀ць. Калì ста̀ла во̀лнасьць, лю̀дзям было́ ляг-чэ̀й. Куодла па́ньскае дава́лі сіля̀нам вуо́бруб. Пазьнѐй прадава́лі, і за дзівяно̀ста рублѐй мо̀жна было̀ купìць до̀бры надзѐл.

Васілёўка. Па запісу настаўніка С. Атраховіча.

К а̀ з к а.

Ета было̀ пры пано̀х. Найшоў пан пастухо̀ў с такім угаво́рам: хто каго усе́рдзіць, і таму̀, хто усѐрдзіцца, вў̀шы адрэ̀заць. Ён пастухо́м нічо̀га не дава́ў, апро́ч вады̀ с со̀льлю. Прыганя́ў увѐчары каро̀ў пастў̀х, а яму̀ давалі вады̀ сало̀най. Пастў̀х кажа са злосьці: „я е́сьці хо̀чу!“ Вў̀шы дало̀ў. Так чалавѐк з два̀ццаць пірабра́ў пан, а по́тым нарва̀ўся на аднаго̀. Пагна̀ў той каро́ў, до̀іць, есь, б'е ма̀сла на стану́. Тады̀ прыго̀ня ўве́чары каро̀ў, падаю̀ць яму̀ вады̀, а ён ка́жа: „А я-ж піць, піць хо̀чу“. Дове́даўся пан, злуе́, што пастў̀х до̀іць каро̀ў, б'е ма̀сла, а маўчы̀ць, бо як абзавѐцца, вў̀шы абрэ̀жуць. Раз пае́халі яны̀ ў го́рад. Пан заказа̀ў, каб ку́чар прыгатава́ў яму́ абѐд, а ў таго гро́шай ні было́. Ён атпро́г аднаго̀ каня̀, павёў на база̀р і прада̀ў. Пан паабе-

[1]) Блізкасьць у вымаўленьні *в* да нескладовага *у* (w) выклікала ў запішчыка такі спосаб азначэньня гэтага гуку.

да́ў і пытàецца: „За што ты купіў абе́д?“ А ён кàжа: „Я, пàне, канѝ прадàў; завізе́, па́не, нас і па́рка“. Тады́ пан кàжа: „Ідзі купі мазі́ пама́заць файтон“. Ён пашòў, купіў ху́нтаў зь дзѐсяць мазі́ — цэ́лы глады́ш і вы́мазаў увѐсь файтòн, і там, дзе садзі́цца пан. Пàну німà чаго́ каза́ць. Пан і кàжа тады́: „Ідзі, купі паркàлю“. Дык ён пашо́ў, у со́рнай ѝмі папàў рагòжу ды прынёс. Се́лі яны́ й паѐхалі дамо́ў. Дома пан і кажа пàні: „Рашчытàйма ѐтага слу́жку“. Пàні кàжа: „Дàйма ямý пяць кароў, тро́йку конѝй, пастàвім дом, ніхàй жыве́“. Так ён і ціпе́р жыве.

Васілёўка. Па запісу настаўніка С. Атраховіча.

За бо́р со́нца, за дубро́ву,—
Пара́ жанцо́м дадо́му.

А мнѣ маладзѣ́ ні хо́чацца
Калі пе́чы wаро́чацца.

Краснаўка.

Ой wалы́э-ж маѣ, дай палаwы́е!
Чаму wы не арэце?
Лѣты маѣ маладзенькі́е!
Чаго wы марнее́це?

Штоб маjім wало́м сѣ́на да мур9г,
Дак яны́-б паэда́лі.
Штоб маjім лѣтам шча́сьце і до́ля,
Дак яны́-б пагуля́лі.

Язьвінцы.

А я ў по́лі жы́та жа́ла,
У ме́не ў до́мі шко́да ста́ла:
Сьwякрў́ха с пло́ту ўпа́ла,
Крапíwачку палама́ла.

Крапíwачка-патрàwачка,
А сьwякрў́ха—ні мàмачка.
Крапíwачку сьwіня́м сѣ́кці,
А сьwякрў́ху—чарwя́м ѣсьці.

Бяліца.

„Старыя лячыць“.

Мíньскія, бабру́йскія, пàрыцкія, азàрыцкія, катòрыя на агні пагарэ́лі, като́рыя на wадзѣ патапíлі, катòрыя гàды пазасысàлі, като́рыя на даро́зі, катòрыя на парòзі дў́шачкі прàwедны́е прад го́спадам бо́гам стая́лі; като́рыя непрàwедны́е, каб із нàмі ні стракàліся із нàмі не wітàліся. Като́рыя прàwедны́е, пе́рад jімі стòлікі стаяць, сьwѣ́чы гарàць; стòлікі пазасьцілàны, кў́бкі паналіwàны. Катòрыя непрàwедны́е, залатóю мѣ́ччу сѣ́кчы, рубàці, на пàньскі дwо́р ссылàці, на пàньскі́е ўпíткі, на пàньскі́е ўѣ́дкі. Там wам смàчнае ўжыwàньне, м‘я́ккае аддыха́ньне. Раб бо́жы (сказаць ім‘я) ні быwàў, сэрца ні тамі́ў, галаwы́ ні крушы́ў. Бо́г с пòмаччу, а я с cwajім дў́хам.

Данілоўка.

Ужэ́ ве́чар wечарэ́е—
Маé сэ́рца wесялѐе
На слàсную wячэ́рачку,
На м‘я́ккую пасьце́лечку.
Чырwо́ная калíначка
Ні сто́й ў лу́зе над wадо́ю,
Ні раўня́йся са мно́ю.
Было́ тады́ раўнawàцца,

Як я былà ў cwайго́ тàткі,—
Таўшчэ́й былà twайго́ дрэ́wа,
Бялѐй была́ twàйго цьwѣ́ту,
Красьне́й былà twajíх ягад.
А цяпѐр я у сьwе́каркі
Стàла тòнка, як былíнка,
А wы́сахла, як лучы́нка.

Данілоўка.

Да со́нейка ў wòду ўпàла,—
Там малóдка wòду бра́ла,
Да с сòнейкам размаўля́ла:

„Ой со́нейка, со́нейка!
Ці було́ ты ў бо́га на ўмѣ,
Ці спагадàеш па мнѣ?“

„Дзіўнàя ты, малòдачка.
Што табѣ сóнейка wінawàта?
Wінawàт табѣ twой сьwòкарка,
Што рàна цябѐ пабуджàе,
Да на пòле wупраўляе.
Ой я рàненька ўзыйдў
Да цябѐ ў пòлі застàну,—
Да я пóзьненька зайдў,
Да цябé ў пòлі пакідàю.

Слабѣдка.

Ой зѐлена, зéлена ў лýзі трawà,
Ой мòлада, мòлада ў мўжа жaнá.
Затым трawà зéлена, што дòж-
джык ідзé,
Затым жaнà мóлада, што дóля дa-
брà.
Сьwóкарка па сѣнечках пахàджywae,
Jѣн cwаю̀ newѣхначку пабуджуўае:
„Ўстawàй, ўстawàй,
Newѣхначка, чужое дзіця!
Ужэ кўры канѣплі паўгрэ̀буўалі,
А кòзы капўсту пазрыэзуўалі.
Яѐ мíленькі па сѣнех пахàджуўае,
Да jѣн cwаѐй мìлай прикàзуўае:
„Да сьпì мaя̀ мілая да бѣлага
дня.
Нà-ж табѣ ў галòўкі падўшку
маю.
Да я тыѣ кўры ў сѣні заманю̀,
Да я тыѣ кòзы ў хлёў зажанў“.

Чэрнін.

Німá гѣрш у сьwѣці,
Як мнѣ сіраціні;
Да ніхтó ні пригòрне
При ліхóй гадзíні.
Ні пригóрне бáцька,
Ні пригòрне màці.
Да ніхàй тѣй пригóрне,
Штѣ дýмае ўзя̀ці.
А жиwў я ў гòры,
Як булìна ў пóлі.
Ніхтó ні разwà̀жыць
Маéй гòркай дòлі.
А я тўю wагу
Да самà разwà̀жу,—
Пасьцялю̀ пасьцѐльку,
Да спà̀танькі ля̀гу.
Пасьцѐлька белéнька,
Самà маладзéнька,
Устàну ранéнька,
Ўмы̀юся белéнька;
Пагляджў ў акóнца,
Дзе усхòдзіць сóнца.
Дзе сòнейка ўсхòдзіць,
Там мѣй мíлы хòдзіць,
Чужўю мілўю,
Пад рўчанькі wòдзіць.
Пры̀дзе jѣн дадóму—
Са мнѣй не гавòрыць.
Jѣн лажы̀цца спáці
Ўпѐрак карawà̀ці.
Ой бòжа мѣй, бòжа,
Якà̀я мaя дòля.

Чыркавічы.

Лецѣлì гўсі зь wісóкага гà̀ю.
Wы/у постóйце, гўсі, я ў wас
пап ы/у таю;
Ці ні с тагò крà̀ю, аткўль
дружкà màю.
Паляцѣлі гўсі у лѣс у лесòчак,
Сѣлі, пà̀лі гўсі на жòўты песóчак,
Загледзѣла маладà тѣлькі дwà
сьлядѣчкі.
Адзін сьлядòчак канà̀ waранòга,
Другі̀ сьлядòчак—то майгó мілóга.
Аторвў я маладà клено́wы лістòчак,
А накры̀ю я мілóга сьлядòчак.
Каб жэ сьлядòчак да не ўпуліўся,
Каб мѣй мілéнькі да ні зажуры̀ўся

Чыркавічы.

Дабрà̀нач,мѣй тà̀тка, дабрà̀нач!
Да ўжэ éты дабрà̀нач ні нà̀нач,
Ні на 'днý нòчаньку, ні на дзьвѣ.
Да ўжэ éты дабрà̀нач на ўwесь wѣк,
Ні на мене маладую, на ўwесь
сьwѣт.

Чыркавічы.

Шляхецкія гаворкі.

П ч о̀ л ы.

Ў нас ішчэ багàта ў каго́ е пчо̀лы. Тых, хто разwо̀дзɛць пчо́лы, заwўць *wъччычамі* або *бъртнікамі*. Дъбры wъччыч ма́ɛ за педзьдзɛся̀т, а то й бъльш кало́д.

Ра́мачных wульлёў ў нас німà,—ўсѣ *калòды*. Wульлі ро́бɛць так: адрɑзà̀юць ат камля̀ сàмай тòўстай хwо́і ў рост чалавѣка цɛле́ш і дзɛўба́юць ягò пѐчнɛй. Калі́ wу́лɛй зрòблɛны, яго зачыня̀юць дзьwума́ *зà-чынкамі*; та́я зà̀чынка, што падыспадам, заwѐцьцɛ *даўжнікъм*. Сьпе́раду wў̀льля ро́бɛць *wъчка* для пчол: пракрў̀чwаюць у wульлі̀ дзі̀рачку й зьве́рху закла̀дà̀юць яѐ камѐньчыкам, кабп жòўны ні праклɛwà̀лі йшчэ бъльшай дзі́рачкі й ні паѣлі пчо̀л. Зьні̀зу каме́ньчыка пакідà̀юць wў̀-зɛнькую шчы́лінку, як пралѣзсьці пчалѣ.

Wульлі́ ў нас цɛгà̀юць на *пъткуры* або *стà̀йлы*. Пъткуры ро̀бɛць у лѣсе. Wыбіра́юць тòўстаɛ крыэпкаɛ дзе́рава—хwою ці дў̀ба, і на jъм на аршы̀н дзе́сɛць-пɛтнаццаць ад зɛмлі прабіwà̀юць дзі́рку, а ў дзі́рку загàня̀юць *сьпіцу*. На канцы̀ сьпі́цы кладў̀ць дwа брускі́, а на брускі́ намъшчwаюць до̀шкі. Калі такіɛ палà̀ці зрòблɛны—пъткур гато̀вы. Іньшы разс пъткур ро̀бɛць на дwох дзѐрawах. Такі пъткур заwе́цьцɛ *дwòйнɛмі*.

Ні лёхкая шту́ка ўсьцɛгнў̀ць wульлі̀ на пъткур. Тў̀така ці ма́ла папапѐтуɛцьцɛ чалаwѣк, покуль jіх паўсьця̀гwаɛ. Wульлі̀ цɛга́юць *лі̀наю*. Адзі̀н канéц лі̀ны прыўя̀зwаюць за калɛсò, якім цɛгà̀юць wульлі̀, а другі̀ за сà̀мы wу́лɛй. Калɛсò тɑксà̀ма крыэпка прыўя̀зwаɛцьцɛ г дзе́рawy wы̀шай пъткура. Адзі̀н чалавѣк, сѣдзɛчы на прыўя̀занай г дзе́рawy *плѐці*, крў̀ціць рукà̀мі й нɑгà̀мі калɛсò, а другі̀ зьні̀зу атпіхàе wў̀лɛй ад дзѐ-рawa, што́бп лɛхчэ̀й было́ цягну́ць. На пъткур ста̀wɛць па чатыры-п'яць wульлёў. Іньшы разс нат пъткурам ішчэ̀ ўсьця̀гwаюць дwа-тры wульлі̀ адзі̀н над адны̀м пɑт сà̀мы *шчыт* дзѐрawa. Wульлі̀ накрыwаюць бɛро́стай й дзераўя̀нымі *кругà̀мі*.

На пъткур ла̀зɛць па *астро̀зі*. Астро̀га ро́біцьцɛ зь ɛлі̀ны. Сьсɛка̀юць ѣлку, з аднаго боку ɛе́ ачэ̀сwаюць, кабп ɛнà была́ лɛхчэ̀йшая, а з другó́га бо́ку пакіда́юць сў̀ччa, як рукъю ўзя̀ць-ця. Па е́таму сў̀ччу, як па драбі̀нах, і ла̀зɛць на ста̀йла.

Wульлі̀ ста̀wɛць на ста̀йла, кабп *садзі̀лісɛ* пчо́лы. А пчɑлà̀ лю̀біць wɛсёлаɛ мѣсца: кабп і заці̀шна было̀, і сло̀нца сьвяці̀ла, і м'jъдт быў нідалѐка. А тамў̀ пъткуры часьцѐй ро́бɛць на бару, ці дзѣ на за̀wараці, а калі́ ў бало́ці, то на грудтку́.

Штобп прыwà̀біць пчо̀лы ў wў̀лɛй, ɛго трыэба *патwарыць*. Wў̀лɛй тwо̀раць так: пѣрш за ўсе прыбіwà̀юць г галаwѣ wў̀льля *на́ўзу*—дъшчачку с трымà калъчкамі, на якіɛ надзɛюцьця *скрылі* wъску; ніжай wъску ўстɑўля̀юць *пɛрэ̀хрысьні* — дзьвѣ-чатыры нà̀крыжш пɑста̀ўленыɛ па̀лачкі, кабп падзьдзѣржwаць м'jъдт, калі̀ ɛго̀ нанó́сɛць пчо̀лы; затым у wў̀лɛй кладў̀ць зɛлёнаɛ лі̀сьцɛ алѐшніку, і ўwѐсь wў̀лɛй дъбра спы̀рскwаюць *wаскаwіцай*. Калі тwо̀раць wў̀лɛй, сà̀маɛ гла̀ўнаɛ, штобп была̀ дъбрая wаскаwі̀ца. Як зрабіць лѣпшую wаскаwі̀цу, кабп ɛнà дɑва̀ла такі пах, які нɑра̀віцьцɛ пчо̀лам, ўмѣɛ тълькі дъбры wъччыч. Трыэба кабп wаскаwі̀ца была̀ і крыэпкая (вы̀стаɛная), і салодткая, і дъбра па̀хла.

Калі wулɛй патwо̀раны дъбра, на ɛго̀ ɑдра̀зу прылɛта̀ɛ *скаль*. Скаль е́та ты̀ɛ пчо̀лы, якіɛ абіра̀юць wу́лɛй для но́waго ро̀я. Скаль абгле́дзіць увѐсь wу́лɛй, *пɑска̀ліць* па іньшых wульлёх і ста̀йлах і прывó́дзіць ро́я ў тъй wу́лɛй, які ɛнà аблюбɑwà̀ла. Так сады̀цьцɛ пчо̀лы.

Кàжны wɤччыч, адзін перад адны̀м, аж шкýры лýжацьцɛ, штобп ɛмý сѣла бɤльш пчол. І ў час райбы̀, як тɤлькі wы́блісьнɛ слòнца, wɤччыч с пляшкай wаскаwìцы й плѣцьцю за плɛчы̀ма ўжэ прэ̀цьця ў лѣс. Німà ɛму ні сьвɛтòга дня ні бýднаго. Емý ажш карціць аббѣгаць усѣ сваѣ стàйлы. Там трыэба wýлɛй ператwарыць, там паглɛдзѐць, ці ні сѣлі дзѣ на баркý ці на грудткý пчолы, бо ўчòра wѣльмі дɤбрая скаль былà, а там правѣрыць, як бɛрэ̀цьця скаль на новую wаскаwìцу. І дармо, што сѣна сухоɛ лɛжы̀ць, грыэбпцì пàрà, што снапы̀ трыэба wазіць,—wɤччыч нешмàнàɛ. Нàwɛт стары̀ɛ wɤччычы, якім-бы здэ̀цьця на пе́чы ўжэ пàрà сɛдзѐць, і тыɛ ні атстаюць ат маладзѣйшых. У Малінаві быў wɤччыч—зwалі яго Базы̀ль, якому бы̀ло з шэзьдзɛсɛт годт, і які хадзіў на мы̀ліцы (адну нагу jɤн злàмаў, ўпàўшы с стàйла), дак і тɤй Базы̀ль ішчэ̀ лàзіў па астро́зі на пɤткуры.

Чамў так зàцягwаюць пчòлы? Тут мо ні так зàйздрась чалавѣка бɛрэ, штɤ другòму сядзɛ бɤльш пчол, як гòнар, штɤ й jɤн ні гɤршы wɤччыч. А wɤччычу, калі пашанцýɛ, за лѣта сядзɛ райɤў з дваццаць—трыццаць, а то й бɤльш.

Але́ wɤччыч мàɛ пчòлы ні тɤлькі ў лѣсі, а й дòма. Даўнѣй-то бɤльш дзɛржàлі пчòлы ў лѣсі. А цɛпѐр, калі пашлò ўсякаɛ зладзѣйствa, бɤльш дзѣржаць дòма. Тут і *пчаладзёру* ні так лёхка дабрàцьцɛ да пчол, і до́глɛд лѣпшы за пчалмі: калі пчòлы нідýжыɛ, іх узімку мɤжна паткарміць; мɤжна і роя злawіць, калі ɛгò пýсьцɛць пчòлы. Абп тым, штɤ пчòлы пускàцьмуць ро́я, мɤжна давѣдацьцɛ зàгадзɛ. Калі ўwѐчары прыслухацьцɛ, як гудýць пчòлы, то мɤжна пàзнàць маладýю мàтку: ɛна пішчы̀ць тònɛнькім галаскɤм, а старàя грубѣйшым,—ѐта сwàрацьцɛ мàткі. Апроч тагò, пчо́лы, як wыйці рòю, wыхòдзɛць уwѐчары на *аблòгу* й сàдзя̀цьця зьвѐрху на wульлі. А ў дзень, пàт паўдня̀, як тɤлькі прыгры̀ɛ слòнца, пчòлы пускàюць рòя. Рɤй *зьвівàɛцьцɛ* на йгрýшы ці на я̀блыні, што бліжай к wульлю̀. Кабп рɤй пасɛдзѣў бɤльш, ɛгò дɤбра спы̀рскваюць wадɤю, а посьлɛ *абірàюць* у *лýбпку*. Лýбпку стàwɛць на зѣмлю ў істòпку, штобп пчòлы ні спàрылісɛ. А ўwе́чары шукàюць мàтку. Пчòлы з лýбпкі wысыпàюць на пòсьцілку і там іх перàграбàюць ажш пòкуль ні знòйдуць мàтку. Мàтку сàдзяць у *мàтачнік* і стàwɛць ɛгò ў прыгàтawàны wýлɛй; туды̀-ж ссыпàюць і пчòлы. Нàзàўтра пчòлы wылɛтàюць *сушы̀цьцɛ*. Праз дні тры-чàты̀ры мàтку wыпускàюць. Але быwàɛ, штɤ за е́тыɛ дні пчòлы ні прыwы̀кнуць к нòwаму wульлю̀, і ɛны̀ перахòдзɛць у нòwы wýлɛй.

Wульлі́ ці стàwɛць прòста (такі wýлɛй зawѐцьця *стàяк*), ці кладýць бòкам,—такі wýлɛй зawе́цьця *лɛжàк*, а пчòлы, штɤ ў jɤм, *лѐжнɛмі*.

Пад wòсɛнь пчòлы падглɛдàюць. Дɤбрыɛ стары̀ɛ пчòлы нанòсɛць м'jɤду *дапоткі* (данізу). М'jɤдт ры̀эжуць *сьцельнікàмі* й склàдàюць ў лýбпку. А кабп пчòлы ні кусàлісɛ й ні лѣзьлі на м'jɤдт, іх паткýрwаюць *зýблɛм* ці *скры̀плɛм*. Зýбɛль—ѐта рашчэ̀плɛ́наɛ і ўсмàлɛнаɛ з аднагò кàнцà палѣна; зýбɛль ні гары̀ць, а тɤлькі дымі̀ць, а ды̀му, як вѐдама, баіцьця пчàла́. Алѐ калі трàпɛццьця сɛрдзі̀тыɛ пчòлы, дак і зýбɛль ні дапамòжаɜ, і пчòлы дɤбра такі нàджгàюць wɤччыча. Калі пчòлы падгле́дзɛць, wýлɛй зачыня̀юць й шчы̀льна закрыwàюць ў jɤм усѣ дзі̀рачкі, штобп узімку пчòлы ні паме́рзьлі.

Даўнѣй у лѣсі wадзі̀лісɛ дзікіɛ пчòлы—*сьлѣпаты*. Цɛпе́р ɛны̀ ўжэ даўно папераɜwòдзілісɛ. А мо йшчэ дзѣ па казённых лɛсòх і трàпля̀юцьцɛ—хто ɛгò вѣдаɛ.

Майсе́еўка.

КАРТА ПАРЫЦКАГА РАЁНУ



ЦНБ НАН Беларуси

Памылкі і папраўкі.

Стар.	Радок.	Надрукована	Трэба
3	21 (зьверху)	ная кую	на якую
8	15 (зьнізу)	XIII—XVII	XIII—XVIII
14	2 (зьверху)	Белакае	Беларускае
21	22 „	Сёмкава	Сямкова
24	17 (зьнізу)	зьвычайнае	звычайнае
25	11 „	Albrỳcht i Mikołaỳ	Albrỳcht l Mikołaij
32	21 (зьверху)	przymuoszony	przymuszony
41	7 „	*губных зычных*	*зычных*
66	28 (зьнізу)	бясспэчна... дэналізацыі	бясспрэчна... дэналізацыі
„	3 „	укрїнськіх	украінських
67	5 „	высьвятляцца	высьвятляюцца
69	24 (зьверху)	вымаўляецца	выяўляецца
72	4 (зьнізу)	пасьля	перад
83	6 „	sorbischen	serbischen
„	4 „	takulty universisty	fakulty university
„	3 „	kosmenkého	komenského
84	10 (зьверху)	ᾱν	Ἰάν
86	22 (зьнізу	лац	лац.
„	13 „	chlòd	chłód
92	17 „	chustacrka	chusteczka
94	21 „	chc. лав.	ch слав.
105	17 (зьверху)	как	„какъ“
120	12 „	ѥако ѿ чалевѣка	ѥако ѿ галелѣю
122	1 (зьнізу)	ténvsi	tenvis
123	19 (зьверху)	*Q	ǫ
„	2 радок увагі [1])	чаргаваньне jv || y	чаргаваньне jy || y
125	21 (зьнізу)	(ъ зам. ъ)	(ъ зам. ы)
128	16 (зьверху)	тады ак у помніках...	тады як у помніках...
129	увага, апошні радок:	польск. Судапі	польск. Cygani
130	4 (зьверху)	і (ы э)	*i* ° (ы э)
134	2-3 „	ввершенѣ	вверженѣ
135	2 „	на стр. 135 [1])	на стр. 136 [1])
136	3 „	ѥоко	ѥако
137	увага [1])	1. Частицы ć	1. Частицы ći
140	6 (зьнізу)	св. 1144 г.,	ев. 1144 г.,
143	19 (зьверху)	для гістарычнай рускай дыялекталёгіі,	для гістарычнай беларускай (і наогул усх.-слав.) дыялектолёгіі,

ЦЭБНАЕ Беларусі

Стар.	Радок	Надрукована	Трэба
143	увага [1])	на мясцовы заходня-рускі слоўнік,	на мясцовы „заходня-рускі“ слоўнік,
145	23	ѡбеца	ѡбецаⷣ
„	24	ра	тоє раⷣ оучинити
146	2	пре вики	преⷣ вики
148	4	бо̀ле	бо́леᵒ
149	3	па зьмесцу	па зьместу
150	9 зьнізу	роличности	ро̀личности
153	14 зьверху	і гравюрамі	і мініатурай.
„	9 зьнізу	єфрѣє	єфрѣеⷬ
„	17 „	ѿ слоубы	ѿ слоуⷬбы
154	25 зьверху	χενϛαυρους	χενταυρους
157	5 „	ѡ се имѣѧ	ѡ сеⷬ имѣѧ
„	6 „	въ памѧ	въ памѧᵀ
„	7 „	въсхотѣ	въсхотѣˣ
160	7 (зьнізу)	пачатковая	пачатковай
163	12 „	Значнаю	Значную
167	7 „	ў кавалах	ў кавалках
176	7 „	сарашо́чак	с арашо̀чак
225	20 „	мы	му
249	11 „	назыралі	назіралі
280	21 (зьверху)	спаткаюцца	спатыкаюцца
282	1 (зьнізу)	грамадзкіх клясавых	грамадзкіх
289	8 „	не зьяўляюцца	не зьяўляецца
„	1 „	моўнай	мовазнаўчай
309	19 (зьверху)	злу, чэнкьняў	злучэньняў
„	33 „	надзвычайне	надзвычайна
312	9 „	Бубруйшчыны	Бабруйшчыны
214	14 „	заяўленьне	зьяўленьне
„	10 (зьнізу)	Падрэсьліваючы	Падкрэсьліваючы
315	6 (зьверху)	locale .u	locale і
„	30 „	выстрачаў-бы	выстарчаў-бы
317	8 (зьнізу)	Харабарскай	Харобарскай
318	6 (зьверху)	Да питання	До питання
„	10 „	можа	можна
319	10 „	Дыялектологіческія	Диалектологические
320	29 „	пахозячы	паходзячы

Увага да стар. 10, п. V: „Кнігі рэлігійна-навуч. характару“.

Для мэтаў Гістар. Слоўніка будуць часткова выкарыстаны толькі „Учит. ев. Калиста“ 1606 г., як найбольш цікавае па мове і часткова ев. Цяпінскага. Усе іншыя, памянёныя ў гэтым пункце помнікі выкарыстоўваць не прадбачыцца.

ЦНБ НАН Беларусі